ПАМЯТЬ

ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ ХРОНІКІ ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ ВЫДАННЕ СТВАРАЕЦЦА ПАВОДЛЕ РАШЭННЯ ЎРАДА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВЕТКАЎСКІ РАЁН

У 2-х кнігах

Кніга 1

МІНСК
БЕЛТА
1997

ББК 63.3 (4 Бен)
П 15
УДК 947.6

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ:

Г. К. КІСЯЛЁЎ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, І. А. ПРОЦКІН, У. Я. РАЙСКІ, Я. І. ЧАВАНЬКОЎ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ:

Я.І. ЧАВАНЬКОЎ (старшыня камісіі), С.В. АНАМАМЕДАВА, В.В. АРХІПЕНКА, Г.А. ДУБРОЎСКАЯ, Э.С. КАВАЛЁЎ, Л.І. КАРМАЧОЎ, А.А. КЕЎЛІЧ, У.Д. МЕЛЬНІКАЎ, Г.Р. НЯЧАЕВА, М.П. САВОСТАЎ, Г.А. СВЯТЛОВА, С.А. СІРАЦІНСКІ, Л.В. СТАРАВОЙТАВА, У.У. ЦЕЙКІН, Я.Я. ЧУМАКОЎ, М.П. ШАРАЕЎ, У.В. ШЫЦІКАЎ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК ПАМЯЦІ ДЗЯРЖКАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:

А.Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік), М. З. БАШЛАКОЎ, У. І. ЛЕМЯШОНАК

Укладальнік
У.Я. РАЙСКІ

Мастак
Э.Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В.А.РАГАЛЕВІЧА

П 9470600000

© БЕЛТА, 1997
© Афармленне. Э.Э.Жакевіч, 1997

ISBN 985-6302-04-8

Уезд у г. Ветка.

100 – 35 тыс. да н. э.	Магчымы час засялення тэрыторыі Веткаўшчыны.
9 – 5 тыс. да н. э.	Гэтым часам датуюцца археалагічныя знаходкі каля в. Рудня-Споніцкая.
1-я палова 3-й чвэрці 1-га тыс. н. э.	Засяленне Веткаўшчыны славянскімі плямёнамі.
VIII – IX ст.	Тэрыторыя Веткаўшчыны заселена радзімічамі.

Пойма р. Беседзь.

Канец IX ст. н. э.	Веткаўшчына ў складзе Кіеўскай Русі.
Каля 1360 г.	Веткаўшчына ўвайшла ў Вялікае княства Літоўскае.
Пачатак XVII ст.	Веткаўшчына належыць федэратыўнай дзяржаве — Рэчы Паспалітай.
1601 — 1603 гг.	Голад, масавая смяротнасць, уцёкі жыхароў з Веткі.
Канец 70-х гг. XVII ст.	Першае ўпамінанне пра раскольнікаў у в. Хальч.

Гарадзішча ва ўрочышчы Баяршчына каля пасёлка Гарадок.

1685 г.	Заснаванне Веткі.
Канец XVII — пачатак XVIII ст.	Сфарміравалася веткаўская школа іканапісу.
1709 г.	У в. Старое Сяло веткаўскімі старавераміі стрыманы войскі Карла XII, за што Пётр I выказаў падзяку старавераm.
1735 г.	Уварванне расійскіх войск на Веткаўшчыну і "першае выгнанне" старавераў у Сібір.
1758 г.	Пачалася дзейнасць Пакроўскай царквы ў Ветцы.

Разварот Евангелля П. Мсціслаўца. Вільна, 1575 г.
З фондаў Веткаўскага дзяржаўнага музея народнай творчасці.

1772 г.	Тэрыторыя Веткаўшчыны ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.
1772 г.	У Ветцы 15 тыдняў пражываў Емяльян Пугачоў.
1784 г.	Ветка і Хальч атрымалі афіцыйны статус мястэчка.
Канец XVIII ст.	Ветка разам з Гомелем — цэнтр суднабудаўніцтва на Беларусі.
Пачатак XIX ст.	Хваляванні прыгонных сялян на Веткаўшчыне.

Разварот рукапіснай кнігі стараабрадцаў.
З фондаў Веткаўскага дзяржаўнага музея народнай творчасці.

1819 — 1820 гг.	Існаванне адной з першых на Веткаўшчыне мануфактур у Свяцілавічах.
1840 г.	У Ветцы адкрылася Праабражэнская царква.
Першая палова XIX ст.	Ветка — буйны гандлёвы цэнтр.
1850 — 1890 гг.	Тэрыторыя Веткаўшчыны — адна з буйнейшых памешчыцкіх латыфундый Магілёўскай губерні.
1868 г., 1874 г.	У Ветцы адкрыты жаночае, а потым мужчынскае народныя вучылішчы.

Фрагмент кнігі “Праздники певчие”, 1826 г.
З фондаў Веткаўскага дзяржаўнага музея народнай творчасці.

1900 г.	У Ветцы пабудавана местачковая бальніца на 15 ложкаў.
Пачатак XX ст.	Ветка ўвайшла ў Гомельскі павет.
1 сакавіка 1917 г.	Выбраны камітэт гарадской бяспекі і дабрабыту.
4 сакавіка 1917 г.	Выбраны першы Савет салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў.
28 жніўня 1917 г.	Створаны першы на Веткаўшчыне чырвонагвардзейскі атрад для барацьбы з карнілаўшчынай.

Веткаўская школа іканапісу. Ікона "Чудо Георгия о змие". 1900 г.

Кастрычнік 1917 г.	У Ветцы створаны саюз сялянскай моладзі (кіраўнік І. Дз. Баравіцкі).
Люты 1918 г.	Веткаўшчына акупіравана германскімі войскамі.
2 снежня 1918 г.	Ветка вызвалена ад нямецкіх акупантаў. Пачатак дзейнасці Саўдэпа.
18 снежня 1918 г.	Ствараюцца камітэты сялянскай беднаты.

Сядзібны палац у в. Хальч. Пабудаваны ў пачатку 19 ст.

26 красавіка 1919 г.	Створана і ўключана ў РСФСР Гомельская губерня, у склад якой увайшла і Ветка.
1925 г.	Ветка атрымала статус горада.
23 мая 1925 г.	Пачала працаваць электрастанцыя ў Ветцы.
8 снежня 1926 г.	Гомельская губерня скасавана. Ветка ў складзе Гомельскага павета перададзена БССР.

Веткаўская дамавая разьба. Фасад дома на адной з вуліц Веткі.

8 снежня 1926 г.	Утвораны Веткаўскі раён.
1928 г.	Арганізавана канатна-вяровачная арцель "Пралетарый".
1929 г.	Заснаваны шавецкая майстэрня "Трудавік", кавальская арцель "Металіст", ткацкая арцель імя Розы Люксембург.
	Пачала працаваць швейная арцель "Аб'яднанне".

Мемарыял савецкім воінам, якія загінулі пры вызваленні раёна, г. Ветка.

1931 г.	Заснавана ткацкая арцель імя Н. К. Крупскай. На будаўніцтва шахт у Данбас з раёна накіравана 250 чалавек.
20 мая 1931 г.	Выйшаў у свет першы нумар раённай газеты "За бальшавіцкія тэмпы".
1935 г.	Пабудавана інфекцыйная бальніца на 20 ложкаў.
Люты 1935 г.	Адноўлены Свяцілавіцкі раён (існаваў у 1926—27) з цэнтрам у в. Свяцілавічы.



Помнік савецкім воінам у в. Хальч.

1938 г.	Пачала самастойна працаваць панчошна-трыкатажная фабрыка імя 20-годдзя ВЛКСМ.
15 жніўня 1940 г.	У Кнігу гонару УСГВ занесены 11 калгасаў і больш за 125 перадавікоў-калгаснікаў Веткаўшчыны.

Від на Ветку і мост цераз Сож з боку в. Хальч.

22 чэрвеня — 18 жніўня 1941 г.

Веткаўшчына ў прыфрантавой зоне.

З 23 чэрвеня райваенкамат праводзіць мабілізацыю.

У Веткаўскім і Свяцілавіцкім раёнах утвораны знішчальныя батальёны, ствараюцца атрады народнага апалчэння.

18 жніўня разгарнуліся жорсткія баі за г. Ветку, які абаранялі часці 55-й дывізіі.

У гэты ж дзень вораг заняў Ветку. Пачалася акупацыя раёна.

ДА ЧЫТАЧА

Веткаўшчына... Адметны куток зямлі беларускай. Адметны не толькі сваёй багатай прыродай, але і надзвычай цікавай гісторыяй. Яго памежнае размяшчэнне на ростанях вялікіх гістарычных зрушэнняў, нашэсцяў, перасяленняў з захаду на ўсход і з усходу на захад, з поўначы на поўдзень і з поўдня на поўнач, незлічонае мноства ўзброеных канфліктаў і войнаў пакінулі на Веткаўшчыне свае глыбокія сляды.

Ветка, Веткаўшчына здаўна асацыіруецца з падзеямі царкоўнага расколу на Русі, як месца бурных культавых і палітычных баталій, што мелі немалую міжрэгіянальную і міждзяржаўную значнасць.

Веткаўшчына грунтоўна засведчыла сябе ў перыяд новай і найноўшай гісторыі. Рэвалюцыйныя падзеі і абарончыя баі пад час грамадзянскай вайны і нашэсцяў акупантаў паказалі высокую грамадзянскую актыўнасць і патрыятычную годнасць пасяленцаў веткаўскага краю.

Глыбокі след на Веткаўшчыне пакінулі жорсткія, кровапралітныя баі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Праславілі сябе веткаўчане ў партызанскім руху і антыфашысцкім падполлі, у пасляваенным аднаўленні гаспадаркі. Не абмінула слаўны край і чарнобыльская бяда.

Пра ўсё гэта апавядае Хроніка Памяці, якая ствараласяпрафесійнымі даследчыкамі і аматарамі-краязнаўцамі на працягу некалькіх гадоў. Яна выдаецца ў дзвюх кнігах. Першая ахоплівае перыяд са старажытных часоў да 1941 года, а таксама ўключае агульны гістарычны нарыс пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны і змяшчае спісы воінаў Чырвонай Арміі, якія загінулі ў час абароны і вызвалення Веткаўскага раёна і пахаваны на яго тэрыторыі.

Пры напісанні кнігі выкарыстаны матэрыялы з фондаў Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі, гістарычных архіваў Масквы і Санкт-Пецярбурга, Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва, Цэнтральнага ваенна-марскога архіва, Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці, архіва Інстытута гісторыі АН Беларусі і інш. Раённая камісія па стварэнні рукапісу хронікі і выдавецтва выказваюць шчырую падзяку ўсім, хто прымаў удзел у рабоце над кнігай і садзейнічаў яе выданню.



Шчыльнасць забруджвання тэрыторыі раёна цэзіем-137 (студзень 1991 года)
Кі/км²
больш за 40
15–40
5–15
1–5
ВЕТКАЎСКІ РАЁН
Цэнтры раёнаў
Цэнтры сельсаветаў
Рудня-Барталамееўская
Зялёная Дуброўка
Валосавічы
Лецяхі
Любоўша
Нісімкавічы
Кашкаўка
Гацкае
Рудня-Нісімкавіцкая
Казацкія Балсуны
Яменец
Верхлічы
Бабічы
Покаць
Вял. Нямкі
Мал. Нямкі
Стаўбунка
Янова
Навілаўка
Скачок
Байлукі
Петраполле
Сябровічы
Дубраўка
Акшынка
Свяцілавічы
Стаўбун
Коўбаўка
Неглюбка
Жалезнікі
Зарэчча (нетылы)
Г О М Е Л Ь С К А Я В О Б Л.
Ухова (нетылы)
Рэчкі
Гарысты
Камінтэрн
Пралетарскі (нетылы)
Стар. Грамыкі
Аднаполле
Шырокае
Рудня-Шлягіна
Хізы (нетылы)
Нов. Грамыкі (нетылы)
Свяцк
Прысно
Барчанкі
Шарсцін
Барталамееўка
Данілавічы
Ягаднае
Стар. Закружжа
Веткаўскі батанічны заказнік
Пыхань
Навасёлкі
Пабужжа
Барба
Марозаўка
Калініна
Радуга
Сівенка
Папсуеўка
Кругоўка
Бальшавік
Хальч
ВЕТКА
Масцішча
Нов. Жыццё
Касцюкоўка
Лапаціна
Тарасаўка
Дубовы Лог
Дзямянкі
Ляўонцева
Стар. Сяло
Яроміна
Пакалюбічы
Д О Б Р У Ш С К І Р - Н
Краснае
Мар'іна
ГОМЕЛЬ

ВЕТКАЎСКІ РАЁН размешчаны на ўсходзе Гомельскай вобласці. Утвораны 8.12.1926. Працягласць тэрыторыі раёна з поўначы на поўдзень — 65, а з захаду на ўсход — 48 км. Агульная плошча — 1563 кв. км.

Межы раёна праходзяць: на поўначы — з Чачэрскім, на захадзе — з Буда-Кашалёўскім, на паўднёвым захадзе — з Гомельскім, на паўднёвым усходзе — з Добрушскім, на ўсходзе — з Чырванагорскім і Краснабыкаўскім раёнамі Бранскай вобласці Расійскай Федэрацыі. Горад Ветка — цэнтр раёна (22 км ад чыгуначнай станцыі Гомель).

На 1.01.1985 у складзе раёна быў 141 сельскі населены пункт, 20 сельскіх Саветаў: Акшынскі, Барталамееўскі, Вяліканямкоўскі, Данілавіцкі, Калінінскі, Маланямкоўскі, Навілаўскі, Неглюбскі, Прыснянскі, Радугаўскі, Рэчкаўскі, Свяцілавіцкі, Сівенскі, Старазакружскі, Стаўбунскі, Хальчанскі, Хізоўскі, Шарсцінскі, Яноўскі. Пражывала 39360 чалавек, у т. л. насельніцтва г. Веткі складала 9600 чалавек. Шчыльнасць насельніцтва — 25 чалавек на адзін кв. км.

Тэрыторыя раўнінная. На ўсходзе невялікія марэнныя грады і дзюнна-ўзгорыстая форма рэльефу, найвышэйшая адзнака 180,9 м над узроўнем мора ля в. Ст. Закружжа.

Сярэдняя тэмпература студзеня – 7°, ліпеня +18,6° С. Ападкаў —580 мм за год. Вегетацыйны перыяд 198 сут. Глебы сельскагаспадарчых угоддзяў (у %): сугліністых — 25,5, супяшчаных — 40,2, пясчаных — 24,3, тарфяных — 9,9.

Карысныя выкапні: 87 радовішчаў торфу — 16,8 млн. т., 12 радовішчаў легкаплаўкіх глін — 3,7 млн. куб. м, радовішча мелу і мергелю.

Сельскагаспадарчыя ўгоддзі складаюць 51006 га (32,8%), пад лясамі і лесапасадкамі 50916 га (32,74%), балотамі — 3187 га (2,05%).

Добра развітая рачная сетка, якая належыць басейну Чорнага мора. Галоўныя рэкі Сож і яго прытокі Беседзь, Нёманка, Спонка, Ліпа.

Беседзь у сваю чаргу прымае воды Пералёўкі, Стаўбункі, Вядзерні. На пойме шмат старыц. Рэкамі і ручаямі, азёрамі і сажалкамі, каналамі і калектарамі занята 2370 га (1,52 %). Па тэрыторыі раёна праходзяць аўтадарогі: Гомель — Ветка — Свяцілавічы — мяжа Расійскай Федэрацыі, Ветка — Добруш, Ветка — Чачэрск.

Астатняя плошча складае 45 680 га. 35 869 га — былыя сельскагаспадарчыя землі — забруджаныя радыенуклідамі пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС у 1986 г.

На тэрыторыі раёна Веткаўскі батанічны заказнік і частка Чачэрскага паляўнічага заказніка.

За 1986 — 1996 гг. з раёна выехала 29 тыс. чалавек, расфарміравана 8 калгасаў і саўгасаў. Перастаў існаваць 61 населены пункт.

Прадпрыемствы пераважна ў Ветцы: бавоўнапрадзільная і ткацкая фабрыкі, цэх будаўнічых матэрыялаў, маслазавод, хлебазавод, раённая сельгастэхніка, цагельныя заводы, крухмальны завод і інш. У раёне выдаюцца 5 калгасаў і 10 саўгасаў. Выдаецца раённая газета "Голас Веткаўшчыны".

Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел раёна

Веткаўскі райсавет: цэнтр — г. Ветка; в. Барталамееўка (адселена), в. Барба (адселена), в. Беседзь (адселена), в. Вераб'ёўка (адселена), п. Восава (адселены), в. Ірынаўка (адселена), в. Косіцкая (адселена), в. Купрэеўка (адселена), п. Ляскі (адселены), в. Пабужжа (адселена), в. Папсуеўка (адселена), п. Петухоўка (адселены), в. Сівенка (адселена), в. Рудня-Сліпіцкая, в. Тарасаўка, п. Тумарын, п. Усход (адселены), п. Чырвоны Кут (адселены), п. Чырвоны Шлях (адселены), п. Чыстыя Лужы.

Вяліканямкоўскі сельсавет: цэнтр — в. Вялікія Нямкі; в. Антонаўка, в. Дарынполле, в. Казацкія Балсуны, п. Новае Залядзе, п. Новая Міхайлаўка, в. Перамога.

Данілавіцкі сельсавет: цэнтр — в. Данілавічы; в. Баркі, п. Выгар (адселены), в. Замосце, п. Зялёная Хвоя, п. Красны Пахар, п. Навіны, п. Нова-Лугінцы (адселены), п. Першамайскі, п. Пралетарскі, в. Пыхань, п. Серадняцкі, п. Сіні Востраў (адселены), п. Хрушчоўка, п. Шаўцоў.

Маланямкоўскі сельсавет: цэнтр — в. Малыя Нямкі; п. Зацішша, п. Іванькін, п. Памяць, в. Пералёўка.

Неглюбскі сельсавет: цэнтр — в. Неглюбка; п. Амяльное (адселены), п. Гібкі, в. Гутка (адселена), п. Канавалава, п. Куты, п. Ляды, в. Новыя Грамыкі (адселена), п. Падгор'е (адселены), п. Падкаменне (адселены), в. Пацесы

(адселена), п. Перавессе, п. Перадавец, п. Рэпішча, п. Свабода, п. Селішча, п. Сініцына, в. Старое Закружжа (адселена), в. Шэйка.

Прыснянскі сельсавет: цэнтр — в. Прысно; п. Аднаполле, п. Барчанкі.

Радужскі сельсавет: цэнтр — в. Радуга; в. Кунтараўка, п. Новае Жыццё, п. Новы Мір.

Свяцілавіцкі сельсавет: цэнтр — в. Свяцілавічы; в. Акшынка (адселена), в. Быкавец (адселена), в. Габраўка, в. Гарысты (адселена), в. Глухаўка, в. Гута (адселена), в. Жалезнікі, п. Залужжа (адселены), п. Зарэчча (адселены), п. Камылін (адселены), п. Малінаўка, в. Навілаўка, п. Непераможны, в. Несцераўка (адселена), п. Нінэль, в. Новаіванаўка (адселена), в. Новы Малкаў (адселена), в. Някрасава, п. Падлогі (адселены), п. Падлужжа (адселены), п. Першамайскі (адселены), п. Петраполле (адселены), п. Пралетарскі (адселены), п. Рашыцельны (адселены), в. Рудня-Гулева (адселена), в. Рудня-Шлягіна (адселена), в. Рыслаўе (адселена), в. Рэчкі (адселена), в. Скачок (адселена), в. Стары Малкаў (адселена), в. Старыя Грамыкі (адселена), в. Сымонаўка (адселена), в. Сяліцкая (адселена), п. Усохі (адселены), в. Ухова (адселена), в. Фёдараўка, в. Хізы (адселена), п. Чамярня.

Стаўбунскі сельсавет: цэнтр — в. Стаўбун; п. Гарадок, в. Глыбаўка, п. Калінін (адселены), в. Коўбаўка, в. Рудня-Стаўбунская, п. Уютны (адселены), п. Юрга.

Хальчанскі сельсавет: цэнтр — в. Хальч; п. Барэц, в. Залаты Рог, п. Канічаў, п. Пабеда, в. Палянаўка, п. Станкі, в. Старое Сяло.

Шарсцінскі сельсавет: цэнтр — в. Шарсцін; п. Ляды, в. Навасёлкі, п. Раманаў Лес, в. Юркавічы, в. Ягаднае.

Яноўскі сельсавет: цэнтр — в. Янова; п. Жалуддзе, п. Лазараў, п. Расуха, в. Стаўбунскае Будзішча.

Заўвага. Да 1986 г. у раёне было 20 сельсаветаў. Пасля Чарнобыльскай катастрофы ў сувязі з адсяленнем вялікай колькасці вёсак у адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзеле раёна адбыліся істотныя змены. Былі скасаваны Акшынкаўскі, Барталамееўскі, Калінінскі, Навілаўскі, Новаграмыцкі, Рэчкаўскі, Сівенскі, Старазакружскі, Хізаўскі сельсаветы. Гэтыя назвы чытач неаднаразова будзе сустракаць на старонках хронікі, паколькі спісы загінуўшых складзены і даюцца ў кнізе паводле ранейшага адміністрацыйнага дзялення.

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

Веткаўскі раён у старажытнасці — адзін з густанаселеных куткоў Гомельшчыны. Сярод многіх фактараў, якія спрыялі пранікненню на тую ці іншую тэрыторыю чалавека, спрадвеку вядучым была наяўнасць сыравіны для вырабаў прыладаў працы. У першую чаргу гаворка пойдзе пра крэмень, бо каменны век першы, праз які прайшло ўсё чалавецтва. Таму і завецца ён каменным, што ўсе прылады, неабходныя ў гаспадарцы, выраблялiся з каменя, а на Беларусі, як і паўсюдна, дзе ён ёсць, з крэменю.

Камень гэты добра паддаецца апрацоўцы, яго лёгка раскалоць, надаць задуманую форму, прытупіць ці завастрыць краі. Апрача ўсяго, крамянёвая сыравіна лёгкадаступная, бо залягае зусім блізка да паверхні, агаляецца на схілах рэк. Буйнымі і дробнымі жаўлакамі ўсыпаны ўсе палі. Іх тут шчодра раскідаў ледавік, які наведаў і Веткаўскую зямлю. Наяўнасць мелу і глін таксама вельмі прыдатны фактар для засялення таго ці іншага рэгіёна ў старажытнасці. На апошнім этапе каменнага веку ў неаліце чалавек навучыўся ляпіць гліняны посуд.

А ці так, як зараз, выглядалі веткаўскія прасторы спрадвеку і асабліва тады, калі на зямлю гэтую ўпершыню ступіла нага чалавека? Даведацца аб гэтым нам дазваляюць сціплыя звесткі з тых далёкіх часін, якія захавала зямля. Гэта шматлікія прылады працы з каменя і костак, адыходы вытворчасці, аскепкі ляпнога посуду, рэшткі даўно пакінутых гаспадарамі пабудоў, іх жытлаў і гаспадарчых ям на паселішчах, вогнішчах, могільнікі, адзінкавыя знаходкі, вырабы са шкла і металу, скуры і дрэва. Знайсці іх можна на тэрасах рэк і пясчаных пагорках рэчышча Сожа і Беседзі, ля ціхіх завадзяў і старых рэчышчаў, у тарфяных адкладах і на пагорках сярод лугоў і балот. Пясчаныя ўзвышшы завуць тут звычайна буграмі. Шмат з іх апошнім часам разарана, некаторыя раздзьмуты ветрам. Знаходкі, якія зроблены рукой чалавека, вывучаюць археолагі. А як даведацца аб асяроддзі, у якім жылі нашы прашчуры? На дапамогу прыходзяць звесткі геалогіі, атрыманыя ў свідравінах, геамарфалогіі, палеагеаграфіі, этнаграфіі і шмат іншых.

Аб чым жа паведамілі нам гэтыя крыніцы? Як і ўся Еўропа, зямля Веткаўшчыны за апошні мільён гадоў зведала не менш 5 зледзяненняў. Нягледзячы на тое, што два апошнія не дасягнулі межаў раёна, уздзеянне іх было вельмі моцным. Інакшы накірунак мелі рэкі, пад час ледавікоў знікалі лясы, паўсюдна былі голыя тундра-стэпавыя ландшафты. Існаванне тагачаснага чалавека ва ўмовах зледзянення было практычна немагчымым. Адліга і росквіт усяго жывога, аднаўленне прыродных зон адбываліся ў перыяды



Свяцілавіцкае скрэбла.

міжледавікоўяў. Працягваліся яны некалькі тысячагоддзяў і менавіта тады чалавек паступова прасоўваўся на поўнач.

Найбольш старажытная знаходка — скрэбла — была знойдзена менавіта на тэрыторыі Веткаўскага раёна ля Свяцілавічаў. Здарылася гэта ў 1929 годзе, калі настаўнік мясцовай школы П. М. Чайкоўскі ля в. Чамерня ва ўрочышчы Каменная (Серыкава) Гара знайшоў гэтую прыладу. Ляжала яна ля вады, на поплаве правага берага Беседзі. Вызначалася цікавай формай. Нават нявопытнаму воку кідаліся ў вочы сляды апрацоўкі краю буйнымі сколамі. Рэч была пакрыта цьмяным налётам, так званай пацінай, якая выдавала яе сталы ўзрост. Усе гэтыя асаблівасці заўважылі спецыялісты-археолагі, калі рэч трапіла ў іх рукі. Па форме, тэхніцы апрацоўкі і іншых адзнаках прыладу датавалі часам мусцьерскай культуры, якая існавала 100—40 (35) тыс. да нашай эры. Гэта канец ніжняга палеаліту, які прыходзіцца на перадапошняе муравінскае міжледавікоўе. Яно доўжылася, па розных звестках, 15—20 тысяч гадоў і скончылася 95—90 тыс. гадоў таму назад.

Менавіта ў гэты час, калі надвор'е было прыкладна такім, як зараз, чалавек засяліў прасторы да 55° паўночнай шыраты. На тэрыторыі Усходняй Еўропы стаянак гэтага часу вядома каля 600. На Беларусі мусцьерскім часам датуюцца 3 прылады, адну з якіх знайшоў П. М. Чайкоўскі. Вядома, што доказы першага пранікнення чалавека ў гэты час на нашу зямлю вельмі сціплыя, бо адна рэч заўсёды можа быць выпадковай. І дадатна яна ніяк не спалучаецца з дадзенымі іншых навук, бо ляжала проста на беразе, а не ў адкладах, якія можна было б датаваць рознымі іншымі метадамі. Тым не менш, дзякуючы знаходцы ля Свяцілавічаў, магчымы час пранікнення першых людзей на зямлю Беларусі па сённяшніх дадзеных — перыяд 100—35 тыс. гадоў. Прыйсці сюды чалавек мог з больш паўднёвых раёнаў па Сожу, ці нават з усходу, з басейна Дзясны. Зусім побач з Веткаўскай зямлёй у Чачэрскім раёне ля в. Падлужжа знойдзены рэшткі наступнай па часе хвалі засялення тэрыторыі Беларусі Бердыжскай познепалеалітычнай стаянкі. Дадзеныя радыевугляроднага даследавання паказалі, што краманьёнцы, жыхары тае пары, жылі тут перад насоўваннем апошняга па часе паазерскага зледзянення прыблізна 23 тыс. г. таму назад. Па сваіх фізічных дадзеных яны ўжо нічым не адрозніваліся ад нас. Палявалі, займаліся збіральніцтвам і, магчыма, рыбнай лоўляй. Жылі гэтыя людзі ў суровы час надыходу апошняга зледзянення, ва ўмовах вечнай мерзлаты, амаль поўнага бязлесся. Таму вымушаны былі будаваць жытлы з костак буйных жывёл, у першую чаргу маманта, шыць вопратку, абутак, дзень і ноч паліць вогнішчы.

Можа, і над маўклівай Беседдзю ці магутным Сожам у той час гарэлі кастры, але ніякіх рэштак позняга палеаліту на тэрыторыі раёна пакуль не знойдзена.

Летапіс існавання чалавека на Пасожжы спыняецца зноў. Увесь перыяд максімальнага насоўвання валдайскага ледавіка (18—17 тыс), яго паступовага адступлення на поўнач, пасляледавіковы перыяд (14—10 тыс.), калі працягвалася



Археалагічныя раскопкі ва ўрочышчы Аўрамаў Бугор. Цёмная пляма ў цэнтры раскопу — рэшткі жытла.

фінальная стадыя палеаліту, не маюць пэўных доказаў існавання на тэрыторыі Веткаўшчыны чалавека. Але гэта, відаць, не адпавядае рэчаіснасці. Магчыма, мы яшчэ проста не знайшлі такіх доказаў, а ўлічваючы чарнобыльскую бяду, не хутка знойдзем.

Па стану на 1990 г. на тэрыторыі Веткаўскага раёна вядома больш 200 археалагічных помнікаў розных эпох, большасць з якіх — каменнага ці бронзавага веку.

Вывучаць старажытнасці краю пачалі яшчэ ў канцы мінулага стагоддзя, калі звесткі аб курганах і гарадзішчах трапілі ў "Збор 1873 г.", праведзены Імператарскай Археалагічнай Камісіяй. У канцы XIX ст. Е. Р. Раманаў і У. Б. Антановіч (1895) правялі першыя раскопкі курганоў ля вёсак Радуга і Навасёлкі. У рабоце Е. Р. Раманава "Археологический очерк Гомельского уезда" (1910) зроблена абагульненне ўсіх вядомых на той час звестак. Краязнаўцы М. В. Фірсаў, С. Ю. Чалоўскі, І. А. Сербаў і інш. прыклалі шмат намаганняў, каб высветліць старонкі старажытнай гісторыі Веткаўшчыны. У даваенныя гады ўжо ў XX ст. пошукі старажытнасцей звязаны з імёнамі К. М. Палікарповіча, А. М. Ляўданскага, Л. Д. Кавалені, а ў пасляваенныя гады тут працавалі І. І.Арцёменка, І. В. Цюрына, Е. Г. Краскоўская, У. Дз. Будзько, І. М. Ціханенкаў. З сярэдзіны 80-х гадоў найбольш актыўныя работы звязаны з працамі аўтара гэтага артыкула, аматараў і навукоўцаў з Гомеля і Веткі (А. А. Макушнікава, У. У. Багамольнікава, С. Я. Расадзіна, А. І. Драбушэўскага, В. І. Сычова, Н. Н. Бычкова, С. М. Васільева, Ю. У. Абадэнка і інш.). Дзякуючы актыўнай рабоце супрацоўнікаў Веткаўскага краязнаўчага музея ўдалося выратаваць дзесяткі старажытных рэчаў. Значная частка новых звестак атрымана ў выніку разведак 1993 г., праведзеных пад кіраўніцтвам А. А. Макушнікава.

У наступны раз чалавек з'явіўся на тэрыторыі раёна, відаць, у канцы палеаліту — пачатку мезаліту (сярэдні каменны век, 9 – 5 тыс. да нашай эры). Найбольш старажытнымі выглядаюць знаходкі з наваколляў в. Рудня-Споніцкая, на р. Спонка. У гэты ж час зусім побач жылі плямёны, якія стварылі свідэрскую і грэнскую культуры. Стваральнікі першай, напэўна, фінальна-палеалітычнай, прыйшлі з заходніх і паўднёва-заходніх раёнаў, а паходжанне і час з'яўлення грэнскага насельніцтва пакуль дакладна не высветлены.

Асаблівасцю першых быў выраб прылад працы з пласцін, а другія дзеля гэтых мэт часцей выкарыстоўвалі адшчэпы. Верагодна, тое і другое насельніцтва неаднойчы наведвала Веткаўскую зямлю, бо асобныя прылады, тыповыя для адзначаных



Наканечнікі стрэл розных тыпаў з мезалітычных паселішчаў у Веткаўскім раёне.

культур, неаднаразова сустракаліся на розных помніках.

Найбольш дакладна вывучаны старажытнасці мезалітычнай эпохі, бо на помніках гэтага часу праводзіліся археалагічныя раскопкі. Цэлы шэраг помнікаў знойдзены намі ля вёсак Глыбаўка і Новыя Грамыкі. На двух з іх ва ўрочышчах Аўрамаў Бугор і Бабулін Бугор праводзіліся раскопкі.

Што ўдалося высветліць? Абодва помнікі пакінуты насельніцтвам мезалітычнай эпохі ў другой палове яе існавання. Насельнікі належалі да сожскай познемезалітычнай культуры, якая склалася ў 8–7 тысячагоддзях на тэрыторыі Верхняга Падняпроўя шляхам далейшага развіцця грэнскай культуры пад уплывам свідэрскай. Для іх гаспадарчай дзейнасці былі ўласцівы заняткі паляваннем, збіральніцтвам і рыбнай лоўляй.

Усё гэта знайшло адбітак у характары тагачасных прылад. Сярод іх найбольш вызначальныя наканечнікі стрэл. Амаль усе яны зроблены з тонкіх пласцін і маюць дрэўка для замацавання ў расшчэпленай косці ці дрэве. Адносна невялікія іх памеры абумоўлены значнымі зменамі ў складзе паляўнічых відаў. Да таго пары вымерлі многія прадстаўнікі верхнепалеалітычнага комплексу (напрыклад, маманты, валасатыя насарогі), на якіх традыцыйна палявалі першыя жыхары Беларусі. Дзічына змяльчэла, адпаведна і зброя стала больш прыстасаванай да палявання ў лесе і на менш буйнога звера.

На помніках знойдзены і шматлікія прылады для апрацоўкі скур забітых жывёл, разбірання іх. Гэта сякеры і нажы, скрабкі, якімі здымалі са скур тлушч, скоблі для апрацоўкі круглай паверхні, свярдзелкі і праколкі, каб шыць вопратку і абутак, разцы для працы па косці, дробныя прылады геаметрычнай формы, з дапамогай якіх утваралі састаўныя прылады. Знойдзены адбойнікі, якімі адбівалі ад крамянёвых жаўлакоў патрэбныя карыктоўкі і рэтушоры, з дапамогай якіх іх даводзілі да патрэбнага рабочага стану (прытуплялі і завастралі, выраблялі пазы ці рукаяці і інш.).

На двух паселішчах знойдзены рэшткі жытлаў. Паўзямлянкавыя ямы круглай ці авальнай формы былі паглыблены ў зямлю ў сярэднім на 0,5 м. У сярэдзіне ёсць рэшткі вогнішча, якое размяшчалася ў паглыбленні падлогі. Дыяметр жытлаў не перавышаў 2,5 метра. Невялікія памеры сведчаць аб тым, што жытлы былі заселены парнымі сем'ямі, якія вялі самастойную гаспадарчую дзейнасць. На падлозе засталіся недаробленыя прылады і нарыхтоўкі. Імі была ўсыпана і ўся паверхня вакол жытлаў і асабліва ля вогнішчаў, размешчаных побач.

На прыведзеных малюнках паказаны асноўныя тыпы розных прылад, без якіх немагчыма было абысціся ў тагачаснай



Прылады працы з мезалітычных паселішчаў у Веткаўскім раёне: 1—3 — разцы; 4—7 — вастрыі; 8—12 — скрабкі; 13—14 — нажы; 15—17 — укладышы; 18 — сякера; 19 — цясла.

гаспадарцы. Углядзіцеся ўважліва ў гэтыя малюнкі: менавіта так выглядалі ўсе тыя прыстасаванні, якімі карыстаемся мы зараз, увасобленыя ў камені. Трывалыя, прыгожыя рэчы, якія, здаецца, захавалі яшчэ цяпло рук нашых прашчураў. Адназначна можна сказаць, што з тае пары чалавек ніколі не сыходзіў з зямлі Беларусі. З пакалення ў пакаленне ён перадаваў свой вопыт і сваё духоўнае багацце.

Помнікаў мезалітычнай пары на Веткаўшчыне не менш 30. Многія з іх размешчаны на тэрасах 5—7-метровай вышыні на берагах Сожа і Беседзі. Зразумела, каштоўнасць іх розная, ёсць малыя і вялікія паселішчы, ёсць і адзінкавыя рэчы. Калі праз стагоддзі зноў з'явіцца магчымасць вывучаць гэтую зямлю шляхам раскопак, няма сумнення, што даследчыкаў чакаюць вялікія нечаканасці і адкрыцці.



Матыка з рога лася (знойдзена ў рэчышчы Сожа ў Ветцы).

Неабходна звярнуць увагу на помнікі ля вёсак Чамерня, Малыя Нямкі, Вялікія Нямкі, Перамога, Глыбаўка, Рудня-Стаўбунская і Споніцкая, Новыя і Старыя Грамыкі, Барталамееўка, Осава, Вераб'ёўка, Някрасава, Беседзь, Прысно, наваколля г. Веткі. Ва ўсіх гэтых месцах ёсць выразныя сляды помнікаў далёкай мезалітычнай пары.

На жаль, глебы Пасожжа дрэнна захоўваюць арганічныя рэчывы, у прыватнасці косць. А яна ў старадаўнія часы ўжывалася вельмі часта. Яшчэ ў неаліце чалавек шырока карыстаўся косцю як будаўнічым матэрыялам, палівам, прыдатнай сыравінай для вырабу разнастайных рэчаў ад рыбалоўных кручкоў да гузікаў і музычных інструментаў.

У мезалітычны час таксама выкарыстоўвалі косць для вырабу вельмі тонкіх стрэл і розных навершыяў і дзяржанняў. Рагавыя муфты, сякеры, скульптурныя вывявы, гарпуны і самыя розныя рэчы неадноўчы знаходзілі ў вадзе ці тарфяных адкладах. Вядомы такія рэчы і з межаў Веткаўскага раёна, у прыватнасці з самой Веткі.

У канцы V – пачатку IV тысячагоддзя да н. э. жыхары Пасожжа навучыліся ляпіць гліняны посуд. Гэтая падзея лічыцца фармальнай адзінкай пачатку новай гістарычнай эпохі неаліту (новы каменны век). На самай справе гэта быў надзвычай важны, пераходны момант у гісторыі, час першага буйнога грамадскага падзелу працы і станаўлення вялікіх племянных аб'яднанняў.

Тэрыторыю Веткаўшчыны, як і ўсё Пасожжа, у гэтыя часы насялілі плямёны верхнедняпроўскай культуры. Каранямі яна адыходзіць у мясцовы мезаліт, а ў плане гістарычнага лёсу – далёка на поўнач, на Валдай.

Галоўныя заняткі насельніцтва яшчэ доўгі час былі тыя самыя, бо крамянёвы інвентар неалітычнай эпохі па складу прылад адрозніваецца ад папярэдняга часу зусім нязначна. Чалавецтва ішло па шляху ўдасканалення іх формы, якасці, рацыянальнага выкарыстоўвання. На змену пласціністым наканечнікам стрэл прыйшлі рамбічныя і трохкутныя, павялічылася колькасць прылад з двухбаковай апрацоўкай паверхні, шліхтаваных, свідраваных, з дрэўкам для замацавання. Стала значна больш добра апрацаваных сякер. У комплексах з'явілася шмат (калі не большасць. – А. К.) цясляў-прылад, якімі дзяўблі лодкі.

Дзякуючы гэтым абставінам, можна меркаваць, што насельніцтва перайшло да актыўнай рыбнай лоўлі. Пачалі ўжывацца больш дасканалыя спосабы рэтушавання.

У канцы неаліту, калі на Пасожжы маглі распаўсюдзіцца жывёлагадоўля і земляробства, на паселішчах сустракаюцца крамянёвыя сярпы. Знойдзена шмат асклепкаў посуду тае пары. Яны вельмі разнастайныя і прыгожыя.

Пасудзіны рабілі шляхам паслядоўнага налепу гліняных стужак. Пры гэтым атрымлівалі востра- і кругладонныя гаршкі розных памераў. У залежнасці ад прызначэння посуд быў тонка- і таўстасценны, з рознымі дамешкамі і рознай ступенню абпалу. Увогуле ўсе гэтыя паказчыкі мяняліся па меры таго, як працэс вырабу ўдасканальваўся. Арнаментацыю ўтваралі адбіткі буйнога грэбня ці ямкавыя наколы, якія наносілі ля дна і каля венца па перыметру гаршка ці па ўсяму тулаву.



План могільніка ва ўрочышчы Страліца каля в. Рудня-Шлягіна (паводле І. І. Арцёменкі). Лічбамі абазначаны нумары пахаванняў.

Часцей посуд ўвогуле не ўпрыгожваўся.

З цягам часу арнаментацыя значна ўскладнілася. Больш сотні разнастайных элементаў складалі больш за 130 матываў, з якіх утвараліся сістэмы. Узоры былі гарызантальныя і вертыкальныя, дыяганальныя і рамбічныя, трохкутныя, лукаватыя, у шахматным парадку і інш. Пры ўсёй разнастайнасці адметнай рысай посуду верхнедняпроўскіх плямёнаў было ўжыванне трох галоўных элементаў асобна ці ў спалучэнні: грабеньчатага, ямкавага і лапчастага. Над вянцом пасудзін па кругу традыцыйна наносіўся рад ямак.

Неаліт на тэрыторыі раёна вядомы больш чым на 100 помніках, але, на паселішчах, як правіла, ён спалучаецца са знаходкамі бронзавага веку. Матэрыялы эпохі бронзы ў чыстым выглядзе можна знайсці толькі на могільніках. Але нават тады, калі вучоныя раскопвалі грунтовы могільнік бронзавага веку ля в. Рудня-Шлягіна, ім давялося знайсці шмат посуду неалітычнае пары таму, што могільнік гэты быў зроблены на месцы былога неалітычнага паселішча.

У 1963 — 1965 гг. І. І. Арцёменкам і І. М. Цюрынай ва ўр. Страліца пры ўпадзенні р. Шлягінкі ў воз. Пескавое ўскрыта 1846 м^2 культурнага слоя (пласт зямлі, які ўтрымлівае рэшткі дзейнасці чалавека). Знойдзена больш 300 прылад працы (скрабкоў, сякер, цесляў, нажоў, стрэл, скобляў, праколак, свярдзелак), некалькі тысяч адыходаў крамянёвай вытворчасці і больш за 10 тыс. фрагментаў ляпнога посуду, упрыгожанага грабеньчата-ямкавым арнаментам, адбіткамі лапчастага штампа.

Усе тыя заканамернасці, якія былі пры-



Фрагменты ляпнога посуду мезалітычнага часу з могільніка ва ўрочышчы Страліца (раскопкі І. І. Арцёменкі).



Інвентар з пахаванняў 1—12 могільніка ва ўрочышчы Страліца.

ведзены вышэй, былі ўласцівы і знаходкам са Страліцы. Рэшткі посуду і вырабы з крэменю, якія па шэрагу прызнакаў можна аднесці да неаліту, знойдзены рознымі людзьмі і ў розныя гады ля Барталамееўкі ва ўрочышчах Выдзьма, Звязда і Уборак, на захад і ўсход ад в. Беседзь, на пясчаных пагорках ля Глыбаўкі, на паўночны ўсход ад могілак в. Малыя Нямкі і ля ўрочышча Прыстань, што на другі бок ад Малых Нямкоў, ва ўрочышчы Нізкі Барок ля Навасёлак, побач з мезалітычнай стаянкай ва ўрочышчы Аўрамаў Бугор ля в. Нов. Грамыкі, па дарозе адтуль на в. Барталамееўка ва ўрочышчы Грамышчына.

У пачатку II тысячагоддзя да н.э. на землі Веткаўшчыны трапілі так званыя "шнуравікі", са з'яўленнем якіх на велізарных прасторах Еўропы адбыліся значныя перамены. У лік культур са шнуравой керамікай (упрыгожанай адбіткамі шнура) і баявымі сякерамі ўваходзіла і сяроднедняпроўская, распаўсюджаная на Верхнім і Сярэднім Падняпроўі.

Узаемаадносіны гэтых прышлых плямёнаў з тубыльцамі, перабудова ў грамадскім жыцці і ідэалогіі гэтых этнічна розных плямёнаў склалі галоўную сутнасць гістарычнага працэсу ў бронзавым веку. Эканамічныя сувязі паміж прышэльцамі і мясцовым насельніцтвам увесь час узмацняліся і прывялі да істотных змен у вытворчых адносінах. Бурнымі тэмпамі працякалі этнічныя працэсы, узніклі новыя этнічныя аб'яднанні. Першабытнаабшчынны лад уступіў у стадыю разлажэння.

У бронзавым веку асабліва пашырыліся земляробства і жывёлагадоўля. Дзеля гэтых заняткаў ужо не хапала толькі дзюнак на поплаве. Патрэбны былі палі, лугі, урадлівыя глебы. Пачалося актыўнае асваенне прырэчных прастораў, падсечка і выпальванне лесу. Таму спатрэбілася многа сякер не толькі каменных, але і з бронзы.

Адзінкавыя знаходкі гэтых рэчаў захоўваюцца ў прыватных калекцыях, школьных і Веткаўскім музеях. Знойдзены яны ля Беседзі, Веткі, Данілавічаў, у Казацкіх Балсунах, Коўбаўцы, Кунтараўцы, Малых Нямках, Навасёлках, ля Радугі, Свяцілавічаў, Сяліцкай, Старых Грамык, Старога Сяла, Ухова. Сярод іх каменныя і крамянёвыя сякеры — кліны, тоўстаабуховыя і вузкаабуховыя, свідраваныя лопасцевыя, клінавідныя і іншыя. У Ветцы з Сожа дасталі матыку з рога.

Яскравым пацвярджэннем наяўнасці ў

Посуд насельніцтва сярэднедняпроўскай культуры з могільніка ва ўрочышчы Страліца.

сярэднедняпроўскіх плямёнаў земляробства і жывёлагадоўлі з'яўляюцца знаходкі на паселішчах і ў могільніках костак буйной і дробнай рагатай жывёлы, коней, свіней, а таксама матык, зерняцёрак, адбіткаў зерня на сценках посуду.

Больш дасканалай стала і зброя. Дзеля гэтай мэты ўжывалася і частка свідраваных сякер, таму іх завуць "баявымі", а ў народзе – "грамавымі стрэламі". Інтэнсіўнае развіццё вытворчай гаспадаркі прывяло да накаплення пэўных багацяў у выглядзе збожжа, статкаў жывёл і інш. Паяўленне маёмаснай няроўнасці стала штуршком да грабежніцкіх паходаў і ўзброеных сутычак. Больш "злымі" зрабіліся і стрэлы. Трохкутныя з шыпамі, якія вы бачыце на мал., сведчаць аб мэце нанесці больш балючую і цяжкую рану.

У гэты час чалавек вельмі добра авалодаў прыёмамі свідравання, шліхтавання, паліравання, навучыўся наносіць вельмі тонкую і доўгую струменьчатую рэтуш, з дапамогай якой апрацоўваў наканечнікі стрэл і дзід, вастрыў лёзы сярпоў і нажоў.

Бронзавы наканечнік кап'я (урочышча Страліца).

Адсутнасць мясцовых руд каляровых металаў – адна з прычын вельмі рэдкіх знаходак вырабаў з іх. На ўсім Пасожжы знойдзена каля 30 рэчаў з медзі і бронзы. На думку вучоных, яны прывезены з Каўказа ці Карпат. Мясцовая бронзаліцейная прамысловасць калі і існавала, дык трымалася на перапрацоўцы гатовых зліткаў.

Менавіта на тэрыторыі Веткаўскага раёна знойдзена значная колькасць такіх рэчаў. Размова ідзе пра могільнік сярэднедняпроўскай культуры ва ўрочышчы Страліца ля в. Рудня-Шлягінская. Ніколі ў пазнейшыя часы пахавальны абрад не быў такім разнастайным.

Сярэднедняпроўскія плямёны хавалі нябожчыкаў пад курганнымі насыпамі і ў грунце па абраду трупаспалення і трупапалажэння. Паселішчы тае пары амаль не вывучаліся, затое могільнікі ўскрыты вельмі багатыя. І як дарагая перлавіна сярод іх – Страліца. На тым самым паселішчы верхнедняпроўскай культуры, якое знаходзілася ва ўрочышчы Страліца, К. М. Палікарповічам у 1926 г. знойдзены могільнік сярэднедняпроўскай культуры.

За выключэннем аднаго трупапалажэння, астатнія зроблены па абраду трупаспалення па-за межамі могільніка. Крэмацыя суправаджалася надзвычай багатым інвентаром. Тут былі крамянёвыя наканечнікі стрэл, нажы і сякеры, ляпны посуд са шнуравым і наразным арнаментам, бурштынавыя каралі, упрыгожанні з косці і металу. Знойдзены нажы, трубчастыя пранізкі пояса, дзве грыўны, 3 бранзалета і 2 вісочных кольца з меднага дроту.

Прынцыпова іншым стаў посуд, які вырабляўся насельніцтвам сярэднедняпроўскай культуры. Найбольш характэрныя для яе акругла- і плоскадонныя гаршкі з шырокім адагнутым наверх венцам. Акра-

Інвентар з пахавання № 43 з могільніка ва ўрочышчы Страліца: нажы, шліхтаваная сякера, ляпныя гаршкі, каралі з бурштыну, упрыгожанні з медзі і бронзы.

мя адбіткаў шнура, дзеля ўпрыгожання паверхні ўжывалі лінейны штамп, складваючы трохкутныя, ялінкавыя кампазіцыі. Абпал стаў лепшым, посуд танкасценным. Пераважала арнаментацыя верхняй часткі посуду. Найбольш пашыраная форма — пасудзіны з шаравідным тулавам і высокай, адагнутай наверх шыйкай.

Вельмі многа знаходак бронзавага часу далі пяскі ля Прысно, наваколлі Барталамееўкі і Малых Нямкоў, Шарсціна, Смедзіна, Ухова і інш.

У сярэдзіне II тысячагоддзя да н.э. Пасожжа засялілі плямёны сосніцкай культуры (ці варыянта тшцынецкай, што дакладна не высветлена). Гэтае насельніцтва выпрацавала прынцыпова іншы посуд. Пасудзіны мелі галоўным чынам цюльпанавідную і баначную форму. Яны былі плоскадоннымі з шырокім горлам і тулавам, якое звужалася да дна. Зрэдку арнаментавалася ўся паверхня, часцей толькі верхняя частка. Пад вянцом зноў з'явіўся ланцужок цыліндрычных наколкаў. Адным з асноўных элементаў арнаменту былі адбіткі кропачнага і ружанцавага штампа, зрэдку адбітак шнура ці буйнога грэбня. Сярод вырабаў з крэменю ў гэты час найбольш адметнымі былі сэрцападобныя наканечнікі стрэл з чарашком.

Позні перыяд бронзавага веку на Пасожжы вывучаны вельмі слаба і высветліць гісторыю насельніцтва гэтае пары пакуль немагчыма.

А. Г. Калечыц.

Таямніцы старажытных гарадзішчаў

Яшчэ ў 1873 г. складальнікі першай археалагічнай карты Веткаўшчыны — вучоныя Імператарскай Археалагічнай Камісіі — былі здзіўлены вялікай колькасцю загадкавых земляных гарадкоў, якія раскіданы па берагах Сожа і Беседзі ў наваколлях Шарсціна, Старога Сяла, Новых Грамыкаў, Жалезнікаў, Свяцілавічаў, Вялікіх Нямкоў. Звесткі пра гэтыя помнікі мінуўшчыны былі сабраны паводле паведамленняў мясцовых сялян, якія называлі гарадкамі рэшткі невялікіх "крэпасцей", пабудаваных у старажытныя часы невядомымі плямёнамі. Гарадкі прываблівалі вока назіральніка размяшчэннем у маляўнічых

Курганны могільнік каля в. Новыя Грамыкі.

мясцінах, на пануючых вышынях па-над рэкамі і поплавамі. Крутыя схілы, глыбокія яры, рэшткі штучных земляных равоў і валоў выклікалі з'яўленне паданняў пра сувязь гарадкоў з падзеямі старадаўніх войнаў, з праваліўшыміся пад зямлю палацамі, з пахаванымі тут ці то панамі, ці то казакамі скарбамі залатых манет і каштоўнасцей.

Выдатны беларускі вучоны, краязнаўца і грамадскі дзеяч Еўдакім Раманавіч Раманаў таксама зацікавіўся гарадкамі пад час сваёй гісторыка-археалагічнай экскурсіі па абшарах былога Гомельскага павета Магілёўскай губерні. Складзеная ім на рубяжы вякоў карта археалагічных помнікаў сучасных Гомельскага, Добрушскага, Буда-Кашалёўскага і Веткаўскага раёнаў была пабудавана не толькі па дадзеных апытанняў мясцовых сялян, але і па матэрыялах асабістых палявых даследаванняў. Пільны позірк вучонага не абышоў і Веткаўскія гарадзішчы. Раманава цікавіла ўсё: геаграфічныя каардынаты і мясцовыя назвы гэтых помнікаў, іх знешні выгляд, форма пляцовак, памеры равоў і валоў, ступень захаванасці і нават паданні, якія б растлумачвалі гісторыю гарадкоў. Вынікі навуковай працы Раманава былі надрукаваны яшчэ ў 1910 годзе, але яны не страцілі сваёй каштоўнасці для сучасных археолагаў і краязнаўцаў. Справа ў тым, што некаторыя помнікі, якія апісваў Еўдакім Раманавіч, былі папсаваны пад час гаспадарчай дзейнасці і ў гады другой сусветнай вайны, а іншыя нават зусім зніклі. Прыкладам такіх звестак з'яўляюцца дадзеныя Раманава пра Свяцілавіцкае гарадзішча, моцна пашкоджанае забудовай XX стагоддзя: "Гарадок на поўдзень ад аколіцы Свяцілавічы, за паўвярсты на правым беразе ракі Беседзі займае вугал берагавой тэрасы і яго форма нагадвае трохкутнік. З захаду і поўначы ахоўваецца ровам і валам, з поўдня – ярам і з усходу – ракой. Плошча каля 300 квадратных сажняў. Глыбіня рова 2 аршына, шырыня 4 аршына, вышыня вала 4 аршына, таўшчыня 6 аршынаў. Зрэшты, гарадок разворваецца пад пасевы і таму памеры равоў і валоў змяняюцца". І сапраўды, зараз ад фартыфікацый гарадзішча амаль нічога не засталося, што само па сабе сведчыць аб бескультур'і мясцовых улад.

Даследчык упершыню верна вызначыў функцыянальную прыналежнасць гарадзішч і аднёс іх да месц старажытных умацаваных паселішчаў. Пэўныя карэктыроўкі і дапаўненні ў назіранні Раманава ўнеслі працы археолагаў беларускай Акадэміі навук, якія былі здзейснены ў перадваенныя гады. У 1936 годзе выдатныя даследчыкі беларускай мінуўшчыны А.М. Ляўданскі і А.Д. Каваленя ажыццявілі суцэльную археалагічную разведку па берагах Сожа ў межах Магілёўшчыны і Гомельшчыны. Яны не толькі агледзілі гарадзішчы каля Прысно, Шарсціна, Нова-Іванаўкі, Старога Сяла, але і

знялі іх схематычныя планы, сабралі ў месцах абгаленняў старажытных культурных пластоў рэшткі глінянага посуду. Мяркуючы па знаходках металургічнага жужала на некаторых помніках і абапіраючыся на тэхналагічныя асаблівасці кавалкаў гліняных вырабаў, Ляўданскі і Каваленя аднеслі час існавання земляных умацаванняў да жалезнага веку і звязалі іх са старажытным даславянскім насельніцтвам гэтых мясцін.

Вынікі даследаванняў беларускіх археолагаў не былі надрукаваны. Вучоных напаткаў трагічны лёс: іх абвінавацілі ў шпіянажы на карысць буржуазнай Польшчы і расстралялі. Цудам пазбег "арышту" дзённік разведкі 1936 года, які захаваўся ў навуковым архіве Інстытута гісторыі беларускай Акадэміі навук. Большая частка звестак Ляўданскага і Кавалені пра гарадзішчы Веткаўшчыны была ўведзена ў навуковы абарот толькі ў 1974 годзе з выхадам манаграфіі вядомага беларускага археолага Л.Д. Побаля "Славянскія старажытнасці Беларусі".

Абгрунтаваная навуковая ацэнка веткаўскіх гарадзішчаў як каштоўных гісторыка-археалагічных крыніц на вывучэнню матэрыяльнай культуры пасожскага насельніцтва сярэдзіны I тыс. да н.э. — першых стагоддзяў н.э. выпрацавана ў 1950—1970-х г. у даследаваннях В.М. Мельнікоўскай і Л.Д. Побаля. Вучоныя адзначылі, што большасць гарадзішч Веткаўшчыны адносіцца да ліку ўмацаваных паселішчаў жалезнага веку і заснавана носьбітамі мілаградскай археалагічнай культуры, помнікі якой распаўсюджаны ў Беларускім Падняпроўі, Прыпяцкім Палессі і ў суседніх рэгіёнах Расіі і Украіны. Пэўны ўклад у распрацоўку больш дакладнай карты Веткаўскага раёна па праграме падрыхтоўкі "Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" ўнеслі разведкі С.М. Васільевай сярэдзіны 1970-х гадоў. Абследаванні гарадзішч працягвалі ў 1980-х гадах С.Я. Расадзін і А.І. Драбушэўскі. Шмат цікавых навуковых звестак пра гэтыя помнікі было атрымана ў 1991—92 гг. атрадам Гомельскага абласнога археалагічнага цэнтра, які працаваў пад кіраўніцтвам аўтара па праграме выратавання гісторыка-археалагічных помнікаў чарнобыльскай зоны.

Жалезны век на Беларусі пачынаецца ў VIII—VII ст. да н.э. Менавіта да гэтага ці крыху пазнейшага (VI—V ст. да н. э.) часу адносіцца з'яўленне на Веткаўшчыне мілаградскіх (названых так па аднаму з першых даследаваных помнікаў каля вёскі Мілаграды на поўнач ад Рэчыцы) плямён. Пачатак эпохі жалеза звязаны з вынаходніцтвам чорнай металургіі і шырокім распаўсюджаннем у побыце людзей жалезных прылад працы, больш дасканалых за каменныя, бронзавыя і касцяныя.

Першабытныя металургі знайшлі на Веткаўшчыне багатыя запасы сыравіны, неабходнай для атрымання жалеза. Мясцовае жалеза ў якасці кампанента балотна-лугавой руды (ліманіту) маецца амаль па ўсёй тэрыторыі раёна, асабліва шмат яго ў вільготных, нізкіх мясцінах. Старажытныя рудакопы добра ведалі прыкметы патрэбных месцазнаходжанняў, пра наяўнасць якіх сведчылі ржавыя плямы на мокрых месцах і абгаленні пластоў самой руды ў разрэзах рачных поплаваў. Здабыча ліманіту не патрабавала распрацоўкі глыбокіх шахтаў і штольняў, бо ягоныя запасы залягаюць на зусім нязначнай глыбіні. Для сучаснай металургіі гэтыя руданосныя пласты не ўяўляюць каштоўнасці, бо іх ёмістасць нязначная з пункту гледжання буйной вытворчасці. Аднак для саматужнага промыслу і задавальнення патрэб невялікіх калектываў спажыўцоў яны прыдатныя. Балотная руда распрацоўвалася на Веткаўшчыне з мілаградскіх часоў да XVIII ст. Багатыя яе запасы, цікавасць да іх у старажытнасці і сярэдневякоўі адлюстраваліся ў назвах мясцовых вёсак, урочышчаў, ручаёў (напрыклад, вёскі Стаўбунская і Споніцкая Рудні, ручай Іржавец каля Шарсціна).

Сутнасць старажытнага працэсу атрымання жалеза зводзілася да наступных аперацый. Здабытую руду пэўны час прасушвалі і разбівалі каменнымі молатамі на дробныя кавалачкі, якія разам з вуглем складалі металургічную шыхту. Працэс гарачай апрацоўкі сыравіны адбываўся ў спецыяльных паглыбленых ці надземных пячах-домніцах. Сценкі домніц рабілі з гліны ці гліны і каменя. Неабходная тэмпература (каля 1100 градусаў) падтрымлівалася ў іх пры дапамозе сасновых дроў і штучнага выдзімання. Старадаўнія металургі не ведалі чорнага ліцця, бо расплавіць жалеза ў домніцах немагчыма. Метал, які аддзяляўся ў печы ад пустой паро-

ды, пераходзіў толькі ў мяккі, губчасты стан. У такім выглядзе ён быў прыдатны для кавальскай апрацоўкі.

На веткаўскіх гарадзішчах шырокіх раскопак не праводзілася, таму пра асартымент асноўных прылад з чорнага металу мілаградскіх плямёнаў можна гаварыць, абапіраючыся на матэрыялы дасканала вывучаных помнікаў суседніх раёнаў Беларускага Падняпроўя. Найбольш распаўсюджанымі інструментамі былі нажы крыху выгнутай формы – універсальныя прылады промыслаў і хатняга побыту. Такі нож, напрыклад, знойдзены археолагамі на мілаградска-зарубінецкім гарадзішчы ва ўрочышчы Хомкін Рог каля Шарсціна і Прысно. Жалезныя сярпы былі неабходнымі пры зборы ўраджаю. Сякеры і цеслы з чорнага металу дапамагалі чалавеку адваёвываць у леса дзялянкі пад паселішчы і палеткі, будавацца, масціць дрыгву, узводзіць тыны драўляных фартэцый, рабіць чоўны, сані і інш. Жалезныя наканечнікі стрэл і дзід якасна адрозніваліся па сваіх баявых вартасцях ад каменных і бронзавых. З жалеза рабілі не толькі некаторыя прыналежнасці адзення, а нават і частку жаночых упрыгожванняў.

Помнікі мілаградскай культуры на Веткаўшчыне прадстаўлены пераважна гарадзішчамі, пэўная частка археалагічных матэрыялаў паходзіць з мест неўмацаваных паселішчаў. Большасць гарадзішчаў адносіцца да тыпу мысавых. Інакш кажучы, пабудаваных на мысах надпоплаўных тэрас. Гарадзішчы складаюцца з адной, радзей некалькіх пляцовак трохкутнай, прамакутнай ці круглападобнай формы плошчай ад некалькіх сот да тысяч квадратных метраў. Акрамя равоў і валоў, пляцоўкі, верагодна, умацоўваліся па перыметру драўлянымі агароджамі. Гарадзішчы забудоўваліся панадземнымі і паглыбленымі ў мацерыковы грунт драўлянымі дамамі з вогнішчамі, а таксама гаспадарчымі пабудовамі рознага прызначэння.

Мілаградскія пахаванні, адкрытыя археолагамі на суседніх тэрыторыях, зроблены па абрадзе целаспалення, рэшткі якіх (перапаленыя косці, вугаль, зрэдку керамічныя чарапкі і рэчы) высыпаліся ў невялічкія грунтавыя ямкі.

Мілаградцы добра ведалі ліццё каляровых металаў. З бронзы рабілі разнастайныя жаночыя ўпрыгожванні, а таксама пэўную частку прадметаў узбраення. На кожным гарадзішчы выраблялі гліняны ляпны посуд традыцыйнай формы і арнаментацыі. Гаршкі мелі шарападобнае ці яйкападобнае тулава, іх шыйкі аздабляліся круглымі, авальнымі адбіткамі палачкі ці пальцаў майстра. Значнае развіццё на мілаградскіх паселішчах атрымалі прадзенне і ткацтва. Сведчаннем гэтых заняткаў з'яўляюцца знаходкі керамічных грузікаў (пераважна сасудападобнай формы), частка якіх выкарыстоўвалася ў якасці прасліц. Мілаградцы падтрымлівалі эканамічныя сувязі з заходнімі і паўднёвымі суседзямі. Частка прылад працы, зброі і ўпрыгожванняў мае кельцкае (Цэнтральная Еўропа) і скіфскае (Паўночнае Прычарнамор'е) паходжанне.

Старажытнае насельніцтва Веткаўшчыны вяло комплексную гаспадарку, аснову якой складалі земляробства і жывёлагадоўля. Значную ролю ў жыцці адыгрывала паляванне, разнастайныя лясныя промыслы і рыбалоўства.

Мілаградская культура праіснавала каля 500 гадоў. Найбольш познія яе помнікі датуюцца III–II ст. да н.э. Даследчыкі яшчэ не высветлілі дакладна, якой была этнічная прыналежнасць мілаградцаў. Існуюць розныя погляды на гэтую праблему. Так, В. М. Мельнікоўская звязвае мілаградскія плямёны з неўрамі (нагаданымі старажытнагрэчаскім гісторыкам Герадотам) і бачыць у іх продкаў славян. Блізкія погляды на праблему адстойвае Л. Д. Побаль. Іншыя вучоныя лічаць мілаградскую культуру балцкай.

Большасць мілаградскіх гарадзішчаў Веткаўшчыны ў канцы III і II ст. да н.э. была заселена носьбітамі зарубінецкай археалагічнай культуры (названай па паселішчу каля вёскі Зарубінцы на Кіеўшчыне), помнікі якой размешчаны на значнай тэрыторыі – у Беларускім Падняпроўі, на Палессі і ў сярэднім Падняпроўі (Украіна). Пэўная частка зарубінецкіх паселішчаў Веткаўшчыны (напрыклад, каля вёсак Юркавічы і Рудня-Шлягіна) заснавана на нізкіх надпоплаўных тэрасах і не мае штучных умацаванняў.

Каштоўны навуковы матэрыял па вывучэнню зарубінецкага пахавальнага абраду быў атрыманы супрацоўнікам Гомельскага абласнога краязнаўчага музея А. І. Драбушэўскім пад час ратавальных раскопак (помнік разбураў-

ся пясчаным кар'ерам) бескурганнага (грунтавога) могільніка каля паўночна-заходняй ускраіны вёскі Юркавічы ў 1985—86 гг. Старажытныя пахаванні займалі дзялянку схіла правабярэжнай тэрасы Сожа, якая ўзвышалася над поплавам на 5—7 м ва ўрочышчы Сіянская гара. А. І. Драбушэўскі даследаваў тут каля 800 квадратных метраў плошчы і знайшоў 19 пахаванняў, здзейсненых па абрадзе целаспалення. Рэшткі спаленняў былі змешчаны ў круглыя (дыяметрам 0,5—0,6 м) і падоўжаныя ямы нязначнай глыбіні. Перапаленыя косці чалавека высыпаны ў магілы разам з рэшткамі пахавальнага вогнішча, а ў двух выпадках змешчаны ў керамічныя гаршкі-урны. Па меркаванню даследчыка, у час функцыяніравання могільніка па-над магіламі існавалі нейкія драўляныя пабудовы, якія адзначалі месцы пахаванняў. У магілах знойдзены тыповыя для зарубінецкай культуры грубаляпныя гаршкі, аздобленыя ямкамі па венчыку і шыйцы. Адметнай іх асаблівасцю з'яўляецца пакрыццё знешней паверхні так званай "штрыхоўкай" — слядамі апрацоўкі травой ці саломай. У жаночых пахаваннях знойдзены шкляныя пацеркі, якія паходзяць з майстэрняў антычных гарадоў — сведчанне далёкіх гандлёвых сувязяў зарубінецкага насельніцтва Пасожжа з эліпскай цывілізацыяй.

Да ліку цікавых знаходак Юркавіцкага могільніка належаць жалезныя фібулы — зашпількі для адзення. Такая фібула з пахавання № 8 "сярэднелатэнскага" тыпу датуецца I ст. да н.э. Даследчыкі лічаць фібулы найбольш яскравай, адметнай рысай зарубінецкага адзення. У некаторых пахаваннях знойдзены ўпрыгожванні з бронзы, у т.л. дротавыя скроневыя кольцы. У двух магілах былі жалезныя нажы, а ў пахаванні № 2 (яно магло належаць воіну) знойдзен жалезны наканечнік дзіды. Юркавіцкі могільнік датуецца I ст. да н.э. — I ст. н.э.

Асноўныя заняткі зарубінцаў былі тыя ж, што і ў іх гістарычных папярэднікаў. Аднак зарубінецкая гаспадарка была больш прагрэсіўнай. У прыватнасці, размяшчэнне зарубінецкіх паселішчаў на найбольш урадлівых глебах, верагодна, сведчыць, што земляробства пасожскага насельніцтва было пераважна ворыўным, заснаваным на апрацоўцы палёў раламі і ўгнойванні глебы. Мясцовыя плямёны валодалі дасканалымі прыёмамі апрацоўкі каляровых металаў і жалеза, падтрымлівалі шырокія гандлёвыя сувязі не толькі з паўднёвымі, але і заходнімі, паўночнымі суседзямі.

Вялікая ўвага археолагаў і гісторыкаў да зарубінецкай культуры тлумачыцца тым, што ёсць сур'ёзныя падставы лічыць яе старажытнаславянскай. Аднак пытанне канчатковага вызначэння этнічнай прыналежнасці насельніцтва Беларускага Падняпроўя на рубяжы эр пакуль застаецца дыскусійным.

А. А. Макушнікаў.

Сляды славянскіх паселішчаў

У канцы I — пачатку II ст. н.э. зарубінецкая культура распадаецца, што было выклікана сацыяльна-эканамічнымі зменамі ў жыцці грамадства лясной і лесасцяпной зоны Усходняй Еўропы, звязанымі з перамяшчэннямі розных па паходжанню (германскіх, сармацкіх, славянскіх і іншых) плямёнаў. Складаныя этнакультурныя працэсы, у якіх самую актыўную ролю адыгралі нашчадкі носьбітаў зарубінецкай культуры, прывялі да фарміравання ў II—III ст. н.э. на тэрыторыі паўднёвай і ўсходняй Беларусі, паўночнай Украіны і сумежных рэгіёнаў Расіі роднасных па паходжанню плямянных утварэнняў, якія ў сучаснай навуковай літаратуры аб'ядноўваюцца пад назвай кіеўскіх ці познезарубінецкіх тыпу Абідні. Кіеўская культура (існавала да V ст.) была ў сваю чаргу асновай фарміравання раннеславянскай пянькоўскай культуры VI—VII ст. (на тэрыторыі Украіны), носьбіты якой пад імем антаў вядомы візантыйскім гісторыкам. На тэрыторыі ж паўночна-заходняй Украіны і на значнай частцы Беларусі ў VI—VIII ст. распаўсюджваецца калочынская культура, роднасная пянькоўскай (названая так па гарадзішчу каля в. Калочын у Рэчыцкім раёне). Адсюль робіцца выснова, што большая частка археалагічных помнікаў першай паловы трэцяй чвэрці I тыс. н. э. паўднёвай часткі Беларускага Падняпроўя (і помнікі Веткаўшчыны разам і імі) таксама пакінуты раннімі славянамі — далёкімі продкамі сучасных бе-

ларусаў. Некаторыя адрозненні матэрыяльнай культуры калочынскіх старажытнасцей ад пянькоўскіх, верагодна, тлумачацца тым, што ў фарміраванні першых прымалі ўдзел не толькі славянскія, але і балцкія групоўкі.

Кіеўскія плямёны пакінулі на Веткаўскай зямлі шмат слядоў. Гэта рэшткі неўмацаваных паселішчаў, якія традыцыйна размяшчаюцца на ўскрайках нізкіх надпоплаўных тэрас каля рэк і ручаёў ці на пясчаных узвышшах сярод поплаваў. На гарадзішчах у гэты час людзі не сяліліся. Значна радзей археолагі сустракаюць сляды бескурганных (грунтавых) могільнікаў з пахаваннямі па абрадзе цераспалення. У 1926 г. беларускі археолаг К. М. Палікарповіч ажыццявіў суцэльную разведку помнікаў розных гістарычных эпох у басейне Ніжняга Сожа. На месцы стаянак каменнага і бронзавага вякоў ён неаднойчы знаходзіў рэшткі культур больш позняга перыяду, менавіта кавалкі грубай ляпной неарнаментаванай керамікі тыпу "гарадзішч". Такі посуд Палікарповіч заўважыў на многіх паселішчах каля Прысно, Аднаполля, Шарсціна, Юркавічаў, у іншых месцах. Аналагічныя знаходкі праз 10 гадоў зрабілі А. М. Ляўданскі і А. З. Каваленя, якія аднеслі іх да жалезнага веку. Частка калекцый 1920–30-х гадоў захавалася ў фондах Інстытута гісторыі беларускай Акадэміі навук і была вывучана Л. Д. Побалем. Зыходзячы з сучасных уяўленняў пра археалагічныя культуры Беларускага Падняпроўя, даследчык вызначыў іх прыналежнасць да помнікаў другой і трэцяй чвэрці I тыс. н.э. Шэраг паселішчаў гэтага часу абследавалі ў 1980-х гадах А. І. Драбушэўскі і аўтар гэтых радкоў.

У 1992 годзе невялікія раскопкі праведзены на шматпластавым паселішчы каля вёскі Юркавічы на правым беразе Сожа (помнік "Юркавічы V"). Тут адкрыты рэшткі ніжняй, паглыбленай у мацярык, пабудовы, якая датуецца III–IV ст. н. э. Яна мела квадратную ў плане форму памерам каля 4х4 м. Сцены дома, відаць, былі драўлянымі, зрубнымі. У цэнтры памяшкання вертыкальна ў земляную падлогу быў укапаны апорны слуп, які падтрымліваў дах. Вакол слупа на падлозе размяшчалася адкрытае вогнішча, ад якога захаваўся пласт попелу і вугольчыкаў. Гэта сведчыць, што пабудова выкарыстоўвалася ў якасці жыллёвай. У ёй знойдзены ляпныя неарнаментаваныя пасудзіны з пляскатым дном і слабапрафіляванымі сценкамі, гліняныя прасліцы біканічнай формы, жалезны нож, а таксама некалькі сініх шкляных пацерак паўднёвага паходжання. Аналагічныя пабудовы вядомы па раскопках у беларускім цячэнні Дняпра і на расійска-ўкраінскім Падзясенні.

Паселішчы кіеўскай культуры пераважна невялікія, плошчай да 0,5–1 га, аднак сустракаюцца сляды і даволі буйных вёсак III–V ст. Верагодна, памеры паселішчаў знаходзіліся ў прамой залежнасці ад урадлівасці навакольных зямель, бо гаспадарка кіеўскага насельніцтва засноўвалася пераважна на ворыўным земляробстве (на суседніх з Пасожжам тэрыторыях знойдзены жалезныя наканечнікі раллёвых прылад). На кожным паселішчы займаліся і жывёлагадоўляй, разводзілі кароў, свіней, авечак і інш. Шырокае распаўсюджанне атрымала вырабоўка глінянага ляпнога посуду, які па прыёмах апрацоўкі паверхні падзяляецца на дзве групы – грубаляпныя і глянцавыя. Керамічны комплекс складаюць гаршкі (часам адзобленыя расчосамі), міскі, мініяцюрныя пасудзіны. Для насельніцтва Верхняга Падняпроўя другой чвэрці I тыс. н.э. характэрна даволі развітая чорная і каляровая металургія.

На тэрыторыі Веткаўскага раёна знойдзены рэшткі шматлікіх паселішчаў трэцяй чвэрці I тыс. н.э., а таксама сляды бескурганных могільнікаў. Паселішчы, як і ў папярэдні час, размешчаны на ўскраінах нізкіх надпоплаўных тэрас, радзей – на выспах у поплавах.

Адно з такіх паселішч, заснаванае на месцы стаянкі каменнага веку, знаходзіцца на маляўнічым узвышшы левага берага Беседзі ніжэй вусця рачулкі Увіч ва ўрочышчы Аўрамаў Бугор каля вёскі Новыя Грамыкі. Некалькі гадоў раскопкі помніка праводзіла экспедыцыя Інстытута гісторыі беларускай Акадэміі навук пад кіраўніцтвам А. Г. Калечыц. Асноўны культурны пласт помніка ўтрымлівае крэмніевыя прылады працы мезалітычнай эпохі, аднак тут жа сустракалася і ляпная кераміка валочынскай культуры. У раскопе 1980 года ўвагу даследчыцы прыцягнула пляма цёмнага грунту, якая выдзялялася на фоне светлага пяску. Яе вывучэнне прывяло да адкрыцця ніжняй часткі жыллёвай пабудовы чатырохкутнай у плане формы памерам 4,8–4,4 м, паглыбленай у

мацярык на 0,5 м. Авальнае вогнішча было зроблена паміж цэнтрам пабудовы і яе сцяной. На падлозе знойдзены кавалкі ляпнога посуду слабапрафіляванай і рабрыстай формы, а таксама керамічных патэльняў. Гэты археалагічны аб'ект датуецца VI—VII ст. н.э. Аналагічныя пабудовы калочынскай культуры вывучаліся аўтарам на паселішчах суседніх тэрыторый — у Нісімкавічах пад Чачэрскам і Насовічах у Добрушскім раёне.

Пахавальны абрад калочынскай культуры характарызуецца змяшчэннем рэшткаў целаспаленняў у бескурганныя і, радзей, курганныя могільнікі. Сляды бескурганных пахаванняў на Веткаўшчыне адзначаў яшчэ ў пачатку нашага стагоддзя Е. Р. Раманаў. Прыкметы "пахавальнага поля" ён заўважыў на левым беразе Сожа каля вёскі Чыстыя Лужы. Ужо ў канцы 1970-х гадоў тут, ва ўрочышчы Хаткі, выпадкова знайшлі зруйнаванае пахаванне — рэшткі крэмацыі ў керамічнай урне, якая была накрыта другой пасудзінай.

Вызначыць прыналежнасць тых ці іншых помнікаў Веткаўшчыны да калочынскай культуры археолагам дапамагаюць асаблівасці ляпной керамікі. Калочынскі посуд мае грубую паверхню ад часцінак жарствы, ён наогул пазбаўлены арнаментацыі. Гаршкі маюць слабапрафіляваную, слоікападобную, цюльпанападобную, біканічную і цыліндраканічную форму. Зрэдку сустракаюцца гліняныя патэльні.

Эканоміка калочынцаў базіравалася на земляробстве і прыселішчнай жывёлагадоўлі. Большасць паселішчаў цягнецца да ўрадлівых глебаў і поплаўных лугоў, якія былі прыдатнымі для выпасу жывёлы і нарыхтоўкі кармоў. Асноўнай культурай было жыта. Сабранае зерне расціралі каменнымі жорнамі ці больш прымітыўнымі зерняцёркамі. Як і ў папярэднія часы, разводзілі кароў і дробную рагатую жывёлу, а таксама свіней. Значную ролю працягвалі адыгрываць традыцыйныя для лясной зоны заняткі — паляванне і рыбалоўства. У сувязі з поспехамі земляробства і жывёлагадоўлі знаходзіўся працэс паступовага вылучэння рамёстваў. Жыхары Пасожжа займаліся апрацоўкай руды і кавальствам, ювелірна-ліцейнай справай, прадзеннем і ткацтвам, апрацоўкай каменю, косці, дрэва і інш.

А. А. Макушнікаў.

Край сівых курганоў

У VIII—IX ст. н.э. Веткаўшчыну засяляюць прадстаўнікі ўсходнеславянскага аб'яднання радзімічаў. Згодна "Аповесці мінулых часоў", напярэдадні станаўлення Кіеўскай Русі радзімічы жылі ў Пасожжы. Кіеўскі манах XII ст., аўтар "Аповесці", запісаў у сваю працу шмат цікавых звестак пра гэту лясную народнасць, якая працяглы час не жадала ні падпарадкоўвацца велікакняжацкай кіеўскай уладзе, ні адмаўляцца ад язычніцкай веры сваіх прадзедаў. Старажытнае паданне сведчыць, што продкі радзімічаў калісьці жылі на захад ад іх будучай айчыны, "у ляхаў", гэта значыць, недзе ў Польшчы (сучасная навука не пацвердзіла і не абвергла гэтыя сведчанні). І былі, быццам, у ляхаў два браты — Радзім і Вятка. Нейкія абставіны прымусілі братоў на чале сапляменнікаў рушыць у далёкае падарожжа, у выніку якога Радзім прывёў свой род на Сож, а Вятка — на Аку. З тых часоў пачалі жыхары Пасожжа звацца радзімічамі.

Радзімічы, як і суседнія славянскія аб'яднанні дрыгавічоў, крывічоў, палян, севяран мелі сваю ваенна-палітычную арганізацыю — княжанне і кіраваліся правадырамі. У IX ст. яны падпалі ў палітычную залежнасць ад Хазарскага каганата, які прымусіў радзімічаў выплочваць даніну. У 885 годзе наўгародска-кіеўскі князь Алег з дынастыі Рурыкавічаў вызваліў зямлю радзімічаў ад хазарскай залежнасці і наклаў на яе сваю асабістую даніну. Аднак у хуткім часе радзімічы выйшлі з-пад улады Кіева, захоўваючы аўтаномію да канца X ст. Толькі ў 984 г., калі ваявода вялікага кіеўскага князя Уладзіміра Святаслававіча Воўчы Хвост разбіў атрады радзімічаў на рацэ Пішчане, Пасожжа, а разам з ім і Веткаўскі край, трывала ўваходзіць у склад Кіеўскай Русі.

Канкрэтных звестак пра гісторыю Веткаўшчыны ў X—XIII ст. пісьмовыя крыніцы не захавалі. Ускосныя дадзеныя дазваляюць выказаць меркаванне аб тым, што яе зямля ўваходзіла ў склад валасцей, якія фарміраваліся вакол летапісных гарадоў Гомія і

Чачэрска (гістарычных папярэднікаў сучасных Гомеля і Чачэрска, упершыню нагаданых у пісьмовых крыніцах у сярэдзіне XII ст. Найбольш старажытныя радзіміцкія паселішчы засноўваюцца ў канцы I тыс. н.э. каля вёскі Старыя Грамыкі на рацэ Беседзь, каля Шарсціна і Хальча на Сожы і ў іншых месцах. Рэшткі паселішча IX – X ст., якое атрымала назву "Старыя Грамыкі VIII", былі знойдзены ў 1992 годзе экспедыцыяй Гомельскага абласнога археалагічнага цэнтра за 1 км на паўночны ўсход ад вёскі Хізы па лясной дарозе на Старыя Грамыкі. Невялікая радзіміцкая вёсачка, памеры якой складалі ўсяго каля 0,12 га, займала схіл надпоплаўнай тэрасы правага берага Беседзі. Вышыня пляцоўкі складала каля 1 – 2 м па-над поплавам. Паселішча было заснавана на месцы больш раняй стаянкі, якая адносіцца да каменнага веку. Культурны пласт са знаходкамі керамікі, выраблена прыёмам лепкі і на ганчарным крузе, археолагі сустрэлі ў разведвальным шурфе. Улічваючы вельмі нязначныя памеры помніка, трэба меркаваць, што тут існавала толькі адна сялянская сядзіба. Шарсцінскае паселішча, "Шарсцін IX", таксама заснавана ў канцы I тысячагоддзя н.э. і існавала да XI ст. Рэшткі гэтага помніка знайшоў яшчэ ў 1926 годзе К. М. Палікарповіч і абследаваў у 1987 годзе А. І. Драбушэўскі. Старажытная вёска займала трохкутны ў плане мыс (памерам 110 – 120х80 м) астатніка тэрасы правага берага Сожа ва ўрочышчы Нівейкава. Яе рэшткі размяшчаюцца за 0,6 – 0,7 км на паўночны ўсход ад фермы вёскі Шарсцін. Вышыня пляцоўкі над поплавам складае 3 – 4 м. На паселішчы знойдзены не толькі ляпная і кругавая кераміка, але і шкляныя пацеркі IX – X ст.

Прыдатнае для гаспадарчага асваення прыроднае асяроддзе спрыяла шырокай каланізацыі ляснога краю ў X – XII ст. Буйныя вёскі разрастаюцца каля Чамярні, Жалезнікаў, Старых Грамыкаў, Аднаполля, Навасёлак, Шарсціна, Хальча. Большасць іх засноўваецца на ўскрайках ці схілах невысокіх надпоплаўных тэрас каля праточнай вады, тлустых лугоў і ля дзялянак, прыдатных у глебава-ландшафтных адносінах для распрацоўкі палёў.

Прыкладам паселішча, якое існавала з канца X ст. да пачатку XII ст., з'яўляецца помнік "Хальч VIII", які размяшчаецца за 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі Хальч, за 300 м на поўдзень ад фермы. Паселішча займала схіл пляцоўкі левага прывусцевага мыса яра Сяліцкі Роў на вышыні 8 – 11 м над поплавам правага берага Сожа. Археалагічныя матэрыялы сустракаюцца на плошчы 450х80 – 100 м. У 1981 г. і 1991 г. аўтар знайшоў тут рэшткі культурнага пласта, які ўтрымлівае камяні ад пячэй і кавалкі кругавой керамікі. На жаль, гэты цікавы помнік пашкоджаны кар'ерам, ператвораны ў сметнік, а ягоная пляцоўка выкарыстоўваецца ў якасці жывёльнага могільніка(?!). Археолагі далёкага будучага з гэтае прычыны, відаць, не высока ацэняць культуру пасяленцаў XX ст. Вялікае шматпласта паселішча "Навасёлкі II", якое існавала ў X – XIII ст., знаходзіцца на паўночна-ўсходняй ускраіне вёскі Навасёлкі. Зараз ягоная тэрыторыя – пляцоўка 5 – 7-метровай тэрасы правага берага Сожа памерамі каля 500х30 – 50 м інтэнсіўна разворваецца. Пры абследаванні помніка аўтарам у 1980 годзе на раллі былі заўважаны плямы цёмнага грунту, у якіх канцэнтраваліся перапаленыя камяні, вугаль, кавалкі керамікі – рэшткі жыллёвых пабудоў X – XIII ст. Непасрэдна на сучаснай паверхні былі знойдзены гліняны грузік, тачыльны камень і надзвычай рэдкі для сельскіх паселішчаў бронзавы крыж-складзень (энкалпіен) XII – XIII ст., на якім адлюстраваны рэльефныя выявы Хрыста і Багародзіцы.

Асновай існавання сярэдневяковай вёскі было ворыўнае земляробства і жывёлагадоўля. Вялікія лясныя абшары, якія захаваліся на Веткаўшчыне са старадаўніх часоў, спрыялі развіццю паляванне на звера і птушку. Чысцюткія Сож, Беседзь, Покаць, Спонка, Стаўбунка і іхнія шматлікія ручаі-прытокі былі багатыя разнастайнай рыбай і бабром.

Паселішчы забудоўваліся драўлянымі хатамі з каменнымі і каменна-гліняным печамі, вакол якіх узводзіліся гаспадарчыя пабудовы. Большая частка вёсак выцягвалася адной вуліцай уздоўж ракі ці поплава. Сяляне займаліся паляваннем на футравага звера, рыбнай лоўляй, здабычай мёду, воску. Некаторыя паселішчы спецыялізаваліся на ганчарстве, здабычы балотнай руды, кавальстве.

У IX – XIII ст. актыўна функцыяніруюць старажытныя сухапутныя і водныя гандлёвыя шляхі. Асабліва значным сярод іх быў шлях

"На радзімічы" па рацэ Сож, які злучаў Сярэдняе Падняпроўе (Кіеўскую зямлю) з раёнамі Верхняга Пасожжа (Смаленская зямля). Роля сожскага шляху ўзрастала над час княжацкіх сутыкненняў у парэччы Дняпра. Менавіта тады Сож ператвараўся ў адгалінаванне вялікага ўсходнееўрапейскага шляху "з грэкаў у варагі", які злучаў Візантыю, Русь і краіны Балтыйскага рэгіёна. Важная для падтрымання ўнутранага адзінства зямлі радзімічаў дарога праходзіла па буйному сожскаму прытоку Беседзі. Яна злучала паўночна-ўсходніх радзімічаў з гарадскімі цэнтрамі Ніжняга Пасожжа. Гандлёвыя сухапутныя шляхі мясцовага значэння праходзілі праз Веткаўшчыну ў розных напрамках. Так, адзін з іх ішоў ад Старадуба праз наваколлі Стаўбуна і Свяцілавічаў у бок Чачэрска і далей на Рагачоў. Старажытная дарога, вядомая па пісьмовых крыніцах XVI ст. як "гомельскі шлях", злучала Чачэрск і Гомій. Яна праходіла па шчыльна населенаму праваму берагу Сожа праз Прысно, Шарсцін, Юркавічы, Навасёлкі і Хальч.

З бліжэйшых гарадскіх цэнтраў у пасяленні Веткаўскага краю паступалі разнастайныя рамесныя тавары (вырабы з чорнага і каляровага металу, некаторыя прылады працы і інш.). Няма сумненняў, што сюды заходзілі і гандляры з аддаленых рэгіёнаў Русі (везлі соль), а таксама іншаземныя "госці", якія дастаўлялі шкляныя ўпрыгожванні, каменныя пацеркі, рэчы хрысціянскага культу і г.д. У абмен продкі веткаўчан прапаноўвалі футра, мёд, воск, лекавыя расліны, сыравіну для чорнай металургіі, кавальскія паўфабрыкаты і інш. Доўгі час асноўнай грашовай адзінкай былі так званыя "футравыя грошы" — шкуркі куніц, вавёрак, баброў. З канца VIII ст. на Русі з'яўляецца і сапраўдная манетная валюта — дырхема Арабскага Халіфата. Знаходкі такіх манет вядомы ў парэччы Беседзі — Вялікіх Нямках, Чамярні і Жалезніках.

Радзімічы, якія ўвайшлі ў склад Кіеўскай Русі яшчэ пры Уладзіміру Святаслававічу, на працягу 100—150 гадоў не жадалі прымаць хрышчэння і заставаліся язычнікамі. Летапісец XII ст. гаварыў пра радзімічаў, што жывуць яны ў лясах як зверы, ядуць "нячыстую" ежу. У іх не бывае хрысціянскіх шлюбаў: жонак яны выбіраюць на "ігрышчах" — рытуальных паганскіх сходах, дзе збіраюцца жыхары некалькіх суседніх паселішчаў. На тых "ігрышчах" наладжваюцца "плясанні", выконваюцца "бесаўскія" песні. Некаторыя радзімічы быццам бы маюць па дзве і па тры жонкі.

Радзімічы адпраўлялі рэлігійныя культы каля рэк і ручаёў, шанавалі крыніцы, калодзежы, вялізныя камяні і дубравы. Яны ахвяравалі сваім багам — Дажджбогу, Перуну, Велесу і іншым. Ужо ў другой палове I тыс. н.э. у Пасожжы адбудоўваюцца спецыяльныя язычніцкія свяцілішчы — культава-рэлігійныя цэнтры пэўных сельскіх акруг ці малых плямёнаў. Рэшткі некалькіх такіх помнікаў захаваліся на Веткаўшчыне да нашых часоў.

У маляўнічым урочышчы Каменная Гара на поўнач ад вёскі Чамярня размяшчаецца старажытнае культавае гарадзішча, пляцоўка якога займае пануючую ў гэтых мясцінах вышыню панад Беседзю. З вяршыні гары, дзе зараз знаходзяцца вясковыя могілкі, добра відаць наваколле Свяцілавічаў і Вялікіх Нямкоў.

Цэнтрам свяцілішча з'яўляецца амаль круглая ў плане пляцоўка дыяметрам 20—24 м. Яна ўздымаецца над поплавам на 12—15 м і абрываецца да ракі вельмі крутым схілам. З напольнага боку пляцоўку абмяжоўвае земляны вал, які ахоплівае яе накшталт падковы. За валам ідзе мала прыкметны зараз роў, які паядноўвае ў адзінае цэлае два глыбокіх яры. На некаторай адлегласці ад рова прасочваюцца рэшткі яшчэ аднаго падковападобнага вала і рова.

Адна з назваў, якую гэтай мясціне далі жыхары Свяцілавічаў і Вялікіх Нямкоў, — Чортава Гара. Паводле паданняў, якія аўтар гэтых радкоў чуў ад сялян пад час абследавання помніка ў пачатку 1980-х гадоў, у незапамятныя стагоддзі на гэтай гары жыў волат Серык. Ён быццам бы кідаў адсюль вялізныя каменныя молаты-сякеры, якія даляталі ажно да наваколляў Вялікіх Нямкоў. Так захаваўся ўспамін пра язычніцкія часы, калі на гары існавала свяцілішча, прысвечанае аднаму з багоў, магчыма, Перуну. З прыходам сюды хрысціянства, з хрышчэннем радзімічаў (а гэта адбылося не раней XII ст.) свяцілішча было пакінута, а ягонае месца працягвала жыць у памяці нашчадкаў як прыстанішча таямнічай нячыстай, д'яблавай сілы. Адсюль і пайшла назва — Чортава Гара.

Калісьці на пляцоўцы былі змешчаны каменныя ці драўляныя статуі мясцовых багоў,

побач з якімі вешчуны запальвалі свяшчэннае вогнішча і адпраўлялі старадаўнія культы. Па святах і ў дні ўспамінаў продкаў вакол пляцоўкі збіраліся жыхары суседніх вёсак. А побач са свяшчэннай гарой размяшчаліся вялікія язычніцкія могілкі — пахаванні ў курганах, якія датуюцца X—XII ст. Яшчэ ў 1873 г. тут налічвалася 212 насыпаў, пры разворванні якіх і скарбашукальніцкіх раскопках знаходзілі чалавечыя шкілеты, шкляныя пацеркі, арабскія дырхемы. Зараз сярод раллі засталося толькі 19 курганоў, моцна пашкоджаных разворваннем і скарбашукальніцкімі ямамі, 2 курганы па-над Беседзю і на самой пляцоўцы свяцілішча. На жаль, сур'ёзныя навуковыя даследаванні помніка яшчэ не праводзіліся.

Амаль аналагічныя помнікі захаваліся на захад і паўночны захад ад вёскі Хальч. Круглае свяцілішча размешчана ў 0,7—0,8 км ад вёскі на пляцоўцы 10—12-метровай надпоплаўнай тэрасы правага берага Сожа па-над возерам Шаманскі Заружак ва ўрочышчы Зібень. Мясцовыя жыхары называюць гэты помнік Краснай Гарой, а ягоныя наваколлі дагэтуль лічацца "месцамі жыхарства" рознай нячыстай сілы — русалак і чароўных коней, якія ўначы выходзяць з яра Гецаў Роў, каб пагуляць па рацэ.

Пляцоўка Краснай Гары моцна пашкоджана германскімі акопамі і бліндажом перыяду другой сусветнай вайны. Не пашкадавалі "гаспадарнікі" могільнік пры закладцы саўгаснага сада. Пра былую веліч гэтага каштоўнейшага помніка нагадваюць 5 разбураных курганоў.

Трэцяе гарадзішча-свяцілішча захавалася за 1 км на паўднёвы захад ад вёскі Гарадок Стаўбунскага сельсавета. За 0,6 км на ўсход ад пасёлка Калінін ва ўрочышчы Баяршчына ці Гарадок. Яно займае авальную пляцоўку (памерам 26х30 м) 5—6-метровай надпоплаўнай тэрасы правага берага ракі Стаўбункі. З напольнага боку прасочваюцца падковападобны вал і роў, якіх першапачаткова было больш. А вось некалі вялікі курганны могільнік, які існаваў тут яшчэ 100 гадоў таму, зруйнаваны разворваннем і не пакінуў аніякіх слядоў. Як кажуць, плугам і бараною па ўласнай памяці.

Веткаўшчына па праву лічыцца краем сівых курганоў. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму гэтыя пахавальныя помнікі можна было сустрэць каля большасці сучасных населеных пунктаў і ў лясных гушчарах, дзе раней існавалі радзіміцкія паселішчы. Час бязлітасны да курганоў — іх разворвалі, раскопвалі пад хаты і гаспадарчыя пабудовы, руйнавалі кар'ерамі і дарогамі. Зусім зніклі курганы каля Радугі, Навасёлак, Шарсціна, Прысно, Аднаполля, Свяцілавічаў, Глухаўкі, Глыбаўкі і ў іншых месцах.

Веткаўчане захавалі некаторыя паданні пра паходжанне курганоў. Даводзіцца чуць, што курганы былі насыпаны ў гады расійска-шведскай вайны пачатку XVIII ст. ці пад час нашэсця Напалеона ў 1812 г. Кажуць, што ў курганах пахаваны салдаты Карла XII ці французы, адсюль і назва курганоў — "шведскія" ці "французскія" магілы. Некаторыя сцвярджаюць, што ў курганах зарыта золата. Археалагічныя раскопкі рашуча адхіляюць гэтыя казкі, з-за якіх часам і знішчаюцца помнікі.

Веткаўскія курганы насыпаны з пяску, супеску ці суглінку. Вышыня большасці іх складае 0,5—1,5 м, зрэдку сустракаюцца насыпы меншай (0,3 м) і большай (2—3 м) вышыні. Пры даследаванні курганоў вакол іх знаходзяць невялікія раўчукі, адкуль бралі грунт для самога насыпу. У насыпе, па гарызонце ці ў яме, ляжыць шкілет, звычайна арыентаваны галавой на захад. Паўстаюць пытанні: ці магчыма, што тут пахаваны шведы альбо французы? Ці маглі ўцекачы ад расійскіх войскаў будаваць для кожнага загінуўшага асобны насып, а не хаваць іх у брацкіх могілках ? Навошта было выпальваць зямлю пад будучым пахаваннем? Чаму аналагічных магіл няма ні ў Швецыі, ні ў Францыі? Чаму палова пахаваных ў курганах — жанчыны? Чаму каля шкілетаў стаяць гліняныя гаршкі? Чаму ў магілах няма ні стрэльбаў, ні шабляў, а замест іх знаходзяцца шкляныя, каменныя пацеркі, бронзавыя скроневыя кольцы, фібулы-зашпількі, бранзалеты, жалезныя крэсівы і нажы?

Археолагі даўно адказалі на гэтыя пытанні. Асаблівасці пахавальнага абраду і знойдзеныя рэчы сведчаць, што ў курганах пахаваны продкі веткаўчан — радзімічы, якія былі сялянамі-земляробамі і майстрамі-рамеснікамі. Золата ў іх няма, што характэрна для ўсіх могільнікаў зямлі радзімічаў X—XII ст.

Да нашых дзён курганныя могільнікі захаваліся каля Старых Грамык, Вялікіх Ням-

коў. Быкаўца і ў некаторых іншых месцах. Далейшы іх лёс выклікае вялікую трывогу з-за разбурэнняў.

З канца XI ст. землі Веткаўшчыны пераходзяць у склад "отчыны" чарнігаўскага князя Давыда Святаслававіча, потым трывала належаць іншым чарнігаўскім князям. У XII ст. ідзе хуткая феадалізацыя мясцовага сялянства, якая суправаджаецца разбурэннем традыцыйных абшчынных звычаяў. Недзе на рубяжы XI – XII ст. у вусці Беседзі (каля аднайменнай сучаснай вёскі) княжацкай уладай будуецца фартэцыя, з'яўленне якой сведчыць пра канчатковае эканамічнае і палітычнае закабаленне раней адносна свабодных абшчыннікаў. Надзейным інструментам уздзеяння на прыхільнікаў веры Дажджбога і Перуна была хрысціянская царква. Першыя місіянеры з'явіліся па берагах Сожа і Беседзі прыкладна ў пачатку XI ст. неўзабаве пасля афіцыйнага хрышчэння Русі (988 г.). Пазіцыі царквы значна ўмацоўваюцца ў першай палове XII ст., калі Гомій і, верагодна, Чачэрск ператвараюцца не толькі ў буйныя ваенна-эканамічныя, але і культурна-ідэалагічныя цэнтры Чарнігаўскага княства. Менавіта з гарадоў княжацкімі і царкоўнымі ўладамі накіроўваецца палітыка па хрышчэнню пасялян Веткаўшчыны. Мясцовых старэйшын і вешчуноў змяняюць прадстаўнікі княжацкай адміністрацыі, свецкія і царкоўныя феадалы. Верагодна, у XII ст. на Веткаўшчыне з'яўляюцца першыя феадальныя сёлы — непасрэдныя гістарычныя папярэднікі многіх сучасных вёсак.

У 1142 годзе Веткаўскі край стаў арэнай усобіцы паміж канфліктуючымі за ўплыў у велікакняжацкіх кіеўскіх справах правіцелямі Чарнігава і Смаленска. Выкарыстаўшы складаную палітычную сітуацыю ў Чарнігаве, смаленскі князь Расціслаў Мсціслававіч здзейсніў паход у чарнігаўскія межы і захапіў усю воласць каля Гомія. Хутка, аднак, смаляне пакінулі гэты край і далейшая гісторыя Веткаўшчыны зноў звязваецца з Гоміям, Чачэрскам і Чарнігавам.

А. А. Макушнікаў.

На раздарожжы

Племянное аб'яднанне радзімічаў большую частку часу знаходзілася ў палітычнай залежнасці ад моцных суседзяў, якім яно мусіла выплачваць даніну. Спярша радзімічы падпарадкоўваліся Хазарскаму каганату, а ў канцы IX ст. былі падпарадкаваны кіеўскім князем Алегам і ўвайшлі ў вялізнае дзяржаўнае ўтварэнне, якое атрымала назву Русь (альбо "Кіеўская Русь", як яго называюць гісторыкі). Доўгі час гэтае падпарадкаванне было вонкавым, не закранаючы асноў родаплемянной структуры.

Больш радыкальныя змены адбыліся стагоддзем пазней, калі кіеўскі князь Уладзімір распачаў палітыку ліквідацыі племянных княжанняў. Супраціўленне падаўлялася ўзброенай сілай. Так, у 984 г. кіеўская дружына разбіла радзіміцкас апалчэнне. Пасля гэтага мясцовыя княжацкія дынастыі былі пазбаўлены ўлады, а магчыма, і знішчаны фізічна. Захаваць сваё месца ў сацыяльнай структуры маглі толькі тыя, хто пераходзіў на службу да кіеўскага князя, уліваўся ў лік яго баяр.

Умацаваныя гарады з племянных цэнтраў кіравання ператвараліся ў рэзідэнцыі кіеўскіх намеснікаў і іх дружын. Тэрыторыя былых племянных княжанняў падзялялася на воласці, кожная з якіх была адзінкай падаткаабкладання, а яе насельніцтва падлягала суду княжацкага намесніка з бліжэйшага горада.

На тэрыторыі Веткаўшчыны, здаецца, не было валаснога цэнтра. Хутчэй за ўсё, ужо ў той час яна была падзелена паміж дзвюма валасцямі, адна з якіх мела цэнтр у Гомелі, а другая — у Чачэрску. У далейшым такі падзел захаваўся не некалькі стагоддзяў.

Амаль адразу пасля ліквідацыі княжання радзімічаў Уладзімір увёў на Русі новую афіцыйную рэлігію — хрысціянства. На Веткаўшчыне, калі ўплыў цывілізацыі і адчуваўся, то бадай што толькі па берагах Сожа. Сож у той час быў вельмі важнай транспартнай артэрыяй. Уздоўж яго пралягаў самы кароткі шлях з Кіева ў Смаленск і больш паўночныя землі Русі.

Кіраваць вялізнай тэрыторыяй Русі з аднаго цэнтра пры тагачасных транспартных сродках было немагчыма. Таму на змену племянным княжанням прыйшла сістэма ўдзелаў. Кіеўскі князь вызначаў часткі сваёй дзяржа-

вы ў якасці ўдзелаў для сваіх сыноў, братоў і іншых родзічаў, якія мелі ў іх практычна поўную ўладу. Іх залежнасць ад цэнтра зводзілася толькі да абавязку аказваць яму пры неабходнасці ваенную дапамогу.

У князя Уладзіміра было шмат сыноў, але мы не ведаем, хто з іх пры жыцці бацькі кантраляваў зямлю радзімічаў. Пасля смерці Уладзіміра ў 1015 годзе адбылася барацьба за ўладу паміж яго сынамі, з якой пераможцамі выйшлі двое — Яраслаў Мудры і Мсціслаў. У 1024 г. яны падзялілі паміж сабой уладанні, прычым Яраслаў атрымаў Кіеў з землямі па правым беразе Дняпра, а Мсціслаў — Чарнігаў з левабярэжжам Дняпра. Тэрыторыя сучаснай Веткаўшчыны, напэўна, увайшла ва ўдзел Мсціслава і апынулася прылучанай да Чарнігаўскага княства.

Калі падраслі сыны Яраслава, большая частка Русі была падзелена на ўдзелы для іх. Перад сваёй смерцю ў 1054 г. Яраслаў Мудры прызначыў сваім пераемнікам старэйшага сына Ізяслава, а другому, Святаславу, аддаў ва ўдзел Чарнігаўскае княства, у склад якога ўвайшла і тэрыторыя Веткаўшчыны.

Пасля 1097 г. спадчыннае права на Чарнігаўскае княства было замацавана за сынамі Святаслава Яраславіча, якія далі пачатак галіне чарнігаўскіх князёў.

У 1123 г. чарнігаўскі пасад перайшоў да Яраслава Святаслававіча, у 1127 г. — да Усевалада Ольгавіча. У 1139 г. памёр тагачасны кіеўскі князь Ярополк, сын славутага Уладзіміра Манамаха. Кіеў павінен быў дастацца яго брату, але Усевалад Ольгавіч з дапамогай малодшых братоў адсунуў яго ад улады, зрабіўшыся вярхоўным уладаром на Русі. Перабраўшыся ў Кіеў, Усевалад вызваліў чарнігаўскі пасад і перадаў яго законным спадкаемцам — Уладзіміру і Ізяславу Давыдавічам. Уладзімір атрымаў непасрэдна Чарнігаў, а Ізяслаў — нейкі ўдзел са складу Чарнігаўскага княства. З гэтага моманту пачалася доўгая барацьба за вяршэнства на Русі паміж дзвюма галінамі княжацкага роду — Ольгавічамі і Манамахавічамі. У ходзе гэтай барацьбы ў 1142 г. адзін з Манамахавічаў, Расціслаў Мсціславіч Смаленскі, зрабіў напад на Чарнігаў і спустошыў Гомельскую воласць. Напэўна, спусташэнне тады зведалі і жыхары Веткаўшчыны — прынамсі, той яе часткі, што прымыкала да Сожа, па якой рухаліся смаленскія дружыны.

З 1151 г. у Чарнігаве княжыў Ізяслаў Давыдавіч. Зрабіўшыся чарнігаўскім князем, ён стаў даволі ўплывовай фігурай у палітычнай гульні. Двойчы на кароткі час нават уладкоўваўся ў Кіеве — спярша пасля смерці Ізяслава Мсціславіча ў 1154, потым — пасля смерці Юрыя Даўгарукага ў 1157 г. Пры гэтым, адчуваючы ненадзейнасць свайго становішча ў Кіеве, ён імкнуўся захаваць за сабой і Чарнігаўскае княства. У 1157 г., праўда, саступіў Чарнігаў стрыечнаму брату Святаславу Ольгавічу, аднак большасць чарнігаўскіх валасцей пакінуў за сабой. У наступным годзе, калі супраць яго выступіла моцная кааліцыя варожых яму князёў, ён вымушаны быў аддаць Святаславу некаторыя воласці, у тым ліку і Чачэрскую з паўночнай часткай Веткаўшчыны. Гомельскую воласць ён усё ж пакінуў сабе. Менавіта туды ён першапачаткова з'ехаў, калі ворагі ўсё ж выціснулі яго з Кіева.

Пад час гэтых бясконцых усобіц гаспадарчае жыццё працягвала ісці сваім ходам. Зямля радзімічаў значна адставала ў сваім развіцці ў параўнанні з больш паўднёвымі абшарамі Чарнігаўшчыны, але і ў ёй адбываліся змены. Павялічвалася колькасць насельніцтва. Актыўна фарміраваліся рысы агульнарускай культуры: пашырала свой уплыў хрысціянства, замест родавых звычаяў распаўсюджваліся агульныя юрыдычныя нормы, замацаваныя ў так званай "Рускай праўдзе". Невыпадкова і племянная назва радзімічаў з другой паловы XII ст. выходзіць з ужытку, перастае сустракацца на старонках летапісаў. Разам з тым многія мясцовыя своеасаблівасці народнай культуры працягвалі жыць. Захоўваліся і многія рысы язычніцтва, якія перапляталіся з хрысціянскімі поглядамі ў адмысловую сумесь, якую акадэмік Б. А. Рыбакоў трапна назваў двухвер'ем.

Пасля смерці Ізяслава старэйшым сярод чарнігаўскай княжацкай галіны застаўся Святаслаў Ольгавіч, які, нарэшце, атрымаў Чарнігаўскае княства ў поўным аб'ёме. Рознымі ўдзеламі ў гэтым княстве валодалі тры яго сыны (Алег, Ігар і Усевалад), пляменнікі Святаслаў і Яраслаў (сыны славутага Усевалада Ольгавіча). Дакладны пералік іх удзелаў невядомы, але не выключана, што тады ўзнікла і асобнае Гомельскае княства, якое ахоплівала частку Веткаўшчыны і належала аднаму з сыноў чарнігаўскага князя.

У 1164 г. уладальнікам Чарнігаўшчыны стаў Святаслаў Усеваладавіч. Пры гэтым Гомель ён, здаецца, вылучыў ва ўдзел уласнаму сыну Усе-

валаду. Нейкі ўдзел атрымаў і яго брат Яраслаў Усеваладавіч. Пазней ён, як некалі яго бацька, зрабіўся кіеўскім князем. Менавіта ён паказаны ў "Слове аб палку Ігаравым" у вобразе старэйшыны ўсіх князёў, а ў яго вусны ўкладзена палымяная прамова пра неабходнасць адзінства Русі. Што да Чарнігава, то ім пасля пераезду Святаслава Усеваладавіча ў Кіеў папераменна валодалі яго стрыечны брат Алег Святаслававіч (памёр у 1180 г.), малодшы брат Яраслаў Усеваладавіч (памёр у 1198 г.), другі стрыечны брат Ігар Святаслававіч — галоўны герой "Слова аб палку Ігаравым" (памёр у 1202) і, нарэшце, сын Усевалад Святаслававіч па мянушцы Чэрмны (Чырвоны).

Увесь гэты час Веткаўшчына трывала ўваходзіла ў склад уласна Чарнігаўскага княства ці, магчыма, Гомельскага, якое часова з яго вылучалася. Княжанне Усевалада Чэрмнага было даволі турботным. Ён актыўна ўдзельнічаў у традыцыйнай для Ольгавічаў барацьбе за Кіеў, якім тройчы авалодваў у 1206, 1207 і 1210 гг. Пры гэтым у трэці раз ён уладкаваўся ў Кіеве толькі дзякуючы таму, што саступіў Чарнігаўскае княства свайму галоўнаму праціўніку — Рурыку Расціслававічу з роду смаленскіх князёў. Але ўжо ў 1214 г., зноў страціўшы Кіеў, Усевалад Чэрмны вымушаны быў вярнуцца ў сваё родавае гняздо — Чарнігаў, дзе і памёр у наступным годзе. Потым да 1224 г. Чарнігавам валодаў яго малодшы брат Мсціслаў, а пасля смерці апошняга — сын Чэрмнага Міхаіл Усеваладавіч. Пры ім Чарнігаўская зямля разам з большай часткай Русі зведала жудаснае татарскае нашэсце.

Хаця войскі хана Батыя ў цэлым абмінулі Беларусь, яе паўднёва-ўсходні кут, уключаючы Веткаўшчыну, быў сумным выключэннем. Пад час заваявання Чарнігаўскага княства ў 1239 г. татары не толькі спалілі Чарнігаў, але і прайшлі далёка на поўнач ад яго. Ва ўсякім выпадку, археалагічныя дадзеныя сведчаць пра спаленне Гомеля. Трэба меркаваць, што паўднёвыя землі Веткаўшчыны таксама былі закрануты татарскім набегам.

Падпарадкаваўшы Чарнігаўскае княства сваёй уладзе, татары напачатку не крануліся мясцовую сістэму кіравання. Князь Міхаіл Усеваладавіч захаваў свой пасад, але павінен быў падпарадкоўвацца хану Батыю. У 1246 г. ён атрымаў загад ехаць у ханскую стаўку, каб прыняць з рук Батыя "ярлык" — дазвол на княжанне ў Чарнігаве. Аднак пад час гэтага візіту князь Міхаіл адмовіўся выканаць паганскі рытуал ачышчэння, які зводзіўся да прахаджэння паміж двума палаючымі вогнішчамі. Татары ўспрынялі яго непаслухмянасць як абразу іх звычаяў і пакаралі смерцю. Пазней праваслаўная царква прылучыла князя Міхаіла Чарнігаўскага да ліку святых.

У Міхаіла засталіся сыны, але іх удзеламі сталі землі на паўночным ускрайку Чарнігаўскай зямлі — у Бранску і вярхоўях Акі. Напэўна, туды, у глухія лясныя мясціны, перамясцілася і асноўная маса ацалелага насельніцтва. Раёны лесастэпу сталі вельмі няўтульнымі для жыцця і амаль цалкам запусцелі. На доўгі час упамінанні пра Чарнігаўскае княства знікаюць са старонак летапісаў. Напэўна, рэшткамі мясцовага насельніцтва кіравалі непасрэдна татарскія баскакі.

Мы можам толькі здагадвацца, што адбывалася ў той час на Веткаўшчыне, бо ніякіх звестак пра яе лёс няма. Магчыма, разам з усёй тэрыторыяй былога Чарнігаўскага княства яна трапіла пад непасрэдную ўладу Залатой Арды. Такое становішча праіснавала каля стагоддзя.

В. Л. Насевіч.

У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

У сярэдзіне XIV ст. расклад палітычных сіл змяніўся. Карыстаючыся часовым паслабленнем Залатой Арды, вялікі князь літоўскі Альгерд Гедымінавіч далучыў да сваёй дзяржавы значную частку зямель былой Кіеўскай Русі. Ён аднавіў і Чарнігаўскае княства, у якім пасадзіў свайго сына Канстанціна. З гэтага моманту (прыблізна з 1360-х гадоў) Веткаўшчына ўвайшла ў склад Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага (ВКЛ).

Пра княжанне Канстанціна Альгердавіча захавалася мала звестак. Здаецца, Чарнігаў так і не здолеў узняцца з таго заняпаду, у які ён трапіў пасля татарскага нашэсця. Самым буйным цэнтрам на

тэрыторыі княства зрабіўся горад Старадуб, у які ў канцы XIV ст. перамясцілася княжацкая рэзідэнцыя. Верагодна, Гомельская і Чачэрская воласці таксама ўвайшлі ў склад Старадубскага княства, якое ўпамінаецца ў 1388 г.

У 1392 годзе да ўлады ў Вялікім княстве Літоўскім прыйшоў пляменнік Альгерда Вітаўт. Сыноў памерлага князя Канстанціна ён перавёў на Украіну, дзе яны далі пачатак роду князёў Чартарыйскіх. Значны абшар былой Кіеўскай Русі, у тым ліку і колішняя Чарнігаўская зямля, былі аддадзены сыну Альгерда Скіргайлу, у якога Вітаўт адабраў уладу над Вялікім княствам Літоўскім. Гэта быў своеасаблівы кампраміс. У афіцыйных дакументах гэтага часу Вітаўт тытулаваўся вялікім князем літоўскім і жамойцкім, а Скіргайла – вялікім князем рускім.

Прыкладна ў гэты час, недзе на пачатку 1390-х гадоў, быў створаны так званы "Спіс рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх", у якім частка гарадоў пералічана як маскоўскія, смаленскія, валынскія, літоўскія, а частка – як кіеўскія. У лік апошніх трапілі і Гомель з Чачэрскам, воласці якіх ахоплівалі абшар Веткаўшчыны. Як мяркуюць некаторыя даследчыкі, літоўскімі ў гэтым спісе названы гарады, якія падпарадкоўваліся Вітаўту, а кіеўскімі – тыя, што належалі Скіргайлу.

На пачатку 1396 г. князь Скіргайла Альгердавіч памёр. Яго вялізныя ўладанні Вітаўт далучыў да сваіх і раздаў іх рознym князям з роду Гедыміна. Старадубскае княства дасталася аднаму з унукаў Гедыміна – Аляксандру Патрыкеевічу, які з 1397 г. неаднаразова згадваецца як князь Старадубскі.

У 1406 годзе абвастрыліся адносіны паміж Вітаўтам і вялікім князем маскоўскім Васілём Дзмітрыевічам (сынам славутага Дзмітрыя Данскога). Справа дайшла да кароткачасовага ўзброенага канфлікту. У гэты момант князь Аляксандр Старадубскі быў абвінавачаны ў змове на карысць Масквы і пазбаўлены сваіх уладанняў. Старадубскае княства (напэўна, разам з Гомельскай і Чачэрскай валасцямі), а таксама суседняе Бранскае княства былі перададзены адвечнаму праціўніку Вітаўта – князю Свідрыгайлу Альгердавічу, які незадоўга да таго ў чарговы раз прымірыўся з ім. Гэтым шчодрым падараваннем Вітаўт спадзяваўся забяспечыць лаяльнасць мяцежнага Свідрыгайлы.

Аднак ужо ў 1408 годзе Свідрыгайла зноў пасварыўся з вялікім князем, пакінуў нованабытыя вотчыны і з'ехаў у Маскву. Пасля гэтага Вітаўт аддаў Старадубскае княства свайму малодшаму брату Жыгімонту Кейстутавічу, у адданасці якога ён не сумняваўся. Пад уладай Жыгімонта гэтыя землі заставаліся да смерці Вітаўта, які памёр у 1430 г.

Пасля Вітаўта вялікім князем літоўскім зрабіўся Свідрыгайла Альгердавіч, які папярэдне з 1418 г., пасля чарговага замірэння з Вітаўтам, валодаў Ноўгарад-Северскім і Бранскім княствамі. Аднак панаваў ён нядоўга – у 1432 г. літоўскія паны зверглі яго з пасада і зрабілі вялікім князем Жыгімонта Старадубскага. Усходнія землі Вялікага княства Літоўскага падтрымалі звергнутага Свідрыгайлу, які ўладкаваўся ў Кіеве. Паміж ім і Жыгімонтам адбыўся амаль такі ж падзел улады, як некалі паміж іх старэйшымі братамі Скіргайлам і Вітаўтам: Жыгімонт стаў вялікім князем літоўскім, а Свідрыгайла – рускім. Улада апошняга распаўсюджвалася і на Веткаўшчыну.

Гэты расклад таксама праіснаваў нядоўга, бо паміж Жыгімонтам і Свідрыгайлам хутка распачалася жорсткая вайна. У ёй Свідрыгайла пацярпеў паражэнне, да 1438 г. згубіў усе свае ўладанні і вымушаны быў хавацца за мяжой. Праўда, і Жыгімонт у 1440 г. быў забіты ў выніку змовы. Вялікім князем быў абвешчаны 14-гадовы брат польскага караля і

пляменнік Свідрыгайлы — Казімір Ягайлавіч, альбо, як яго тады часта называлі, Ягелончык. Фактычна ж дзяржавай у гэты час кіравала групоўка літоўскіх панаў на чале з віленскім ваяводам Янам Даўгірдам, якія ўтваралі раду Вялікага княства Літоўскага. Ад імя вялікага князя панырада, як іх называлі, раздалі значную частку дзяржаўных валасцей ці асобных сёл з іх складу ў прыватныя рукі. Частка гэтых маёнткаў дасталася самім радным панам, частка — іх прыхільнікам.

У дакументах так званай Літоўскай метрыкі (архіва канцылярыі вялікага князя) захаваўся вялікі пералік маёнткавых "пажалаванняў", здзейсненых у першыя гады панавання Казіміра Ягелончыка. Сярод іх мы ўпершыню сустракаем назвы населеных пунктаў сучаснага Веткаўскага раёна.

Так, за подпісам віленскага ваяводы Даўгірда, які памёр у 1443 г. (гэта значыць, паміж 1440 і 1443 гг.), былі падараваны ў прыватную ўласнасць два маёнткі ("двары") са складу Гомельскай воласці.

Праваслаўнаму баярыну Герману Радзівонавічу дастаўся двор Хальч, а літоўскаму пану-каталіку Міхаілу Монтаўту — Шарсцін. Такім чынам, гэтыя два паселішчы — першыя на Веткаўшчыне, якія трапілі на старонкі пісьмовых крыніц.

Гэтая падзея азначала, што названыя паселішчы вылучаюцца з-пад улады намесніка, які кіраваў воласцю, і пераходзяць у падпарадкаванне да новых гаспадароў. Усе падаткі, якія раней ішлі ў воласць, зараз траплялі да панаў. Напачатку гэта мала закранала інтарэсы сялян, бо іх жыццё ішло сваім чынам. У далейшым, аднак, становішча дзяржаўных і прыватнаўласніцкіх сялян пачало адрозніваццца, хаця для гэтага спатрэбіліся некалькі дзесяцігоддзяў паступовых змен. Гісторыя маёнтка Шарсцін пасля вылучэння з воласці прасочваецца дрэнна. Што да Хальча, то ён на доўгія стагоддзі застаўся ў руках нашчадкаў Германа Радзівонавіча, якія ўтварылі вядомы ў гісторыі Беларусі род панаў Халецкіх.

Асноўная частка Гомельскай воласці ў 1446 г. была аддадзена перабежчыку з Вялікага княства Маскоўскага — князю Васілю Яраслававічу Бароўскаму. Ён трымаў Гомельскую і шэраг іншых валасцей да 1449 г., калі памірыўся з вялікім князем маскоўскім і вярнуўся на радзіму.

Тым часам апальны князь Свідрыгайла, якому было ўжо ледзь не 80 гадоў, таксама вярнуўся з эміграцыі і прымірыўся з вялікім князем Казімірам. Свідрыгайла атрымаў Валынскае княства на тэрыторыі сучаснай Украіны, а ў дадатак — шэраг іншых уладанняў. Сярод іх каля 1450 г. яму была падаравана Гомельская воласць, за выключэннем тых сёл, якія ўжо перайшлі да іншых уласнікаў.

Незадоўга да сваёй смерці (1452), Свідрыгайла таксама вылучыў са складу Гомельскай воласці тры сялы і падараваў іх аднаму з радных панаў, будучаму троцкаму ваяводзе Андрэю Саковічу. Гэтымі сёламі былі Данілавічы, Дуравічы і Валосавічы, з якіх першае знаходзіцца на тэрыторыі Веткаўшчыны. Пра гэтую падзею вядома з больш позняга дакумента, датаванага 1483 годам. У гэтым годзе адбыўся суд паміж сынам Саковіча (у публікацыі дакумента яго прозвішча памылкова прыведзена як "Юковіч") Багданам Андрэевічам і князямі Мажайскімі, тагачаснымі ўладальнікамі Гомельскай воласці. Багдан Саковіч скардзіўся, што пасля смерці яго бацькі (з іншых крыніц вядома, што пан Андрэй Саковіч памёр каля 1464 г.) гэтыя "пажалаванні" былі зноў далучаны да воласці, у той час як павінны былі перайсці ў спадчыну да яго, Багдана. Суд пацвердзіў яго правы і вярнуў яму маёнткі.

Пасля смерці Свідрыгайлы вялікі князь Казімір зноў аддаў Гомельскую воласць выхадцу з Масквы. На гэты раз ім

стаў князь Іван Андрэевіч Мажайскі. Як і Васіль Бароўскі, ён быў блізкім сваяком вялікага князя маскоўскага Васіля II. У адрозненне ад Бароўскага, князь Мажайскі застаўся ў Вялікім княстве Літоўскім да канца жыцця. Яго ўладанні былі затым перададзены двум яго сынам, Андрэю і Сямёну. Менавіта з імі судзіўся ў 1483 г. Багдан Саковіч, дамагаючыся звароту маёнткаў.

Хутка затым Андрэй Мажайскі памёр, а яго брат Сямён захоўваў свае ўладанні да 1499 г., калі распачалася вялікая вайна паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай. У ходзе гэтай вайны князь Мажайскі з усімі сваімі ўладаннямі перайшоў на бок Івана III Маскоўскага. Вайна закончылася перамогай Масквы, і, паводле мірнага пагаднення ад 1503 г., уся Гомельская воласць і якраз тая частка Чачэрскай, што ахоплівала Веткаўшчыну (з сёламі Свяцілавічы, Галоднае, Жалезавічы), адышлі да Маскоўскай дзяржавы і былі ўключаны ў Старадубскі павет.

Пад уладай Масквы ўся Веткаўшчына заставалася да 1535 г., калі ў ходзе новай вайны Гомель быў адбіты войскамі Вялікага княства Літоўскага. У выніку новага мірнага пагаднення, заключанага ў 1537 г., Масква адмовілася ад Гомельскай воласці. Маёнтак Хальч быў вернуты панам Халецкім. Што да Данілавічаў, то яны былі зноў далучаны да Гомельскай воласці, бо іх колішні спадчыннік Багдан Саковіч не пакінуў нашчадкаў мужчынскага полу.

З дыпламатычных дакументаў аб заключэнні перамір'я ў 1537 г. вынікае, што паўночная Веткаўшчына з сёламі Галоднае, Жалезавічы (Жалезнікі) і Свяцілавічы не была вернута ў склад Чачэрскай воласці і засталася ў Маскоўскай дзяржаве. Тым не менш пазней гэтыя ўмовы былі нейкім чынам перагледжаны, бо ў другой палове XVI ст. паўночная Веткаўшчына зноў згадвасцца як частка Чачэрскай воласці.

В. Л. Насевіч.

Дакументы сведчаць

ПЕРШЫЯ ЗВЕСТКІ ПРА ВЁСКІ ДАНІЛАВІЧЫ, ДУБРОВІЧЫ І ДРУГАВІЧЫ

17 красавіка 1483 г.

ДЕКРЕТ МЕЖИ КНЯЗИ АНДРЕЕМ А СЕМЕНОМ ИВАНОВИЧАМИ А МЕЖИ МАРШАЛКОМ ЗЕМСКИМ, ПАНОМ БОГДАНОМ АНДРЕЕВИЧОМ О ТРИ СЕЛА У ГОМЕЙСКОМ ПОВЕТЕ, О ДАНИЛОВИЧИ, О ДУРОВИЧИ И О ВОЛОСОВИЧИ, КОТОРИЕ ПАНУ БОГДАНУ АНДРЕЕВИЧУ НА ВЕЧНОСТЬ ПРИСУЖОНО.

Казимир, Божью милостью.

Смотрели есьмо с паны радою нашою промежи князя Андрея а князя Семена Ивановичом з маршалком земским, наместником полоцким, паном Богданом Андреевичом о село, на имя о Даниловичи, а о Дуровичи (Другавичи), а о Волосовичи у Гомейском повете, што дал отцу его пану Андрею Юковичу князь Швитригайло.

И князи сами перед нами прызналися, же тое село Даниловичи а Друговичи а Волосовичи держал пан Андрей, отец пана Богданов, до своее смерти, а по смерти пана Андреевой взял отец их, князь Иван тое село Даниловичи а Дуровичи а Волосовичи.

И мы, о том досмотревшы, и присудили есьмо тое село Даниловичи а Дуровичи а Волосовичи пану Богдану Андреевичу вечно ему и его детем, и его ближним, со всим, што к тому селу издавна слушаеть, как держал отец его, пан Андрей.

Волен он тое село Даниловичи а Дуровичи а Волосовичи отдати, продати и заменити и к своему лепшому обернути, как сам лепей розумеючи.

А при том были панове рада наша: князь Андрей, бискуп виленский; воевода виленс-

кий пан Олехно Судимонтович, канцлер наш; а пан троцкий, наместник новгородский пан Михаило Монтовтович; а маршалок наш, наместник берестейский пан Якуб Немирович; а наместник витебский пан Ивашко Илинич; а маршалок наш, наместник лидский пан Петрашко Пашкович; а маршалок наш, наместник слонимский пан Солтан Александрович; а маршалок наш пан Станислав Михайлович.

А на твердость того казали есмо и печать нашу привесити к сему нашому листу. Писан у Вильни в лето 6991, априль, 17 день, индикт I.

Литовская метрика. Отдел I. Ч. I: Книга записей. Т.1 // Русская историческая библиотека. Спб.,1910. Т. 27. С. 373–375.

На мяжы стагоддзяў

Тэрыторыя цяперашняга Веткаўскага раёна (Веткаўшчына) у XVI ст. уваходзіла ў склад Гомельскай і Чачэрскай валасцей Вялікага княства Літоўскага. Пісьмовых крыніц з канкрэтнымі звесткамі пра асноўныя працэсы развіцця Веткаўшчыны захавалася мала. А тыя, што захаваліся, адносяцца ў асноўным да той яе часткі, якая ўваходзіла ў склад Гомельскай воласці. Таму пры асвятленні гісторыі Веткаўшчыны у дадзеным выпадку будуць выкарыстаны менавіта тыя факты, што адносяцца да яе гомельскай часткі.

Гомельская воласць, павет, або староства ў XV–XVI ст. – буйное ўладанне з цэнтрам у Гомельскім замку ("Гомей"), якое з'яўлялася фактычна і ніжэйшай адзінкай адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ. Яна як дзяржаўная ўласнасць уключаецца ў склад гаспадарскіх (велікакняжацкіх) Падняпроўскіх, або Рускіх валасцей. У якасці кіраўнікоў ёю вялікі князь літоўскі прызначае сюды дзяржаўцаў або старостаў. Сялянскае самакіраванне воласцю традыцыйна ўзначальвае старац, які абіраецца сялянамі, але зацвярджаецца дзяржаўцам або старостам.

Адным з прыкметных працэсаў у гісторыі гаспадарскай Гомельскай воласці, як і ўвогуле дзяржаўных уладанняў у ВКЛ да Люблінскай уніі 1569 г., з'яўляецца скарачэнне яе тэрыторыі ў выніку велікакняжацкіх наданняў феадалам (шляхціцам) сёлаў у вотчыну. Побач з вотчынным тут развіваліся і формы часовага ўладання гаспадарскай зямлёй баярамі-шляхціцамі ў выніку наданняў "до воли и ласки господарской", "до живота", г. зн. пажыццёва або "на вечность потомкам мужского рожаю", г. зн. у якасці лена. Так, у 1560 г. ленным правам былі нададзены польскаму шляхціцу, гомельскаму ротмістру сёлы Прысно і Шарсцін.

Разам з тым варта адзначыць тое, што ў Гомельскай воласці, як і ў іншых акраінных ("украінных") усходніх гаспадарскіх валасцях ВКЛ, працэс ператварэння дзяржаўных зямель у шляхецкія ў выніку велікакняжацкіх наданняў ішоў менш інтэнсіўна, чым у заходняй частцы дзяржавы. Амаль пастаянныя ваенныя разбурэнні гэтага рэгіёна як маскоўскімі войскамі, так і ордамі крымскіх татар не стымулявалі набыццё тут маёнткаў феадальнай знаццю, якая актыўна набывала зямельную ўласнасць у больш выгадных заходніх рэгіёнах ВКЛ. Таму галоўным чынам Гомельская воласць, як і Чачэрская, да канца XVI ст. і ў далейшым заставалася ў складзе дзяржаўных ўладанняў, якія страцілі на карысць шляхты толькі адносна нязначную частку сваёй першапачатковай тэрыторыі. Указаныя вышэй фактары абумовілі таксама слабае развіццё тут панскай гаспадаркі ў форме фальварка.

За карыстанне разнастайнымі сельскагаспадарчымі ўгоддзямі сяляне павінны былі выконваць на карысць гаспадара і мясцовай адміністрацыі шэраг феадальных павіннасцей у асноўным у выглядзе даніны прадукцыяй сваіх гаспадарак (мёд, футра і інш). Адзінкай абкладання служыў "дым", г.зн. сялянская гаспадарка. Акрамя асноўных, сяляне-даннікі неслі і іншыя павіннасці: плацілі "серебшизну" – дзяржаўны падатак грашыма на ваенныя патрэбы; прадастаўлялі падводы для перавозкі прадстаўнікоў дзяржаўнай улады, паслоў, а таксама разнастайных грузаў; рамантавалі і будавалі абарончыя ўмацаванні, у прыватнасці Гомельскі і іншыя акраінныя ("украінныя") замкі. Віды і нормы павіннасцей сялян-даннікаў Гомельскай і іншых гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцей вызначаліся вялікімі князямі спецыяльнымі інструкцыямі ("уста-

вамі"). На працягу XVI ст. павіннасці сялянданнікаў павялічваліся. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі даннікаў суправаджалася таксама шматлікімі злоўжываннямі мясцовай адміністрацыі, якая патрабавала ад сялян, насуперак гаспадарскім уставам, выканання разнастайных звышнарматыўных павіннасцей натурай і грашыма. Рост павіннасцей у цэлым і асабліва ў выніку самавольства мясцовай адміністрацыі быў адной з асноўных прычын амаль няспынных вострых канфліктаў паміж даннікамі і дзяржаўцамі воласці. Пры гэтым барацьбу супраць пагаршэння свайго становішча сяляне-валашчане вялі калектыўна і, як правіла, разам з гомельскімі мяшчанамі.

Так, у сувязі са спусташэннем воласці ў ходзе ваенных дзеянняў кароль польскі і вялікі князь літоўскі Жыгімонт вызваліў мяшчан і валашчан, г. зн. сялян – жыхароў воласці, ад усіх данін (грашовай, мядовай, бабровай і кунічнай), серабшчын і падвод на працягу дзесяці гадоў, а ад будаўніцтва Гомельскага замка – на працягу года. Аднак адзін з першых жа дзяржаўцаў князь В.Ю. Талачынскі насуперак гэтаму з мэтай свайго абагачэння, адабраўшы адпаведныя ўставы ("листы"), пачаў па сутнасці рабаваць сялян: патрабаваў выканання не толькі часова адмененых традыцыйных, але і многіх звышнарматыўных павіннасцей ("новин"). Нягледзячы на моцнае процідзеянне дзяржаўцы, падрыхтаваныя мяшчанамі і валашчанамі хадакі змаглі даставіць гаспадару свае скаргі. У іх яны прасілі змяніць дзяржаўцу і спыніць злоўжыванні. У 1536 г., пасля безвыніковай паездкі ў сувязі са скаргамі ў гэту воласць дварапіна І. Грыгор'евіча, Жыгімонт, улічваючы, у прыватнасці, пагранічнае ("украінпае") становішча воласці, уцёкі сялян і запусценне воласці, вымушаны быў зноў паслаць сюды для разбору скаргаў іншага свайго дварапіна М. Пацаткоўскага. Можна з вялікай доляй верагоднасці меркаваць, што злоўжыванні гомельскага дзяржаўцы князя В. Ю. Талачынскага працягваліся, бо гэта было тыповай з'явай.

К сярэдзіне XVI ст. архаічная сістэма землекарыстання і абкладання сялян павіннасцямі перастала задавальняць дзяржаўную казну і феадалаў. З-за адсутнасці прамой сувязі норм абкладання з дзяржаўнымі рэсурсамі адзінак абкладання яна не дазваляла аператыўна павялічваць павіннасці сялян у адпаведнасці з канкрэтнымі ўмовамі іх гаспадарчай дзейнасці, якія змяніліся. Таму імкненне феадалаў павысіць прыбытак ад сваіх маёнткаў шляхам далейшага ўзмацнення эксплуатацыі і абумовіла правядзенне з сярэдзіны XVI ст. аграрнай рэформы, г. зн. масавай рэарганізацыі архаічнай сістэмы землекарыстання сялянства і абкладання яго феадальнымі павіннасцямі.

Амаль адначасова з правядзеннем аграрнай рэформы ("номеры волочной") з галоўнай мэтай павышэння даходаў казны ("скарбу") у дзяржаўных уладаннях у заходняй частцы ВКЛ з той жа мэтай па ўказанню караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста рэвізоры паны Г. Валовіч і М. Нарушэвіч рэарганізавалі архаічную сістэму землекарыстання і абкладання яго феадальнымі павіннасцямі і ў гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцях, у тым ліку і ў Гомельскай воласці. Адпаведная ўстава для гэтых валасцей істотна адрозпівалася ад Уставы на валокі 1557 г. з улікам прыроднай і сацыяльна-эканамічнай спецыфікі дадзенага рэгіёна. Мяркуючы па дадзеных рэестраў ("інвентароў") рэвізій гэтых валасцей, і перш за ўсё Гомельскай, тут аграрная рэформа заключалася ў тым, што рэвізоры "поровнали грунты", г. зн. вымералі ворыва на "службы" – роўныя па плошчы ўчасткі на 30 салянак (бочак) насеву збожжавых, што адпавядае 30 моргам або валоцы зямлі (21,36 га), і ўвялі іх у якасці галоўнай адзінкі абкладання замест ранейшай – "дыму", г. зн. сялянскай гаспадаркі. Пры гэтым была вызначана якасць зямлі кожнай службы: "добрая", "сярэдняя" або "дрэнная". Службу зямлі бралі ў карыстанне, як правіла, два дымы. Была высветлена таксама наяўнасць сенакосных (у вазах накошваемага сена), рыбалоўных і паляўнічых угоддзяў, у тым ліку і бабровых гонаў. Апошнія знаходзіліся звычайна ў агульным уладанні сялян аднаго або некалькіх сёлаў. Адначасова былі ўдакладнены і апісаны межы сельскагаспадарчых і промыславых угоддзяў кожнага сяла.

Мяркуючы па дадзеных "Рэестра" рэвізіі 1560 г., воласць была слабазаселеным краем. На вялізнай тэрыторыі налічвалася ўсяго 50 сёл, у кожным з якіх у сярэднім было прыкладна па шэсць сялянскіх дымоў – двароў. Нізкая ў параўнанні з заходнімі рэгіёнамі ВКЛ шчыль-

Табліца

АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ СТАНОВІШЧА ГАСПАДАРСКІХ СЯЛЯН НЕКАТОРЫХ СЁЛ ПА ДАДЗЕНЫХ "РЭЕСТРА" РЭВІЗІІ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ 1560 Г.

Назвы сёл	Дымы	Службы	Якасць ворыва	Сенакосы	Рабочая жывёла		Сума грашовых плацяжоў у казну		
				вазы	валы	коні	копы	грошы	пенязі
Данілавічы	8	4	с.	60	10	6	9	39	5
Навасёлкі	5	2	с.	60	5	5	5	51	
Старое	10	4	с.	100	13	11	13	9	
Юркавічы	4	2	с.	50	6	5	9	15	
Усяго	24	12		270	34	27	36	114	5
На адзін дым	1	0,5		11,25	1,4	1,1	1,5	4,75	0,2
На адну службу	2,0	1		22,5		2,25	3,0	9,5	0.42

насць насельніцтва, як і іншых акраінных усходніх валасцей, абумоўлена галоўным чынам амаль пастаяннымі ваеннымі разбурэннямі.

Рэвізоры ўстанавілі са службаў і ўгоддзяў, якія да іх адносіліся, новыя "певные и врочистые платы", г. зн. дакладна вызначаныя віды і нормы асноўных павіннасцей, галоўным чынам грашыма. Нормы павіннасцей са службы былі наступнымі: 60 грошаў — з добрай зямлі, 50 — з сярэдняй і 40 — з дрэннай. Акрамя таго, з кожнай службы сяляне ўносілі па адной бочцы жыта і аўса. За воз сена яны павінны былі плаціць па 4 пенязі, г. зн. 0,4 гроша, а за кожны ўстаноўлены пуд (медніцу) мёду — 25 грошаў. Плацяжы за паляўнічыя і рыбалоўныя угоддзі ўстанаўліваліся ў памерах, якія прыблізна адпавядалі наяўнасці і багаццю такіх угоддзяў. Замест ранейшай павіннасці наладжваць у рэках запруды ("езы") для лоўлі рыбы была ўстаноўлена "езовшина" па шэсць грошаў са службы. Паколькі памеры плацяжоў залежалі не толькі ад якасці ворыва і колькасці сенакосаў, але і ад наяўнасці і багацця промыславых угоддзяў, пастолькі агульныя памеры плацяжоў са службы ў розных сёлах былі неаднолькавыя.

Па нашых падліках адпаведных звестак, якія маюцца ў "Рэестры" рэвізіі Гомельскай воласці 1560 г., пры значных ваганнях асобных паказчыкаў на адзін дым у сярэднім прыпадала: 0,44 службы ворыва, 10 вазоў сенакосаў, 1,4 вала і 1,0 каня, а таксама 80,2 гроша плацяжоў у дзяржаўную казну, якія складваліся з чыншу ("дани грошовой"), платы за мядовую дань, за сенакосы, за звярыныя, птушыныя і рыбныя ловы, за бабровыя гоны і за "езовшину". На адну ж службу ў сярэднім прыпадала: 2,3 дымы, 23,6 воза сенакосаў, 3,1 вала і 2,4 каня, а таксама 183,4 гроша плацяжоў у казну. Усяго ж гаспадарскія сяляне ўносілі ў казну каля 300 коп грошаў.

Гаспадарскія сяляне Гомельскай воласці, як і сяляне іншых гаспадарскіх Падняпроўскіх валасцей, побач з указанымі асноўнымі павіннасцямі абавязаны былі па-ранейшаму выконваць і шэраг дадатковых: будаваць і рамантаваць свой і іншыя памежныя замкі, утрымліваць у Гомельскім замку дазорныя насты, збіраць грошы на падводы, а таксама дакладна вызначаныя ўзносы натурай і грашыма на карысць мясцовага дзяржаўцы, або старосты.

У выніку правядзення аграрнай рэформы ў 1560 г. у Гомельскай воласці сістэма абкладання сялян феадальнымі павіннасцямі стала абапіраца на больш дакладны, чым раней, улік колькасці і якасці іх сельскагаспадарчых і промыславых угоддзяў. Віды і нормы павіннасцей з новай адзінкі абкладання — службы — сталі адзінымі ва ўсіх гаспадарскіх сёлах. Такім чынам, ранейшыя сяляне-даннікі ператварыліся ў сялян-чыншавікоў — у структуры іх рэнты сталі абсалютна пераважаць плацяжы грашыма.

Нягледзячы на тое, што адной з задач аграрнай рэформы было абмежаванне злоўжыванняў розных ўраднікаў, яна не змагла засце-

рагчы сялян ад звышнарматыўных паборaў. Так, у 1567 г. падданыя скардзіліся на свайго старосту пана Каленіка Васільевіча Цішкевіча, які ўвёў цэлы шэраг навін у павіннасцях і ўвогуле амаль не лічыўся з пастановамі рэвізораў. Праз 30 год у 1596 г. гомельскія мяшчане і валашчане неаднаразова скардзіліся каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Жыгімонту III на гомельскага старосту пана Андрэя Сапегу, слугі якога на чале з падстарастам увялі новыя павіннасці, рабавалі гаспадарскіх падданых, а ў выпадку супраціўлення збівалі іх. Шматлікасць такіх скаргаў сведчыць аб малой эфектыўнасці барацьбы сялянства ў форме скаргаў супраць ўзмацнення ўсіх форм феадальнага прыгнёту.

У ходзе рэвізіі Гомельскай воласці высветлілася, што частка зямлі ў многіх гаспадарскіх сёлах знаходзілася ў законным і незаконным уладанні дробных мясцовых баяр-шляхціцаў "на шляхецкай службе". Пры адсутнасці гаспадарскіх лістоў — "данін" на зямлю і нават пры наяўнасці такіх дакументаў, выдадзенных мясцовымі дзяржаўцамі на часовае валоданне зямлёй, апошнія іншы раз адбіраліся, але часцей пакідаліся ў ранейшых уладальнікаў, аднак з умовай унясення ў казну ўстаноўленых грашовых плацяжоў. Частка ж зямлі ў гаспадарскіх сёлах здаўна, як пацвердзілі ў шэрагу выпадкаў гомельскі валасны старац О. Булізіч і сяляне, належала чатыром гомельскім, а таксама кошалёўскай і ўваравіцкай праваслаўным цэрквам і таму ім была і пакінута.

Усяго ў "Рэестры" рэвізіі 1560 г. у Гомельскай воласці зафіксавана 49 сёл, з якіх 17 знаходзіліся ў пастаянным або часовым уладанні шляхты, праваслаўнай і каталіцкай цэркваў. Наданні зямель на розных умовах працягваліся да Люблінскай уніі 1569 г. Пашырэнне шляхецкага землеўладання суправаджалася істотным уціскам зямельных і іншых інтарэсаў гаспадарскіх сялян. На гэтай глебе неаднаразова ўзнікалі вострыя зямельныя канфлікты. Напрыклад, амаль пастаянна са сваім новым суседам — баярынам Я. Фашчом, які выслужыў у 1562 г. на ленным праве сяло Насовічы, вялі барацьбу гаспадарскія сяляне некалькіх побач размешчаных сёл.

У 1565 г. у выніку рэформы адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу ВКЛ Гомельская воласць апынулася ў складзе Рэчыцкага павета Менскага ваяводства.

М.Ф. Спірыдонаў.

Дакументы сведчаць

З ЛІСТА ВАЯВОДЗЕ ВІЛЕНСКАМУ ПАНУ ГАШТОЛЬТУ АБ КРЫЎДАХ МЯШЧАН ГОМЕЛЬСКІХ АД ДЗЯРЖАЎЦЫ ІХ КНЯЗЯ ВАСІЛЯ ТАЛАЧЫНСКАГА

18 чэрвеня 1537 г.

Жикгимонт, Божю милостью король и великий князь. Воеводе виленскому канцлерю нашому старосте белскому и мозырскому пану Олбрахту Мартиновичу Кгаштолту.

Што перво сего приходили до нас многии люди наши гомейские, жалуючи сами от себе и от всих мещан и людей волости Гомейское на державцу гомейского князя Василя Толочинского о том, што ж которыи листы наши подавали есмо им, вызволяючи их от даней грошовых и медовых, бобровых и куничных, подвод и серебщизн и всяких инших платов на десять год, а от робот замку Гомейского на год есмо их вызволили под тым обычаем, иж они не мели до году оного замку робити и ничого в нем оправовати, хиба естли бы которыи кгонты з замку спали або дощка ся где оторвала, то мели зася прибити и направити.

Ино деи князь Василей тни листы наши у них поотнимал и того ж году почал им кривды чинити: напервей, князь им с того там у Гомьи справовати а потом ез робити и моцне почал их ку тому приворочати и грабити, который жо де ез, наймуючи, они робили и выложили на то тридцать коп грошей, а острогу жадным обычаем за великими тяжкостями и знищеньем своим доконати не могли. И к тому деи он озера и берега бобровыи, с чого они перед тым пожиток мевали, в них отнял и бобров битых сто в них взял. Потом деи он в некоторых людей тамошних земли их отчизныи бортныи поотнимал, и тыи деи люди для великих тяжкостей проч оттоль пошли. А коли деи князь Василей в объезде ездил и

дань и тивуновщину з них брал и всих пенязей двинадцать коп грошей, а меду пресного за десять коп на них узял, тогды деи сем сел людей от того для великого обтяженья проч пошло. И теж деи казал он им сено на себе косити, чого они перед тым николи не знавали, и до того деи сена пятсот воз они ему укосили и незносную тяжкость в том приняли. Затым которые гости збожьем и з иншыми речми до Гомья приездчають, он деи с тых гостей мыта великие береть и для оных люди торговыи с тыми живностями там зъездити переставають, а подданыи наши тамошнии великий недостаток в живностях мають. При том они жаловали нам, штож деи князь Василей казал им гридну собе в Гомьи робити, и они мусили наймом тую гридну вробити, а пять рублей за то заплатили. А потом другим разом заставил их стайню на себе робити, за которую ж стайню дали они от роботы чотыри копы грошей. И не могучи они кривд и тяжкостей своих великих от него терпети, выправили были неколко людей с жалобою до нас господаря, и он деи оных людей казал на дорозе переняти и ограбити и у вежу посажати, и пенязей готовых взял в них шестнадцать коп грошей и двадцать бобров а двесте грошей вины на всих их взял.

И плачливе били они нам чолом, абыхмо другого державцу им дали и водле первых листов наших вызволеных их заховали.

Где ж мы квапне того не чинячи, а хотячи певную справу в том мети, посылали там дворенина нашого Ивана Григорьевича и казали ему о тых всих кривдах и тяжкостях и грабежох их достаточне ся доведати и тых сел розгнаных осмотрети и оных теж людей битых, которых они первей з жалобами выправовали, а он их имал и был их у вязенье сажал, огледати и того ся теж справедливе доведати, што князь Василей будеть с них взял и которыми речми их обтяжал, — им то все отказати.

Яко ж оный дворянин наш там ездил и в князя Василья з листом нашим был, через который расказали были есмо ему вси тые речи, што колве з них будеть побрал, в целости перед тым дворенином нашим им поотдавати и листы наши вызволеныи им вернути. И он деи дворенина нашого ссоромитил и бити его хотел, а оных речей побраных и листов наших первших вызволеных тым людем гомейским поотдавати не хотел. И над то деи ещо жоны и дети их поимавши, до дворца послал, оли ж они в него их выручили у сту и двадцати копах грошей. И сам деи он з Гомья до именей своих поехал, а того ничого им не оправил, а жоны деи их и теперь у него за порукою суть. О чом жо и тых часов некоторые люди гомейские и повторе на князя Василья, от всих мещан и людей волостных тамошних жалуючи, приходили.

А и тот дворянин наш Иван Григорьевич, оттоль приехавши и всякие речи на реистр списавши, нам его дал, с которого ж есмо реистру взяли великое от него утиснене и обтяжливости подданым нашим тамошним и не вемы, в который он обычай так срокго к тым людем украинным заховал, а над волю и росказанье нашо через листы нашы вызволеныи таковыми незносными их обтяжал, што ж з великою невдячностью от него прыймуем.

И ач колве быхмо за таковою неслушною справою его и за великими обтяжливости тых людей наших гомейских, што ся перед нами оказало, мели тот замок наш з рук его взяти и иншого державцу, хто бы ся нам на то годный бы видел, там послати; леч маючи есмо узгляд на твою милость пана и раду преднейшую, иж на причину твоей милости замок князю Василью есмо дали, того ещо потерпели, бо сам твоя милость добре тому сведом, иж тот замок за великим накладом к рукам нашим пришол, а он на реч нашу господарскую и земскую бачности не маеть и того ж часу почал собе с тых новых людеи пожитки вымышляти и их убожити и земль их отнимати, и листы нашы в них отбирати, и к роботе замковой приворочати, а они до году не мели замку робити и оли ж бы рок вышол, тогды мели его оправовати водле слушного обычаю. Яко ж мы сами, им фолкгуючи, вси платы наши до десяти год отпустили, же бы ся они запомгли и иншыи люди, отчичи тамошнии абы за ся на отчизны свои пришли, а звлаще в теперешнии часы, як ся нам с князем московским перемирье стало, могли бы они безпечне отчизн своих уживати и запоможенье собе мети. А тепер того не бачим, же бы князь Василей за держанья своего людей што там присадил, але и тых, которые после войска нашого в той волости зоставали, немало оттоль пошло проч. За таковою справою его николи ся они поправити не могуть. Водже и сам он мог бы тому розумети, иж тот замок на украйне есть, а к людем украинным треба ся ласкаве заховати и не годиться им ни в чом обтяженья чинити, нижли коли бы ся они запомогли и добре там

укгрунтовали, мог бы тым нам, господару, пожиток привлащыти и собе теж знаючи по часу пожиток з них мети. Для чого ж мы и теперь послали до него дворенина королевое нашое милости и великое княгини Боны Мартина Пацотковского.

А так бы твоя милость князя Толочинского напомянул и науку ему дал, же бы он уперод лепшую бачность на нас господара и на реч земскую мел и слушне а радне на том справовал и такового обтяженья людем тамошним украинным не делал и листы наши, даныи им от нас на вызволенье даней и платов наших, им отдал и в роботе замковой водле тых первших листов наших их заховал. А што колвек пенязей и бобров и медов пресных и вин будеть з них побрал, то бы все нехай им поотдавал и тыи пенязи, што на гридню и стайну его они будуть выложили, им заплатил и за то за все досыть им вчынил перед тым дворенином королевое ее милости. А естли бы он к чому ся знати не хотел, ино на што они довод слушный або присягу перед тым дворянином королевое ее милости учинять, то бы все нехай им без мешканья заплатил и жон их с порук вызволил и вин з них не брал и жадных хором на себе им робити и сен косити не казал, а земли их отчизные и озера, которые колвек будеть у них поотнимал, за ся им вернул перед тым же дворенином королевое ее милости. И так того смотрел, жебы подданыи нашы тамошние таковых тяжкостей от него не приймовали и з отчизн своих проч ся не росходили.

А што ся дотычеть старца, хто бы мел старченство у той волости заведати, ино которого человека волость на старченьство выбереть, тот нехай старцом у них будеть. А князь Василей бы того з жалобами до нас ся не втекали, бо мы, маючи причину твоее милости у себе приемную, за такими тяжкостями подданых наших с того держанья его не рушали и мамы за то, иж твоя милость так рачишь того осмотрети и науку ему дати, яко бы было з нашым господарским добрым земским пожиточным. А пак ли бы он пред ся в том небачным был и хотел якии пожитки с тых людей наших вымышляти и кривды и драпежства им чинити, а они бы для того мели проч оттоль ся розходити и (того Боже не дай), естли збытки, а неслушною справою его мел оный замок наш, который за немалым накладом нам ся достал, ку якой шкоде прийти, мы того всего хочем на твоей милости смотрети.

Писан у Кракове под лет. Бож. нарож. 1537, м-ца июня, 18 день, индикт 10.

Довнар-Запольский М. В. Очерки по организации западнорусского крестьянства в XVI в. Киев, 1905. Приложения. N 14.

З АПІСАННЯ ВЁСАК ДАНІЛАВІЧЫ, НАВАСЁЛКІ, СТАРОЕ І ЮРКАВІЧЫ З "РЕЕСТРА" РЭВІЗІІ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛАСЦІ

1560 г.

Село Даниловичи

Максим Былизич волов два, конь один, дым один, служба.

Василь Тимофеевич, Максим Иванович, Яков Ходорович волов чотыри, конь один, дымов три, служба.

Федько Пешкович, Лукьян Игнатович волы три, кони чотыри, дымы два, служба.

Иван Карпович, Петруша Борысович вол один, дымы два, служба.

А под каждою службою сеножатей воз петнацать.

В том селе дымов осим, службы чотыри грунту среднего, сеножати воз шестьдесят.

При том селе пустовщизны на имя Ивановщина, Огеевщина, Денисовщина, Совостияновщина, Ермоловщина, Левоновщина, Лаверковщина, Путятина а Волосовщина. Подданые того справы певное дати не могли, як много в тых пустовщинах залегло, бо з давных часов у пусте лежать.

Повинность того села: в кождый год о светом Михале, свята римского, мают давати до скарбу господарского с кождое службы по пятидесят грошей, жита бочку ровную, без верха и нетресеную, овса бочку также ровную, без верха и нетоптаную, то чинить з служоб чотырох коп три, грошей дватцать, жита бочок чотыри, овса бочок чотыри; з сеножатей от возов шестидесят, от кождого воза сена по чотыри пенези, то чинить грошей дватцать чотыри; за дань медовую и за отвоз за три пуды и за три безмены, за кождый пуд по двадцати пяти грошей, а за кождый безмен по пяти грошей, то чинить копу одну, грошей тридцать, а грошь-

ми здавна за дань платят кону одну, грошей чотырнатцать.

А зособна платить Петруша Борисович за полтора пуда меду грошей тридцать семь, пенезей пять; тот же Петруша платит копу одну.

За ловы звериные, яко великого, так и малого зверу и теж куничные, белочные и инные всякие и пташие грошей сорок; за ловы рыбные и за гоны бобровые грошей тридцать; за езовщину з кождое службы по шести грошей, то чинить з служоб чотырох грошей дватцать чотыри.

Сума всих платов и доходов господарских с того села коп девять, грошей тридцать девять, пенезей пять, жита бочок чотыри, овса бочок чотыри.

Доходы на державцу: с каждое службы жита пол бочки, овса пол бочки тое ж меры, которое на господара его милости мает быти давано, а зособна за каждою копою всякого плату по шести грошей, а надто с кождое службы по два возы сена, або за кождый воз по три гроши, а по два возы дров.

А окром того, што на той уставе описано, никоторых инших платов, ани подачок жадных, ни на господара его милости, ни на державцу своего, они на врадников земских и надворных давати не повинни.

Граница того села: От границы Хольчанское, села панов Халецких, от Кобыльего болота у Ковбин болото, от болота у Роман Столп, от того Столпа у Глубокий лес, от Глубокого леса у речку Городечну, Городечною вниз при границы бояр чечерских Шарипичов зася у Кобылье болото, откуль ся граница почала.

Широкость того всего грунту: От Романова Столпа до Руденца логу вдолж на полторы мили, а впоперек от Глубокого лесу до Кобыльего болота на три версты.

Ловов звериных, окром переходом, никоторых нет; ловы рыбные на реце Сожи и на озерах Хомиры а Смедине; гоны бобровые на реце Сожи от озера Смедина до речки Неменути, спольные з Юрковичи, одним берегом на две версты, а другие гоны бобровые на той же реце Сожи, от Селица до Киёвца озера, на три стрельбища з лука.

Село Юрковичи

Кудин а Ермола Созоновичи волов два, кони три, дымы два, служба.

Ларко Микулич, Овтух Игнатович волов чотыри, кони два, дымы два, служба.

А под кождою службою сеножатей воз по дватцать пять.

В том селе дымы чотыри, службы две грунту среднего, сеножати воз петдесят.

При том селе пустовщина, на имя Сидоровская, в той запустело грошей дватцать.

... Граница того села описана быти не могла, иж грунт суместный з селом тое ж волости Гомельское з Новоселками, Волковичами и з Романовичами и теж з селом поручника роты гомельское з Дуровичами.

Село Новоселки

Охрем Иванович, Малофей Абакунович волов два, кони два, дымы два, служба.

Осип Андреевич, Совостиян Степанович, Пилип Климятич волы три, кони три, дымы три, служба.

А под кождою службою сеножатей воз по тритцать.

В том селе дымов пять, службы две грунту среднего, сеножатей воз шестьдесят. При том селе пустовщина на имя Матковщина, запустело в ней грошей сорок.

В том же селе чоловек попа волотовского Микольского, на имя Ларко, пашни бочок пять, сеножатей воз шесть здавна держит на тую церковь; яко ж и подданые господарские перед нами сознали, иж тая земля з давных часов на тую церковь надана; мы по старому того попа при той земли (оставили).

Граница того села: От реки Сожа при границы села пана Халецкого Хальча у в Иржавец реку, тою речкою, уверх у болото Колбин, з болота у Романов Столп лес, с того леса у Колодейский лес, от Колодейского леса у Бден озеро, з озера зася до реки Сожи, откуль ся граница почала.

Широкость того всего грунту от речки Иржавца до Романовского Столпа лесу вдолж на три версты, а в впоперек от болота Ковпинского до леса Колодейского на две версты.

Ловов звериных, окром переходом, никоторых нет; ловы рыбные и гоны бобровые на

реце Сожи, от Каменя великого до Халецкого рубежа, одним берегом на две версты; ловы рыбные на озере Зимнем, в котором тони пять и у озере Внукове, в котором тоня одна, а на озере Кловницы тоня одна.

Тые ж подданые мают остров на имя Коледейский, спольный з селом тоеж волости Гомельское Юрковичи, в котором острове селу Новоселкам в дереве бортном третяя часть, и теж сеножати свои в том острове мают; другий остров на имя Повоз бор, спольный з селом Юрковичи и Волковичи, людьми боярскими Хомировыми, в котором острове селу Новоселкам в дереве бортном третяя часть; третий остров на имя Смединский, спольный з селом Юрковичи, в том острове тому селу третяя часть.

Село Старос

Моисей Игнатович, Яков Титович волов три, кони чотыри, дымы два, служба.

Степан Петрович, Матфей Борисович, Петько Игнатович, вол один, кони два, дымы три, служба.

Гридко Прокопович, Стома Яковович волов чотыри, кони два, дымы два, служба.

Ходот Савич, Созон Дашкович, Никон Прокопович волов пять, кони три, дымы три, служба.

А под кождою службою сеножатей воз по дватцать пять.

В том селе дымов десять, службы чотыри, грунту среднего, сеножатей воз сто.

При том селе поп замковый Микольский Семен держит землю на имя Колбасовщину; в том земли пашное бочок петнацать, сеножатей воз дванадцать; тую землю здавна к той церкви надано от колькодесят лет; якож старец и подданые господарские волости замку Гомельского, ставши перед нами, сознали, иж тая земля Ковбасовщина з давных часов на тую церковь надана. А так мы водле сознанья старцового и подданых господарских заставили есьмо тую землю по старому при той церкви.

Граница того села: От границы Романовское, от озера Бронного до Вышнего озера, от Вышнего у Холхлицу речку, тою речкою уверх у Гатищо болото, з Гатища логом до Селецкое криницы, от криницы через реку Сож у речку Грезливицу, Грезливицою уверх при границы Хольчанской в речку Перечовку, Перечовкою вниз в Незу у бор, с Незы до Сеножатки врочища, от Сеножатки лесом до Меленецкого мха, от мха до Токова болота, с Токова болота у Грызливое озеро, зася через реку Сож до границы Романовское и до озера Бронного, откуль ся граница почала.

Широкость того всего грунту от болота Гатища до речки Прочовки вдолж на милю, а впоперок от озера Бронного до речки Грезливицы на три версты.

Ловов звериных, окром переходом, и рыбных никоторых нет; гоны бобровые на реце Сожи, от Ипутья речки до Бронного озера, одним берегом на три версты; у другом местцу гоны бобровые на реце Сожи, от Перебоя врочища до Мертвицы речки, одним берегом на три стрельбища з луку; у третьем мейстцы на той же реце Сожи гоны бобровые, от лугу Терени до криницы Селецкое, одним берегом на полторы версты; в четвертом мейстцы гоны бобровые на той же реце Сожи, от озера Бронного до речки Грезливой, одним берегом на три версты.

... Люди волости Гомельское новорозданые ротмистру Гомельскому пану Криштофу Ленскому: село Присно – человеков дватцать шесть, пустовщин осим, озер больших два, и инные меньшие; село Шерстин чоловеков два; широкость тых обеих сел удолж на чотыри мили, а впоперок также много, – на листе господарском, до пана старосты гомельского писаном, за которым увящий тые села пану ротмистру подал, одно село Присно, а Липиничи описано, а Шерстина не доложоно, нижли тых сел Присны а Шерстина земли пашное и бортные суплетные суть и обруб один. В селе Липиничах человеков пять, пустовщина одна, того села грунт суместный з людьми господарскими рогачевскими и чечерскими; листов данины господарское на то пан ротмистр не оказал, менуючи их быти у захованью у брата своего ложничого господарского пана Лукаша Ленского.

Пану Василю а пану Андрею Халецким дано у в одном обрубе сел чотыри, то есть: Чоботовичи, Засовье, Кольскевичи а Чорные, человеков петдесят. Широкость того всего грунту удолж на шесть миль, а впоперок на чотыри мили, индей ширей, индей ужей; листов данины господарское на тые села не оказано, иж сами панове Халецкие на тот час у Гомли не были за послугою господарскою и земскою военною.

Акты, издаваемые Виленской археографической комиссией. Вильна, 1886. Т. 18: Акты Главного литовского трибунала. N 100. С. 371–375, 376.

У СКЛАДЗЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

ВОЙНЫ, СПУСТАШЭННІ, ГОЛАД

У XVII ст. на Веткаўшчыне працягвалі панаваць феадальна-прыгонніцкія адносіны. Частка зямель знаходзілася ва ўласнасці буйных землеўладальнікаў, да якіх адносіліся Радзівілы, Халецкія. Аднак большая частка зямель Веткаўшчыны належала дзяржаве — Рэчы Паспалітай. Кароль раздаваў гэтыя землі ў кіраванне буйным магнатам за заслугі перад дзяржавай, шляхце, якая абавязана была ахоўваць межы дзяржавы. Шляхецкія землі часта пераходзілі ў спадчыннае валоданне. Да населеных пунктаў Веткаўшчыны ў гэты перыяд адносіліся Хальч, Шарсцін, Данілавічы, Юркавічы, Навасёлкі, Старое Сяло, Прысно, Свяцілавічы, Жалезнікі, Хізы і іншыя.

Прыватнаўласніцкія сяляне эксплуатаваліся ў асноўным шляхам адработачнай рэнты — паншчыны, якая ва ўсходняй Беларусі была ніжэйшай, чым у цэнтральнай і заходняй Беларусі. Тлумачыцца такое становішча тым, што ў першай палавіне XVII ст. фальварачная гаспадарка ва ўсходняй Беларусі не атрымала шырокага распаўсюджання. Вядзенне на сугліністых і супясчаных землях такой гаспадаркі не абяцала ўладальнікам вялікіх даходаў. Такая з'ява вызначыла больш марудныя тэмпы развіцця таварна-грашовых адносін. Да таго ж узмацненне эксплуатацыі на тэрыторыях, памежных з Рускай дзяржавай, да якіх адносілася і Веткаўшчына, стварыла б ачаг унутранай напружанасці і аслабляла б тым самым абарончы патэнцыял дзяржавы. У тым жа накірунку дзейнічаў і такі фактар, як уцёкі сялян на Украіну і ў Расію.

Пасля Люблінскай уніі 1569 г. вялікакняжацкія землі або дзяржаўныя маёнткі (староствы) перайшлі ў распараджэнне караля Рэчы Паспалітай. Староствы даваліся каралём у часовае карыстанне феадалам у якасці натуральнай пенсіі за службу. Яны даваліся таксама ў пажыццёвае карыстанне як узнагарода за заслугі перад дзяржавай і здаваліся ў арэнду за гадавую плату. З 1562 г. уладальнікі старостваў уносілі ў казну на ўтрыманне арміі так званую кварту — чацвёртую частку чыстага даходу. На дзяржаўных землях існавалі тыя ж самыя формы эксплуатацыі сялян. Частка тэрыторыі Веткаўшчыны ўваходзіла ў Гомельскае староства.

Пачатак XVII ст. на Веткаўшчыне, як ва ўсёй усходняй Беларусі, характарызаваўся частымі няўродамі. Дэталёвае апісанне гэтых гадоў утрымліваецца ў "Баркулабаўскім летапісе":

З Баркулабаўскага летапісу

"Того же року 1601, месяца октября десятого дня, целую неделю снег сильний и кгвалтовый ишол, выпал до полголени; также и буря сильна была. Тогды пшеницы ярицы, овес, гречиху, горохи и вси овощы, великое множство ярицы на полях непожаты, также и копы жатые снегом позаметала метелица, иж было жалосно и страшно гледети и вяковедити уздыханя и плачу людей убогих, пашников немаетных. А так лежал тот снег 2 недели аж до Дмитровы суботы; яко ж з великих морозов река Днепр был замерз, и ездили по нем яко сред зимы. А потом за ласкою всемилостивого господа бога для плачу и великого уздыханя снег ростал и река Днепр росплынулся. А потым почали жати-горовати по снегу у стужу. Были теж морозы великие, огне клали, сами грелися, иж страшно и жалосно было гледети: три-два человеки на день ледво снопов 40 нажнут овса албо ярицы, бо велми

к земли [прилегло]... А тот гнев божий был и непогода, почавши от Менска до Полоцка к Витебску до Орши, до Мстиславля, до Пропойска, до Рогачева, Могилева, Любошаны... А так потом много множества людей убогих з голоду на Низ з жонками и детками и зъ семею, што иж страшно было не только видети, але трудно было и выписати, то ест з верху з волости Шкловское, з Друцка, з Дубровны, з Круглы, з Бобря, з Витебска, з-под Полоцка, з-под Менска и з инших многих украин. Того же року была зима злая, снеги великие и сильные были морозы. Многим людем поморозило кому ногу, кому палецы, другому вид: уши, нос; а другие з морозу померли. А коли вже была весна в року 1602, тот находи людей множество почали мерти; по пятеру, по трицати у яму [хоронили]. Хворых, голодных, пухлых многое множество, — страх видети гневу божого... Там же, которые ишли на Низ, тыя вси там померли, мало се зостало. А так мерли одны при местах, на вулицах, на дорогах, по лесам, по пустыни, при распутиях, по пустых избах, по гумнам померли. Отец сына, сын отца, матка детки, детки матку, муж жену, жена мужа, покинувши детки свои, резно по местам, по селам разышлися, один другого покидали, не ведаючи один о другом, — мало не вси померли. А коли тот находи у ворот, албо в дому у кого стоячи хлеба просили, отец з сыном, сын со отцом, матка з дочкою, дочка з маткою, брат з братом, сестра с сестрою, муж з женою, тогми словы мовили силне, слезне, горко, мовили так: "Матухно, зезулюхно, утухно, панюшко, сподариня, слонце, месец, звездухно, дай крошку хлеба!" Тут же подле ворот будут стояти з раня до обеда и до полудня, так то просячи; там же другий под плотом и умрет." (Баркулабовская летопись. Полное собрание русских летописей. М. 1975. Т. 32. С. 187 – 188.).

Вялікую небяспеку для жыхароў Веткаўшчыны ўяўлялі набегі казакоў. Яшчэ ў XVI ст. на чарнігаўскіх землях, што адышлі ад Вялікага княства Літоўскага да Маскоўскай дзяржавы, стала складвацца казацтва як самастойнае ваеннае саслоўе. Знаходзячыся ва ўмовах прыгранічча, яно складала даволі актыўную сілу, здольную аказаць націск на Рэч Паспалітую. Іншы раз яны выступалі разам з запарожскімі казакамі. Пачатак XVII ст. суправаджаўся паходамі казакоў на пасожскія і падняпроўскія беларускія землі. У 1603 г. казакі пад камандаваннем Куцковіча і Касога ў колькасці 4 тыс. чалавек былі на Гомельшчыне і Рагачоўшчыне. Гэтыя паходы характарызаваліся грабяжом і насіллем над беларускім насельніцтвам. Летапіс паведамляе, што ў час вяртання назад "на ніз" казакі-запарожцы "вялікую шкоду па сёлах, па месцах чынілі", вывозячы з сабой жанчын, дзяўчат, падлеткаў, а таксама забіраючы коней.

Геаграфічнае становішча Веткаўшчыны як пагранічнага фарпоста Рэчы Паспалітай таіла ў сабе, асабліва ў перыяд абвастрэння руска-польскіх адносін, разарэнне і спусташэнне. Калі ў 1615 г. былі сарваны руска-польскія перамовы адносна Смаленска, цар Міхаіл Фёдаравіч загадаў ваяводзе князю Міхаілу Цінбаеву і Мікіту Ліхараву ісці да літоўскай мяжы і разараць тэрыторыі ў раёне Віцебска, Вележа і Суража. Землі суражскія, асабліва на захадзе, былі заселены беларусамі (некаторыя з іх — Казацкія Балсуны, Неглюбка — увайшлі пасля ў склад Веткаўскага раёна). Ваенныя дзеянні ў 1615 г. вяліся з асаблівай жорсткасцю і прычынілі вялікі ўрон мясцоваму насельніцтву.

У час вайнаў украінскага народа пад кіраўніцтвам Багдана Хмяльніцкага супраць Рэчы Паспалітай (1648 – 1654) і Расіі з Рэччу Паспалітай (1654 – 1667) Веткаў-

шчына станавілася арэнай ваенных дзеянняў. Тут былі польскія, рускія войскі, казакі Багдана Хмяльніцкага. Вясной 1648 г. у гомельскім Пасожжы былі казакі палкоўніка Нябабы, якія неаднойчы спустошвалі сёлы вакол Гомеля. Летам 1648 г. праз чарнігава-северскія землі на Веткаўшчыну нахлынулі атрады Гаркушы, Мікуліцкага, Хвяcько, Крывашапкі і інш. Яны сканцэнтроўваліся ў раёне Чырвонай Гары, дзе над Беседдзю размяшчаўся захоплены імі замак, і накіроўваліся ў раён баявых дзеянняў на Днепр, Бярэзіну і далей на захад. Сяло Казацкія Балсуны стала вартавым пастом казакоў. Яно атрымала назву ад прозвішча аднаго з палкоўнікаў Хмяльніцкага — Балсуна. У 1649 г. Масква згадзілася выступіць супраць літоўскіх войскаў, што накіроўваліся на Украіну. Неўзабаве ва ўсходняй Беларусі, у тым ліку і ў Пасожжы, з'явіліся рускія войскі. Тым часам Хмяльніцкі, забяспечаны ад нападу з поўначы, павінен быў рушыць асноўныя свае сілы супраць палякаў. Так Веткаўшчына з самага пачатку ваенных падзей у 1648 г. стала аб'ектам ваенных дзеянняў. У 1649 г. казацкія палкі, кінутыя на поўнач "аж па Гомель і Дрохаў і Мглін" зноў пабывалі на Веткаўшчыне, несучы новае спусташэнне. Летам 1654 г. атрады казакоў, якімі камандаваў швагер Багдана Хмяльніцкага Іван Залатарэнка, асадзіўшы Гомель, рабілі разбойніцкія набегі на гарады і сёлы, якія ляжалі па Сожу і Дняпру.

У 1649 г. па Збораўскаму дагавору межы Украіны ўстанаўліваліся ад Чорнага мора, Дняпроўскага лімана і вярхоўяў Днястра да ракі Гарынь і Прыпяць, а адтуль па Дняпру да Быхава, ад апошняга па рацэ Сож да Смаленскага павета. Уласна кажучы, гэтыя межы былі названы Багданам Хмяльніцкім у 1656 г. у перыяд перагавораў з Польшчай. Гэтыя межы сведчаць аб тым, што амаль уся тэрыторыя Веткаўшчыны засталася ў складзе Рэчы Паспалітай. Але частка яе (Казацкія Балсуны, Неглюбка) была ў складзе Украіны.

У сярэдзіне 50-х гадоў XVII ст. Гомель стаў цэнтрам своеасаблівай "казацкай рэспублікі" на чале з авантурыстам Андрэем Мурашкам. Сотнік вядомага палкоўніка Івана Нячая рабаваў і разараў не толькі сам Гомель, але і яго наваколле. У сферы яго дзеянняў была і Веткаўшчына. Андрэй Мурашка і яго брат сотнік Дзіянісій за вернасць Рэчы Паспалітай атрымалі шляхецтва. На працягу дзесяцігоддзя працягвалася гэта спусташэнне Гомеля і сёл, што прылягалі да яго. Пасля Андрусаўскага перамір'я 1667 г. Веткаўшчына знаходзілася ў складзе Рэчы Паспалітай.

Войны сярэдзіны і другой палавіны XVII ст. прывялі да значнага адтоку беларускага насельніцтва Пасожжа ў Расію — на Браншчыну, Арлоўшчыну, Тульшчыну, Куршчыну. Раёны Пасожжа ў сваю чаргу сталі засяляцца насельніцтвам паўднёва-заходняй Беларусі, збеглымі сялянамі з Расіі, украінцамі з Валыні і Прыкарпацця. Усё гэта ўжо ў XVII ст. да прыходу стараверaў стварыла тут цеснае ўзаемадзеянне розных галін славянства.

Украінскія землі, якія пасля Пераяслаўскай рады ўвайшлі ў склад Расіі, у гістарычных крыніцах іншы раз насілі назву Гетманшчына. Яе тэрыторыя дзялілася на палкі. На Чарнігаўшчыне было чатыры палкі, з адным з якіх (Старадубскі полк) даволі цесна пераплялася гісторыя Веткаўшчыны.

У 1684 г. з ведама рускага цара гетман запарожскі Іван Самайловіч рушыў казацкія палкі да Сожа, і ўсе сёлы ад Гомеля да Рослаўля (у тым ліку і Гомельская воласць) былі захоплены і далучаны да Старадубскага палка. Аднак у 1688 г. па

дамоўленасці з палкамі польскага караля захопленыя землі зноў адышлі да Рэчы Паспалітай. Часам палкі самі пераходзілі на левабярэжжа Сожа, а потым заяўлялі, што гэтыя землі належалі Рэчкаўскаму павету.

РАСІЙСКІЯ СТАРАВЕРЫ БЕГЛІ Ў ВЕТКУ

У сярэдзіне 80-х гадоў XVII ст. у беларускім Пасожжы адбылася падзея, якая заняла важнае месца ў гісторыі рускай праваслаўнай царквы і надоўга прыцягнула да сябе ўвагу значнай часткі насельніцтва Расіі, Беларусі і Украіны. Гэтаму ў немалой ступені садзейнічаў раскол рускай праваслаўнай царквы. Царкоўная рэформа, якую распачаў патрыярх Нікан у 50-х гадах XVII ст., прадугледжвала ў канчатковым выніку ўмацаванне праваслаўнай царквы ў рускім грамадстве. У 1653 г. спецыяльна скліканы сабор адобрыў асноўныя палажэнні рэформы. Сярод істотных новаўвядзенняў, прыўнесеных ёю, былі: звычай хрысціцца замест двума пальцамі трохперсцем, слова "алілуя" вымаўлялася не двойчы, а тройчы, рух вакол аналоя не па сонцу, а супраць яго і інш. Усе праціўнікі рэформы на саборах 1655 і 1656 гг. былі адлучаны ад царквы. Царкоўны сабор 1666 – 1667 гг., акрамя праклёну, прадугледжваў для іх яшчэ адданне пад суд па артыкулах Саборнага Улажэння 1649 г., якія гаварылі аб спальванні на кастры кожнага, "хто ўскладзе знеслаўленне на Госпада Бога". На гэтых кастрах скончылася жыццё многіх праціўнікаў патрыярха Нікана. Рашэнні сабора 1666 – 1667 гг. азначалі раскол рускай праваслаўнай царквы. Праціўнікі Нікана сталі называцца раскольнікамі, або старавераміі. Вельмі шырокая была сацыяльная база старавераскага руху. Тут былі сяляне, пасадскія людзі, стральцы, купцы, прадстаўнікі баярства. Ратуючыся ад ганенняў афіцыйнай царквы, раскольнікі ўцякалі на ўскраіны Расіі, у месцы глухія і неасвоеныя, а таксама за яе межы. Так з'явіліся раскольнікі на ўсходзе Беларусі. Першыя ўпамінанні аб іх адносяцца да канца 70-х гадоў XVII ст. Раскольнікі аселі ў Хальчы. У той жа час стараверы рушылі на Чарнігаўшчыну, у раён Старадуба (зараз Бранская вобласць). Сюды з Масквы прыйшоў поп Кузьма з 12 купецкімі сем'ямі руплівых сваіх прыхільнікаў. Неўзабаве з прыбыццём новых беглякоў у раёне Старадуба ўтварылася некалькі слабод стараверaў. З прыходам раскольнікаў з Бялёва з папом Стэфанам утварылася яшчэ адна слабада. Паток беглякоў усё больш і больш павялічваўся. Ён быў прадстаўлены праціўнікамі рэформы Нікана з Масквы, Калугі, Яраслаўля, Вязьмы, Арла, Кастрамы, Вялікіх Лук, Юр'ева-Падольскага і іншых мясцовасцей Расіі. Раскольнікі пасяліліся на неўрадлівых землях Дняпрова-Сожскай нізіны, дзе глеба была пясчаная, месцамі пераходзіла ў сыпучы пясок. Раскольнікі пасяліліся на землях украінскіх феадалаў, зацікаўленых у асваенні сваіх пустынных зямель. Таму яны давалі прышэльцам пэўныя льготы.

У хуткім часе пачаліся ганенні на старадубскіх раскольнікаў, звязаных з паўстаннем стральцоў у Маскве, сярод якіх было шмат праціўнікаў ніканаўскіх рэформ. Першае ганенне адбылося ў канцы 1682 — пачатку 1683 года, другое — у другой палавіне 1684 г. Чарнігаўскаму архірэю і старадубскай адміністрацыі прыйшоў з Масквы ўказ, які патрабаваў вярнуць збеглых раскольнікаў на ранейшае месца пражывання і схіліць іх да праваслаўя. Тады раскольнікі ўцяклі з ужо ў значнай меры абжытых зямель. Папы Кузьма і Стэфан са сваімі аднадумцамі накіраваліся за мяжу, у Рэч Паспалітую. Там яны спыніліся ва ўладаннях Казіміра Халецкага, старосты мазырскага, размешчаных за 15 вёрст ад мяжы. Раскольнікі заснавалі ў 1685 г. на востраве ракі Сож

першую слабаду. Так узнікла стараверскае паселішча Ветка.

Існуе некалькі версій паходжання назвы Веткі. Адны лічаць, што каля вострава працякала рачулка — галіна Сожа (па рускай мове — ветвь, ветка); іншыя — што сам востраў, на якім пасяліліся прышэльцы, насіў назву Ветка; трэція — што Ветка — гэта галіна (па-руску ветка) Масквы, падкрэсліваючы тым самым кроўную сувязь з Расіяй. Востраў меў у акружнасці не больш дзвюх-трох вёрст. Пан Халецкі, уладальнік вострава, быў рады староверам, якія занялі пуставаўшую лясную зямлю. Па ўмовах заключанага дагавору раскольнікі карысталіся ёю на правах арэнды і прыносілі ўладальніку немалыя даходы. Неўзабаве яны пачалі набываць зямлю ва ўласнасць. На першыя гады староверы атрымалі свабоду ад падаткаў, перамяшчэння і права гандляваць на роўных падставах з мясцовымі мяшчанамі, а таксама права трымаць сваіх святароў, узводзіць культавыя будынкі. Гэтыя ўмовы сведчаць аб тым, што сярод перасяленцаў былі як сяляне, так і купцы. Апошнія, на думку некаторых даследчыкаў, пераважалі, што ў значнай меры на некалькі стагоддзяў вызначыла напрамак развіцця Веткі. Вакол яе ў канцы XVII — пачатку XVIII ст. узнікла 14 слабод, у тым ліку Косіцкая, Папсуеўка, Мар'іна, Тарасаўка, Раманава, Дубовы Лог, Крупец і інш. У 1722 г. утварылася яшчэ 9 слабод, у тым ліку Пабужжа, Купрэеўка. Усе слабоды разам уяўлялі сабой своеасаблівую федэрацыю староверaў, і ў цэнтры яе была Ветка. Такім чынам, на рубяжы XVII—XVIII ст. ва ўсходняй Беларусі поруч з уніяцкай, праваслаўнай, каталіцкай цэрквамі з'явілася староверства, уяўляўшае сабой той напрамак у праваслаўі, які панаваў у Расіі да пераўтварэнняў Нікана.

Пасля смерці папа Кузьмы значнае месца сярод староверaў заняў чорны поп (іераманах) Іаасаф. Перасяліўшыся з адной са слабод, ён угаварыў веткаўцаў будаваць царкву, якая ўзводзілася даволі хутка. Аднак Іаасаф так і памёр, не асвяціўшы яе. Пасля яго быў прызваны веткаўцамі да сябе чорны поп Феадосій. Вартая ўвагі яго біяграфія. Пачаў Феадосій сваю кар'еру ў Рыльску. Калі праследаванне староверaў прыняло шырокія маштабы, ён уцёк на Дон. Хутка схоплены ўладамі, Феадосій высылаецца ў Белазёрскі манастыр. Яму ўдаецца ўцячы з манастыра. Пабываў у Памор'і, Каржанцы. Ратуючыся ад праследаванняў, Феадосій накіраваўся ў Ветку. Па дарозе, у Калузе, у адной з закінутых цэркавак ён адшукаў шэраг старажытных рытуальных скарбаў. З імі Феадосій з'явіўся ў Ветцы. Ён загадаў расшырыць недабудаваную царкву ў даўжыню і шырыню. Царква была асвячона ў 1695 г. у імя Пакрова Прасвятой Багародзіцы і стала называцца Пакроўскай. Гэта была першая староверская царква, а літургія, адпраўленая ў дзень яе асвячэння, была першая раскольніцкая абедня. Неўзабаве поруч з цэрквамі, капліцамі сталі ўзнікаць староверскія манастыры.

Весткі пра новых людзей, што пасяліліся ў пагранічных раёнах Рэчы Паспалітай, дайшлі да Варшавы. Вышэйшы трыбунальны суд, назначаны каралём, разглядаў справу аб "маскаліях". Прадстаўнікі раскольнікаў так гаварылі на трыбунале аб прычынах, якія прымусілі іх пасяліцца ў межах Рэчы Паспалітай: "Мы вольныя людзі з маскоўскіх уладанняў. Прычына нашага выхаду такая: яшчэ пры цару Аляксею Міхайлавічу быў патрыярхам Нікан... Ён пастанавіў па свайму домыслу і загадаў, каб кожны хрысціўся са словамі: "Господзі божа наш, памілуй нас", а не як было спрадвеку: "Господзі Ісус Хрыстос, сыне божы, памілуй нас". За што пацярпелі пакуты, іншыя, не жадаючы пераносіць мучэнні, з пажыткамі выйшлі з Масквы і прыйшлі сюды". Суд 8 лютага 1690 г. пастанавіў: "Гэтая рэлігія і тыя, хто

яе вызнае, становяцца роўныя з усімі грамадзянамі Рэчы Паспалітай і знаходзяцца пад заступніцтвам яе законаў". Такія талерантныя адносіны вышэйшага трыбунальнага суда можна растлумачыць тым, што суд меў справу з напрамкам, апазіцыйным афіцыйнай рэлігіі і ў значнай меры ўраду Расіі, варожых Рэчы Паспалітай.

Як жа складваліся адносіны раскольнікаў з Халецкімі, мясцовымі сялянамі? Халецкія, атрымліваючы вялікія даходы ад раскольнікаў, ставіліся з разуменнем да іх рэлігійных перакананняў і абаранялі па меры магчымасці іх інтарэсы. Так, Казімір Халецкі ў пісьме старадубскаму палкоўніку Самайловічу абураўся з выпадку нападзення "маскоўскіх людзей" на раскольнікаў, што вярталіся са старадубскага святочнага з'езда, якіх яны "збілі неміласэрна, у турму пасадзілі". Абараняў стараверaў і Міхаіл Халецкі. У пісьме гетману Мазепу 20 верасня 1701 г. ён патрабаваў адпусціць затрыманых веткаўскіх жыхароў.

Раскольнікі таксама пры выпадку аказвалі дапамогу Халецкім. Яны вельмі актыўна адстойвалі інтарэсы свайго заступніка ў яго супрацьборстве з суседам Радзівілам, які хацеў перамясціць мяжу сваіх уладанняў на зямлю Халецкага. Справа дайшла да бойкі. Радзівіл супраць Халецкага выставіў сваіх прыгонных, а апошні – стараверaў з Веткі. "Чарняцы, – пісаў протаіерэй Андрэй Іаан з Пецярбурга, які ў канцы XVIII ст. азнаёміўся з гэтымі падзеямі, – уступіліся за свайго памешчыка, учынілі страшны бой і закончылі яго жудасным праліццём... крыві". Гэта быў адзінкавы канфлікт стараверaў з мясцовымі сялянамі, зафіксаваны ў гістарычных дакументах.

Стараверы былі добрымі арганізатарамі гаспадарчага жыцця. Шляхам высечкі лесу расшыраліся пасяўныя плошчы, заводзілася значная колькасць жывёлы, будаваліся млыны, развівалася агародніцтва, садаводства, пчалярства. Сярод пасяленцаў было шмат выхадцаў з рамеснікаў. На новых месцах яны працягвалі сваю справу.

Асаблівае значэнне сярод заняткаў стараверaў стаў набываць гандаль. За кароткі перыяд часу веткаўскія слабоды ператварыліся ў развіты гандлёвы цэнтр. Раскольнікі сканцэнтравалі ў сваіх руках гандаль усходняй Беларусі з левабярэжнай Украінай. Яны са сваімі таварамі пранікалі ва ўсходнія і паўночна-ўсходнія раёны Расіі. Гэта дзейнасць веткаўскіх купцоў абапіралася на саматужную вытворчасць рамеснікаў Старадуба і часткова Веткі. Веткаўскія купцы давалі рамеснікам крэдыты, забяспечвалі іх сыравінай, засяродзілі ў сваіх руках збыт выпрацаванай прадукцыі. Сярод рамёстваў, якія атрымалі развіццё ў асяроддзі раскольнікаў, былі шапачны, вязальны, кравецкі, кушнерскі, фарбавальны, бондарскі, шавецкі промыслы, а таксама выраб крыжыкаў, лыжак і кубкаў для прычасця. Гандлёвыя сувязі з Украінай, Расіяй садзейнічалі фарміраванню веткаўскага стараверскага гандлёвага капіталу.

Славілася Ветка будаўнікамі, разьбярамі па дрэву, чырванадрэўшчыкамі, залацільшчыкамі, чаканшчыкамі. Майстроў з Веткі запрашалі будаваць і ўпрыгожваць саборы, багатыя дамы ў Кіеве, Маскве і Пецярбургу. Яны прынялі ўдзел у аздабленні Зброевай палаты ў Крамлі, Новадзявочага і Іверскага манастыроў.

ВЕТКА – ЦЭНТР РАСІЙСКАГА РАСКОЛУ

Ветка ў пачатку XVIII ст. становіцца цэнтрам расійскага стараверства. Да яе прыслухоўваліся і духоўна падначальваліся раскольнікі Масквы і Паволжа, Дона і Яіка, паўднёвага захаду Расіі і нават Сібіры. Кіраўнік веткаўскіх раскольнікаў Феадосій фактычна з'яўляўся кі-

раўніком усяго рускага расколу. У Ветку прыходзіла вялікая колькасць папоў, якія парвалі з афіцыйнай царквой. Тут яны "выпраўляліся" ў старавераскім духу і рассылаліся па Расіі. Раскольнікі імкнуліся арганізацыйна аформіцца як самастойны напрамак у праваслаўі, аб чым сведчыць іх зварот да канстанцінопальскага патрыярха аб устанаўленні епіскапату, які не ўвянчаўся поспехам. Рабілася нават спроба ўвесці старавераскае архірэйства. З гэтай мэтай веткаўцы ўступілі ў кантакт з малдаўскім мітрапалітам Антоніем. Але спроба закончылася няўдачай. Гэтак жа скончылася задума маскоўскіх раскольнікаў, якія прывезлі ў Ветку епіскапа Епіфанія, які не знайшоў агульнай мовы з мясцовымі старавераміі.

Узвышэнню Веткі садзейнічала яе размяшчэнне за межамі Рускай дзяржавы, а таксама стан раскольніцкіх абшчын у самой Расіі, які выявіўся ў адсутнасці адзінства паміж імі і ўнутранай барацьбой. У спрэчках паміж раскольнікамі Расіі Пакроўская царква ў Ветцы выступіла ў якасці арбітра. Веткаўскія раскольнікі дзейнічалі як місіянеры старавераства ў Маскве, Калузе. Яны распаўсюджвалі па ўсёй Рускай дзяржаве ідэі расколу. Пад выглядам купецкіх людзей з ружжом і рагацінай, жабракоў з кайстрамі на спінах, вандроўнікаў і багамольцаў яны пранікалі ў самыя аддаленыя куточкі краіны, збіраючы ахвяраванні на веткаўскую царкву. Пад уплывам раскольніцкай прапаганды прыток незадаволеных з Расіі ўзмацніўся, і веткаўская федэрацыя старавераў складала ў пачатку XVIII ст. 40 тыс. чалавек. Гэтаму прытоку не змаглі перашкаджаць ніякія, нават самыя жорсткія меры пакарання ў адносінах да схопленых на мяжы беглякоў. "Адносна Веткі, — пісаў М. І. Лілееў, адзін з буйнейшых даследчыкаў расколу, — смела можна сказаць, што нібыта нават не існавала для яе пагранічнай лініі: тут былі свае дарогі, свае станавішчы, свая пошта і карэспандэнцыя, свае спецыялісты-рамізнікі, якія перапраўлялі жадаючых перайсці за рубеж".

Узмацненню ўплыву Веткі як цэнтра старавераскага свету садзейнічалі пятроўскія пераўтварэнні. Шэраг новаўвядзенняў у быце і звычаях (змяненні верхняга адзення, забарона насіць бароды, новае летазлічэнне) моцна хваляваў народныя масы, выклікаў боязь за чысціню веры, маральныя ўзрушэнні. У такіх умовах місіянерская дзейнасць раскольнікаў з Веткі знаходзіла спрыяльную глебу ў краіне. Ужо вядомы нам протаіерэй Андрэй Іаан характарызаваў Ветку як галаву ўсяго расколу. "Прывабнасць яе, — пісаў ён, — з часам больш распаўсюдзілася паўсюдна, так што самыя аддаленыя гарады, паветы і сёлы Расіі не пазбеглі заразы яе".

Старавераства ўнесла свой важкі ўклад у развіццё культуры Беларусі. Пры манастырах і цэрквах ствараліся школы граматы. Праслойка пісьменных людзей сярод раскольнікаў была вышэйшая, чым сярод беларускіх сялян. Акрамя граматы, спецыяльныя настаўнікі, пераходзячы ад адной слабады ў другую, давалі прафесійныя веды, абучаючы дзяцей рамяству. Шырокае распаўсюджанне ў Ветцы і ў навакольных слабодах атрымалі кніга- і іконапісанне. Рукапісныя кнігі, якія выходзілі з асяроддзя старавераў, адрозніваліся высокай мастацкасцю, якая знаходзіла сваё ўвасабленне ў цудоўных арнаментах, мініяцюрах. Гэтыя кнігі развозіліся па ўсёй Расіі і прадаваліся па даволі высокіх цэнах. У канцы XVII — пачатку XVIII ст. сфарміравалася веткаўская школа іканапісу. У Ветцы вучыліся гэтай справе не толькі мясцовыя старавераы, але і прышлыя людзі з іншых раёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Украіны, якія часта не падзялялі ідэй расколу.

Дзейнасць старавераў, што рассяліліся ва ўсходняй Беларусі, не насіла антырускі

характар. Іх памкненні зводзіліся да таго, каб забяспечыць сабе бяспечнае існаванне, адгарадзіцца ад ганенняў за веру. Больш таго, стараверы выступалі на баку рускай арміі ў перыяд Паўночнай вайны (1700–1721). Дайшоўшыя да нашых дзён паданні сведчаць пра тое, што непадалёку ад Веткі адбылося сутыкненне рускіх і шведскіх войскаў, у якім "рускія пабілі шведаў". Мясцовыя жыхары не шкадавалі "ўцякаўшых шведаў", якія прыйшлі як грабежнікі і захопнікі. Пётр I выказваў сваю ўдзячнасць стараверам за іх удзел у вайне са шведамі і, як паведамляе крыніца, дараваў ім уцёкі.

Аднак прапаганда ідэй расколу ў Расіі выклікала незадаволенасць прэлатаў праваслаўнай царквы. Першы, хто прапанаваў знішчыць Ветку, быў Піцірым, мітрапаліт Наўгародскі і пазней патрыярх усяе Русі. У 1715 г. ён прапанаваў Пятру I разбурыць раскольніцкія пасяленні за польскай мяжой і перш за ўсё Ветку.

Існаванне калоній стараверaў выклікала незадавальненне ў рускіх памешчыкаў, прыгонныя якіх збеглі ў Рэч Паспалітую, вызваляючыся ад рэкрутчыны, падушнага падатку. Яны папаўнялі рады раскольнікаў. Гэтыя ўцёкі асабліва неспрыяльна адбіваліся на памешчыках прыгранічнай паласы Расіі.

Веткаўскія купцы ўяўлялі сабой сур'ёзных канкурэнтаў у гандлёвых справах купецтву шэрагу расійскіх гарадоў. Апошнія патрабавалі ад улад абмежаваць або зусім ліквідаваць канкурэнцыю замежных стараверaў. У 1721 г. з прапановай знішчыць раскольніцкую Ветку звярнуліся да ўлад кіраўнікі маскоўскай цівунскай палаты Феакцістаў і Міхайлаў, якія сутыкаліся з веткаўцамі ў Маскве і яе наваколлях.

Масавыя ўцёкі ў раскольніцкія слабоды наносілі ўрон царскай казне з-за змяншэння падатковых паступленняў. Да таго ж пагранічнае становішча стараверскіх абшчын, нягледзячы на лаяльнасць апошніх да пануючага ў Расіі ладу, утойвала ў сабе пэўныя негатыўныя міжнародныя наступствы. У канцы царствавання Пятра I сталі збірацца весткі аб замежных раскольніках. Аднак пры ім ніякіх рэпрэсіўных мер супраць стараверaў не прымалася. Такі збег абставін быў прадыктаваны тым, што Расія ў барацьбе са Швецыяй заключыла дагавор з Рэччу Паспалітай аб сумесных ваенных дзеяннях.

У пачатку царствавання Ганны Іванаўны (1730–1740) былі сабраны разнастайныя весткі аб замежных раскольніках, у тым ліку і веткаўскіх слабодах. Урад атрымаў вялікую колькасць скаргаў ад памешчыкаў заходніх раёнаў Расіі наконт уцёкаў сялян у межы Рэчы Паспалітай. Царскі ўрад вырашыў прыняць меры прафілактычнага характару для прыпынення ўцёкаў і вяртання беглякоў. Для папярэджання ўцёкаў на мяжы ўстанаўліваліся фарпосты, над злоўленымі ўчынялася суровая расправа. Была нават сфарміравана спецыяльная камісія, у задачу якой уваходзіла спыненне ўцёкаў. Аднак гэтыя меры не прынеслі жаданых вынікаў. Раскольнікі сілай прабіваліся праз фарпосты або пракладвалі новыя шляхі.

У ход ішлі і абяцанні дараваць беглякам у выпадку добраахвотнага вяртання. Ганна Іванаўна абнародавала два спецыяльныя ўказы ў 1732 і 1733 гадах. Некаторыя стараверы Веткі, Гомеля, Хальча вярнуліся пад іх уплывам у Расію. У 1734 г. было аб'яўлена новае запрашэнне, і зноў невялікая колькасць стараверaў выкарыстала яго. Але паток беглякоў з Расіі ў шмат разоў перавышаў колькасць тых, што вярталіся.

Тады царскі ўрад вырашыў прымяніць больш радыкальныя меры. Да гэтага падштурхоўвала і тая акалічнасць, што раскольнікі адмаўлялі права жанчын на царскі прастол. У 1735 г. Ганна Іванаўна,

груба парушаючы суверэнітэт Рэчы Паспалітай, загадала 5-і палкам пад камандаваннем палкоўніка Сыціна перайсці польскую мяжу, акружыць Ветку і вярнуць раскольнікаў на старыя месцы пражывання. Войскі акружылі Ветку. Усе веткаўскія манахі і манашкі былі сасланы ў рускія манастыры для пакаяння, астатнія раскольнікі адасланы на ранейшае месцажыхарства, тых жа, хто ўтойваў сваё першапачатковае месцапражыванне, адпраўлялі пад нагляд начальства. Сыцін правёў цэлы год у Ветцы. Пад яго кіраўніцтвам спальваліся манастыры, жытло раскольнікаў. Гэта быў акт вандалізму самадзяржаўя ў адносінах да іншадумцаў. У гісторыі Веткі перамяшчэнне амаль 40 тыс. старавераў у рускія межы, жорсткае іх разарэнне атрымалі пасля назву "першага выгнання".

Аднак Ветка як цэнтр рускага расколу яшчэ праіснавала тры дзесяцігоддзі. Частка раскольнікаў, якая ў час выгнання апынулася за межамі Веткі, вярнулася назад. Расправа над веткаўцамі выклікала абурэнне сярод старавераў Расіі. З усіх яе неабсяжных канцоў у Ветку ішлі матэрыяльныя сродкі. Узмацніўся прыток новых старавераў, і хутка яна была адноўлена амаль у ранейшых маштабах. У 1758 г. стала дзейнічаць Пакроўская царква, паблізу якой пабудаваліся мужчынскі і жаночы манастыры. Зноў манахі і манашкі аб'язджалі гарады і сёлы Расіі, прывозячы ў Ветку значныя ахвяраванні.

Хаця "веткаўская стрэмка" і знаходзілася за межамі Расіі, але працягвала даволі адчувальна "калоць" пануючую царкву, заходнерускіх памешчыкаў. Імкненне канчаткова расправіцца з замежнымі раскольнікамі не пакідала самадзяржаўе. У 1760 г. імператрыца Лізавета Пятроўна выдала маніфест, у якім прапаноўвалася раскольнікам вярнуцца ў Расію і абяцалася дараванне. Падобныя запрашэнні і абяцанні мелі месца пры ўступленні на прастол Пятра III і Кацярыны II. Ва ўказах Кацярыны II у 1762 і 1763 гадах гаворка нават ішла пра тое, што, калі сяляне не згодныя вярнуцца да сваіх старых памешчыкаў, то яны могуць запісацца ў саслоўе дзяржаўных сялян або купецтва, могуць сяліцца староверскімі слабодамі не толькі ў аддаленых месцах Сібіры, але і ў Курскай, Варонежскай і Казанскай губернях. Тым, што вярталіся, даваліся льготы на 6 гадоў, што выражалася ў вызваленні ад усіх падаткаў і рэкруцкіх набораў. Частка раскольнікаў скарыстала гэтыя ўказы і вярнулася ў Расію. Аднак большасць веткаўцаў засталіся вернымі ідэалам старавераства.

Тады, зноў-такі не зважаючы на суверэнітэт Рэчы Паспалітай, Кацярына II пасылае на Ветку 2 палкі пад камандаваннем генерал-маёра Я. В. Маслава. Акружыўшы Ветку і прылягаючыя да яе 15 слабод, Маслаў на працягу двух месяцаў перавёз у Расію да 20 тыс. старавераў, якія былі накіраваны ў розныя раёны Расіі, у тым ліку і ў Сібір. Ішлі яны пад канвоем да Шылкі і Селенгі доўгія пяць гадоў. Але да нашых дзён тут, на Веткаўшчыне, пражывае да 100 тыс. нашчадкаў веткаўскіх раскольнікаў.

Яшчэ пры пераходзе рускімі войскамі мяжы частка раскольнікаў з Веткі пусцілася наўцёкі ў іншыя месцы Магілёўшчыны, асабліва ў суседні Рагачоў і прылягаючыя да яго сёлы. Другая частка пайшла ў Старадуб, куды з Веткі была перавезена Пакроўская царква. Падзеі 1764 г. атрымалі назву "другога выгнання". З ім звязана падзенне Веткі як агульнарасійскага цэнтра старавераства. Свяшчэнная для раскольнікаў Пакроўская царква аднавіла сваю дзейнасць паміж Міцькаўскай і Клімаўскай слабодамі. У 1765 г. яна была асвячоная 7 папамі. Буйнейшым цэнтрам старавераства стаў Старадуб. Ветка, хаця і засялілася ў далейшым, у тым ліку і староверамі, усё больш перат-

вараецца ў багатае гандлёва-прамысловае мястэчка з увесь час растучым яўрэйскім насельніцтвам.

З Веткай звязана дзейнасць Емяльяна Пугачова. Двойчы будучы кіраўнік буйнейшага сялянскага паўстання эпохі феадалізму ў Расіі быў у Ветцы. Першы раз – у 1764 г., у час "другога выгнання", у якім ён прымаў непасрэдны ўдзел у саставе войскаў генерала Маслава. У 1772 г. Пугачоў уцёк са станіцы Зімавейскай за польскую мяжу і 15 тыдняў жыў у Ветцы. Раскольнікі дапамаглі яму ў Дабранскім фарпосце, дзе ён на працягу 6 тыдняў знаходзіўся на каранціне, атрымаць пашпарт, дзякуючы якому ён утаіў сваё казацкае паходжанне і з'явіўся як раскольнік. У Ветцы Емяльян Пугачоў жыў у старавера Крылова. Тут жа і далі Пугачову імя "цудам уцалелы цар Пётр III".

РЭЛІГІЙНЫЯ КАНФЕСІІ НА ВЕТКАЎШЧЫНЕ

Веткаўшчына ў XVII ст. уяўляла сабой месца сустрэч, узаемадзеянняў, варожых і мірных, розных рэлігійных напрамкаў. Вышэй ужо адзначалася, што яна працягглы час была цэнтрам усерасійскага расколу, да якога вельмі цярпіма і, больш таго, з заступніцтвам ставілася Рэч Паспалітая. Але адначасова тут жа ішла ўпартая барацьба паміж імкненнем пануючага класа, прэлатаў каталіцкай царквы акаталічыць мясцовае насельніцтва, з аднаго боку, і шырокімі слаямі праваслаўных сялян, мяшчан, якія супраціўляліся гэтаму намеру, – з другога. Брэсцкая царкоўная унія 1596 г. мела меншы ўплыў на ўсходнюю Беларусь. У Магілёўскай епархіі, куды ўваходзілі і праваслаўныя цэрквы Веткаўшчыны, з 380 цэркваў 200 было адабрана ў праваслаўных і ператворана ва уніяцкія або нават каталіцкія. Адымаліся ў праваслаўнага насельніцтва цэрквы і ў наваколлях Гомеля. У іх ліку – Шарсцінская, Радужская, Навасёлкаўская цэрквы. У 1738 г. была адабрана і царква ў Хальчы. Згарэлыя праваслаўныя цэрквы забаранялася аднаўляць. Усё гэта выклікала пратэст у насельніцтва, якое засталося адданым праваслаўю. Яно звярталася са скаргамі не толькі да каралёў Рэчы Паспалітай, чыімі падданымі яно з'яўлялася, але і да рускіх цароў. У прыватнасці, такі зварот быў да Пятра I, які ў 1720 г. пісаў каралю Рэчы Паспалітай, што "працяг ... ганенняў на праваслаўных можа стаць зачэпкай і прычынай непрыемных вынікаў".

На Веткаўшчыне ў XVII ст. разгарнулі сваю дзейнасць езуіты. У Хальчы была іх місія, якая ўваходзіла ў Мсціслаўскую калегію – адну з шасці, што дзейнічалі ва ўсходняй Беларусі. Гэтую місію падтрымлівалі матэрыяльна буйныя польскія памешчыкі – Фашчы, Дзерналовічы, Жукоўскія, Халецкія і інш. У распараджэнні езуітаў былі цэрквы ў Хальчы і Радузе. У апошняй налічвалася больш за тысячу прыхаджан. У ёй вялі службу два езуіты. Яны займаліся місіянерствам і выхаваннем юнацтва.

ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ ВЕТКАЎШЧЫНЫ

У другой палавіне XVIII ст. пачаўся рост прадукцыйных сіл ва ўсходняй Беларусі. У значнай меры ён вызначаўся новымі знешнепалітычнымі абставінамі і перш за ўсё спыненнем згубна ўплываўшых на эканоміку войнаў. Працягвалі развівацца рыначныя адносіны: узмацніўся вываз сельскагаспадарчай прадукцыі за мяжу. У гэтых умовах памешчыкі ўзмацнялі эксплуатацыю сялян. Паншчына іграла вядучую ролю ў гэтым працэсе. Таксама сяляне адбывалі вартавую павіннасць, ахоўваючы панскія двары, пастаўлялі падводы для перавозкі панскай паклажы. Быў таксама і падымны падатак, які спаганяўся з кожнага двара. Уносілі

натуральны аброк, а таксама чынш — грашовы аброк.

Сярод буйных прыватнаўласніцкіх гаспадарак Веткаўшчыны выдзяляўся маёнтак маршалка і кавалера Івана Казіміравіча Халецкага, у склад якога, акрамя мястэчка Хальч, уваходзілі сёлы Радуга, Беседзь і вёскі Раманава, Сіўкі, Папсуеўка, Лявонцьеўка, Пабужжа. Усяго ў яго ўладаннях было 497 сялянскіх двароў, у якіх налічвалася 2836 душ сялян абодвух полаў. У маёнтку былі два ветраныя млыны, на якіх малолі збожжа для панскіх патрэб.

Вялікакаронны сакратар і кавалер князь Міхаіл Станевіч, жанаты на княгіні Марыі Радзівіл, валодаў мястэчкам Ветка, сёламі і вёскамі Чыстая Лужа, Купрэеўка, Косіцкая, Тарасаўка. Усяго яму належала каля 1,5 тыс. прыгонных, якія пражывалі ў 321 двары. Тры млыны, размешчаныя ў маёнтку, здаваліся ў арэнду. У памешчыцкіх уладаннях былі вінакурні. У Беларусі было распаўсюджана так званае прапінацыйнае права, па якому памешчыкі не толькі выраблялі гарэлку ў сваіх вінакурнях, але і прадавалі яе сваім прыгонным. Гэтае права стала крыніцай абагачэння памешчыкаў і ўзмацнення эксплуатацыі сялян. Такія вінакурні мелі месца на Веткаўшчыне. На аснове вінакурнай вытворчасці развівалася жывёлагадоўля, бо яе адходы (брага, або барда) уяўлялі сабой цудоўны корм. У памешчыцкіх гаспадарках развівалася таксама садоўніцтва.

Аснову сялянскай гаспадаркі Веткаўшчыны складала земляробства. Высяваліся збожжавыя культуры, галоўным чынам жыта, лён, каноплі. Атрымала развіццё птушкагадоўля: разводзілі гусей, курэй, качак. Дзе-нідзе сяляне разводзілі сады, садавіна цалкам ішла для панскага двара. Займаліся адкормам свіней, пчалярствам, паляваннем. У лясах Веткаўшчыны вадзілася багата мядзведзяў, лісіц, ваўкоў, кунакоў, дзікоў, ласёў, гарнастаяў, цецеруко̆ў, курапатак і інш. З лесу выпальвалі паташ, гналі дзёгаць. Сярод промыслаў выдзялялася рамізніцтва ў зімовы час. Жанчыны пралі лён, выраблялі сукно.

Як адзначалася вышэй, у тэрыторыю сучаснай Веткаўшчыны ўваходзіць шэраг пасяленняў, якія належалі ў XVII—XVIII ст. Гомельскаму старостве. Апошнім старостам быў князь Міхаіл Чартарыйскі, у распараджэнні якога, акрамя мястэчка Гомель, было 82 вёскі. У валоданні Чартарыйскага лічылася 13,3 тыс. сялян абодвух полаў і 293 тыс. дзесяцін зямлі. Староства Чартарыйскага было адным з самых даходных ва ўсходняй Беларусі. Толькі адной кварты ў казну ён уносіў 20752 злотых, што ў 4—5 разоў пераўзыходзіла ўзнос суседніх старостваў. Частка зямель у Гомельскім старостве здавалася арандатарам, якія за тэрмін арэнды стараліся выціснуць усё магчымае з сялян. Частка веткаўскіх зямель уваходзіла таксама і ў Рагачоўскае староства, у якім дамінавалі Агінскія.

Сярод прамысловых прадпрыемстваў Веткаўшчыны былі прадпрыемствы па вырабу мыла, скур, кузні. Усе яны сканцэнтроўваліся ў Ветцы.

Важную ролю ў эканамічным развіцці Веткаўшчыны ў другой палавіне XVIII ст. адыгрываў гандаль. Гэтаму ў немалой ступені садзейнічала выгаднае размяшчэнне ля ракі Сож, якая з'яўлялася галоўнай воднай магістраллю Магілёўскай губерні. Сож, звязаны з Дняпром, даваў магчымасць весці гандаль з верхнедняпроўскімі рускімі землямі, Украінай. Развіццю эканамічных сувязей садзейнічала таксама даволі развітая сетка прасёлкавых дарог. З Веткаўшчыны вывозілі лён, пяньку, лес, канапляны і льняны алей, ялавічыну, свіное сала, мёд, воск, паташ, дзёгаць. Лясны тавар (карабельны і будаўнічы лес) адпраўляўся па рацэ Беседзь. Шмат грузаў ішло ў Кіеў, Херсон, Крамянчуг. Значную ролю ў гандлі адыгрывалі кірмашы і

таржкі. У Хальчы было два кірмашы ў год, на якія з'язджаліся купцы з Беларусі, Украіны. Тут гандлявалі салам, сукном, жалезнымі вырабамі, дзёгцем, ляснымі матэрыяламі, мёдам, хлебам, мылам, свечкамі. З Украіны на кірмаш прыганялі коней. Два кірмашы штогод праходзілі і ў Ветцы. На іх гандлявалі сукном, шоўкам, сярэбранай пасудай, мылам, салам, свечкамі, воскам, мёдам, рагожай, канапляным алеем, смалой, драўлянай пасудай, хлебам, тытунём, конямі, вяленай рыбай.

З Памор'я ў Ветку дастаўлялася соль. Кожны тыдзень у Ветцы праходзілі таржкі, якія ўяўлялі сабою невялікія кірмашы.

Х. Ю. Бейлькін.

Е. І. Пугачоў і Ветка

Вследствие сего вышедший из-за польской границы с данным в Добрянского форпосту пашпортом для определения на жительство по реке Иргизу раскольник Емельян Иванов был найден и приведен ко управительским делам выборным Митрофаном Федоровым и Филаретова раскольничьего скита иноком Филаретом и крестьянином Мечетной слободы Степаном Васильевым с товарищи, – оказался подозрителен, бит кнутом; а в допросе показал, что он зимовейский служилый казак Емельян Иванов Пугачев, от роду 40 лет; с той станицы бежал великим постом сего 72 года в слободу Ветку за границу, жил там недель 15, явился на Добрянском форпосте, где сказался вышедшим из Польши; и в августе месяце, высидев тут 6 недель в карантине, пришел в Яицк и стоял с неделю у казака Дениса Степанова Пьянова.

П у ш к и н А. С. Собрание сочинений. М., 1976. Т. 7. С. 101.

ПАШПАРТ ЕМЯЛЬЯНА ПУГАЧОВА
(паводле архіўных звестак)

По указу ея Величества государыни императрицы Екатерины Алексеевны, самодержицы Всероссийской, и прочая, и прочая, и прочая объявитель сего, вышедший из Польши и явившийся собою на Добрянском форпосте веры раскольнической Емельян Иванов сын Пугачев, по желанию ево для жизни определен в Казанскую губернию в Синбирскую провинцию к реке Иргиз, которому по тракту чинить свободный пропуск: оскорблений, налогов и притеснений не чинить и давать квартиры по указам.

А по прибытии ему явиться с сим паспортом в Казанской губернии в Синбирской провинциальной канцелярии, тако ж следуя и в протчих провинциальных и городовых канцеляриях являться. Праздно же оному нигде не жить и никому не держать, кроме законной нужды.

Оной же Пугачев при Добрянском форпосте указанный карантин выдержал, в котором находился здоров, и от опасной болезни – по свидетельству лекарскому – явился несомнительный.

А приметами оными: волосы на голове темно-русые, усы и борода – черные с сединой, от золотухи на левом виске шрам... рост двух аршин с половиной, от роду – 40 лет. При оном, окромя обычной одежды и обуви, никаких вещей не имеется.

В верность чего дан сей от главного Добрянского форпостного правления за подписанием руки и приложением печати алой.

В благонадежном месте 1772 года августа 12 дня.

Майор Мезников.

Пограничный лекарь Андрей Томашевский.

При исправлении письменных дел канценармус Никифор Баранов.

ЛІТАРАТУРА:

Акты, относящиеся к истории Западной России. 1855. Т. 5.

Без-Корнилович М. О. Исторические сведения о примечательных местах в Белоруссии. СПб., 1855.

Виноградов Л. Гомель. Его прошлое и настоящее. М., 1900.

Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 1.

Закалинская Е. П. Вотчинное хозяйство Могилевской губернии во второй половине XVII в.

Лилеев М. И. Из истории раскола на Ветке и в Стародубье. Киев, 1895. Вып. 1.

Лойка П. А. Прыватнаўласніцкія сяляне Беларусі. Мн., 1991.

Мошкин М. Иезуиты в царствование Екатерины II и до нашего времени. СПб., 1867.

Никольский Н. М. История русской церкви. Мн., 1900.

Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т. 32.

Роголев А. Ф. От Гомеюка до Гомеля. Гомель, 1994.

Российский архив древних актов. Ф. 1355. Оп. 1.

Русов А. А. Описание Черниговской губернии. Т. 1.

Эйдельман Н. Я. Грань веков. СПб., 1992.

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

У выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. усходняя Беларусь была далучана да Расіі. Захопленыя рускімі войскамі землі ўвайшлі ў спецыяльна створанае генерал-губернатарства, якое складалася з Магілёўскай і Пскоўскай губерняў. Апошняя ў хуткім часе была перайменавана ў Полацкую губерню. Частка Веткаўшчыны ўвайшла ў Беліцкі павет, частка — у Рагачоўскі павет Магілёўскай губерні.

Кацярына II у наказе полацкаму і магілёўскаму губернатарам прадпісвала "весці ўсе справы на расійскай мове". Неўзабаве ва ўсходняй Беларусі пачало афармляцца шляхам прынясення прысягі рускае падданства. Аднак у вырашэнні гэтага пытання Кацярына II сутыкнулася з пэўнымі цяжкасцямі. Каталіцкае і уніяцкае духавенства не толькі не прысягнула першым, але сваімі паводзінамі садзейнічала апазіцыйным настроям. Езуіты ж першымі накіраваліся ў Пецярбург і прысягнулі Кацярыне II. Гэтым яны заваявалі яе прыхільнасць. У ліку тых, хто прысягнуў, былі і езуіты Хальча. К таму часу езуіты былі выгнаны амаль з усіх краін Еўропы. Хаця Кацярына II і дала прытулак езуітам і надзяліла іх роўнымі правамі з праваслаўнымі, яны вялі антырасійскую дзейнасць. У час вайны 1812 г. імі былі створаны ваенныя падраздзяленні, у тым ліку і ў Хальчы, якія ваявалі на баку Напалеона I. У царстваванне Аляксандра I у 1820 г. езуіты былі выгнаны з Расіі.

У Беларусі, у адрозненне ад Расіі, да прысягі Кацярыне II было прыведзена ўсё сельскае насельніцтва, у тым ліку і сяляне. Але не ўсе прадстаўнікі польскай знаці пагадзіліся яе прыняць, хаця імператрыца захавала за імі амаль усе прывілеі. Князь Міхаіл Чартарыйскі, уладальнік Гомельскага староства, адзін з найбольш заўзятых праціўнікаў вырашэння пытання аб ураўнаванні ў правах праваслаўных і пратэстантаў з католікамі, адмовіўся прымаць прысягу і эмігрыраваў за мяжу. Староства было секвестравана і прыпісана да казённых маёнткаў. Маёнткі Халецкіх, Станевічаў на Веткаўшчыне засталіся ў руках ранейшых уладальнікаў, якія прысягнулі Кацярыне II.

Адным з важных мерапрыемстваў царскай адміністрацыі пасля далучэння ўсходняй Беларусі было правядзенне па распараджэнню генерал-губернатара Чарнышова перапісу насельніцтва, без якога было немагчыма вядзенне адзінага з Расіяй падатковага абкладання. Урад цікавілі перш за ўсё падатковыя групы насельніцтва: сяляне, мяшчане, яўрэі, якія складалі асноўную масу жыхароў усходняй Беларусі. У выніку канфіскацыі зямель памешчыкаў, што не пажадалі перайсці ў рускае падданства, а таксама пераходу каралеўскіх старостваў і эканомій у казну ва ўсходняй Беларусі ўтварыўся значны фонд дзяржаўных зямель. Кацярына II шчодра раз-

давала гэтыя землі сваім прыбліжаным. 12 верасня 1775 г. генерал-фельдмаршалу графу Пятру Аляксандравічу Румянцаву, герою руска-турэцкай вайны 1768–1774 гг., які атрымаў бліскучыя перамогі пры Ларгі і Кагуле, былі падараваны, як бачна з папер сакратара Кацярыны II Безбародкі з пометкамі імператрыцы, м. Гомель з сёламі, што прылягалі да яго, усяго 7129 душ. Паводле іншых архіўных даных, Румянцаву 3 кастрычніка 1775 г. быў аддадзены Гомель з 40 вёскамі з агульнай колькасцю жыхароў 7376 душ. Сярод вёсак Веткаўшчыны яму належалі Навасёлкі, Данілавічы, Старое Сяло, Сяліцкае, Рамановічы і інш. У гэтых населеных пунктах, акрамя слабады, было 296 дамоў і 1856 жыхароў. 11 снежня 1775 г. генерал-маёру Завадоўскаму было падаравана з былога Гомельскага староства 887 душ. Частка былога староства засталася ў казны. Вёска Усохі, у якой налічвалася прыкладна 230 сялян, с. Расуха (29 дамоў і 230 сялян) былі падараваны генералу ад інфантэрыі Вязьміцінаву.

У с. Рэчкі было 30 дамоў, у якіх пражывала 116 жыхароў. Належала яно памешчыку. У Жалезніках быў адзін дом і 5 жыхароў. Вёска толькі пачынала фарміравацца. Сяло Свяцілавічы складалася з 20 дамоў, у якіх пражывала 110 чалавек. Адным з буйных сёлаў Веткаўшчыны была в. Стаўбуны, якая належала генерал-губернатару, генерал-фельдмаршалу Чарнышову. У яго маёнтку налічвалася 1074 двары і 2750 прыгонных. Сярод сёлаў у гэты перыяд фігуруюць Грамыкі (41 двор, 238 жыхароў), Барталамееўка (73 двары, 392 жыхары), Вераб'ёўка (17 двароў, 52 жыхары).

Ва ўсходняй Беларусі пасля далучэння да Расіі захаваліся старыя прыгонніцкія адносіны. За памешчыкамі, якія прысягнулі Расіі, засталіся ў недатыкальнасці землі і прыгонныя сяляне. Памешчыкі атрымалі права прадаваць сялян без зямлі. Рускім памешчыкам дазвалялася аддаваць беларускіх сялян у рэкруты ў лік сваіх рускіх прыгонных.

Становішча сялян з далучэннем да Расіі не палепшылася. Яны выконвалі старыя павіннасці — паншчыну, аброк, грашовы чынш, згоны, гвалты і інш. Паранейшаму сяляне павінны былі будаваць і рамантаваць панскія гаспадарчыя аб'екты, дарогі, масты, гаці, перавозіць іхнія грузы, нарыхтоўваць дровы, працаваць на агародах, адбываць вартавую павіннасць.

З 1773 г. уводзілася падушная падаць, а таксама зямельны падатак. Асноўным сваім цяжарам гэтыя падаткі клаліся на сялян і мяшчан. На іх жа распаўсюджвалася рэкруцкая павіннасць, якая заключалася фактычна ў бестэрміновай службе ў царскай арміі. І меў рацыю У. М. Ігнатоўскі, калі адзначаў, што ў Рэчы Паспалітай працоўныя масы былі рабочым "быдлам", а ў царскай Расіі яны ператварыліся ў рабочую "скаціну". Аднак трэба адзначыць, што пасля праведзенага перапісу насельніцтва царскі ўрад на два гады вызваліў сялян ад дзяржаўных падаткаў, а на наступныя дзесяць гадоў вызначыў браць падушны падатак, зменшаны ў два разы.

Як адзначалася вышэй, ва ўсходнюю Беларусь з пагранічных раёнаў Расіі ўцякалі ад прыгоннага ўціску рускія сяляне. Пасля далучэння ўсходнебеларускіх зямель рускія памешчыкі сталі адшукваць сваіх збеглых сялян, насільна забіралі іх і везлі ў свае маёнткі. Гэта прывяло да пратэстаў і сутыкнення з сялянамі. У сувязі з гэтым у 1776 г. быў выдадзены ўказ, які дазваляў адшукваць збеглых сялян па суду. Указ 1782 г. забараняў вяртаць тых сялян, што ўцяклі ад памешчыкаў да далучэння ўсходняй Беларусі да Расіі. Гэтыя дзеянні ўрада не ўхілілі супярэчнасці паміж сялянамі і памешчыкамі. Адбываліся таксама сутыкненні і на рэлігійнай глебе.

У час праўлення Паўла I намецілася паслабленне канфрантацыі са стараверствам. Спроба згладзіць супярэчнасці з раскольнікамі была зроблена ў 1798 г. Афіцыйная царква распрацавала "правілы аднаверства". Староверы атрымалі права мець асобыя аднаверскія цэрквы і святароў. У 1800 г. Павел I канчаткова зацвердзіў сістэму, па якой староверы абавязаны былі прымаць праваслаўных святароў, а апошнія павінны былі служыць раскольнікам па старых кнігах і выконваць абрады. Аднак гэты парадак быў адхілены раскольнікамі, што выклікала хвалю рэпрэсій супраць іх.

У гэтым кантэксце можна разглядаць і падзеі ў Ветцы ў 1798 г. Земскі суддзя Беліцкага павета, куды ўваходзіла Ветка, прыехаў для затрымання староверскага святара як збеглага, які быў закаваны ў кайданы. Але веткаўцы "ад малога да вялікага збегліся, адбілі вязня" і ледзь не забілі суддзю. Адбылося гэта за некалькі дзён да прыезду беларускага і магілёўскага епіскапа Анастасія Братаноўскага. Даведаўшыся пра тое, што адбылося, епіскап загадаў веткаўцам прыбыць да яго, каб абмеркаваць становішча. Староверы паабяцалі, што без ведама духоўных уладаў не будуць прымаць да сябе святароў. Пакаяўшыся, яны выказалі жаданне быць у распараджэнні епархіі Беларусі. Епіскап у спецыяльным пасланні магілёўскаму губернатару С. С. Жыгуліну адзначаў, што не варта распальваць пажар з гэтай прычыны.

Указам 16 снежня 1798 г. свяшчэнны сінод, які кіраваў з часоў Пятра I царкоўнымі справамі ў Расіі, "па сакрэту" дазволіў староверам Веткі мець у сябе царкву і свяшчэннікаў для адпраўлення службы па староверскіх кнігах.Сам гэты факт з'яўляецца сведчаннем таго, што больш чым векавая барацьба стараверaў Веткі з расійскімі ўладамі фактычна закончылася іх прызнаннем з боку афіцыйнай царквы.

Пасля далучэння Беларусі да Расіі староверы прыпісваліся звычайна да саслоўя мяшчан і былі менш абцяжараны падаткамі і павіннасцямі, вызваляліся ад цялесных пакаранняў. Іх асноўным заняткам заставалася земляробства. Да рэформы 1861 г. яны ўяўлялі сабой асабіста свабодных арандатараў, якія наймалі памешчыцкую зямлю за грашовую плату.

Што датычыцца дзяржаўных сялян, то іх на Веткаўшчыне, як і ва ўсёй усходняй Беларусі, дзе казённыя землі шчодра раздаваліся рускім вяльможам, была невялікая колькасць. Жылі яны ў асноўным у раёне Стаўбуноў.

Яшчэ задоўга да рэформы 1861 г. на Веткаўшчыне была і сялянская прыватная ўласнасць на зямлю. Казацкія Балсуны, якія ўваходзілі разам з Неглюбкай у склад Суражскага павета Чарнігаўскай губерні, часткова былі заселены казакамі, якія валодалі зямлёй на правах прыватнай уласнасці.

Для ўсіх катэгорый сялян, а таксама мяшчан цяжкім ярмом з'яўляліся кватэрная і харчовая павіннасці ў час вайсковых пастояў. У праведзеным у 40-х гадах XIX ст. абследаванні афіцэрамі Генштаба Магілёўскай губерні падкрэслівалася, што Рагачоўскі і Беліцкі паветы складаюць шчаслівае выключэнне ў губерні для раскватаравання войскаў. Асабліва, адзначалі афіцэры, вызначаліся пасады і слабоды паблізу вусця Беседзі і Іпуці. Такая пахвальная характарыстыка афіцэраў Генштаба дорага абыходзілася веткаўчанам, якія павінны былі забяспечваць салдат і афіцэраў кватэрамі, а салдат — яшчэ і харчаваннем.

Галоўнай галіной вытворчасці Веткаўшчыны ў канцы XVIII — пачатку XIX ст. заставалася земляробства. У сялянскіх гаспадарках вядучае месца займала вырошчванне збожжавых культур. Сустракаліся пасевы льну, каноплі. Шырокае

распаўсюджанне сярод сялян мелі рыбная лоўля, паляванне, пчалярства. Зімой мужчыны займаліся рамізніцтвам, жанчыны пралі лён, ткалі сукно.

Станоўчы ўплыў на развіццё сельскай гаспадаркі ў разглядаемыя гады аказала прадпрымальніцкая дзейнасць рускіх вяльможаў. Гэта перш за ўсё адносіцца да М. П. Румянцава, сына вялікага палкаводца, які атрымаў у спадчыну маёнтак у 1796 г. Час М. П. Румянцава – перыяд гаспадарчага ўздыму і росквіту маёнтка. Румянцаў падзяліў сваё ўладанне на асобныя фальваркі, на чале якіх былі пастаўлены кіраўнікі-іншаземцы. У земляробстве пераважнае значэнне атрымалі вытворчасць збожжа, бульбаводства, тэхнічныя культуры – лён, каноплі. Часткова збожжа, льняное валакно, алейнае насенне збываліся за межы губерні. У сувязі з развіццём жывёлагадоўлі стала практыкавацца травасянне. У маёнтку ствараліся вотчынныя мануфактуры, заснаваныя на прыгоннай працы. У 1809 г. дзейнічалі мануфактуры па вытворчасці паруснага палатна, насовак і міткалю (баваўняная тканіна палатнянага перапляцення), шкляны завод (гута). Было таксама чатыры вінакурныя заводы і два млыны.

Сярод буйных уладанняў Веткаўшчыны быў маёнтак Чарнышова ў Стаўбунах. Яго славутасцю стаў завод па вырабу жалеза. Руду прывозілі з Украіны. Везлі яе прыгонныя сяляне 33 вёсак. Выплаўлялася 122 пуды жалеза. У маёнтку быў млын, мануфактура па вытворчасці палатна.

На палатняных і іншых мануфактурах браўся пад увагу шматгадовы вопыт прадзільна-ткацкай хатняй вытворчасці жанчын, якія з дзяцінства, звычайна зімой, займаліся ткацтвам.

У канцы XVIII ст. значную ролю ў эканамічным жыцці сталі адыгрываць мястэчкі. З 1784 г. Ветка і Хальч афіцыйна лічацца мястэчкамі. Яны сталі цэнтрамі прамысловасці і гандлю. У Ветцы, у прыватнасці, налічвалася 6 прамысловых прадпрыемстваў, з якіх 5 – гарбарныя і 1 – мылаварнае. Было таксама мноства кузняў, з якіх 10 – спецыялізаваліся на вырабе якараў. У год выраблялася прыкладна да 150 якараў. Ветка разам з Гомелем і Прапойскам з'яўлялася цэнтрам суднабудавання Магілёўскай губерні.

Адмоўныя вынікі для развіцця эканомікі Беларусі мела вайна 1812 г. Прычына ўпадку Магілёўскай губерні ў першай трэці XIX ст., на думку камітэта дваран, была ў нястрымным рабаванні правіянту і фуражу, рагатай жывёлы і коней, якое чынілі французскія войскі. Тое ж самае рабіла і руская армія. У 1813 г. на Магілёўшчыне фарміравалася рэзервная пяхотная армія, дзесяткі кавалерыйскіх эскадронаў. Усё гэта ажыццяўлялася ва ўмовах масавых рэкруцкіх набораў. Сітуацыя ўскладнялася масавымі няўродамі. У 1830 г. Беліцкі павет спасцігнуў няўрод. Гэта выклікала голад, ад якога моцна пацярпела перш за ўсё сялянскае насельніцтва. Бяда не абмінула і Веткаўшчыну.

Пэўнае ўздзеянне на развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі мела рэформа дзяржаўных сялян, якая была праведзена міністрам дзяржаўнай маёмасці графам Кісялёвым. Але дзяржаўных сялян на Веткаўшчыне была нязначная колькасць.

Граф Кісялёў імкнуўся распаўсюдзіць пачатую рэформу і на памешчыцкіх сялян. У 1844 г. быў зацверджаны Мікалаем I закон, які тычыўся нарміравання павіннасцей памешчыцкіх сялян заходніх губерняў. Аднак фактычна гэты закон не ажыццяўляўся на практыцы з-за нежадання памешчыкаў. Павіннасці сялян не былі абмежаваны. Пра гэта сведчаць інвентары маёнткаў, складзеныя ў канцы 40-х – 50-х гадах XIX ст. Так, паводле інвентару маёнтка Ветка княгіні Любамірскай, у ім было 3808 прыгонных мужчын і жанчын. Цяглавых двароў налічвалася 467, агароднікаў – 108, бабылёў – 48. Усяго ў Люба-

Былы сядзібны дом, в. Рэчкі.

мірскай было 16,2 тыс. дзесяцін зямлі. Лясныя масівы ў маёнтку цалкам знаходзіліся ў руках памешчыцы. Менавіта Ветка — адна з буйнейшых памешчыцкіх латыфундый Магілёўскай губерні. У карыстанні сялян знаходзілася каля 10 тыс. дзесяцін зямлі. У сярэднім на кожную цяглавую сялянскую гаспадарку прыпадала 1,5 дзесяціны сядзібнай, 6 дзесяцін — ворнай і каля 3 дзесяцін сенажацяў. У распараджэнні сялян было 1095 галоў рабочай жывёлы, 802 — нерабочай і 2094 дробнай жывёлы. Калі зыходзіць з таго, што бабылі не трымалі жывёлу, а агароднікі ад сілы мелі 1 галаву нерабочай жывёлы і 1—2 галавы дробнай жывёлы, то ў сярэднім на адну цяглавую гаспадарку прыходзілася прыкладна 2,3 галавы рабочай жывёлы, 1,5 — нерабочай і 4 — дробнай жывёлы. Паншчына ў маёнтку складала два вупражныя дні, калі селянін працаваў з канём, і два дні мужчынскія пешыя. У год прадугледжвалася 8 мужчынскіх і 8 жаночых згонных дзён. Маёнтак прыносіў Любамірскай 9,5 тыс. рублёў прыбытку.

У маёнтку Шарсцін, што належаў графу Мелінгу, налічвалася 7470 дзесяцін зямлі, пражывала 1436 сялян абодвух полаў. Цяглавых гаспадарак было 158, бабылёў — 43, агароднікі адсутнічалі. Акрамя таго, памешчыка абслугоўвалі 63 дваровыя. Пры трох фальварках налічвалася 135 дзесяцін сядзібнай, 810 дзесяцін ворнай, 36 дзесяцін сенакоснай зямлі. У сярэднім на цяглавую гаспадарку прыходзілася 1 дзесяціна сядзібнай зямлі, 6 дзесяцін — ворнай, каля 3 дзесяцін сенажацяў. У сялян было 506 галоў рабочай жывёлы, 203 — нерабочай і 1033 дробнай жывёлы. У сярэднім на цяглавую гаспадарку прыходзілася 3,2 галавы рабочай, 13 — нерабочай, каля 7 галоў дробнай жывёлы. Колькасць паншчынных дзён і згонаў была такой жа, як і ў маёнтку Ветка. Прыбытак Мелінга быў роўны 9,5 тыс. рублёў. Маёнтак адносіўся да ліку буйных памешчыцкіх гаспадарак.

Да такіх жа гаспадарак на Веткаўшчыне належаў маёнтак Рэчкі, уладальніцай якога была памешчыца Бычкоўская. У ім было 4545 дзесяцін зямлі. Згодна з інвентаром, тут налічваўся 241 прыгонны мужчына і 252 — жанчыны. Пры фальварку было 10 дзесяцін сядзібы, 258 дзесяцін ворнай зямлі, 48,5 дзесяціны сенажацяў. На кожны сялянскі двор у сярэднім прыпадала 8,5 дзесяціны зямлі. Формы эксплуатацыі былі тыя ж самыя, што і ў маёнтках Ветка і Шарсцін. Увесь прыбытак памешчыцы быў роўны 2 тыс. рублёў.

Маёнтак Свяцілавічы памешчыка Драбышэўскага адносіўся да ліку дробных. У ім было 413 дзесяцін зямлі, дзесяць прыгонных сялян, у распараджэнні якіх было 23 дзесяціны зямлі, 3 галавы рабочай жывёлы, 8 — нерабочай і 8 — дробнай жывёлы. Увесь прыбытак памешчыка быў роўны 75 рублям.

Аналіз чатырох маёнткаў паказвае, што на Веткаўшчыне пераважала паншчынная сістэма, якая ўяўляла сабой асноўную форму эксплуатацыі сялян. Вядучае месца ў сельскагаспадарчай вытворчасці займала збожжавая гаспадарка. Гэта ў роўнай ступені тычыцца як памешчыцкай, так і сялянскай гаспадаркі. У маёнтку Шарсцін, да прыкладу, у трох фальварках уладальніка высявалася 2430 пудоў жыта, у сялян — 4860 пудоў. Жыта заставалася галоўнай зерневай культурай.

У памешчыцкіх гаспадарках у 30—40-я гады шырока сталі распаўсюджвацца пасевы бульбы, з якой было звязана далейшае развіццё вінакурэння. Вінакурныя заводы ў гэты перыяд працавалі ў Ветцы, Акшынцы, Грамыках, Шарсціне, Свяцілавічах. У сялянскіх гаспадарках пасевы бульбы сустракаліся рэдка. На Веткаўшчыне, як і ва ўсёй Расіі, сяляне з апаскай глядзелі на гэтую культуру. Усяляк мусіраваліся чуткі, што ад ужывання бульбы бываюць няўроды і іншыя непрыемнасці. Затое сярод сялян Веткаўшчыны, як і ўсёй Магілёўскай губерні, адбывалася далейшае распаўсюджванне пасеваў ільну і канапель. Шмат канапель высявалася ў Казацкіх Балсунах, Неглюбцы, якія ўваходзілі ў Суражскі павет Чарнігаўскай губерні. У памешчыцкіх маёнтках гэтыя пасевы практыкаваліся даволі рэдка, бо каноплі, як і лён, лічыліся такімі культурамі, якія даволі моцна спустошвалі зямлю і патрабавалі ўнясення значнай колькасці ўгнаенняў. Ураджайнасць канапляна семя з 1 дзесяціны была 5—8 чвэрцяў, часам даходзіла да 10 чвэрцяў, пянькі — 10—20 і рэдка 30 пудоў. Сяляне выраблялі з канапель алей, які ў асноўным ішоў на рынак. Для асабістага спажывання ішлі рэшткі вытворчасці.

Сярод сялян Веткаўшчыны, мяркуючы па інвентарах, пераважалі цяглавыя сяляне. У княгіні Любамірскай яны складалі 75% усіх сялянскіх двароў, у графа Мелінга — 77,7%. Разам з тым даволі высокі быў працэнт бабылёў, якія нават не мелі свайго дома, а наймалі куток. У маёнтку Шарсцін амаль кожны чацвёрты адносіўся да гэтай катэгорыі. У маёнтку Ветка 17,3% сялян былі агароднікі. Яны не мелі палявой зямлі, а карысталіся толькі невялікім сядзібным участкам. Гэтыя даныя сведчаць аб маёмаснай няроўнасці сялян Веткаўшчыны. У сярэднім на адну цяглавую гаспадарку прыходзілася, з улікам маёнтка Рэчкі, ад 8,5 да 10,5 дзесяціны зямлі.

Акрамя вотчынных прадпрыемстваў, у першай трэці XIX ст. на Веткаўшчыне сталі адкрывацца мануфактуры, заснаваныя на наёмнай працы. Так, у Свяцілавічах з 1819 г. існавала шкляное прадпрыемства, якое належала Сямёну і Андрэю Язерскім. Яно было пабудавана на спецыяльна набытай зямлі. У 1819—1820 гг. на мануфактуры было выпушчана 7 тыс. адзінак посуду для разліву вінаградных він, штофаў — 16 тыс., паўштофаў — 21 тыс. На прадпрыемстве працавала 4 майстры, 4 майст-

равыя (чаляднікі) і 2 вучні. Усё гэта былі прышлыя з розных месц вольнанаёмныя, якія мелі гадавыя або часовыя пашпарты. Відаць, Язерскія прадалі сваё прадпрыемства. Больш яны не прасочваюцца ў спісах уладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў. Затое ў 1825—1830 гг. фігуруе ў Свяцілавічах шкляная мануфактура, якая належала 2-й гільдыі купцу Навазыбкаўскага павета Чарнігаўскай губерні В. Скарнякову. У 1826 г. яна выпусціла 22 тыс. штофаў, 17 тыс. паўштофаў, 9 тыс. бутэлек, 157 тыс. адзінак аптэкарскага посуду і 350 штук хімічнага.

Акрамя Свяцілавіч, шкляная мануфактура была ў Грамыках. У 1819—1820 гг. на прадпрыемстве штогод выраблялася 5 тыс. штофаў, 800 паўштофаў, 15 тыс. бутэлек. Завод размяшчаўся на зямлі, арандаванай у памешчыка Гарбачэўскага. Працавалі на заводзе 6 майстроў, 3 чаляднікі, 3 вучні і 5 чорнарабочых. Усе яны былі прыгонныя памешчыка Гарбачэўскага.

У 40-х гадах у Ветцы далейшае развіццё атрымала суднабудаванне. Будавалі байдаркі, баркі, барліны.

Вялікае значэнне ў жыцці Веткаўшчыны ў першай палове XIX ст. меў гандаль. У Ветцы на прыстані быў збудаваны свіран для захоўвання грузаў. Тавары з Веткі збываліся ў Рыгу. Сярод іх вызначаліся пянька, лён, паташ, канапляны алей, скуры. Гэтыя грузы канцэнтраваліся ў Ветцы, мясцовыя скупшчыкі звозілі іх з навакольных вёсак і сёл. Яны праходзілі даволі вялікі шлях: адпраўляліся па Сожы, потым па Дняпры везліся да Оршы, адтуль сухапутна накіроўваліся да Віцебска і па Заходняй Дзвіне дастаўляліся ў Рыгу. Пяньку і канаплянае семя таксама вывозілі і ў Кёнігсберг.

Ужо ў першай палавіне XIX ст. Беліцкі павет стаў вылучацца ў Магілёўскай губерні развіццём ляснога гандлю. Шмат лясных грузаў, а таксама тавараў, атрыманых ад перапрацоўкі лесу, вывозілася з Веткі. Гэта перш за ўсё — бярвенне, дровы, смала, дзёгаць. Збываліся таксама лубок, рагожы. У магілёўскім Пасожжы Ветка ўяўляла сабой буйнейшы цэнтр вывазу тавараў. У сярэдзіне 40-х гадоў ад яе прыстані адпраўлялася 21 судна, з Гомеля — 23. Аднак з Веткі адпраўлялі 32,4 тыс. пудоў, а з Гомеля — 24,8 тыс. Ветка па колькасці вывезеных грузаў уступала толькі Прапойску (34 тыс. пудоў).

Адначасова Ветка з'яўлялася буйным імпарцёрам солі. Да далучэння да Расіі соль дастаўлялася ў асноўным з Памор'я. У 1803 г. па распараджэнню галоўнага наглядчыка крымскіх азёраў генерал-маёра Мяртвагі ў Ветцы стала праводзіцца распрадажа крымскай солі, дастаўка якой ішла па Дняпры і Сожы. Усяго прывезлі 50 тыс. пудоў. Ветка стала своеасаблівым манапалістам у Магілёўскай губерні па гандлю соллю. Вялікія барышы атрымлівалі ад гэтага гандлю веткаўскія перакупшчыкі. Не выпадкова магілёўскі губернатар, выказваючы інтарэсы купецтва Магілёва, ставіў пытанне перад Мяртвагам аб дастаўцы солі непасрэдна ў губернскі цэнтр, адкуль бы яна развозілася па ўсёй губерні. Аднак Ветка і ў далейшым заставалася важнейшым цэнтрам салянога гандлю.

Гандлёвымі цэнтрамі сталі таксама Хальч і Старое Сяло, чаму ў немалой ступені садзейнічала паромная пераправа. У Хальчы паромам перавозілася ў дзень да 800 пудоў грузаў. Улетку паром працаваў пры дапамозе каната, вясной — вёслаў і шастоў. Паром у Старым Сяле перавозіў да 400 пудоў грузаў.

На Веткаўшчыне з'явіліся купцы, якія сканцэнтравалі ў сваіх руках лясны, саляны і іншыя віды гандлю. У 1849 г. у Ветцы налічвалася пяць купцоў 3-й гільдыі, у Хальчы — адзін купец той жа гільдыі.

Вялікае значэнне ў жыцці Веткаўшчыны мелі кірмашы, якія ўяўлялі сабой цэнтры ўнутранага гандлю. Двойчы ў год

збіраліся кірмашы ў Хальчы (Пятроўскі і Міхайлаўскі кірмашы) і ў Ветцы (Сырны і Спаскі). Асабліва вылучаўся Пятроўскі кірмаш у Хальчы, які адносіўся да ліку буйных кірмашоў Беларусі. (Буйнымі лічыліся кірмашы з абаротам звыш 100 тыс. руб.) У 1832 г. яго абарот складаў 155,8 тыс. руб., у 1846 г. – 60,7 тыс. руб., у 1847 г. – 73,5 тыс. руб., у 1853 г. – 163,1 тыс. руб., у 1858 г. – 105,6 тыс. руб. Абарот Міхайлаўскага кірмашу толькі ў 1832 г. перавысіў 100 тыс. руб., у астатнія гады ён вагаўся ад 30 да 70 тыс. руб. Кірмашы Веткі па абароту значна ўступалі хальчанскім. Толькі ў 1832 г. на Сырным кірмашы абарот склаў 110 тыс. руб. У іншыя гады ён быў у межах 12–35 тыс. руб.

Абарот Спаскага кірмашу ў пяці вышэйназваных гадах не перавышаў 73 тыс. і не апускаўся ніжэй 7 тыс. рублёў.

Абароты кірмашоў Веткаўшчыны зведвалі істотныя ваганні, якія адбываліся пад уплывам гандлёвай кан'юнктуры, стану ўраджаю і іншых акалічнасцей. У цэлым кірмашовы гандаль у 30–50-я гады адыгрываў істотную ролю ў развіцці тавара-грашовых адносін.

Асартымент кірмашовага гандлю складаўся з трох катэгорый: расійскія тавары, у якія ўключаліся і тавары мясцовага паходжання, замежныя тавары і азіяцкія тавары. Сярод расійскіх тавараў на Петрапаўлаўскім кірмашы ў 1832 г. былі прадстаўлены воўна, сукно, баваўняныя, льняныя, шаўковыя, футравыя вырабы, скуры, хлеб, крупы, рыба, коні, рагатая жывёла, фарфор, фаянс, хрусталь. Частка гэтых тавараў – ільняныя вырабы, хлеб, крупы, рыба, коні, рагатая жывёла – была ў значнай ступені мясцовага паходжання. На расійскія тавары прыпадала прыкладна 80 % усяго прывозу, на імпартныя – 5 і азіяцкія – 15% прывозу. Сярод расійскіх тавараў першае месца займалі металічныя вырабы, рыба, коні. На іх прыходзілася 56% усяго прывозу. На кірмашах у Хальчы ў 1842 г. былі маскоўскія, калужскія, тульскія, чарнігаўскія купцы. Сукны пастаўляліся з Чарнігаўскай і Гродзенскай губерняў. Замежныя тавары былі прадстаўлены ў асноўным вінамі, парфумай, азіяцкія – рознымі вострымі прыправамі.

У другой палове 40-х гадоў сярод населеных пунктаў Веткаўшчыны вызначалася Ветка, у якой налічвалася 500 двароў, і ў вёсках паблізу яе – 114 двароў, Хальч – адпаведна 100 і 300 двароў, Хізы – 99 і 274 двары, далей ішлі Стаўбуны (89 двароў), Свяцілавічы (84 двары). Па рэвізіі 1858 г. у Казацкіх Балсунах было 303 рэвізскія душы казакоў і 143 рэвізскія душы памешчыцкіх сялян, у Неглюбцы – 1001 рэвізская душа дзяржаўных сялян.

Першая трэць XIX ст. запоўнена барацьбой сялян-стараверaў Веткі і слабады Косіцкай супраць памешчыкаў Любамірскіх, да якіх перайшло многа зямель, якія раней належалі Халецкім і Станевічу. Сяляне неаднаразова апратэстоўвалі права памешчыцы Любамірскай валодаць імі. У 1806 г. яны патрабавалі, каб павіннасці выконваліся па інвентарах 1792 г. І ў далейшым сяляне не пагаджаліся з умовамі новых інвентароў 1805 і 1814 гадоў, якія прыраўноўвалі іх да ўладальніцкіх сялян. Скарга 1806 г. не была задаволена. Адхілена была таксама скарга 1813 г. У лістападзе 1826 г. павятовы суд таксама адхіліў патрабаванне сялян, чые інтарэсы ў судзе прадстаўляў Машкоўскі. Сялян асабліва абурала распаўсюджанне на іх рэкруцкай павіннасці. Яны апелявалі ва ўрадавы сенат, у якім справа разглядалася ў апеляцыйным дэпартаменце і які пацвердзіў рашэнне павятовага суда. Гэтае рашэнне ажыццявіў падсудак Вішнеўскі, які паабяцаў, што калі яму дадуць 1500 руб., то ён аддасць у рэкруты 37 мужчын са свайго маёнтка. Але сяляне былі ашуканы.

У студзені 1829 г. у слабаду Косіцкую прыбылі прадстаўнікі афіцыйных улад для ўзяцця рэкрута. Аднак сяляне запраці-

віліся гэтаму, а прадстаўнікоў мясцовай адміністрацыі (войта і соцкага), папярэдне збіўшы, выгналі са слабады за тое, што падпарадкаваліся распараджэнням памешчыцы. "Пасля гэтага, — паведамляў генерал-губернатар смаленскі, віцебскі і магілёўскі Н. Н. Хаванскі высокапастаўленаму чыноўніку корпуса жандараў аб паводзінах сялян, — сабраўшыся натоўпамі, хадзілі па вуліцы ўзброеныя сякерамі, ружжамі і калмі, ухваляючы адзін аднаго і пагражаючы страляць і біць, калі хто з паліцэйскіх чыноўнікаў датыкнецца іх браць". Сяляне даказвалі, што яны вольныя і не належаць Любамірскай. На месца дзеяння прыбыў беліцкі земскі спраўнік, а потым камандзіраваны магілёўскім губернскім праўленнем саветнік 1-га дэпартамента галоўнага суда Карпіловіч. Яны здолелі ўціхамірыць сялян.

На гэтым падзеі ў Косіцкай не закончыліся. Яны перакінуліся і на Ветку. Магілёўскі губернатар 17 верасня 1829 г. паведаміў генерал-губернатару, што 9 верасня ён асабіста адправіўся на месца ўціхамірвання сялян. Апошнія паслалі ў Пецярбург свайго паверанага Багданава для падачы прашэння цару. Чакаючы адказу, сяляне адмаўляліся адбываць паншчыну, аброк. Яны згаджаліся ўнесці некаторыя плацяжы пры ўмове выдачы пашпартоў, ды і то па меры магчымасці. Лёс хадака застаўся невядомы. У слабаду Косіцкую была ўведзена ваенная каманда. Восем сялян былі аддадзены пад суд. Падзеі 1829 г. у Ветцы і слабадзе Косіцкай уяўлялі сабой даволі значную з'яву ў барацьбе сялян Беларусі і ў цэлым усёй Расіі супраць феадальнага прыгнёту.

Адной з форм пратэсту супраць прыгонніцкага ўціску сталі ўцёкі сялян ад сваіх памешчыкаў. У 1841 г. у паўднёвыя губерні накіраваліся сяляне Беліцкага павета. Непасрэдным штуршком для ўцёкаў сялян з наседжаных месц паслужылі чуткі аб свабодзе сялян, якую ім нібыта даў маніфест 16 красавіка 1841 г. Усяго з павета пайшло 1,2 тыс. сялян. У гэтым руху прымалі ўдзел і веткаўчане.

К сярэдзіне XIX ст. веткаўская стараверская федэрацыя значна зменшылася. У 1847 г. у Беліцкім павеце налічвалася 12013 раскольнікаў. Прыкладна ў гэтыя гады ў Рагачоўскім павеце пражывалі 704 раскольнікі. У параўнанні з пачаткам XVIII ст. колькасць стараверaў зменшылася ў 3 разы. Для ажыццяўлення рэлігійных рытуалаў у стараверaў было 8 манастыроў, 15 капліц, 4 малітоўныя дамы. У 1855 г. беларускі гісторык М. В. Без-Карніловіч, апісваючы стараверaў Веткаўшчыны, адзначаў іх цвярозасць, кемлівасць, працавітасць, уласную годнасць і недаверлівасць. У хатах і ў вопратцы яны адрозніваліся чыстатой і ахайнасцю. Паміж імі слова гонару даражэй усялякіх пісьмовых абавязацельстваў. Без-Карніловіч асабліва падкрэсліваў, што час і любоў зраднілі рускіх стараверaў з беларусамі.

Х. Ю. Бейлькін.

ЛІТАРАТУРА:

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1961. Т. 3.

Военно-стратегическое обозрение Российской империи. СПб., 1848. Т.VIII. Ч. 3.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2.

Жданов А. Путевые заметки по России. СПб., 1848.

Ігнатоўскі У. Гісторыя Беларусі ў XIX і пачатку XX стагоддзя. Мн., 1925.

Могилевская старина / Сб. статей "Могилевских губернских ведомостей". Вып. 3. Могилев, 1903.

Могилевские губернские ведомости. 1849. № 16. Отд. 2.

Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 год. Вильно, 1874.

Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861 — 1900 гг. Мн., 1990.

Пичета В. И. Восточная Белоруссия под властью царизма. Ученые записки МГУ. Вып. 93. История. Кн. I. М., 1946.

Дакументы сведчаць

СПІС ДВАРАН, ЯКІЯ ВАЛОДАЛІ НАСЕЛЕНЫМІ ПУНКТАМІ ВЕТКАЎШЧЫНЫ

1785 г.

№ п/п	Фамилия Имя Отчество	Населенные пункты	Количество жителей		
			христиан	евреев	всего
1	Козлов Иван	Даниловичи, Кунторовка, Замостье	359	5	364
2	Завадский Петр Васильевич	Старые Юрковичи, Новые Юрковичи	788	23	811
3	Халецкий Игнатий, Княгиня Радзивилл	Ветка, Старое Село, Косицкое, Хальч, Сивинка, Леонтьево, Тарасовка, Купреевка, Чистая Лужа, Рудня-Споницкая, Воробьевка	386	8	394
4	Вишинский Казимир (арендатор)	Новиловка, Немки, Шелоховка, Малые Немки, Яново, Будище, Перелевка	477	11	488
5	Халецкий Казимир	Беседь, Радуга, Бартоломеевка	590	16	606
6	Шелюта Михаил и Осип	Светиловичи	17	–	17
7	Шелюта Осип	Акшинка	43	–	43
8	Бычковская	Бартоломеевка	41	–	41
9	Вязьмитинов Сергей	Рассохи	62	2	64
10	Озерские Иван и Осип	Светиловичи	35	5	40
11	Ермолаев Василий	Громыки	5	–	5
12	Малиновский Демьян	Хизы, Громыки, Немки, Светиловичи	121	5	126
13	Устинович О. и Ф.	Ухово	39	2	41
14	Граф Чернышев Захар	Столбуны	453	4	457
15	Дернолович	Шерстин	218	20	238
16	Васильев Алексей Васильевич	Репки	98	7	105

Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў старажытных актаў. Ф. 16. Воп. 1. Спр. 763а. Л. 91–92, 160–162, 164, 168–169, 172, 176.

СУТЫЧКА СТАРАВЕРАЎ З УЛАДАМІ

1798 г.

От 26 октября 1798 года белорусский и могилевский епископ Анастасий Братановский по секрету рапортовал св. синоду: "Посещая часть моей епархии, был я проездом в Ветковской слободе, селе Белорусского краю, столь же древнем, как и знаменитом, виталище старообрядцов. За два дня до прибытия моего туда, зделался там бунт, коего следствия не без затруднений ко усмирению. Земской судья Белицкого уезда делал там выимку старообрядческого попа их, яко беглаго. Он, было, сего попа взял и оковал, но ветковцы, от мало до велика збежавшавшись, отбили узника и чуть было не приступили к убийству выемщика. Сей поступок явно противузаконный и толико в упорстве утверждающий ветковчан, что сами они при разсказывании сего действия, знаменуясь крестом, рекли: "Так и быть, а двух смертей нет. Пусть и нам и детям нашим рубять головы..." (Все сие говорено было в поздний вечер дорогою, от ветковской слободы до перевозу через реку, верст более двух продолжавшеюся). Я велел им явиться ко мне по утру, дабы обстоятельнее выслушать событие. Между слушанием уразумел их и собственно признаемую повинность и желание быть помилованными ходатайством начальства того духовенства, к коему они не имели прибежища. По сему предлогу, на что я успел их преклонить, тому прилагаю при сем из собственного их прошения копию. А по поводу сего, какое я возымел к господину губернатору отношение по секрету, и оного тоже приобщаю список. Таким образом бунт утушен: ибо я изусатно от г.

губернатора при встрече с ним (ибо и г. губернатор в то же время объезжал уездныя присутственные места) в уездном городе Чаусах слышал, что все по тому (ветковскому) делу успокоено, а сие слышал я сентября 22 дня. Но как мне впредь поступать, благопочтенно о сем рапортуя, всепокорнейше прошу наставления.

От ветковских старообрядцов — купцов и мещан — прошение преосвященному Анастасию от 6 сентября 1798 года гласило: "Из многократных случаев испытали мы, что священники, принимаемые нами, исследываются от светского правительства, через что претерпеваем как огорчение душевное, так и разорение спокойствия нашего, чего мы временем не в силах будучи вытерпеть, делаемся принужденно огорчителями светской команды. Но как сему служить поводом мнение о нас, якобы мы принимаем попов беглых, безчестных и без всякого о них с нашей стороны разыскания, в чом мы однак употребляем всевозможную осторожность, — то впредъ для спокойствия как светского правительства, так и собственного вашего, мы о принимаемых священниках с точным о них показанием имеем впредъ относится к вашему преосвященству, желая и быть под ведомством епархии вашего превосходительства, так как находимся в Белорусской губернии. О чем о нас по забрании точных и несомнительных справок о находящихся у нас священниках, имеем представить вашему преосвященству формальное прошение; а ныне, объявляя таковое наше намерение просим возиметь к спокойствию нашему архипастырское попечение. К сей записке ветковский житель Афанасий Семенов руку приложил вместо всего общества".

Губернатору С. С. Жегулину преосвященный Анастасий писал: "Проезжал я через Ветку, узнал от самих ветковских обывателей об их поступке противузаконном. Раскаяние их подало им такое намерение, каковое желательно давно, сколько мне известно по делам старообрядцов. Они впредь не иначе будут принимать священников, как с ведения духовной власти, к ней и представлять будут о принимаемых попах точныя и неподозрительные справки, желая впредъ считаться под ведением епархии Белорусския, так как находятся в Белорусской губернии, о чем намерены подать формальное прошение. А как таковое их послужит к спокойствию не меньше церкви, как и светского правления: то благоволите, ваше превосходительство, взяв об оном внимание, употребить благонамеренныя меры к погашению искры, дабы не произошел пожар. О намерении же их вышеписанном я уведомлю ваше превосходительство, не на словах их полагаясь, но на поданной от них бумаге, яко залог, по которому я и передаю их в ваше к успокоению их касательно находящихся нечае у них попов благопромыслительство".

Указом 16 декабря 1798 года св. синод "по секрету" разрешил преосвященнику Анастасию дозволить ветковским старообрядцам иметь у себя церковь и священников для отправления службы Божией по старопечатанным книгам, ежели от них вступит к нему об этом формальное прошение. Но, избежав кары за противление власти, ветковцы, по-видимому, отказались от мысли вступить в общение с господствующей церковью, что, разумеется, было не приятно их ходатаю, преосвященному Анастасию. Владыке досталось огорчение еще с другой стороны. Донесение его св. синоду от 26 октября доведено было до сведения Государя Императора Павла I. Его Величество 21 ноября 1798 г. высочайше повелеть соизволил: за название происшедшаго в Ветке непокорения бунтом, означавших оное весьма немаловажным и клоняшимся к нарушению общего спокойствия, которое уже там возстановлено, — учинить выговор епископу преосвященному Анастасию.

Могилевская старина /Сб. статей "Могилевских губернских ведомостей". Вып. 3. Могилев, 1903. С. 26 – 27.

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА АБ СТАНЕ ГАСПАДАРКІ ГУБЕРНІ

1804 г.

...Когда же именным высочайшим указом, состоявшимся в 23 день сентября 1802 г., крымские соляные озера обращены в казенное содержание, то в 1803 г. по распоряжению г-на генерал-майора, главного крымских озер надзирателя Мертваго, устроена Могилевской губ. в мест. Ветке продажа крымской казенной соли, доставляемой туда из Крюковских магазинов р. Днепром и Сожем; количество оной составляло 50000 пуд., цена соли назначена в продажу по 47 1/2 коп. пуд. По сей цене оная соль определенным к тому от главного надзирателя крымских озер соляным приставом с декабря 1803 г. по апрель 1804 г. в течение 4 месяцев продана и с того уже времени таковой поставки и продажи не производится. Продажа в мест. Ветке казенной соли в столь краткое время и по большей части большим количеством в руки перекупщиков не могла быть средством к уменьшению цены, но больше

служила поводом к возрождению монополии, ибо не примечено по выпуске оной в продажу ни малейшего унижения цен, да и быть не могло по причине, что соль досталась большею частью перекупщикам, а они, перевозя оною по городам и местечкам, взимали там цены, по которым и прежде продавалась. Сей ради причины в начале 1804 г. делал я сношение с главным крымских соляных озер надзирателем г-ном генерал-майором Мертваго, что гораздо было бы удобнее соляную казенную продажу устроить в губернском гор. Могилеве, лежащем среди своей губернии, вместо м. Ветки, яко помещичьего селения, состоящего в отдаленности от прочих городов, из которых одни ближайшие к Ветке жители имеют к покупке соли удобности.

Белоруссия в эпоху феодализма. Мн., 1961. Т. 3. С. 142–143.

З ПІСЬМА СМАЛЕНСКАГА, ВІЦЕБСКАГА І МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНАТАРА М. М. ХАВАНСКАГА НАЧАЛЬНІКУ 1-ГА АДДЗЯЛЕННЯ 3-Й АКРУГІ КОРПУСА ЖАНДАРАЎ П. К. МЕРДЗЕРУ

17 верасня 1829 г.

Секретно.

Милостивый государь мой, Павел Карлович!

До истечения 1828 г. не имел я от могилевского губернского начальства никаких донесений о неповиновении в тамошней губернии крестьян своим помещикам и о ненадлежащем отношении сих последних к первым. Но с наступлением сего 1829 г. я получал от г. тамошнего гражданского губернатора частые сведения о возникших между крестьянами беспокойствах и неповиновении помещичьей власти. Случаи сии суть следующие:

1. В январе сего года Белицкого повета помещицы кн. Любомирской крестьяне Косицкой слободы сделали ослушание экономии в поставке рекрута и некоторые из числа посланных для взятия оного крестьянам причинили тяжкие побои и даже увечья, а войта и сотского, также побив и разорив дома их, выгнали из слободы за то, что они, выполняя приказ экономии, не преклонились к совместному с ними возмущению. После сего, собравшись толпами, ходили по улице, одобряя друг друга и похвалясь стрелять и бить, если кто из полицейских чиновников коснется их брать. Но вскоре буйство сие благоразумными мерами белицкого земского исправника и потом командированного губернским правлением советника 1-го департамента главного суда Карпиловича прекращено, и крестьяне, в означенных буйственных поступках раскаясь, обещали повиноваться помещичьей власти. Между тем двое главных зачинщиков оного возмущения, коих бы следовало подвергнуть законному преследованию, бежали в Черниговскую губ. О сем происшествии могилевский гражданский губернатор в то же время всеподданнейше донес е. и. в. Таким образом, неповиновение означенных крестьян Косицкой слободы казалось быть прекращенным, и до сего времени о беспокойстве их донесений я не получал. Но ныне могилевский гражданский губернатор от 9 сентября известил меня, что он отправил в м. Ветку и слоб. Косицкую для усмирения взбунтовавшихся крестьян кн. Любомирской, следовательно, беспокойные вновь оказали буйство.

Крестьянское движение в России в 1826–1849 гг. Сб. документов. М., 1861. С. 134–135.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ КІРМАШАХ 1846 г.

Наименование ярмарок	Где и когда бывают ярмарки	Оборот ярмарок	
		На какую сумму привезено товаров	На какую сумму продано
		В рублях серебром	
Петровская	В Хальче, 29 июня	32549	28175
Михайловская	В Хальче, 7 ноября	18255	9174
Спасская	В Ветке, 6 августа	6734	4549
Сырная	В Ветке, в четверг на сырной неделе	9153	8153

Военно-статистическое обозрение Российской империи. Соб. 1848. Т. VIII. Ч. 3. С. 7.

Парэформенная Веткаўшчына (1861—1900 гг.)

Рэформа 1861 г., у наш час названая "рэвалюцыяй зверху", стала найважнейшай падзеяй для ўсёй Расіі. Ва ўсходняй Беларусі (Магілёўская губерня і беларускія паветы Віцебскай губерні) яна праходзіла на аснове "Мясцовага палажэння аб пазямельным уладкаванні сялян, населеных на землях памешчыкаў у губернях Вялікарасійскіх, Новарасійскіх і Беларускіх". У выніку рэформы сяляне атрымалі свабоду, памешчыкі пазбаўляліся права ўмешвацца ў сямейныя і маёмасныя справы сялян, наказваць, дарыць і прадаваць іх. Сяляне атрымалі права гандляваць, займацца прамысловай дзейнасцю, заключаць пагадненні, валодаць рухомай і нерухомай маёмасцю, несці асабістую адказнасць перад судом, паступаць у вучэбныя ўстановы, пераходзіць у іншыя саслоўі. Зямлю сяляне атрымоўвалі за выкуп. Пры падаўленні паўстання 1863 г. царскі ўрад імкнуўся схіліць на свой бок беларускіх, украінскіх, літоўскіх сялян, ліквідаваў часоваабавязаны стан сялян, перавёўшы іх у разрад сялян-уласнікаў. Урад знізіў на 20% выкупныя плацяжы, вярнуў сялянам надзелы, аднятыя перад гэтым і ў ходзе рэформы 1861 г., захаваў права карыстацца сервітутамі, надзяліўшы беззямельных сялян трыма дзесяцінамі зямлі на двор без уліку прысядзібнай зямлі. У 1867 г. на абавязковы выкуп былі пераведзены дзяржаўныя сяляне, далучаныя з гэтага моманту да разраду ўласнікаў. Больш спрыяльныя ўмовы вызвалення сялян садзейнічалі больш хуткаму станаўленню капіталістычных адносін у Беларусі.

Разам з тым рэформа захавала і перажыткі прыгонніцтва. Захавалася землеўладанне памешчыкаў, абшчына. Сяляне адчувалі на сабе ўвесь цяжар сістэмы адпрацоўкі самых розных падаткаў і павіннасцей.

Веткаўшчына адносілася да раёна, дзе ўладарыла абшчыннае землеўладкаванне, пры якім існавала абшчыннае (калектыўнае) валоданне зямлёй і індывідуальнае карыстанне ёй. Абшчына характарызавалася перадзелам зямель праз вызначаныя часовыя перыяды. Абшчыннае землеўладкаванне ў Гомельскім павеце ахоплівала 90,9% двароў, яму належала 90,4% усёй надзельнай зямлі, у падворным землеўладанні было суадносна 9,1% двароў і 9,6% усёй надзельнай зямлі.

Своеасабліва вырашалася пытанне аб пазямельным уладкаванні стараверaў. Большасць іх у паслярэформенны перыяд заставалася бестэрміновымі арандатарамі памешчыцкіх зямель. Да сярэдзіны 70-х гадоў яны арандавалі каля 100 тыс. дзесяцін зямлі.

Стараверы варожа аднесліся да паўстання 1863 г., што было станоўча ацэнена царскім урадам. Таму ўсе спробы памешчыкаў пазбавіць іх арандаваных зямель спыняліся. 17

Рэшткі сядзібнага дома ў в. Навасёлкі.

чэрвеня 1863 г. душыцель вызваленчага паўстання на Беларусі генерал Мураўёў выдаў часовы цыркуляр, згодна з якім памешчыкам забаранялася зганяць стараверaў з зямлі і падымаць арэндную плату. Ды з часам адносіны да стараверaў з боку правячых колаў сталі змяняцца. Стараверaў нельга было выкарыстаць у барацьбе з вызваленчым рухам у Заходнім краі, яны з варожасцю ставіліся і да царызму. І ўрэшце ў 1871 г. мураўёўскі цыркуляр быў адменены. Пры такіх умовах памешчыкі пачалі выганяць стараверaў з зямлі, павышалі арэндную плату. Такому павароту спраў садзейнічала адсутнасць сур'ёзнага аграрнага руху сярод арандатараў-стараверaў. Прыняты 22 мая 1876 г. закон замест выкупа зямлі стараверамі прадугледзеў бестэрміновую арэнду на пастаянных умовах. Выкуп зямлі мог адбыцца толькі па патрабаванню памешчыкаў або па ўзаемнай згодзе бакоў. Сродкі для набыцця зямлі прадастаўляліся ў выглядзе пазыкі ўрадам. Пры нязгодзе стараверaў на ўмовы выкупу яны павінны былі на працягу года пакінуць маёнтак. Усяго на выкуп выйшла больш 60% душ стараверaў. Выкупіўшыя зямлю стараверы далучаліся да сялянскага саслоўя. Права абавязковага выкупу зямлі на ўмовах, указаных вышэй, стараверы атрымоўвалі па закону ад 4 чэрвеня 1901 года. Працэс рэфармавання арэндных адносін стараверaў на Веткаўшчыне адбываўся ў тым жа накірунку, што і ва ўсім Заходнім краі.

Веткаўшчына ў паслярэформенны перыяд адносілася да буйнога памешчыцкага землеўладання. У канцы 70 – пачатку 80-х гадоў тут налічвалася больш 20 памешчыцкіх уладанняў, з якіх 15 адносіліся да ліку буйных маёнткаў (звыш 500 дзесяцін зямлі). У асноўным гэта былі землі, якія належалі дваранам. Сярод іх – маёнтак Шарсцін графа Мелінга, маёнтак Раманава, Папсуеўка – маёнтак надворнага саветніка Гергарда, маёнтак Гута – дваранкі Селістроўскай, маёнтак Закружжа – дваранкі Сабуравай, маёнтак Ветка – двараніна Станевіча, маёнтак Рэчкі – двараніна Бачкова, маёнткі Хальч і Канічава – двараніна Сенажынскага-Войніч ды іншых. Колькасць зямлі ў гэтых маёнтках налічвала ад 2 да 4,5 тыс. дзесяцін. У сямі астатніх маёнтках зямельныя ўладанні даходзілі ад 100 да 430 дзесяцін. У палове маёнткаў гаспадарку вялі самі памешчыкі, у шасці – аканомы, у адным – часткова аканом, часткова арандатары, у другім – часткова ўладальнік, часткова арандатары, тры маёнткі поўнасцю здаваліся ў арэнду. Да іх ліку належаў самы вялікі маёнтак на Ветцы – маёнтак у Пабужжы, уладальнікамі якога былі ганаровыя грамадзяне браты М. М. і Е. М. Харшуновы. У астатніх маёнтках былі прамысловыя і гандлёвыя прадпрыемствы, сярод якіх вылучаліся млыны, цагельні, вінакурні, крупяныя заводы, сукнавальні, паромы, лаўкі, корчмы. Усе яны прыносілі немалы даход памешчыкам.

У гаспадарках памешчыкаў Веткаўшчыны землі апрацоўвалі шляхам адпрацовак, а таксама найму парабкаў. Сярод адпрацовак былі як здзельны наём, так і здольшчына. Селянін з адным канём у 1871 г. у 1-м квартале атрымліваў за дзень працы 1 руб. 23 кап., у 2-м квартале – 1 руб. 30 кап., у 3-м – 1 руб. 79 кап., у 4-м – 1 руб. 09 кап. Найбольшы заробак быў у ліпені – жніўні, калі падыходзіла ўборка ўраджаю. Заробак селяніна з двума коньмі складаў 1 руб. 85 кап., 2 руб. 23 кап., 3 руб. 10 кап., 1 руб. 72 кап. У Казацкіх Балсунах шырока практыкавалася здольшчына. Так, пры кругавой апрацоўцы дзесяціны азімага жыта доля ўладальніка складала 1/3 частку ўраджаю. Але акрамя таго селянін павінен быў адпрацаваць некалькі конных дзён. У той жа вёсцы заліўныя сенакосы здымаліся ў арандатара маёнтка, якому даставалася 2/3 часткі сабранага сена. За кожную знятую дзесяціну неабходна было адпрацаваць яшчэ адзін конны дзень.

Часцей за ўсё парабкамі былі мясцовыя сяляне. Так, у Неглюбцы 34 селяніны наймаліся на падзённую працу. Заробак гадавым батракам на Веткаўшчыне ў 1871 г. для мужчын складаў 60 руб., для жанчын – 36 руб., летніх рабочых адпаведна – 30 і 12 руб., месячных – 5 і 3 руб., падзённых (без каня) – 45 і 35 кап. За ўзворванне адной дзесяціны падзёншчыкам плацілі 3 руб., за жніво мужчыне і жанчыне – 30 капеек у дзень. За касьбу адной дзесяціны ворнай зямлі заробак складаў 3 руб., за адну дзесяціну луга – 2 руб.

Размеркаванне надзельнай зямлі сярод сялян Веткаўшчыны можна разгледзець на прыкладзе ўсяго Гомельскага павета. Згодна статыстычным дадзеным 1877 г., 96,4% усіх

сялянскіх двароў мелі да 15 дзесяцін зямлі на двор. 3,5% – ад 15 да 20 дзесяцін і толькі 0,1% – звыш 20 дзесяцін. Гэтыя дадзеныя сведчаць аб тым, што надзельныя землі размяркоўваліся ў 70-х гадах параўнальна раўнамерна і расслаенне сялян па надзельнай зямлі было надта слаба выяўлена. Праўда, у некаторых пасяленнях працэс расслаення сялян дасягнуў даволі значнага ўзроўню. Так, у Казацкіх Балсунах з 193 двароў да 15 дзесяцін мелі 78,2%, ад 15 да 20 дзесяцін – 7,8 і звыш 20 дзесяцін – 14% двароў. Апошняя група сялян – заможныя сяляне, на кожны двор якіх прыпадала да 30 дзесяцін зямлі. У в. Неглюбка быў 431 двор. З гэтага ліку 78,7% двароў валодалі да 15 дзес., 8,6% – ад 15 да 20 дзес. і 12,7% – звыш 20 дзес. На адзін заможны двор тут прыпадала больш 25 дзес. зямлі. Землі сялян у Казацкіх Балсунах размяркоўваліся наступным чынам: 4,3% складалі прысядзібныя землі, 62,3 – паша, 14,4% – сенакосныя, 6,1% – лес, 12,9% – неапрацаваныя землі.

Дыферэнцыяцыю сялян можна прасачыць па прыкладах размеркавання коней. Так, па перапісу коней 1875 г. такіх сялян, у якіх не было коней, у Веткаўскай воласці не існавала, у 35,3% двароў было па аднаму каню, у 40,8% – было па 2 і 3 кані, 23,9% – мелі больш 4-х коней. Першая група адносілася да вясковай беднаты, другая – да сераднякоў, трэцяя – да заможных сялян. Але ж гэтыя лічбы нельга абсалютызаваць. У дадзеным выпадку трэба мець на ўвазе той факт, што Веткаўская воласць належала да ліку тых, у якіх колькасць коней была вельмі значнай, што ў сваю чаргу тлумачылася развіццём рамізніцкага промыслу. У тых мясцовасцях, дзе промысел рамізнікаў быў слаба развіты, колькасць коней была значна меншая. Так, у Казацкіх Балсунах з 193 гаспадарак 53,1% двароў зусім не мелі рабочай скаціны, 37,8% – мелі па 2–3 галавы і 10,9% – 4 і болей галоў.

Аб расслаенні сялян сведчыць і развіццё арэндных адносін. Недахоп надзельнай зямлі прымушаў сялян браць яе ў арэнду або ў землеўладальнікаў-памешчыкаў, або ў сялян. Здольшчына ўяўляла сабой кабальную арэнду. Разам з тым практыкавалася і грашовая арэнда. У Казацкіх Балсунах здымалася 85 дзесяцін зямлі, што складала да агульнай колькасці worнай зямлі, якая была ў сялян, 4,3%, а з улікам неапрацаванай – 3,7%. У Неглюбцы сяляне арандавалі 200 дзес. зямлі, што складала ў адносінах да агульнай колькасці зямлі 3,8%. Зямля арандавалася амаль выключна ў памешчыкаў. У Казацкіх Балсунах сяляне здавалі ў арэнду толькі 1 дзес. зямлі, у Неглюбцы – 4 дес. Маючы патрэбу ў зямлі, сяляне былі вымушаны яе купляць. Грошы з канца XIX ст. яны маглі пазычыць у Гомельскім саслоўным банку, які быў адчынены з асноўным капіталам у 25 тыс. руб. у 1896 г. Сяляне ўсіх 14 валасцей павета ўносілі сродкі для яго стварэння. 1 студзеня 1897 г. банк выдаў пазыку на суму 50 тыс. руб., большая частка якіх пайшла на пагашэнне даўгоў ліхвярам, а 1/3 – на набыццё зямлі.

Па-ранейшаму сярод сельскагаспадарчых культур вызначаліся азімае жыта, авёс, ячмень, проса. Вельмі важнай культурай у сялян заставаліся каноплі. Асабліва развіццё канапляводства атрымала ў 60–80 гг. Пянька добра прадавалася за мяжой. Каноплі часцей за ўсё вырошчвалі на прысядзібнай зямлі, іншы раз займаючы 20% плошчы. У Неглюбцы каноплі сеялі ў так званых займішчах, якія былі амаль у кожнай сялянскай сям'і. Яны былі ўласнай маёмасцю сялян і не ўваходзілі ў грамадскія землі. Ураджаі ў сялян былі невысокія. У асобных месцах збор налічваў 16–24 пуды з дзесяціны (2,5–3,8 ц). Сельскагаспадарчая тэхніка была адсталай, пераважалі плуг, драўляная барана, серп, граблі, цэп і інш. Але і гэтыя прылады працы былі не ва ўсіх сялян. Так, у Казацкіх Балсунах 27 сялянскіх гаспадарак (17,5%), а ў Неглюбцы 40 гаспадарак (10,3%) бралі чужы інвентар для апрацоўкі поля. Малыя ўраджаі залежалі не толькі ад прымітыўнай тэхнікі, яшчэ ад таго, што адсутнічалі ўгнаенні. Угнаенне маглі ўнесці прыкладна на 1/10 частку пасяўной плошчы. Дый вывозілі яго на адны і тыя ж самыя кавалкі зямлі, галоўным чынам пад яравыя (ячмень, проса).

У гаспадарках памешчыкаў, асабліва там, дзе былі вінакурні, сеялі вялікую колькасць бульбы. Адходы на вінакурнях былі добрым кормам для жывёлы. У гэтых маёнтках даволі вялікае месца займала жывёлагадоўля. Тут шырока былі прадстаўлены палепшаныя пароды жывёл, у асноўным замежныя. Такія жывёлы былі ў стаўбунскім маёнтку графа Чарны-

Сядзіба ў в. Хальч. Помнік архітэктуры пачатку XIX ст.

шова-Круглікава, гомельскім маёнтку князя Паскевіча. Адначасова пачаў развівацца адкорм буйной рагатай жывёлы. Спецыяльна для гэтай мэты сюды прыганялі скот, так званы чаркаскі, аж з Украіны. У 1898 г. у маёнтку Сенажынскага-Войніч у трох фальварках адкормлівалі 600 галоў буйной рагатай жывёлы, у веткаўскім маёнтку, які належаў у той час Камстадыўсу, — 150 галоў.

У паслярэформенны перыяд сярод сялян Веткаўшчыны атрымалі развіццё мясцовыя промыслы, сярод якіх вылучаліся: сталярны, бандарны, кавальскі, такарная апрацоўка дрэва, калёсны, абутковы ды інш.

У канцы 70 — пач. 80-х гг. гэтымі промысламі было занята больш 300 чалавек. Найбольш распаўсюджаным промыслам з'яўлялася апрацоўка дрэва. Выраблялі посуд, калёсы, разнастайныя бандарныя рэчы. На апрацоўку дрэва прыпадала палавіна ўсіх рамеснікаў Веткаўшчыны. Сярод рамеснікаў вылучаліся краўцы (48 чалавек), абутнікі (40 чалавек), кавалі (44 чалавекі). Гадавы заробак рамесніка вагаўся ў залежнасці ад спецыяльнасці ад 10 да 300 руб. Больш за ўсё цанілі працу кавалёў (ад 15 да 300 руб.), краўцоў (10–180 руб.), абутнікаў (10–80 руб.). Асабліва шмат рамеснікаў было ў Ветцы — 84 чалавекі.

Побач з мясцовымі промысламі сярод сялян вялікую ролю мелі адыходныя промыслы, пры якіх сяляне на доўгі час пакідалі свае вёскі і ў пошуках заробку ішлі за межы родных мясцін. З вёсак і сёлаў Веткаўшчыны ў канцы 70 — пач. 80-х гадоў выходзіла каля 2 тыс. чалавек. З Веткі ў адыходныя промыслы ішло 430 чалавек, з Неглюбкі — 274, Мар'інай Слабады — 173, Рудні-Споніцкай — 173, Тарасаўкі — 137, Барталамееўкі — 97, Казацкіх Балсуноў — 78, Старога Сяла — 75, Стаўбуна — 70 чалавек.

Адыходныя промыслы падзяляліся на летнія і зімнія. Да першых адносіўся сплаў лесу, земляныя работы, звязаныя з будаўніцтвам чыгуначных і шашэйных дарог, праца на цагельнях. Сярод летніх промыслаў вылучалася здабыча каменю для будаўніцтва шашэйных дарог. Такой жа працай лічылася арэнда ў Чарнігаўскай і Палтаўскай губернях фруктовых садоў з наступным продажам пладоў, разносны гандаль дробным таварам. Але найбольш распаўсюджаным промыслам быў сплаў лесу. Так, напрыклад, з 78 жыхароў Казацкіх Балсуноў, якія ішлі ў адыход, 76 займаліся сплавам лесу. Да летніх промыслаў сялян Веткі адносіліся работы, звязаныя з навігацыяй па Сожы і Дняпры, а таксама — на суднабудаўнічых прадпрыемствах. Сярод зімовых відаў адыходу найбольш распаўсюджанымі былі высечка лесу, распілоўка, дастаўка да прыстаней, праца на цукровых, вінаробчых заводах Украіны. Асабліва вялікае значэнне меў лясны промысел. Непасрэдна ў Веткаўскай воласці гэтым промыслам займалася 20 мужчын, але ў іншых валасцях Гомельскага павета (Рэчкаўская, Пакацкая воласці), вёсках, якія ўваходзяць у склад сучаснай Веткаўшчыны, лясны промы-

сел меў надта вялікае распаўсюджванне. Так, у Рэчкаўскай воласці ім было занята 600 мужчын, 300 жанчын, 610 дзяцей, у Пакацкай воласці – 100 мужчын. Лясны промысел пачынаўся з паловы снежня і заканчваўся ў канцы сакавіка. Многа сялян з Неглюбкі (241 з 274 адыходнікаў) ішлі на цукровыя заводы Украіны.

Асаблівае месца ў жыцці Веткаўшчыны ў паслярэформенны час займаў рамізніцкі промысел. Перш за ўсё ён быў звязаны з хлебным гандлем. У Гомельскім павеце гэтым промыслам займалася да тысячы чалавек. Але будаўніцтва чыгунак, і ў прыватнасці Роменскай жалезнай дарогі, перапыніла гэты промысел, звязаны з хлебным гандлем. Хлеб па чыгунцы са станцыі Ромны пачаў дастаўляцца ў Гомель. Але промысел не знікнуў. У канцы 70–пачатку 80-х гадоў ім у Ветцы займалася 100 чалавек. Промысел набыў іншыя рысы. Вырас звоз лесу, дастаўка яго да прыстаней. Звоз садзейнічаў таму, што Ветка стала цэнтрам размяшчэння, канцэнтрацыі многіх грузаў – пянькі, ільну, льнянога і канаплянага насення, алею, кары, смалы, дзёгцю, газы, свечак, мыла, мануфактуры, хлеба.

На Веткаўшчыне развівалася дробная рамесніцкая прамысловасць. Да яе мелі адносіны розныя прадпрыемствы. Так, сярод іх у 1881 г. налічвалася 3 гарбарныя ўстановы. Звычайна ў такой установе працаваў сам рамеснік. На прадпрыемстве выраблялася 100–200 скурак у год. Усе ўстановы належалі сялянам. У тым жа 1881 г. функцыянавала 6 суконных рамесніцкіх прадпрыемстваў. Яны былі ў Рудні-Споніцкай, Вялікіх Нямках, Навілаўцы, Рудні-Шлягінскай, Новых Грамыках і Рудні-Гулевай. У сярэднім на прадпрыемствах выраблялася ад 300 да 10 тыс. аршынаў сукна на суму ад 20 да 200 руб. У самой Ветцы знаходзіліся канатныя і вяровачныя прадпрыемствы, на якіх, у адрозненне ад суконных прадпрыемстваў, прымянялася праца наёмных рабочых. Лік апошніх вагаўся ад 5 да 12 чалавек, апрача майстра. У сярэднім на кожным прадпрыемстве выраблялася каля 1,5 тыс. пудоў канатаў і вяровак, а валавы даход складаў 1,3 тыс. руб.

Хутка пасля рэформы 1861 г. на Веткаўшчыне сталі ўзнікаць прадпрыемствы па вытворчасці круп. У 1867 г. у в. Беседзь і Акол яе дзейнічалі два такія прадпрыемствы, якія належалі ганароваму грамадзяніну Харшунову. На іх працавала па 13 чалавек. Выраблялі крупы на суму да 10 тыс. руб. У 1870 г. толькі на прадпрыемстве ў Беседзі вырабілі круп на 9,5 тыс. руб. Прадпрыемства ў Беседзі займала вядучае месца не толькі ў Гомельскім павеце, але і ва ўсёй Магілёўскай губерні. Па сваёй пабудове яно ўяўляла сабой вялікі вадзяны млын для перамолу пшаніцы ў крупы. Штогод перамолвалі каля 22 тыс. пудоў. У канцы 60-х гадоў крупяное прадпрыемства было ў Ветцы. Яно належала мешчаніну Кушнярову. У 1881 г. у Ветцы функцыянавала 3 крупадзёрныя прадпрыемствы і адно – у Старым Сяле. У 60-х гадах у памешчыкаў сустракаліся цагельні, на якіх працавалі 2–3 чалавекі. Такія прадпрыемствы былі ў Шарсціне, Стаўбуне.

У Ветцы да рамесніцкай вытворчасці належала будаўніцтва барак (кошт 1200–1500 руб.), берлін (1500–2000 руб.), вялікіх лодак (100–200 штук). Два кавалі-рамеснікі займаліся вырабам якараў вагой да 33 пудоў. За зімовы час выраблялася да 90 якараў. На Веткаўшчыне шырокае распаўсюджванне атрымалі млыны. У сярэдзіне 80-х гадоў іх налічвалася каля 40.

Сярод прамысловых устаноў Веткаўшчыны, якія адносіліся да фабрычна-завадскіх прадпрыемстваў, былі вінакурні. У 1894 г. налічвалася 4 вінакурныя заводы. У м. Хальч знаходзіўся завод А. Сенажынскага-Войніч, на якім працавалі 1 майстар і 9 рабочых, паблізу м. Хальч – завод С. Сенажынскага-Войніч (1 майстар, 14 рабочых), у в. Гута – завод Сумароўскай (1 майстар, 8 рабочых), у Стаўбцах – завод Чарнышова-Круглікава (1 майстар, 8 рабочых). Заводы былі заснаваны ў паслярэформенны час. Валавы даход ад гэтых прадпрыемстваў вагаўся ад 2 да 9 тыс. руб.

Згодна перапісу 1897 г. на Веткаўшчыне было да 90 разнастайнага тыпу прамысловых прадпрыемстваў. Асабліва многа было кузняў. Частка іх належала мясцовым сялянам. Былі і такія, якія ўяўлялі сабой дробную рамесніцкую прамысловасць. Цэнтрам такой прамысловасці была Рудня-Споніцкая, у якой налічвалася 27 кузняў. У Ветцы іх было 12. Самыя разнастайныя, галоўным чынам прызначаныя для сельскай гаспадаркі прадметы працы выраблялі

ў гэтых кузнях. Колькасць млыноў перавышала лічбу 30. Функцыянавалі таксама 5 крупяных, 5 вінакурных, 2 маслабойныя, 5 канатных прадпрыемстваў і 5 цагельняў.

Гандаль меў важную ролю ў жыцці Веткаўшчыны. Хоць будаўніцтва чыгункі прама не кранулася Веткі, яно адцягнула частку грузаў, якія раней прыбывалі ў Ветку ракой ці пры дапамозе гужавога транспарту. Гэта больш за ўсё тычылася зерневых тавараў. На рацэ Сож і яе прытоках, якія заставаліся галоўнымі транспартнымі магістралямі Веткаўшчыны, былі прыстані (Ветка, Стаўбун, Новыя Грамыкі, Беседзь), паромы (Юркавічы, Хальч, Старое Сяло). Яны мелі вялікую ролю ў гандлі. Праз Ветку ішоў паштовы тракт Гомель – пасад Свяцкі, які выкарыстоўваўся таксама для гандлёвых мэт. Ветка на рубяжы 70–80 гадоў сярод сожскіх прыстаней па адпраўцы суднаў была на першым месцы, а па адпраўленых грузах у вагавым і грашовым налічэнні – на другім месцы пасля Чачэрска, апярэджваючы Крычаў, Чэрыкаў, Прапойск, Гомель. Па колькасці разгружаных суднаў Ветка была на другім месцы, уступала Гомелю, але пераўзыходзіла яго па вагаваму і грашоваму паказчыках. У 1871–1881 гг. у сярэднім у год з Веткі адпраўлялася 45 суднаў з агульным грузам 317,4 тыс. пудоў на суму 162,4 тыс. руб., прыбывала і разгружалася 52 судны (379,8 тыс. пудоў на суму 265 тыс. руб.).

Аб развіцці гандлю Веткі сведчаць лічбы транспартнай статыстыкі. У 1880 г. з Веткі было адпраўлена 319 тыс. пудоў грузаў, у тым ліку 78 тыс. пудоў дроў, 156 тыс. пудоў лесаматэрыялаў, 26 тыс. пудоў заналак, 24 тыс. пудоў вырабаў з драўніны, 16 тыс. пудоў шкла, 12 тыс. пудоў яблык, 7 тыс. пудоў канаплянага масла. Рачным транспартам у гэтым жа годзе прыбыло 339 тыс. пудоў грузаў, у тым ліку 167 тыс. пудоў зерня, мукі, круп, 171 тыс. пудоў солі і 1 тыс. пудоў табакі. Аснову вывазу складалі дровы, лясныя матэрыялы або тавары, зробленыя з дрэва. На іх прыпадала 4/5 усяго вывазу. Трэба звярнуць увагу на вываз шкла, заналак. Хоць прадпрыемстваў па іх вытворчасці на Веткаўшчыне не было, аднак Ветка стала цэнтрам для вывазу шматлікіх грузаў, якія паступалі з іншых месцаў. Ва ўвозе грузаў на першым месцы знаходзілася соль (49,3%) і табака (0,3%). Такі характар таваразвароту рачным транспартам захоўваўся і ў наступныя гады. Калі ў сярэднегадавым вылічэнні ў канцы 70-х гадоў у Ветку дастаўлялася 210 тыс. пудоў зерневых тавараў, то ў 1881–1885 гг. – 141, у 1886–1890 гг. – 97, у 1891–1895 гг. – 61, у 1896–1900 гг. – 146 тыс. пудоў хлеба. У канцы 70-х гадоў у Ветку было прывезена 146 тыс. пудоў солі, у 80–90 гг. гэты ўвоз стабільна перавышаў 200 тыс. пудоў. Асноўны вываз з Веткі ў 80–90 гг. складаўся з лесаматэрыялаў, дроў, лясных вырабаў. Частка гэтых матэрыялаў адпраўлялася буксірамі, частка – плытамі. Вываз гэтых грузаў бесперапынна павялічваўся. Так, калі ў 1889–1891 гг. у сярэднім у год прадавалі 1675 тыс. пудоў, то ў 1897–1899 гг. – 2512 тыс. пудоў, або на 50% болей. Лясныя грузы адпраўляліся ўніз па цячэнні Сожа і былі прызначаны, галоўным чынам, для Украіны. Яны паступалі ў Херсон, Крамянчуг, Кіеў, Чаркасы. З Веткі таксама вывозілі садавіну, лён, пяньку, канаплянае і льняное насенне.

Ва ўнутраным гандлі па-ранейшаму істотную ролю мелі кірмашы. З падзеннем ролі кірмашоў рос стацыянарны гандаль, адчыняліся крамы. У 1886 г. у Ветцы іх налічвалася 190, у Хальчы – 85, Свяцілавічах – 3. У 1897 г. толькі ў Ветцы дзейнічала 245 крамаў, аптовы склад спірту, 5 піцейных устаноў. Такія ж установы былі і ў іншых населеных пунктах Веткаўшчыны.

Прыкметную ролю ў гандлі мелі скупшчыкі. Сярод іх пераважалі яўрэі, якія займаліся дробнай скупкай. Скупкай займаліся і стараверы. Па вёсках скупляліся ў асноўным лён, пянька, сала, скура, шчаціна, пух, пяро, воск і інш. Гэтыя тавары затым групаваліся ў вялікія партыі і перапрадаваліся больш буйным прадпрыемствам.

У паслярэформенны перыяд назіраўся даволі вялікі рост насельніцтва Веткаўшчыны. У 1863 г. у Ветцы было 4180 жыхароў, у пачатку 80-х гадоў – 5982, ў 1897 г., згодна ўсеагульнаму перапісу, 7204 жыхары. У канцы XIX ст. Ветка ўваходзіла ў лік буйных населеных пунктаў Магілёўскай губерні, уступаючы толькі губернскаму цэнтру, чатыром павятовым гарадам (Гомель, Орша, Рагачоў, Мсціслаў). Па колькасці насельніцтва Ветка апярэджвала шэсць павятовых цэнтраў Магілёўшчыны – Сянно, Горкі, Чавусы, Быхаў, Чэрыкаў,

Клімавічы. У параўнанні з 1863 г. насельніцтва Веткі ў 1897 г. павялічылася на 72,3%. У 42 населеных пунктах Веткаўшчыны, у якіх пражывала 500 і больш чалавек, было каля 40 тыс. жыхароў. Сярод іх у 11 пунктах налічвалася ад 500 да 700 жыхароў, у 12 – ад 700 да 1 тыс., у 19 – звыш 1 тыс. жыхароў. Да буйных населеных пунктаў Веткаўшчыны належалі Неглюбка (3,5 тыс. чалавек), Старое Сяло (2,3), Хальч (1,9), Казацкія Балсуны (1,7), Шарсцін (1,7), Закружжа (1,5), Прысно (1500), Барталамееўка (1,27 тыс. чалавек) ды інш. За перыяд з 1886 г. па 1897 г. насельніцтва Шарсціна павялічылася на 147%, Свяцілавіч – 91%, Прысно – 86%, Стаўбуна – 84%, Хальча – 77%, Вялікіх Нямкоў і Данілавіч – 66%, Радугі – 65%, Старога Сяла – 60%. Насельніцтва Неглюбкі ў параўнанні з 1882 г. вырасла на 24,8%, Казацкіх Балсуноў – на 47%.

У пачатку 80-х гадоў XIX ст. Ветка ўяўляла сабой мястэчка з перавагай драўляных забудоў. З 1005 дамоў 994 былі драўлянымі. У Ветцы знаходзілася валасная ўправа, паштовае аддзяленне. З 5982 жыхароў Веткі да пачатку 80-х гадоў праваслаўных было 21,9%, старавераў – 35,3%, іудзеяў – 42,6%, католікаў – 0,2% ад усяго насельніцтва. У канцы 1897 г. з 7204 жыхароў праваслаўныя складалі 23,7%, староверы – 24,4, іудзеі – 51,7, католікі – 0,2% ад усіх жыхароў. Да канца XIX ст. Ветка ператварылася ў мястэчка з перавагай яўрэйскага насельніцтва. Да пачатку 80-х гг. у Хальчы налічвалася 253 драўляныя дамы. Большасць складала праваслаўнае насельніцтва – 77,6%, яўрэі – 21,4%, католікі –1%. У мястэчку Шарсцін было 110 драўляных дамоў. Жылі ў асноўным праваслаўныя (94,2%) і невялікая колькасць яўрэяў (4%). У першай палове 80-х гадоў на Веткаўшчыне функцыянавала звыш 20 праваслаўных цэркваў, 8 сінагог, 5 культавых устаноў староверaў.

Староверства на Веткаўшчыне працягвала існаваць і развівацца ў 60–90 гг. XIX ст. У Ветцы, слабодах Тарасаўка, Папсуеўка, Косіцкае, Раманава, Лявонцьева да пачатку 70-х гадоў налічвалася 3,6 тыс. старавераў, у 1897 г. – прыкладна 4,3 тыс. Сярод іх усё менш заўважнымі былі старыя разыходжанні з праваслаўным насельніцтвам і ўладамі. Гомельскі павятовы спраўнік у рапарце магілёўскаму губернатару ў 1871 г. падкрэсліваў прыязныя адносіны староверaў да праваслаўнага насельніцтва і праяўленне "дастатковага даверу" да мясцовых уладаў.

Паслярэформенае 40-годдзе характарызуецца значнымі мерапрыемствамі ў галіне народнай асветы Расіі. Сярод рэформаў 60–70 гг. адно з галоўных месцаў заняла школьная рэформа, якая ўводзіла сістэму асветы для ўсіх саслоўяў. Але "Палажэнне аб пачатковых народных вучылішчах" 1864 г. у Беларусі не дзейнічала. Царскі ўрад пасля падаўлення паўстання 1863 г. імкнуўся шляхам школьнай асветы абмежаваць беларускіх і літоўскіх сялян ад польскага ўплыву. Для гэтага міністэрству асветы было прапанавана скласці правілы для пабудовы школ у літоўска-беларускіх губернях. Замест "Палажэння аб пачатковых народных вучылішчах" у Беларусі дзейнічалі "Часовыя правілы", мэта якіх была ў тым, каб забяспечыць у асвеце вядучую ролю рускай мовы. Па ініцыятыве М. М. Мураўёва – душыцеля паўстання 1863 г. у Беларусі і Літве – асігнаванні на сярэднія вучэбныя ўстановы ў заходніх губернях паменшаліся. У школах Беларусі забаранялася навучанне на беларускай і польскай мовах. Навучанне ў школах вялося толькі на рускай мове.

Як адзначалася вышэй, першае народнае вучылішча на Веткаўшчыне было адчынена ў 1859 г. у в. Стаўбун. У першай палове 70-х гадоў на ўтрыманне вучылішча адпускаўся 251 руб. Грошы збіраліся ў сялян. Выкладаў Ф. І. Палчанінаў, выхаванец смаленскай духоўнай семінарыі. Ён жыў у бясплатнай кватэры і атрымліваў 150 руб. у год. Праз 10 гадоў народнае вучылішча было адчынена ў Барталамееўцы. На ўтрыманне вучылішча ішло 60 руб. Урокі вёў селянін Л. Ф. Лапніцкі з акладам 60 руб. Ён скончыў Беліцкае прыходскае вучылішча. У тым жа 1869 г. стала працаваць вучылішча ў в. Новыя Грамыкі, на патрэбы якога ад мясцовых сялян паступала 60 руб. Настаўнічаў там былы унтэр-афіцэр Дабрыцкі, які быў навучэнцам Чарнігаўскага павятовага вучылішча. У 1869 г. было адчынена Веткаўскае народнае вучылішча, на патрэбы якога з дзяржаўнай казны выдзялялася 120 руб. і 226 руб. – ад магілёўскага праваслаўнага брацтва. Настаўнічала Е. Л. Хар'янава з акладам 120 руб. у год, яна таксама жыла ў бясплатнай кватэры. У канцы 70-х гадоў Барталамееўскае вучылішча

ўжо не існавала ў спісах школ. Відаць, яно было зачынена. Але з'явіліся новыя вучылішчы. У 1875 г. узнікла Рэчкаўскае вучылішча. На ўтрыманне яго выдзялялася 219 руб. сялянскай грамадой і 158 руб. – казной. У вучылішча было прынята 27 вучняў. Выкладаў К. М. Якушаў, які вучыўся ў Магілёўскай духоўнай семінарыі і меў званне настаўніка павятовых вучылішчаў. Якушаў атрымоўваў 200 руб., бясплатнае жыллё. У 1877 г. было адчынена Шарсцінскае вучылішча, на якое ішоў 241 руб. казённых грошай і 146 руб. сабраных сялянамі. Настаўнічаў І. І. Кугук – выхаванец Полацкай настаўніцкай семінарыі. Ён меў званне настаўніка павятовых вучылішчаў. Праз некаторы час у Ветцы было адчынена яшчэ адно вучылішча. Старая вучэльня была ператворана ў жаночае народнае вучылішча, якое ўтрымлівалася за кошт казны (120 руб.) і збораў з насельніцтва (50 руб.). У вучылішчы навучалася 31 дзяўчынка. Выкладала А. К. Пляскоўская, якая мела званне настаўніцы. Ёй плацілі 150 руб. і забяспечвалі бясплатнай кватэрай. У новай мужчынскай пачатковай вучэльні выкладаў П. П. Цітовіч, выпускнік Магілёўскай духоўнай семінарыі. На ўтрыманне вучылішча казна адпускала 175 руб. і 50 руб. складаў збор з насельніцтва. У школе навучалася 48 хлопчыкаў. У наступныя гады народныя вучэльні былі адчынены ў Вялікіх Нямках, Завідаўцы, Расохах, Старым Сяле, Данілавічах. У сярэдзіне 80-х гадоў на Ветцы функцыянавала 11 народных вучэльняў. Да гэтай лічбы да пачатку XX ст. дабавілася вучылішча ў в. Пералёўка.

Разам з народнымі вучылішчамі на Ветцы атрымліваюць развіццё царкоўнапрыходскія школы, якія знаходзіліся цалкам пад кантролем праваслаўнай царквы. У колькасных адносінах яны ўступалі народным вучылішчам. Такая школа была ў Ветцы. Знаходзілася яна ў царкоўным будынку. Вучыў дзяцей псаломшчык М. Ідаловіч. У школе вучылася 19 хлопчыкаў і 2 дзяўчынкі. Пад кантролем царквы працавалі так званыя школы граматы. У Чыстых Лужах навучанне ў такой школе вёў С. Іваноў. У школе вучыўся 21 хлопчык. Побач з вышэйназванымі вучэбнымі ўстановамі ў Ветцы ў сярэдзіне 80-х гадоў налічвалася 5, у Хальчы – 1 яўрэйская школа. У гэтых школах хлопчыкаў вучылі канонам іудзейскай рэлігіі.

У паслярэформенны перыяд першыя крокі на Веткаўшчыне рабіла сістэма аховы здароўя. У канцы 70 – пачатку 80-х гадоў у Свяцілавічах функцыянавала бальніца. У 1886 г. у ёй лячылася 125 хворых. Утрыманне хворых абыходзілася казне ў 682 руб., аднаго хворага ў дзень – 39 кап. Пры бальніцы працавала амбулаторыя, у 1880 г. яе наведала 434 хворыя. У Ветцы існаваў прыёмны пункт. У 1880 г. тут лячылася 48 хворых. На бальнічны пакой было выдаткавана 329 руб., на аднаго хворага – 43 кап. у дзень. Амбулаторных наведванняў было 75. У Ветцы працавала аптэка, якая належала калежскаму асэсару Бачкову. Гадавы абарот аптэкі ў 1880 г. склаў 1,5 тыс. руб.

Рэформа 1861 г., якая ліквідавала прыгонніцкае права, захавала пережыткі прыгону, галоўным сярод якіх з'яўлялася землеўладанне памешчыкаў. Ягоная моц вызначала сялянскае малазямелле. Аграрнае пытанне да канца XIX ст. рабілася галоўным пытаннем палітычнага жыцця краіны. Аграрны крызіс 80–90 гг. садзейнічаў абвастрэнню класавых супярэчнасцей, асабліва паміж шматмільённымі масамі сялян і жменькай памешчыкаў. У паслярэформенны перыяд сялянскія выступленні адбываліся і на Веткаўшчыне. У 1869 г. былыя памешчыцкія сяляне слабод Косіцкай і Раманава адмовіліся засейваць свае палі і аддаваць выкупныя плацяжы, матывуючы свае дзеянні дрэннай якасцю зямлі. Адной з форм барацьбы былі высечкі лесу. Сяляне захоплівалі як памешчыцкі, так і казённы лес. У 1870 г. сяляне в. Казацкія Балсуны агульнай колькасцю да 100 чалавек напалі на казённыя дачы, дзе працавала 70 чалавек, якія расчышчалі лясныя плошчы. Тыя, хто нападаў, пабілі лясную варту, а таксама рабочых, якія нарыхтоўвалі лес купцам, захапілі болей тысячы дзесяцін зямлі. Затым яны цэлымі абозамі вывозілі лес. У 1883 г. у ноч на 12 сакавіка 10 жыхароў Веткі адправіліся ў лес памешчыка А. Сенажынскага-Войніч за дровамі, насеклі 5 вязанак і вярталіся дахаты. Вярсты за 3 ад Веткі яны сустрэлі вартаўнікоў Вайцэхоўскага і Аціпава. У бойцы Вайцэхоўскі параніў стрэлам у нагу аднаго з вяртаўцаў.

Х. Ю. Бейлькін.

ЛІТАРАТУРА:

Белоруссия в эпоху капитализма. Мн., 1983. Т. 1.

Волости и важнейшие селения в Европейской России. СПб., 1886. Вып. 5.

Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі. Мн., 1940. Т. 2.

Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии. Могилев, 1884.

Кернажыцкі К. І. Гаспадарка прыгоннікаў у канцы XVIII — першай паловы XIX ст. Мн., 1935.

Отчет о церковноприходских школах Могилевской епархии на 1889/90 учебный год. Могилев, 1891.

Памятная книжка Виленского учебного округа на 1874 г.; на 1886/7; на 1900 г. Вильно, 1887, 1900.

Русов А. А. Описание Черниговской губернии. Чернигов, 1898. Т. 2. Приложение.

Самбук С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Мн., 1980.

Статистика поземельной собственности и поименных мест Европейской России. СПб., 1882. Вып.V.

Статистический сборник МПС. СПб., 1882. Вып. 6—67.

ВЕТКАЎШЧЫНА НА ПАЧАТКУ XX СТАГОДДЗЯ

СТАН ГАСПАДАРКІ І ЎМОВЫ ЖЫЦЦЯ

Да пачатку XX ст. у склад Гомельскага павета ўвайшлі Палеская, Пакацкая, Стаўбунская і Рэчкаўская воласці. З гэтага часу амаль уся Веткаўшчына, за выключэннем Неглюбкі, Казацкіх Балсуноў (Суражскі павет Чарнігаўскай губерні) і Прысно (Рагачоўскі павет), увайшлі ў склад Гомельскага павета.

Насельніцтва Веткі ў 1909 г. складала 10,3 тыс. чалавек (3 тыс. хрысціян і 7,3 тыс.

Кірмаш у Ветцы.

Былая панская сядзіба ў Ветцы.

яўрэяў), была ўладальніцкім мястэчкам, належала палкоўніку В. П. Шлейферу. Асноўны склад насельніцтва ўтваралі мяшчане (8,8 тыс.), сялян было толькі 1,5 тыс., дваран і чыноўнікаў – 1,2, купцоў – 1,4, духоўнага звання – 5 чалавек. Мястэчка мела 1767 пабудоў, з якіх 980 – жылых і 787 – нежылых. 15 дамоў былі зроблены з каменя, астатнія – драўляныя. Нежылыя пабудовы – гэта ўсялякія склады, сховішчы. У Ветцы знаходзілася камера земскага начальніка 4-га ўчастка Гомельскага павета, паштова-тэлеграфная, натарыяльная кантора, мяшчанскае ўпраўленне, вольнае пажарнае таварыства. У Веткаўскую воласць уваходзілі Веткаўскае, Беседскае, Куптараўскае, Мар'інскае, Навасёлкаўскае, Радужскае, Рудня-Споніцкае, Тарасаўскае, Хальчанскае, Чысталужскае сельскія таварыствы. У 1912 г. паводле прыблізнага падліку ў Ветцы жыло 12 тыс. чалавек. За кароткі перыяд часу насельніцтва Веткі павялічылася на 16,5%.

Сярод буйных населеных пунктаў Веткаўшчыны вылучалася м. Хальч, якое належала А. П. Сенажынскаму-Войніч. У 1909 г. тут налічвалася 2256 жыхароў, пераважалі хрысціяне (2026 чалавек), яўрэяў было 236 чалавек. Хальч уяўляў сабой мястэчка з перавагай сялянскага насельніцтва – 2012 чалавек, мяшчане складалі 230, купцы – 6, духоўныя асобы – 8 чалавек. Да буйных населеных пунктаў адносілася мястэчка Шарсцін, у якім налічвалася 1619 жыхароў, у тым ліку 1388 хрысціян і 231 яўрэй. Як і ў Хальчы, тут пераважала сялянскае насельніцтва – 1369 чалавек, мяшчан налічвалася 231 чалавек, купцоў – 10, духавенства – 9 чалавек. Мястэчка належала купцу А. В. Пенкіну.

Вядучае месца ў гаспадарчым жыцці Веткаўшчыны па-ранейшаму займала сельская гаспадарка. Увесь яе зямельны фонд на 1 студзеня 1909 г. складаў 116,7 тыс. дзесяцін. Зямля надзялялася па саслоўнаму прынцыпу. Уласнікамі з'яўляліся дваране, сяляне, ганаровыя грамадзяне, купцы, мяшчане, духавенства. Дваранам належала 21,1 тыс. дзес., сялянам – 71,7 тыс. дзесяцін. Сялянскае землеўладанне хутка расло ў гады сталыпінскай рэфор-

мы, звязанай з разбурэннем абшчыны, калі сяляне набывалі магчымасць замацоўваць за сабой землі ва ўласнасць і праз Сялянскі банк мець сваю зямлю.

Сярод буйных уладальнікаў Веткаўшчыны пераважалі дваране. С. П. Сенажынскі-Войніч валодаў 4312 дес. зямлі, граф Чарнышоў-Круглікаў — 3665, Бычкоў — 2899, Гергард — 1400, Случкоўскі — 1470, Фрамандзер — 1301, А. П. Сенажынскі-Войніч — 1100, Даўгоў-Сабураў — 1080, Лашкевіч — 967, Шлейфер — 448 дзесяцінамі. Сярод буйных землеўладальнікаў быў ганаровы грамадзянін М. М. Харшуноў, які меў 2864 дзес.

Патрэба сялян у зямлі прымушала іх звяртацца да арэнды. Арэндныя цэны былі надзвычай высокімі. Так, за 1 дзес. луга плацілі 24 руб., пад азімую сяўбу — 10 руб. 40 кап., яравую — 9 руб. 40 кап.

У сялянскай гаспадарцы па-ранейшаму існавала традыцыйная трохпольная сістэма севазвароту, якая, па словах агранома 4-га ўчастка Гомельскага павета А. М. Міхайлава (ва ўчастак уваходзіла Веткаўшчына), з даўняга часу не ведала змен. Азімае поле селянін звычайна засяваў жытам, яравое — аўсом, ячменем, бульбай, льном, грэчкай. Трэцяе поле пакідалі незасеяным. Гэтае поле адначасова служыла выганам для скаціны. Гэты пералік сельскагаспадарчых культур быў бы няпоўным, калі б не ўлічвалася сяўба на прысядзібных кавалках клеверу, цімафееўкі, канопляў. Адну трэцюю частку ўсёй пашы займала жыта, затым — бульба, грэчка, лён. У Веткаўскай воласці лён у сялян іншы раз займаў да 50% усёй пасяўной плошчы. Гомельскі павет займаў першае месца ў Магілёўскай губерні па льнаводству. Дзесяціна льна давала да 100 руб. даходу, а іншы раз — і болей. Лён быў выключна сялянскай культурай.

У гаспадарках сялян рабіліся спробы пераходу на 4-польны севазварот.

Ураджаі асноўных культур на Веткаўшчыне хоць і перавышалі ўзровень другой паловы XIX ст., былі невысокія. Сярэдні ўраджай жыта з 1 дзес. складаў 50 пудоў (8 ц), бульбы — 400 пудоў (64 ц), грэчкі — 40 пудоў (6,4 ц), ячменю — 60 пудоў (9,6 ц), проса — 70 пудоў (11,2 ц), аўса — 50 пудоў (8 ц). У асобныя гады ўраджай быў вышэйшым. Так, у 1913 г. ураджай жыта быў роўны 70 пудам (11,2 ц), аўса — 100 пудам (16 ц), проса — 80 пудам (12,8 ц), бульбы — 600 пудам (96 ц). Ураджаю зерневых культур і бульбы ледзь-ледзь хапала для ўласных патрэб.

Руцінны характар мела сельскагаспадарчая тэхніка сялян. Зямлю апрацоўвалі пры дапамозе барон, сох, матык, плугоў. Сяляне лічылі, што з сахой конь ходзіць лягчэй, чым з плугам. Таму не часта імі карысталіся. Плугі, як правіла, былі мясцовай вытворчасці. Яны вараблялiся з матэрыялаў дрэннай якасці, вызначаліся не надта ўдалай канструкцыяй. Матыкамі акучвалі бульбу, апрацоўвалі прысядзібную зямлю, распрацоўвалі зямлю з-пад лесу.

Буйная рагатая жывёла ў асноўным разводзілася для атрымання гною. З-за дрэннага корму каровы толькі на працягу 6—8 тыдняў пасля ацёлу давалі малако. У такім жа стане была і свінагадоўля. Праўда, сяляне трымалі скаціну, па заключэнню земскіх спецыялістаў, у 1,5—2 разы болей, чым маглі пракарміць.

Натуральных сенакосаў у сялян, на думку тых жа спецыялістаў, было шмат, але сена збіралі мала. Сенакосы знаходзіліся ў першабытным стане. Іх нават не імкнуліся паляпшаць. Палі з травамі і караняплодамі для кармоў скаціне сустракаліся рэдка.

Значную працу па паляпшэнню сельскагаспадарчай вытворчасці ў сялян выконвалі земствы, дзейнасць якіх асабліва актывізавалася пасля 1913 г. Яны разам з

камісіямі па землеўладкаванню, якія ажыццяўлялі сталыпінскую рэформу на месцах, унеслі значны ўклад у развіццё сялянскай гаспадаркі. Гомельскае павятовае земства вяло працу па прапагандзе паляводства, жывёлагадоўлі, агародніцтва. У павеце працавала 5 інструктараў, земскі аграном. Яны займаліся паляводствам, жывёлагадоўляй, малочнай гаспадаркай, агародніцтвам. Земства праводзіла, у тым ліку і на Веткаўшчыне, вопыты з мінеральнымі і раслінными ўгнаеннямі. На ўгнаенне было раздадзена звыш 200 пудоў лубіну. Ствараліся спецыяльныя ўчасткі для ўнясення ўгнаенняў пад жыта, авёс, бульбу. На кожны ўчастак выдзялялася па 20 руб. Такія палеткі былі ў Пералёўцы, Свяцілавічах. Сярод мінеральных угнаенняў для вопытаў выкарыстоўвалі суперфасфат, калійную соль, чалійскую салетру, томасаў шлак ды іншыя. Ствараліся таксама пракатныя пункты сельскагаспадарчых прадметаў працы. Такі пункт быў створаны ў слабадзе Раманава. На ім былі прадстаўлены малатарні з прыводам, веялкі "Поспех" і сарціроўкі Робера, Вараксіна і "Змейка", дзве сямірадныя сеялкі Эльварта, сеялка "Кроун" для канюшыны, дзве бараны "Зіг-заг", два акучнікі, 2 плугі "Сухені", каранярэзка, саломарэзка, льномялка, льнотрапалка, лугавая барана Разеўскага. Амаль усе гэтыя механізмы даваліся сялянам у бясплатнае карыстанне, некаторыя – за плату. Ствараліся зернеачышчальныя пункты. Для сялян Гомельскага павета земства зрабіла сельскагаспадарчы склад. Прадметы працы і машыны прадаваліся з нацэнкай на 10%, што лічылася прымальнай, умеранай нацэнкай. Склад атрымаў ад земства 6,8 тыс. зваротных сродкаў. У крэдыт прадаваліся прылады, кошт якіх перавышаў 10 руб. Пры набыцці выплачвалася палова кошту, другая – праз паўгода. Машыны і прылады коштам да 100 руб. таксама прадаваліся ў крэдыт, але патрэбна было, каб валасное праўленне закінула слова. Але склад у асноўным абслугоўваў заможных сялян, беднякам такія пакупкі былі не па кішэні.

На ўзорных участках прапагандаваліся травасеянне, пасевы кармавых буракоў, турнэпсу, морквы. Розным чынам заахвочваліся лугаводства, агародніцтва, пчалярства.

Земствы на Веткаўшчыне займаліся і праблемамі жывёлагадоўлі. Для паляпшэння сялянскай гаспадаркі разводзілі бычкоў замежных і рускіх парод. На 1 студзеня 1914 г. у Гомельскім павеце было 39 такіх бычкоў, у тым ліку ў слабадзе Раманава – 4, Стаўбуне – 1, Свяцілавічах – 4, Завідаўцы – 4. Тыя з сялян, каму даставаліся быкі (а гэта былі заможныя сяляне), плацілі за іх карыстанне 25 руб. у год. Пасля некалькіх гадоў утрымання быкі пераходзілі ва ўласнасць сялян. Разводзілі таксама палепшаныя пароды свіней, авечак. Так, з 47 вепрукоў, набытых і размеркаваных Гомельскім павятовым земствам, 12 прыпадала на Веткаўшчыну, з 20 бараноў – 7. Сялянам Веткаўшчыны далі 7 жарабцоў. Жарабцы належалі да фінскай пароды, быкі – яраслаўскай, вепрукі – йоркшырскай і беркшырскай парод. Палепшаныя пароды жывёл звычайна давалі заможным сялянам, хутаранам, адрубчанам, якія былі ў стане пракарміць жывёлу. Праўда, у Гомельскім павеце быў найменшы лік хутарскіх і адрубных гаспадарак.

Магілёўская і Віцебская губерні, як і ўся Беларусь, ішлі наперадзе многіх рэгіёнаў Расіі па ажыццяўленню сталыпінскай аграрнай рэформы. Разбурэнне абшчыны адбывалася і на Веткаўшчыне. Але ж высяленне на хутары і адрубы тут ішло даволі марудна. Адной з прычын такой з'явы можна лічыць хранічнае малазямелле. Да высялення на хутары і адрубы былі схільны перш за ўсё шматзямельныя сяляне.

Немалое значэнне мелі і тыя абставіны,

што значная частка сялян Веткаўшчыны ўсё болей і болей далучалася да пабочных заробкаў — да саматужных і адыходных.

Сярод саматужных промыслаў, не заўсёды адасобленых ад заняткаў сельскай гаспадаркай, вылучаліся промыслы па апрацоўцы льну і асабліва пянькі. Веткаўская і Стаўбунская воласці ў гэтых адносінах былі прыкметнымі ў Гомельскім павеце. Пяньковы промысел быў вялікай дапамогай для сялян. З ім была звязана праца канатна-вяровачных прадпрыемстваў Веткі. Апрацаваная пянька паступала на гэтыя прадпрыемствы. У сялян, занятых трапаннем пянькі, не было спецыяльных майстэрняў. Працавалі ўсе, хто мог. Адны пралі, другія (слабыя жанчыны і дзеці) часалі пяньку ў гумнах. Зараблялі не надта многа. Атрымоўвалі ў дзень па 50—70 кап. Але да пачатку першай сусветнай вайны патрэба на канат і вяроўкі паменшылася. Заняпаду пяньковага промыслу садзейнічала таксама адкрыццё ў Парычах, Бярэзіне, Гомелі і Рагачове прадпрыемстваў па перапрацоўцы пянькі. Многія веткаўцы пачалі працаваць на гэтых прадпрыемствах.

Многа ўсялякіх саматужных промыслаў было ў Малых Нямках. Да ліку іх адносіўся экіпажны промысел. Займаліся ім выключна на заказ і толькі зімой. Заробак у год складаў прыкладна 20 руб. У гэтай жа вёсцы быў распаўсюджаны бондарскі промысел. Бондарскія работы выконваліся восенню і толькі пад заказ. У Малых Нямках займаліся і вытворчасцю дзёгцю, але заробак быў нязначным — 15—20 руб. у год. Сяляне таксама займаліся вытворчасцю воўны. Некаторыя саматужнікі мелі воўначасалкі. Заробак складаў 60 руб. у год. У Малых Нямках быў таксама развіты аўчынны промысел. Аўчыннікі працавалі выключна зімой па заказах мясцовых сялян. Зараблялі ў год да 70 руб. Малыя Нямкі на Веткаўшчыне вылучалі адзін з нешматлікіх цэнтраў сялянскай рамесніцкай вытворчасці.

У сяле Барталамееўка была наладжана такарная вытворчасць. Рабілі выключна калаўроты (самапрадкі). Майстэрняў у саматужнікаў не было, працавалі ў жылых дамах круглы год. Калаўроты рабілі як на рынак, так і на заказ. Зараблялі гэтыя майстры даволі значную суму — 500 руб. у год. У Свяцілавічах саматужнікі шылі абутак на заказ мясцовага насельніцтва. Заробак складаў 60—80 руб. у год. У тых жа Свяцілавічах каля 20 сялян-саматужнікаў займаліся ганчарным промыслам. Працавалі галоўным чынам зімой. Вырабы прадавалі сялянам, развозячы іх па вёсках, у рэдкіх выпадках збывалі на рынках. Заробак складаў да 80 руб. у год. Апрача Малых Нямкоў, бондарская вытворчасць развівалася ў сёлах вакол Веткі. У гэтых жа сёлах атрымоўвае развіццё і выраб цэглы.

На Веткаўшчыне сяляне займаліся таксама вырабам лубка, лыка. Атрымлівалі развіццё промыслы, звязаныя з вырабам вобадаў, спіц, палазоў для санак. Значнае развіццё меў кавальскі промысел, звязаны галоўным чынам з вытворчасцю сельскагаспадарчых прадметаў і дамашніх прылад. У в. Данілавічы два кавалі рабілі лёгкія плугі, сярпы, падковы, сякеры, долаты, акоўвалі колы для калёс.

Значнае месца ў жыцці веткаўскіх сялян займалі адыходныя промыслы. Вясной і летам сяляне ішлі на сплаў лесу. На працягу 2—3 месяцаў яны зараблялі ў сярэднім па 25 руб. Займаліся сяляне і падзённай працай у памешчыкаў і заможных сялян. Зімой ішлі на загатоўку дроў, пілавалі дошкі. Адпраўляліся ў бліжэйшыя гарады, дзе займаліся сталярствам, будаўніцтвам. Працягваў існаваць і такі промысел, як рамізніцтва. Сярод адыходных промыслаў выконваліся працы на бураковых плантацыях і цагельнях Украіны. Стараверы Веткі ішлі на будаўнічыя работы. “Летам веткаўскія стараве-

ры, – пісаў аўтар этнаграфічнага нарыса аб стараверах, – рассыпаюцца ў розныя бакі, зарабляючы хлеб на зіму. Восенню вяртаюцца дадому і Ветка ажывае".

На пачатку XX ст. сяляне Веткаўшчыны пачалі з'язджаць у замежныя краіны, асабліва ў ЗША. Земскі аграном, які працаваў на Веткаўшчыне, у сваёй справаздачы адзначаў, што едуць у асноўным маладыя людзі, а на вёсцы застаюцца старыя, жанчыны і дзеці. Сярод эмігрантаў было нямала і заможных сялян, таму што праезд у ЗША патрабаваў значных сродкаў. Сялянам даводзілася пераадольваць усялякія бюракратычныя перашкоды. Некаторыя шукалі дапамогі ў тайных пасрэдніцкіх кантор, якія за грошы садзейнічалі выезду за мяжу. Звычайна замежны адыход працягваўся 2–3 гады. За гэты час адыходнік скалочваў капітал у памеры 2–3 тыс. руб. і вяртаўся дахаты. Умовы працы ў ЗША былі цяжкімі. Аб сваім знаходжанні за мяжой адыходнікі не любілі расказваць, звычайна на роспыты адказвалі коратка: "З'ездзі, сам убачыш", а іншы раз дабаўлялі, што "ў нас коні так не працуюць, як мы там, у Амерыцы". З-за няведання мовы і адсутнасці прафесійных навыкаў адыходнікі ішлі на самыя цяжкія работы – на шахты, руднікі, домны.

Цяжкія матэрыяльныя ўмовы жыцця сялян Веткаўшчыны прымушалі іх перасяляцца ў Сібір, на Далёкі Усход. У пачатку XX ст. царскі ўрад раней рабіў перашкоды перасяленцам, а ў сувязі з будаўніцтвам і пачаткам эксплуатацыі сібірскай чыгункі пачаў дазваляць перасяленне сялян у Сібір. У 1903 г. дазвол на перасяленне ў Амурскую вобласць атрымала сям'я з в. Гутка Стаўбунскай воласці селяніна Д. К. Мельяненкава, у якой было 15 душ, у тым ліку жанатыя і замужнія дзеці. У прашэнні аб перасяленні галава сям'і пісаў: "Многія гады мы цярпелі страшэнныя нястачы па прычыне беднасці нашай зямлі, якую цяпер заносіць сыпучымі пяскамі. Не было такога года, каб мы мелі карысць з яе, хаця б на выплату казённых павіннасцей, не кажучы ўжо пра тое, каб забяспечыць хлебам сваю сям'ю; нам самім часта выпадае пакідаць свае бедныя хаціны ды ісці на бок шукаць заробкаў, якія ў нашы дні амаль перапыніліся". Просьба была выканана. Атрымалі дазвол на перасяленне ў Амурскую вобласць сяляне гэтай жа вёскі Н. І. Музыкін з сям'ёй у 14 душ і В. Т. Мелюкоў з сям'ёй у 12 душ. У 1901 г. з в. Пералёўка 12 сямей атрымалі дазвол пераехаць у Енісейскую губерню. У 1902 г. узбудзілі хадайніцтва аб перасяленні ў Новарасію 14 сямей з в. Акшынка. Толькі дзвюм сем'ям было адмоўлена ў перасяленні.

Прамысловасць Веткі не толькі характарызавалася сялянскімі рамесніцкімі промысламі. Да прамысловых прадпрыемстваў належалі вінакурныя заводы – Радужскі (уладальнік Харшуноў), Лужчынскі (С. П. Сенажынскі-Войніч), Баркоўскі (Буйно), Трэбаўшчанскі (Гергард), Шарсцінскі (Мяльжынскі), Хальчанскі (А. П. Сенажынскі-Войніч). Прыкладна палова ўсіх вінакурных прадпрыемстваў Гомельскага павета прыходзілася на Веткаўшчыну. На Веткаўшчыне налічвалася каля 40 паравых, вадзяных і ветраных млыноў. Згодна "Спісу населеных месцаў Магілёўскай губерні", прамысловыя прадпрыемствы на Веткаўшчыне былі ў Ветцы, Беседзі, Навасёлках, Хальчы, Барталамееўцы, Рэчках, Нова-Іванаўцы, Гарустах, Новых Грамыках, Несцераўцы, Стаўбуне, Малых Нямках, Пералёўцы, Янове, Вархулішчах, Свяцілавічах.

На пачатку XX ст. у Ветцы было 9 прадпрыемстваў па перапрацоўцы пянькі. Але гэта былі прадпрыемствы саматужнага тыпу. Сярод іх вылучалася канатная мануфактура. На ёй было занята звыш 50 рабочых. У Данілавічах мелася два цагельныя заводы. Цэгла выпальвалася толькі летам ад 20 да 25 тыс. штук на прадпры-

емстве. Прадавалася па 9 руб. за тысячу, іншы раз збывалася сырая цэгла — па 3 руб. за тысячу. Прыбытак ад такога прадпрыемства складаў 200 руб. у год.

Важнае месца ў жыцці Веткаўшчыны меў гандаль, якім займалася яўрэйскае насельніцтва і часткова стараверы. Апошнія працягвалі традыцыі сваіх папярэднікаў. Многія стараверы былі даволі заможнымі людзьмі, мелі ўласныя параходы і берліны. Яны займаліся сплавам драўніны, мелі склады солі, якую збывалі ў Чарнігаўскую губерню. Дробным гандлем у асноўным займаліся яўрэі, якія жылі ў Ветцы.

У цэлым гандаль паспяхова развіваўся, і Веткаўшчына на пачатку XX ст. мела актыўны гандлёвы баланс. У 1901 — 1903 гг. у сярэднім за год (без уліку гужавых перавозак) ракою адпраўлялася 550 тыс. пудоў розных грузаў, прывозілася 224 тыс. пудоў. Вываз пераўзыходзіў увоз амаль у 2,5 раза. Асноўную масу вывазу ракой складалі дровы, лясныя будаўнічыя матэрыялы. Лясныя матэрыялы сплаўляліся са Старога Сяла, Веткі, Беседзі, Свяцілавіч, Казацкіх Балсуноў. Ракой дастаўляліся на Веткаўшчыну ў асноўным хлебныя грузы і соль. Як і ў ранейшыя часы, Ветка заставалася месцам канцэнтрацыі саляных грузаў, якія развозіліся па Магілёўскай і Чарнігаўскай губернях. Таварааварот на рачных магістралях меў тэндэнцыю да росту. Перад першай сусветнай вайной вываз грузаў з Веткаўшчыны павялічыўся на 61,2%. У той жа самы час увоз тавараў меў тэндэнцыю да памяншэння.

Напярэдадні першай сусветнай вайны Гомель стаў найбуйнейшым цэнтрам вывазу льновалакна. Лён для Гомеля скуплівалі на агромністай прасторы, куды ўваходзіла і Ветка. Дробныя гандляры, у асноўным выхадцы з яўрэйскага асяродку, скуплялі валакно на вёсках, на кірмашах, а затым перапрадавалі буйным прадпрымальнікам. У адрозненне ад ільну ўся пяньковая маса ўраджаю ішла на перапрацоўчыя прадпрыемствы Веткі.

Унутраны гандаль сканцэнтраваўся на кірмашах, таргах, стацыянарных крамах. Кірмашы і таргі на пачатку XX ст. губляюць сваё значэнне. Але ў раёнах, аддаленых ад жыццёвых дарог, яны мелі важную ролю. Кірмашы праходзілі ў Ветцы, Свяцілавічах, Шарсціне, Хальчы, Новых Грамыках.

На пачатку XX ст. у сацыяльна-эканамічным жыцці Веткаўшчыны значную ролю мелі кааператыўныя ўстановы.

Функцыянавалі пазыка-ашчадныя таварыствы. На 1 студзеня 1914 г. у Ветцы былі Веткаўскае пазыка-ашчаднае таварыства, заснаванае ў 1905 г., і Веткаўска-Праабражэнскае таварыства, заснаванае ў 1911 г. У гэтым жа годзе падобная ўстанова адкрылася ў Стаўбуне.

У 1913 г. у Веткаўскім таварыстве налічвалася 679 членаў, у Веткаўска-Праабражэнскім — 635 і Свяцілавіцкім — 366 членаў. Баланс 3-х таварыстваў у 1913 г. складаў 9,15 тыс. руб. У гэтым жа годзе было выдадзена пазык на суму 172,5 тыс. руб. Пазыка-ашчадныя таварыствы займаліся прыёмам укладаў і выдачай пазык. За прадастаўленую пазыку выплачваліся працэнты. Так, за пазыку 150 руб. неабходна было, акрамя самой пазыкі, унесці яшчэ 12%. Пазыкамі, як правіла, магла карыстацца толькі невялікая частка членаў таварыства. Астатнія ў пошуках сродкаў звярталіся да ліхвяроў. Напярэдадні першай сусветнай вайны ўзнікла яшчэ адна крэдытная ўстанова — земская каса дробнага крэдыту з асноўным капіталам 35,5 тыс. Каса заснавана была Гомельскім павятовым земствам. За 150 руб., узятых у доўг, неабходна было ўнесці 8 — 10%, за 300 руб. — 7 — 10%.

НАРОДНАЯ АСВЕТА

На пачатку XX ст. значныя змены адбыліся ў народнай асвеце Веткаўшчыны.

Яны былі вынікамі тых новаўвядзенняў, якія з'явіліся ў сацыяльна-эканамічным жыцці Расіі ў выніку рэвалюцыі 1905 – 1907 гг. Рэвалюцыя высунула на пярэдні план грамадскага жыцця пытанне аб усеагульнай пачатковай асвеце. Гэтае патрабаванне падтрымлівалася партыямі розных арыентацый. У лютым 1907 г. Дзяржаўная Дума прыняла распрацаваны Міністэрствам адукацыі закон аб усеагульнай адукацыі, разлічаны на 10 гадоў. Размова ішла перш за ўсё пра ўвядзенне ўсеагульнай пачатковай адукацыі. Пасля прыняцця закона значна паскорылася будаўніцтва школ.

Як адзначалася вышэй, да пачатку XX ст. на Веткаўшчыне функцыянавала 12 пачатковых навучальных устаноў. У 1906 г. было адчынена народнае вучылішча ў Янове, царкоўнапрыходскія школы ў Беседзі, Радузе, Свяцілавічах, Тарасаўцы, Хальчы. Усяго на Веткаўшчыне было прыкладна 20 навучальных устаноў.

У час ажыццяўлення закона аб усеагульнай пачатковай адукацыі колькасць пачатковых школ узрасла. У 1912 г. існавала 29 народных вучылішчаў, з якіх 3 – з тэрмінам навучання 2 гады (Веткаўскае мужчынскае, Старасельскае, Старадубскае) і 26 – аднагадовых.

У Ветцы (мужчынскае вучылішча) і Старым Сяле меліся тры камплекты, у Стаўбуне, Данілавічах, Юркавічах, Янове, Будзішчах, Малых Нямках – 2 камплекты. Астатнія школы былі аднакамплектнымі. Усяго ў гэтых школах навучалася 1864 вучні, у тым ліку 392 дзяўчынкі (21%). У 1913 г. налічвалася 24 царкоўнапрыходскія школы, з якіх Кунтараўская, Раманаўская, Свяцілавіцкая, Хальчанская, Чыста-Лужская былі двухкамплектнымі. Усяго тут навучалася 1594 чалавекі, у тым ліку – 555 дзяўчынак. Такім чынам, на Веткаўшчыне напярэдадні першай сусветнай вайны было 53 пачатковыя вучэбныя ўстановы, у якіх навучалася 3458 дзяцей, у тым ліку – 947 дзяўчынак (27,4%).

Напярэдадні і пад час вайны земствы ажывілі сваю дзейнасць у галіне народнай адукацыі.

У 1915 г. у распараджэнне земстваў перайшлі фактычна ўсе школы Міністэрства адукацыі. Але фінансаванне школ ішло ў асноўным за кошт казны. Так, у 1911 г. на фінансаванне толькі 11 школ Веткаўшчыны было затрачана 9595 руб., з якіх 168,8 руб. (1,8%) прыходзілася на земствы. Школы ўтрымліваліся таксама за кошт вясковых таварыстваў. З 9595 руб. на гэтыя таварыствы прыпадала 2757 руб. (28,7%). Астатнія выдаткі несла дзяржава. У далейшым роля земства ў фінансаванні школ узрасла. Паводле пастановы Гомельскага земства сялянскія таварыствы вызваляліся ад выдаткаў на адукацыю.

Земствы займаліся і будаўніцтвам школ. Так, у 1912 г. будавалася школа ў Несцераўцы, у 1915 г. у Стаўбуне, Свяцілавічах, Рудні-Стаўбунскай, Рэчках, Хізах, Жалезніках, Старых Грамыках, Хальчы. Каб вывесці школы з асабістых дамоў і пашырыць школьную сетку, земствы пачалі выкупляць дамы і рабіць з іх школьныя будынкі. Адначасова павялічвалася колькасць настаўнікаў.

Для яўрэйскіх дзяцей, якія не наведвалі народныя вучэльні і тым больш царкоўнапрыходскія школы, пры сінагогах у Ветцы і Хальчы існавалі малітоўныя школы, дзе вывучаліся Тора і Талмуд. Дзеці найбольш заможных бацькоў далучаліся да свецкай адукацыі шляхам найму дамашніх настаўнікаў. Галоўная ўвага ў гэтых школах надавалася вывучэнню рускай мовы. Але ў справе асветы было і шмат недахопаў. Нягледзячы на дзейнасць мясцовых органаў самакіравання і дзяржаўных устаноў, значная частка пачатковых школ не мела ўласных памяшканняў, не хапала настаўнікаў. Так, у 1908 г., у першы год ажыццяўлення ўсеагульнай пачатковай

Белая Мікалаеўская царква ў в. Жалезнікі.

адукацыі, у Гомельскім павеце 20,5 тыс. дзяцей не былі ахоплены навучаннем.

На пачатку XX ст. рабіліся першыя крокі па развіццю прафесійнага навучання. У Ветцы існавала рамесніцкая школа, якая належала ганароваму грамадзяніну В. С. Дрыбніцкаму. Школу ён затым перадаў земству. У 1912 г. уладальнік маёнтка Рэчкі В. С. Быкаў перадаў магілёўскаму губернскаму земству 200 дзес. зямлі з пабудовамі для адкрыцця сельскагаспадарчага вучылішча. Праграма навучання прадугледжвала падрыхтоўку з сялянскіх юнакоў спецыялістаў па лугаводству і меліярацыі, малочнай гаспадарцы, сельскагаспадарчай тэхніцы, агранаміі.

Славутасцю Веткі на пачатку XX ст. стала бібліятэка, а таксама кнігарня, якая належала А. Я. Браўнд.

АХОВА ЗДАРОЎЯ

Існаваўшая сістэма аховы здароўя не магла задаволіць патрэб жыхароў Веткаўшчыны. У 1910 г. тут функцыянавалі толькі лячэбніцы ў Свяцілавічах і прыёмныя пакоі ў Ветцы і Рэчках, а таксама аптэка ў Ветцы. Насельніцтва між тым пакутавала ад розных хвароб, на першым месцы з якіх былі інфекцыйныя эпідэмічныя хваробы. Асабліва пакутавалі дзеці ад шкарлятыны і дыфтэрыі. Пры Свяцілавіцкай лячэбніцы быў адчынены фельчарскі пункт. Радыус дзеяння лячэбніцы складаў 20 км. За 1912 г. праз лячэбніцу прайшло 104 стацыянарныя хворыя і 15416 амбулаторных. Веткаўскі прыёмны пункт быў ператвораны ў лячэбніцу з прыёмным пунктам, пры якой дзейнічаў і фельчарскі пункт. Радыус дзеяння веткаўскай лячэбніцы і прыёмнага пункта складаў 20 км. У 1912 г. 76 хворых лячыліся ў Ветцы стацыянарна і 12103 — амбулаторна. Было зроблена 7 тыс. прышчэпак супраць воспы і прынята 56 родаў. Веткаўская лячэбніца ўяўляла сабой надта цеснае памяшканне ў драўляным доме, які ні ў якой

Данілавіцкая царква, пачатак XIX ст.

ступені не адпавядаў свайму прызначэнню. Таму не выпадкова гомельскае земства планавала купіць у Ветцы дом памешчыка Шлейфера з гаспадаркай за 33 тыс. руб. і ператварыць яго ў лячэбніцу. Але магілёўская губернская земская ўправа, маючы невялікія сродкі, урэзала адлічэнні для Гомельскага павета, у тым ліку і на будаўніцтва лячэбніцы. Гомельскае земства палічыла неабходным адкрыць лячэбніцу ў Ветцы, і ў 1912 г. у смеце з'явіўся артыкул аб набыцці зямлі для яе. Зямельны ўчастак для лячэбніцы быў ахвяраваны памешчыкам А. І. Брытавым-Кажамякіным. У 1915 г., ужо пад час вайны, на расходы па будаўніцтву Свяцілавіцкай бальніцы было адпушчана 880 руб. На Веткаўскую накіроўвалася 6659 руб., у тым ліку на ежу 1550 руб. Для састарэлых і бездапаможных жыхароў Гомельскага павета ў Ветцы меркавалі адчыніць багадзельню.

ВЕТЭРЫНАРНАЯ СЛУЖБА

Першыя крокі рабіла і ветэрынарная служба. У Ветцы знаходзіўся адзін з трох ветэрынарных участкаў Гомельскага павета. За ім было замацавана 21,3 тыс. коней, 25,6 тыс. буйной рагатай жывёлы, 22,9 тыс. коз, 15,7 тыс. свіней. Участкам кіраваў ветурач, быў таксама і ветэрынарны фельчар. Жывёлы хварэлі сібірскай язвай, чумой. Ад хвароб гінула ад 5 да 15 % пагалоўя. У Ветцы была ветэрынарная лабараторыя, якая знаходзілася ў кватэры ветурача. Земства палічыла патрэбным пабудаваць у Ветцы ветлячэбніцу, а таксама ў Свяцілавічах або ў Стаўбуне ветэрынарны фельчарскі пункт.

КАНФЕСІІ НА ВЕТКАЎШЧЫНЕ

Па-ранейшаму рэлігійнае жыццё складала важны накірунак у ідэалагічных адносінах на Ветцы. Пануючым было праваслаўе. Яго цэрквы і часоўні былі больш чым у 20 населеных пунктах Веткаўшчыны. У 6 месцах, у тым ліку і ў Ветцы, дзейнічалі культавыя ўстановы старавераў. Ветка ператварылася ў своеасаблівую староверскую Мекку. У Ветцы на пачатку XX ст. жыло да 2 тыс. старавераў. У асноў-

[illegible] яны складалі гандлёва-прамысловае насельніцтва, жылі даволі забяспечана. Дамы іх адрозніваліся ад аналагічных пабудоў сялян, яўрэяў, былі са светлымі і прасторнымі пакоямі, з 3—5 вокнамі, якія выходзілі на вуліцу. Двары былі абнесены высокім плотам, у кожным былі добрыя вароты з дахам і веснічкамі. Вокны, вароты, платы ўпрыгожваліся разнастайнай прыгожай драўлянай разьбой.

Захаваліся на пачатку XX ст. і культавыя будынкі каталікоў: касцёлы і капліцы ў Рудні-Шлягінскай, Рудні-Стаўбунскай, Ухове. У мястэчках Ветка, Хальч, Шарсціи існавалі яўрэйскія сінагогі. У самой Ветцы была яўрэйская дабрачынная грамада, якая займалася апякунствам бедных, састарэлых людзей.

Х. Ю. Бейлькін.

Грамадскі зрух на Веткаўшчыне

Прыкметнай з'явай на пачатку XX ст. на Веткаўшчыне стаў рабочы і сялянскі рух. Адной з прычын гэтага была тэрытарыяльная блізкасць да Гомеля, які ў канцы XIX — пачатку XX ст. стаў буйным прамысловым цэнтрам Беларусі. У Гомелі ў 1895—1896 гг. дзейнічала 5 рабочых гурткоў. Група кіраўнікоў гэтых гурткоў (І. Захарын, В. Фядотаў, Г. Калашнікаў) праводзіла сустрэчы моладзі і ў Ветцы. У 1898—1900 гг. у Ветцы ўжо функцыянаваў свой рабочы гурток. У 1900 г. ён быў выяўлены жандарамі, а яго ўдзельнікі арыштаваны. Начальнік Магілёўскай жандарскай управы падпалкоўнік Уласьеў быў занадта самаўпэўнены, калі сцвярджаў, што пасля арышту рабочага руху ў Ветцы больш не існуе. Ужо ў 1902 г. у Ветцы адбылася эканамічная забастоўка.

У Ветцы панаваў бундаўскі накірунак у сацыял-дэмакратычным руху. У 1903 г., як бачна з матэрыялаў Магілёўскай жандарскай управы, былі гурткі яўрэйскай моладзі, якія займаліся распаўсюджваннем сацыял-дэмакратычных ідэй. У 1903 г. бундаўскія групы арганізавалі некалькі палітычных выступленняў. 1 сакавіка, у дзень 22-й гадавіны трагічных падзей, звязаных з забойствам Аляксандра II, адбыўся мітынг, на якім услаўлялася дзейнасць герояў "Народнай волі". Мітынг адбываўся пад чырвоным сцягам і суправаджаўся спевамі рэвалюцыйных песень. У знак салідарнасці з рабочымі Златауста адбылася забастоўка і вулічная дэманстрацыя. У забастоўцы прынята ўдзел большасць рабочых Веткі. Была і палітычная забастоўка салідарнасці з рабочымі Растова-на-Доне. 1 мая адбылася дэманстрацыя, у якой удзельнічалі амаль усе рабочыя мястэчка. З 20 палітычных забастовак, якія адбыліся ў Беларусі ў 1903 г., 2 забастоўкі прыходзіліся на Ветку. Не выпадкова кіраўніцтва Бунда далучала Ветку разам з Лоддзю, Смаргонню, Гомелем, Вільняй да буйных цэнтраў рэвалюцыйнага руху.

У лютым 1904 г. у Ветцы былі раскіданы пракламацыі, накіраваныя супраць руска-японскай вайны. 1 мая гэтага ж года ў Ветцы адбылася невялікая забастоўка рабочых. Актывізаваліся эсэры. Яны належалі да Гомельскай арганізацыі. Эсэры выкарыстоўвалі тэрарыстычныя метады барацьбы. Яны забілі ў Ветцы трох чалавек, у тым ліку аднаго з-за падазрэння ў здрадзе пры допыце. Эсэры знішчылі ў маёнтку Шлейфера 2 дзес. маладога саду, гаспадарчыя пабудовы памешчыка, запасы сена і саломы. Двое эсэраў у Ветцы хадзілі па дамах багатых купцоў і патрабавалі значныя сумы, пагражаючы пры гэтым зброяй. Было зроблена нападзенне на жандарскага унтэр-афіцэра.

У 1901—1904 гг. у Ветцы адбыліся 4 эканамічныя забастоўкі, 3 палітычныя, у якіх прымала ўдзел 270 чалавек, 1 дэманстрацыя (100 чалавек удзельнікаў), 2 маніфестацыі (142 чалавекі).

Рабочыя, рамеснікі Веткі прымалі ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905 г. Яны выступілі з пратэстам супраць крывавых падзей 9 студзеня 1905 г. у Пецярбургу. 24 студзеня ў Ветку прыехаў гомельскі сацыял-дэмакрат землямер Іван Мохаў. З некалькімі таварышамі ён накіраваўся на вяровачна-канатны завод Мебеля. У Ветцы адбылася дэманстрацыя пад лозунгамі "Далоў самадзяржаўе!", "Далоў вайну!". Дэманстрацыя была разагнаная, Мохаў —

арыштаваны. Хутка дэманстранты зноў сабраліся і накіраваліся да дому прыстава, каб вызваліць Мохава. Ад дома прыстава дэманстранты пайшлі на кірмашовую плошчу. Дэманстрацыя пачала набываць даволі значны характар. Жыхары Веткі выйшлі на вуліцу і назіралі за такой незвычайнай з'явай. Як толькі дэманстранты параўняліся з чайнай, дзе стаяла група старавераў, прыстаў, які ішоў на канцы калоны, звярнуўся да старавераў з просьбай уціхамірыць дэманстрантаў, якія хочуць зрабіць "жыдоўскае царства" (дарэчы, сярод дэманстрантаў яўрэі складалі меншасць). "Цёмная маса", як называе групу старавераў аўтар артыкула аб падзеях у Ветцы, рушыла на мірную дэманстрацыю з каламі, дубінамі, а былы мяшчанскі староста Іван Скарабагатаў – з нажом. З натоўпу дэманстрантаў прагучаў стрэл, які быў сігналам, каб удзельнікі дэманстрацыі разышліся. Але тут пачалася сапраўдная расправа. Дэманстрантаў хапалі і збівалі да паўсмерці. Не шкадавалі і жанчын. За расправу над мірнай дэманстрацыяй прыстаў даў старавераm 5 руб. на гарэлку. Ён не пагрэбаваў выкарыстаць у сваёй бруднай справе і дзяцей. Дзецям, якія паказвалі месцы, дзе хаваліся дэманстранты, прыстаў жменямі сыпаў медзь "за заслугі". Было арыштавана 18 удзельнікаў дэманстрацыі. Калі сталага ўзросту чалавек Малееў прыйшоў да прыстава, каб даведацца пра лёс чатырох арыштаваных дзяцей, апошні збіў яго. 25 студзеня ў Ветку прыехаў павятовы спраўнік Яленскі з казакамі. Ён паклікаў да сябе некалькі яўрэяў і патрабаваў 60 рублёў для казакоў. Але тыя адмовіліся дапамагаць казакам.

Падзеі 24 студзеня выклікалі жывы водгук у веткаўчан, якія патрабавалі вызваліць арыштаваных. Усяго ў студзеньскіх падзеях у Ветцы ўдзельнічала 2 тыс. чалавек, у тым ліку не менш 350 рабочых. У Ветцы для барацьбы з рэвалюцыйным рухам быў пакінуты атрад казакоў колькасцю 25 чалавек, які знаходзіўся там да снежня 1905 г. і быў выведзены для падаўлення забастоўкі ў Гомелі.

20 чэрвеня 1905 г. у Ветцы адбыўся масавы палітычны мітынг, на якім прысутнічала да 2 тыс. чалавек. На мітынгу з прамовай выступіў прадстаўнік Палескага камітэта РСДРП, які казаў пра неабходнасць спынення руска-японскай вайны і скліканне Устаноўчага сходу на аснове ўсеагульнага, прамога і роўнага выбарнага права з тайнай падачай галасоў. Паліцыя пабаялася зрабіць які-небудзь націск на мітынгоўшчыкаў.

У рэвалюцыйных падзеях 1905–1907 гг. прынялі ўдзел і сяляне Веткаўшчыны. Асабліва вялікі размах гэтага руху назіраўся летам 1905 г. Выступленні сялян адбываліся ў Закружжы, Навасёлках, Прысно, Юркавічах, Старым Сяле, Кунтараўцы, Данілавічах, Рудні-Шлягінскай і інш. месцах. Выступленні мелі ярка выражаны антыпамешчыцкі характар. У в. Юркавічы сяляне-батракі, якія працавалі ў памешчыка Капцелева, патрабавалі павелічэння зарплаты да 1 руб. у дзень. Яны адмаўляліся выходзіць на працу і пагражалі не дапусціць працаваць іншых батракоў. У в. Рудня-Шлягінская сяляне самавольна пасвілі жывёлу на пашах памешчыка Быкава. Сяляне Старога Сяла захапілі луг памешчыка і падзялілі яго паміж сабой. Сяляне вёсак Навасёлкі і Кунтараўка з'явіліся ў маёнтку Войніч-Сенажынскіх, які здаваўся ў арэнду, і патрабавалі ад арандатара выдаліць з маёнтка ўсіх батракоў, месцы якіх яны б хацелі заняць. Пры гэтым патрабавалі, каб арандатар плаціў ім 1 руб. у дзень. Калі іх патрабаванні не былі выкананы, яны прагналі з сенакосу наёмных рабочых, занялі іх месцы і дабіліся патрабуемай аплаты працы. У в. Закружжа сяляне настойвалі на вяртанні ім ад памешчыка Даўгова-Сабурава 40 дзес. зямлі, якая з-за памылкі землямера насуперак устаўнай граматы была аддадзена памешчыку. Выбраныя ад сялян 2 чэрвеня патрабавалі вярнуць ім зямлю, папярэдзіўшы, што калі да 8 чэрвеня зямля не будзе вернута, яны забяруць яе сілай. Таксама яны настойвалі на замене працы наёмных батракоў мясцовымі сялянамі. Для падаўлення сялянскіх выступленняў у Гомельскім павеце, які ў гэтым плане вылучаўся ва ўсёй Магілёўскай губерні, была накіравана экспедыцыя пад кіраўніцтвам віцэ-губернатара Ладыжэнскага. 8 ліпеня 1905 г. па прыбыцці ў Навасёлкі ён сабраў сход з прадстаўнікоў сялян Веткаўскай, Пакалюбіцкай і Рэчкаўскай валасцей. Тут жа, на сходзе, было арыштавана 8 сялян, абвінавачаных у падбухторванні да паўстання. 9 ліпеня віцэ-губернатар з войскам быў у Закружжы. Сямёра сялян было арыштавана, што выклікала незадаволенасць астатніх. Тады Ладыжэнскі

ля навядзення "парадку" загадаў пакараць чатырох сялян — нанесці па 25 удараў розгамі кожнаму. Восенню 1905 г. у в. Нямкі і м. Хальч для барацьбы з сялянскімі паўстаннямі было ўведзена па роце салдат. У лістападзе 1905 г. у Стаўбунскай воласці адбылося нападзенне сялян на маёнтак памешчыка Брытава. Выступленне было падаўлена ўведзенай ротай салдат. Паліцыя арыштавала "зачыншчыкаў", але сялянне аказалі актыўнае супраціўленне, спрабавалі сілай вызваліць арыштаваных, але былі разагнаны салдатамі. У 1905 г. сялянскія выступленні адбыліся ў с. Рэчкі, с. Ухове. У Радузе сярод сялян распаўсюджваліся лістоўкі. Шырокі размах на Веткаўшчыне ў 1905 г. атрымаў батрацкі рух, які праходзіў у значнай меры пры ўдзеле сацыял-дэмакратаў Веткі.

Рэвалюцыйныя выступленні сялян працягваліся і ў наступныя гады. Восенню 1906 г. сяляне ў маёнтку Хальч высеклі 2 тыс. садовых дрэваў, тлумачачы свой учынак тым, што сады загароджвалі ўсю зямлю, тады як сялянам літаральна не было куды выгнаць курыцу. У 1906 і 1907 гг. сялянскі рух пайшоў на спад. Магілёўскі губернатар у справаздачы пару за 1907 г. адзначаў, што ў Гомелі і Гомельскім павеце, які характарызаваўся як цэнтр злачыннай прапаганды, рэвалюцыйныя выступленні сталі рэдкімі. Тым не менш у данясенні начальніка жандарскай управы Мінскай губерні ў дэпартамент паліцыі адзначалася, што адбылася забастоўка сялян вёскі Малыя Нямкі Стаўбунскай воласці. Сем рабочых па загаду бабруйскага паліцмайстра былі арыштаваны і пасаджаны пад ахову.

Цяжкім выпрабаваннем для працоўных Веткаўшчыны, як і ўсёй Беларусі, стала першая сусветная вайна, якая пачалася ў ліпені 1914 г. Хутка Магілёўская губерня была аб'яўлена на ваенным становішчы. Імянным указам Мікалая II губерня далучалася да ліку тых, у якіх была аб'яўлена мабілізацыя аналчэння 1-га разраду. У некаторых сёлах Веткаўшчыны палова мужчынскага насельніцтва была ўзята ў войска. Праходзілі рэквізіцыі жывёлы і фуражу ў сялян. Так, на 27 лютага 1917 г. была аб'яўлена рэквізіцыя коней у Веткаўскай, Вылеўскай, Рэчкаўскай, Пакалюбіцкай і Стаўбунскай валасцях.

У гады вайны многія сялянскія гаспадаркі, у тым ліку і хутарскія, развальваліся. Так, у 1915 г. за нявыплату тэрміновых плацяжоў Сялянскаму банку прадавалася ўрочышча Дубкі пры маёнтку Рэчкі, якое належала хутараніну. Прыходзілі ў занядбанне і некаторыя маёнткі. Так, няспраўным плацельшчыкам Магілёўскага аддзялення Дваранскага банка быў аб'яўлены уладальнік маёнтка Ветка Шлейфер. За пазычаныя 1775 руб. яму трэба было прадаць з таргоў 429 дзес. зямлі.

Працоўныя пакутавалі ад непамерна высокіх цэн. На жыта яны выраслі ў 4 разы, на жытнюю муку — у 2,7, на ячмень — у 3,2, на авёс — у 3, на сала — у 2,9, на масла — у 4,1, на мяса — у 3, на бульбу — у 3,4 раза.

Сусветная вайна абвастрыла супярэчнасці ў грамадстве. Нягледзячы на ваенны час, мелі месца выступленні сялян супраць памешчыкаў. Пачаліся самавольныя высечкі панскага лесу. Не выпадкова абарона лясоў стала важнай справай мясцовых уладаў. Так, Магілёўскі лесаахоўчы камітэт далучыў частку лясной дачы ўладальніка маёнтка Хальч С. А. Войніч-Сенажынскага плошчай 156 дзес. да ліку ахоўных лясоў. У Ветцы адбылася сутычка салдат з паліцыяй і патрулямі.

Перамога лютаўскай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі прывяла да ажыўлення грамадска-палітычнага жыцця на Веткаўшчыне. У другой палове сакавіка 1917 г. у Гомель са ўсяго павета, у тым ліку і Веткаўшчыны, прыбылі дэлегаты для арганізацыі сялянскага саюза. Дэлегаты віталі паражэнне самадзяржаўя, выказваліся за арганізацыю моцнага і ўплывовага саюза, які павінен быў займацца гаспадарчымі і культурнымі пытаннямі. Але на сходзе даволі моцна прагучалі патрабаванні сялян аб надзяленні іх зямлей за кошт казённых і панскіх зямель.

Як і ў другіх паветах, на Веткаўшчыне пачалі стварацца Саветы. У Ветцы спачатку ўзнік Савет рабочых і салдацкіх дэпутатаў. 18 чэрвеня ён арганізаваў мітынг, на якім была прынята рэзалюцыя аб даверы Часоваму ўраду і аб устанаўленні кантролю над вытворчасцю. Функцыянаваў таксама Савет сялянскіх дэпутатаў. Хутка Саветы аб'ядналіся і ў Ветцы пачаў дзейнічаць Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Адначасова ў вёсках пачалі ўзнікаць сялянскія камітэты. Сярод салдат сфарміраваліся батарэйныя камітэты.

Адначасова на Веткаўшчыне ўзніклі разнастайныя грамадскія і партыйныя арганізацыі.

У Ветцы пачаў дзейнічаць прафесійны саюз. Працавала бундаўская арганізацыя, якая аб'ядноўвала яўрэйскіх рабочых. Гэтыя арганізацыі прадстаўлялі інтарэсы рабочых і дробнабуржуазных пластоў насельніцтва. Арганізацыі меншавікоў і бальшавікоў адсутнічалі. У чэрвені 1917 г. пачалося стварэнне эсэраўскай групы.

21 мая ў Гомелі ў палацы князя Паскевіча адбыўся павятовы сялянскі з'езд, які абраў Гомельскі Савет сялянскіх дэпутатаў. Ад Веткаўшчыны ў яго ўвайшоў П. Рабаў. 25 чэрвеня ў Гомелі пачалася 1-я канферэнцыя раённага камітэта Гомельскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў, на якой было 3 прадстаўнікі ад Веткі. На канферэнцыі выступіў эсэр Малееў. Ён рэзка крытыкаваў веткаўскі харчовы камітэт, які займаўся галоўным чынам спекуляцыяй і не аказваў дапамогі насельніцтву. Канферэнцыя выказалася за падтрымку Часовага ўрада і аб'яўленай ім "пазыкі свабоды".

Часовы ўрад не рабіў рэальных крокаў для вырашэння сялянскага пытання, адкладваючы яго да склікання Устаўнага сходу. Але сяляне не хацелі мірыцца з уціскам, які існаваў пры памешчыцкім землеўладанні. Паўсюдна ў Гомельскім павеце сяляне самачынна пачалі захопліваць землі памешчыкаў, секчы панскі лес. Дзеянні гомельскай міліцыі не маглі ўжо спыніць сялянскі рух.

Х. Ю. Бейлькін.

ЛІТАРАТУРА:

Абрамов И. Старообрядцы на Ветке. СПб., 1907. С. 9.

Бейлькин Х. Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии. М., 1989.

Бич М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861 – 1904 гг. Мн., 1983.

Денежный отчет Гомельской уездной земской управы. Гомель, 1913.

Доклад Гомельской уездной управы 2-му уездному земскому собранию. Гомель, 1912.

Доклады Гомельской уездной земской управы 1-му очередному уездному земскому собранию (октябрь 1911 г.). Гомель, 1911.

Журнал агрономического совещания при Могилевской земской управе. Могилев, 1913.

Журнал Гомельского первого очередного уездного земского собрания. Октябрьская сессия 1911 г. Могилев, 1912.

Кищенко Г. А. Крестьянское хозяйство в Сурожском уезде Черниговской губернии по двум переписям – 1882 и 1911 г. Чернигов, 1916.

Народное образование Могилевской губернии за 1912 – 1913 учебный год. Могилев, б/г.

Обзор Могилевской губернии за 1911 г. Могилев.

Отчет Гомельской уездной земской управы по агрономическим мероприятиям за 1913 г. Гомель, 1914.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1912 год. Могилев, 1911. Отд. 3.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988.

Революционное движение в Белоруссии 1905 – 1907 гг. Мн., 1955.

Революционные события в Гомеле и Гомельской области в годы первой русской революции 1905 – 1907 гг. Гомель, 1955.

Список всех потребительских обществ в России как действующих, так и закрывшихся на 1 января 1912 г. СПб., 1912.

Статистический сборник МПС. СПб., 1903. Вып. 71; СПб., 1904. Вып. 75; СПб., 1905. Вып. 79; Спб., 1906. Вып. 83; Спб., 1907. Вып. 87; СПб., 1908. Вып. 91; Спб., 1909. Вып. 100; Спб., 1910. Вып. 104; СПб., 1911. Вып. 109, ч. 1; СПб., 1912. Вып. 120; Спб., 1913. Вып. 127, ч. 1; СПб., 1915. Вып. 113; СПб., 1916. Вып. 139.

Шабуня К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905 – 1907 гг. Мн., 1962.

1917

1941

НА КРУТЫМ ПАВАРОЦЕ ГІСТОРЫІ

Працягвалася першая сусветная вайна. З самага яе пачатку ў Ветцы стаяў 3-і запасны артылерыйскі дывізіён, які рыхтаваў папаўненне франтам. У дывізіёне афіцэры і малодшыя чыны былі прыхільнікамі кадэцкай партыі. Сярод салдат панавалі эсэраўскія настроі. "...І толькі два чалавекі, — піша ў сваіх успамінах веткаўчанін Іван Герасімавіч Малееў, — вольнанаёмны зубны ўрач Злотнікаў (меншавік) і яфрэйтар Банцэрэш (бальшавік) выступалі супраць кадэтаў".

Мясцовая буржуазія і памешчыкі вітали лютаўскую рэвалюцыю "гарачымі прамовамі", але пры гэтым прыкладалі ўсё старанне, каб пагасіць рэвалюцыйны запал рабочых і салдат.

Асабліва з "захапленнем" рэвалюцыю вітала местачковая "знаць": дробны памешчык, ён жа міравы суддзя Рошчын, страхавы агент Чарняўскі, камерсанты Гусакоў і Калашнікаў, лесапрамысловец Якерсберг і інш.

2 сакавіка 1917 г. местачковая буржуазія выбрала "Камітэт грамадскай бяспекі і дабрабыту". 3 сакавіка ў Ветцы прайшоў агульнаместачковы мітынг пад лозунгамі: "Далоў вайну!", "Міру і хлеба!". 4 сакавіка выбралі першы часовы Савет салдацкіх, рабочых і сялянскіх дэпутатаў на чале з Яўгенам Максімавічам Седляровым. У Савеце была большасць прадстаўнікоў левых эсэраў, меншавікоў і кадэтаў. Таму Савет практычнай работай не займаўся, а абвяшчаў лозунгі і заклікі.

Такім чынам, веткаўскай буржуазіі ўстанавіць адзінаўладдзе не ўдалося, але створаны ёю Камітэт настойліва праводзіў палітыку Часовага ўрада, у чым яго актыўна падтрымлівалі мясцовыя арганізацыі правых палітычных партый. Гэта дазваляла буржуазіі ігнараваць сацыяльныя патрабаванні рабочых і сялян. Адказ у іх быў адзін: "Не можам. Працуем дзеля абароны, дзеля перамогі над кайзераўскай Германіяй". А між тым у воласці расло беспрацоўе, збяднение і разарэнне людзей. Канфлікт паміж рабочымі і гаспадарамі прадпрыемстваў, сялянамі і памешчыкамі, салдатамі і афіцэрамі ўзмацняўся.

Лютаўская 1917 г. рэвалюцыя абнадзеіла рабочых, сялян і салдат у хуткім рашэнні пытанняў міру, зямлі і волі. Рэчаіснасць аказалася іншай. Сяляне паранейшаму заставаліся палітычна бяспраўнымі. Мясцовыя памешчыкі валодалі тысячамі дзесяцін зямлі, а сялянскія гаспадаркі заставаліся малазямельнымі і збяднелымі.

У в. Прысно памешчык Дрыбінцаў меў пры сядзібе ў маёнтку (в. Барчанкі) 2500 дзесяцін зямлі, а ў 500 сялянскіх гаспадарках іх было 2300 дзесяцін. Толькі за арэнду зямлі сяляне плацілі гэтаму памешчыку штогод па 500 і болей пудоў хлеба. Не лепшым было становішча сялян і ў іншых маёнтках. У воласці ўжо напярэдадні лютаўскай рэвалюцыі без пасеваў альбо з пасевамі ў 1—2 дзесяціны было 41,64% гаспадарак, а на адзін сялянскі двор у

воласці прыпадала ўсяго па чвэрці дзесяціны зямлі на едака. Гэта і на палову не забяспечвала патрабаванні сялянскай сям'і. Цяжкім ярмом заставаліся павіннасці сялян капаць акопы, будаваць бліндажы, рамантаваць масты і дарогі і іншыя прымусовыя работы на вайну. Разбуралі гаспадаркі рэквізіцыі коней, буйной рагатай жывёлы, свіней, авечак, хлеба і фуражу. Людзі няўхільна даводзіліся да галечы, а то і голаду.

У сёлах і вёсках воласці яшчэ доўга пасля рэвалюцыі праследавалі ўсіх, хто хоць што-небудзь гаварыў пра звяржэнне самадзяржаўя. Нягледзячы на пастанову сінода царкоўнікі прызывалі маліцца за цара і захаванне старога ладу. Для расправы з сялянамі ў вёскі пасылаліся пераапранутыя ў салдацкія шынялі паліцэйскія, у абавязку якіх было "...захаванне рэвалюцыйных заваёў народа".

У сваіх успамінах ураджэнец Веткаўшчыны Андрэй Андрэевіч Грамыка пісаў: "...в деревне далеко не все понимали, что такое "власть" ...Но сразу после революции не стало слышно колокольчика станового пристава. Исчез и урядник... К приставу и уряднику крестьяне всегда относились с опаской. Но особая боязнь у крестьян еще долго сохранялась к царю — а вдруг вернется царь, что тогда будет?"

Бязлітасная рэчаіснасць красавіка — мая 1917 г. неаднойчы падымала сялян. Разам з рабочымі яны грамілі валасную ўправу, арыштоўвалі сельскіх стараст і пісараў, стражнікаў і ўраднікаў. У дамах сельскіх актывістаў кіпелі спрэчкі. Сходы зацягваліся да світанку. Адны настойвалі на неадкладным раздзеле панскай зямлі і маёмасці, іншыя заклікалі чакаць Устаноўчага сходу. І ўсё ж асноўная маса сялян воласці заставалася пасіўнай і ў палітычную барацьбу ўключалася надзвычай марудна, чакаючы, што Часовы ўрад сам вырашыць зямельнае пытанне ў іх інтарэсах. А новая ўлада не спяшалася.

У валасцях ўзнікалі так званыя зямельныя камітэты. Але на Веткаўшчыне такія камітэты не сталі нізавымі органамі буржуазнай ўлады. Сяляне проста праігнаравалі іх, самавольна захоплівалі і дзялілі паміж сабой панскія землі, сенажаці, жывёлу, інвентар, разбуралі радавыя маёнткі.

Улады спрабавалі спыніць развіццё сялянскага руху. Урад патрабаваў ад губернскай і павятовай адміністрацыі "прыняць рашучыя меры аж да ваеннай сілы"для падаўлення сялянскіх беспарадкаў. Аднак гэта не спыніла рашучых выступленняў беднаты і рабочых Веткаўшчыны. У маі і чэрвені 1917 г. у вёсках, дзе сялянскія камітэты складаліся з беднаты і батракоў, ствараліся сялянскія Саветы. Яны цалкам бралі на месцах уладу ў свае рукі. Першы з'езд сялян Веткаўскай воласці прайшоў у маі 1917 г. У прынятым рашэнні было запісана: "...раздаць частку памешчыцкай зямлі і сенажацяў сялянам, якія жывуць у нястачы". Усе сельскія камітэты не толькі прынялі рашэнне гэтага з'езду да выканання, але на практыцы "развілі прынятыя рашэнні і пайшлі далей".

Актыўна дзейнічалі і веткаўскія рабочыя. 20 чэрвеня 1917 г. па ініцыятыве мясцовых палітычных дзеячаў стварылі першы аб'яднаны прафсаюз. У яго склад ўвайшлі: Іван Герасімавіч Малееў (старшыня), рабочыя Злата Лапіна, Сямён Полацкі (сакратар), Люба Мадорская і Рахіль Шулькіна. Тады гэта была адзіная ў Ветцы рабочая прафсаюзная і палітычная арганізацыя.

Прафсаюзнікі стварылі свой рабочы кааператыў "Зара". Цэны на тавары тут былі значна ніжэйшыя, чым у "граблаўках", як веткаўчане называлі мясцовых кааператараў.

У канцы чэрвеня 1917 г. у Ветцы і воласці прайшлі выбары новага складу Савета. У ходзе кампаніі ўсюды ўспыхвалі адкрытыя спрэчкі. Незалежна ад палітычных поглядаў прамоўцаў, усе яны выказвалі незадаволенасць сусветнай вайной. Асабліва востра гэта гучала ў вуснах салдат-франтавікоў. У склад Веткаўскага Савета рабочых, салдацкіх і сялянскіх

дэпутатаў другога склікання выбралі Івана Герасімавіча Малеева, Сяргея Герасімавіча Малеева, Мітрафана Фадзеевіча Малеева, прапаршчыкаў Іларыёна Шацілава, Лазара Кушнярова, І. Я. Дадзіомава, Ф. І. Жукава, Г. Ф. Селькіна, А. А. Ганчарова, М. Кеніна і іншых. Старшынёй Саўдэпа стаў Іван Герасімавіч Малееў, сакратаром – Лазар Яўгеньевіч Кушняроў.

Расстрэл мірных дэманстрацый 3 і 4 ліпеня ў Пецярбургу і Маскве выклікаў масавы пратэст веткаўчан і салдат мясцовага гарнізона. У верасні 1917 г. у воласці прайшлі перавыбары зямельных камітэтаў. У новы іх склад сяляне выбралі тых, хто неадкладна быў гатовы рашаць пытанні пра зямлю, хто стаяў за неадкладнае склікание ўстаноўчага сходу. Рабочыя явачным парадкам уводзілі на прадпрыемствах васьмігадзінны рабочы дзень. У Ветцы стварыўся першы саюз рабочай і сялянскай моладзі, якім кіраваў Іван Дзянісавіч Баравіцкі.

Восенню 1917 г. у вёсках Хальч, Беседзь, Кунтараўка, Навасёлкі, Малыя Нямкі, Радуга камітэты вясковай беднаты яшчэ да Кастрычніцкай рэвалюцыі дазволілі сялянам практычна поўнасцю распараджацца памешчыцкай зямлёй.

28 жніўня 1917 г. у Ветцы ў знак пратэсту супраць ваеннага мяцяжу генерала Карнілава прайшоў запіс добраахвотнікаў у чырвонагвардзейскі атрад. 29 жніўня пры Саўдэпе пачала дзейнічаць "Надзвычайная чацвёрка". У яе ўвайшлі А. Ганчароў, П. Асмалоўскі, С. Малееў, Л. Кушняроў. З Гомеля прыйшоў зварот "актыўна змагацца з карнілаўскім мяцяжом, здраднікамі народа і крывапійцамі". Прынятыя меры былі вельмі своечасовымі. Справа ў тым, што камандзір размешчанага ў Ветцы артдывізіёна палкоўнік Фёдараў спрабаваў перакінуць у Магілёў матчасць, зброю і верных салдат. Манеўр не ўдаўся.

У жніўні 1917 г. Веткаўскі Савет адкрыта выказаў незадаволенасць палітыкай Часовага ўрада.

С. Г. Малееў.

І. Г. Малееў.

І. Г. Шацілаў.

Ц. Г. Шацілаў.

10 жніўня 1917 г. з "аб'яднання" сацыял-дэмакратаў выйшлі і стварылі сваю партыйную арганізацыю веткаўскія балышавікі. Вакол іх у Савеце аб'ядналіся левыя палітычныя сілы. Падтрыманыя беспартыйнымі дэлегатамі, прадстаўнікі левых дэмакратычных сіл узмацнілі свой уплыў у Савеце рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. У верасні 1917 г. Савет патрабаваў неадкладна ўвесці рабочы кантроль, узмацніць барацьбу з разрухай, за ўвядзенне прагрэсіўнага падатку на прадпрымальнікаў і заводчыкаў. Такія меры былі неабходнымі. Да кастрычніка 1917 г. у воласці стварыўся востры гаспадарчы крызіс. Насельніцтва аказалася перад тварам немінучага голаду.

У. Я. Райскі.

Саўдэп. Першыя крокі

Вестка аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе і падзенне Часовага ўраду прыйшла ў Ветку 26 лістапада 1917 г.

У той жа дзень на рынкавай плошчы адбыўся шматлюдны мітынг, які заклікаў безадгаворачна прыняць Кастрычніцкі пераварот і першыя дэкрэты Савецкай улады. Распаўсюдзілі паведамленне: "Исполком Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов доводит до сведения:

1. Вся власть в волости перешла в руки Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов.

2. Должности буржуазных комитетов и земской управы в волости упраздняются.

3. Комиссаром Совета по гражданской части назначается Пантелеймон Осмаловский. Он же командир красногвардейского отряда.

4. Все гражданское население и гарнизон призываются к сохранению полного порядка, спокойствию и революционной дисциплине.

5. Всякие попытки к нарушению нормальной жизни в местечке и в волости будут подавляться самыми суровыми мерами.

Исполнительный комитет Ветковского Совета рабочих, солдатских и крестьянских депутатов".

У в. Акшынку вестку аб перамозе пралетарскай рэвалюцыі прынёс зямляк Іван Пятровіч Раманаў. І. П. Раманаў прайшоў вялікі і цяжкі шлях рэвалюцыянера-прафесіянала. Ён 12 гадоў правёў на катарзе. "Універсітэты" палітkatаржан моцна падкавалі яго палітычна. Акшынцы выбралі яго старшынёй Савета. Ужо на другі дзень пасля выбрання Іван Пятровіч разам з памочнікам Уладзімірам Пятровічам Гусаковым раздалі з панскіх складоў збожжа сялянам, размеркавалі племянную жывёлу, а затым і зямлю.

У в. Неглюбцы старшынёй сяляне выбралі Андрэя Іванавіча Суглобава, а ў Шарсціне — Фёдара Паўлавіча Кашубіна, у Стаўбуне — Аляксандра Міронавіча Беладзедава. У канцы лістапада Савецкая ўлада канчаткова замацавалася ў Ветцы і воласці. Скасавалі і земскую ўправу.

Ахову парадку добраахвотна ўзяў на сябе чырвонаармейскі атрад. У буйных вёсках стварылі рэвалюцыйныя дружыны колькасцю ад 3 да 10 чалавек.

На з'ездзе беспартыйных сялян воласці выбралі новы выканком сялянскага зямельнага камітэта. На месцах прыступілі да ажыццяўлення дэкрэта аб зямлі, іншых дэкрэтаў Савецкай улады.

Літаральна на працягу двух-трох тыдняў памешчыкі пакінулі свае маёнткі. Усю рухомую і нерухомую маёмасць Саветы ўзялі на ўлік. Інвентар, жывёлу, фураж ды іншую маёмасць памешчыкаў бясплатна ці па нізкіх цэнах перадалі бедным сялянам. У Ветцы нацыяналізавалі аптэку, вяровачна-канатныя заводы, механічныя млыны, рамонтна-будаўнічую суднаверф, прыпісаныя да веткаўскага порта параходы мясцовых купцоў Грошыкавых, у Навасёлках — віна-гарэлачны завод, гарбарныя заводы Ліўшыца, Цыркіна і Ратнера. Аднак запусціць гэтую вытворчасць змаглі не адразу. Да канца 1917 г. беспрацоўе ў Ветцы яшчэ ўзмацнялася. Разам з прафсаюзамі выканком у адміністрацыйным парадку прымушаў прадпрымальнікаў ствараць новыя працоўныя месцы. За кошт прагрэсіўнага падаткаабкладання буржуазіі стварылі фонд дапамогі сем'ям беспрацоўных.

Увялі працоўныя кніжкі. Іх выдаваў валвыканком, а ў вёсках — сельсаветы. Такая кніжка была ў адзіні і той жа час пасведчаннем асобы і разліковай кніжкай, а пры захаванні асобных умоў давала права на атрыманне харчовай карткі на нармаваныя прадукты.

Пачалася перабудова сістэмы адукацыі, аховы здароўя і ўстаноў культуры. Сродкаў на вырашэнне гэтых мер у Саўдэпа не было. Не было іх і ў дзяржавы.

Пачатак мірнага будаўніцтва перарваў узброены мяцеж польскага корпуса легіянераў генерала Доўбар-Мусніцкага, які 18 студзеня 1918 г. аб'явіў паход супраць Савецкай улады. На захопленых тэрыторыях легіянеры арыштоўвалі дэпутатаў Саветаў, учынялі масавыя рабункі і акты насілля. На барацьбу з мяцежнікамі ў Чырвоную гвардыю з Веткі і воласці пайшлі сотні добраахвотнікаў. У баях вызначыўся створаны з веткаўцаў яшчэ ў лістападзе 1917 г. чырвонаармейскі атрад пад камандаваннем Рыгора Цімафеевіча Паўленкі.

Павялічылася пагроза ваеннай інтэрвенцыі з боку Германіі. Тэрыторыя Веткаўшчыны ў любы момант зноў магла стаць тэатрам ваенных дзеянняў.

У. Я. Райскі

У тыя дні

З успамінаў удзельніка рэвалюцыйных падзей на Веткаўшчыне І. Г. Малеева

17 января 1918 года из Могилева, из ставки Западного фронта в Ветку пришла телеграмма-молния: "В два адреса: начальнику дивизиона зап председателю Ветковского Совета тчк Дивизион расформировать зап имущество дивизиона сдать Совету тчк"

Командиру дивизиона поручику Молчанову телеграмму вручили первому. Ознакомившись с текстом, Молчанов потребовал ее второй экземпляр, пообещав лично вручить его председателю Совдепа.

Своего обещания Молчанов, конечно же, не выполнил.

Через день из Могилева в те же адреса в Ветку пришла вторая телеграмма: "Расформирование дивизиона воздержитесь тчк Ждите дополнительных указаний тчк". Молчанов задержал и вторую телеграмму.

В Совете о срочных телеграммах из штаба Западного фронта узнали случайно от местного письмоносца М. Амельченко.

Для выяснения обстановки я выехал в Гомель. Возвращался поздно. Еще не доезжая до Ветки встретил члена волисполкома, бывшего фронтовика-разведчика Архипа Зенченко. Он рассказал, что получена очень срочная, третья по счету, телеграмма Запфронта, в которой предлагалось: "Дивизион немедленно расформировать. Все имущество сдать Совету".

...Было 11 часов вечера, когда исполком Совета принял конкретные решения. Я отправил члена исполкома Авксентия Гончарова в канцелярию дивизиона с требованием немедленно приступить к выполнению приказа Главковерха Западного фронта — дивизион расформировать, имущество передать Совдепу.

Молчанов ответил ему:

— Никакой сдачи имущества Совдепу производить не буду.

Получив такой ответ, я взял карабин и с пятью вооруженными красногвардейцами направился в канцелярию дивизиона. Там застал Молчанова и пять офицеров.

— Поручик Молчанов, вот экземпляр телеграммы штаба Запфронта о немедленной сдаче Совету всего имущества дивизиона. Чем вы можете объяснить отказ от сдачи?

— Я не обязан давать Вам объяснений.

Я снял с плеча карабин. Бойцы щелкнули затворами, вскинули винтовки.

— Руки вверх! — скомандовал я. — Сдать оружие! При попытке к сопротивлению будете убиты на месте, как изменники. Гончаров, заберите у всех револьверы...

Потом я приказал Молчанову написать акт о сдаче имущества, что и было им сделано.

В принятом Советом в ту же ночь Постановлении об имуществе расформированного дивизиона говорилось:

"Во исполнение телеграфного распоряжения штаба Запфронта Уисполком постановляет:

1. Вещи и продовольствие распределяются для бедного населения и солдатских семей Ветки и близлежащих сел Левобережья реки Сож.

2. Винтовки и патроны — развезти по сельским Советам. Указанное необходимо сохранить и использовать лишь в случае необходимости.

3. С оставшихся орудий дивизиона снять замки. Орудия при подходе оккупационных войск потопить, так как ни одного снаряда к орудиям на складах не оказалось".

К утру следующего дня члены Совета мобилизовали местных извозчиков с подводами и перевезли продовольствие и вещевое имущество со складов дивизиона в лавку рабочего кооператива.

На столбах в людных местах в местечке расклеили распоряжение Совдепа о нормах и ценах на распределяемое имущество и продовольствие.

С самого утра у лавки рабочего кооператива стали собираться люди. За полчаса до открытия толпа насчитывала около пятисот человек. Люди из Ветки и окрестных сел. В толпе раздавались призывы не ожидать распределения, а разобрать имущество самовольно.

Члены исполкома пытались уговорами остановить произвол. Обстановка накалялась. Последствия могли оказаться непредсказуемыми.

Тогда к подступавшей к выходной двери ларька толпе вышел рабочий, бывший фронтовик, Дмитрий Слуцкий.

— Предупреждаю, кто хоть пальцем посмеет тронуть продавцов кооператива или нарушить решение исполкома, будет иметь дело со мной. В руках его блеснул браунинг.

Ветковчане хорошо знали, что Митька слов на ветер не бросает.

Люди на площади приутихли. Постепенно выстроилась очередь. Кооператоры без конфликта распределили имущество".

Малеев И. Г. "Провинция в те дни (Как это было?). Российская государственная библиотека. Отдел рукописей, фонд 218.

1918 г. Нямецкая акупацыя

18 лютага 1918 г. 30 дывізій кайзераўскай Германіі, без аб'яўлення вайны, пачалі наступ па ўсім руска-германскім фронце. У напрамку Веткі наступаў 41 нямецкі корпус. Узнавілі свае дзеянні і легіянеры генерала Доўбар-Мусніцкага.

Веткаўскі Саўдэп не меў сіл, неабходных для абароны. Інфармацыя аб набліжэнні немцаў паступала нерэгулярна. Артдывізіён, які дыслацыраваўся ў Ветцы, ужо фактычна не існаваў. Спадзяванца на тое, што жменька чырвонаармейцаў і тых салдат, якія не паспелі разбегчыся з мясцовага гарнізона, змогуць спыніць рэгулярныя часці нямецкай арміі, было нельга. Каб прыпыніць бязмэтавае кровапраліцце, Савет распусціў байцоў-чырвонаармейцаў па дамах, пры гэтым быў дадзены загад схаваць зброю і боезапасы. Атрыманыя перад гэтым з Гомеля 1000 вінтовак і патроны схавалі ў лесе на балоце. Батарэю з 6-і гармат, да якіх не было ніводнага снарада, затапілі ў рацэ.

Узважыўшы становішча, выканком вырашыў пакінуць Ветку і перайсці на падпольную работу. Для кіравання партызанскай барацьбой з акупантамі Саўдэп выдзеліў аператыўна групу ў складзе старшыні Саўдэпа Фёдара Іванавіча Жукава, членаў — Івана Герасімавіча і Сяргея Герасімавіча Малеевых, Іларыёна Шаціпава і Лазара Кушнярова. Група дыслацыравалася ў в. Пабужжа.

Партызанскі атрад у в. Свяцілавічы.

На акупіраванай тэрыторыі немцы ўзнаўлялі старыя парадкі. У Ветцы ажыла земская ўправа. Вярталіся памешчыкі, купцы і заводчыкі.

У в. Дзям'янкі з нямецкім абозам вярнуўся памешчык Геральд і загадаў усім называць яго не інакш як фон Геральд. З дапамогай нямецкіх салдат адабраў у сялян засеяныя імі палі і жывёлу, якія нават яму не належалі.

У в. Жалезнікі вярнулася пані Варвара Вільгельмаўна. У в. Вялікія Нямкі — памешчык Брытаў і іншыя. Грабежніцтва і здзек рабіліся нормай паводзін акупантаў.

10 сакавіка 1918 г. галоўнакамандуючы Заходнім фронтам загадам № 7 для барацьбы з нямецкімі акупантамі патрабаваў "... образовать на прифронтовой полосе прочную завесу отрядов, в коем не пропускать в глубь России противника в случае возобновления им враждебных действий". Загад вызначаў: "...создать боевые отряды и группы войск", указваў размежаваныя лініі раёнаў, іх дыслакацыі і дзеянняў, структуру і баявы склад. Падкрэслівалася, што "...главная по силе "завеса" должна состоять из линии местных партизанских отрядов, усиленных на важнейших направлениях революционными войсками".

Вызначаючы крыніцы і базы забеспячэння войска, загад падкрэсліваў: "Довольствие — из местных средств покупной платой, реквизиции от жителей, как окажется удобней..."

На працягу невялікага часу партызанскія атрады былі створаны ў Старым Закружжы, Акшынцы, Неглюбцы, Стаўбуне, Вялікіх Нямках, Пералёўцы, Рудні-Споніцкай, Рэчках. Атрады самаабароны — у Ветцы, Хальчы, Навасёлках, Свяцілавічах і інш.

Больш пяці гадзін ішоў няроўны бой каля в. Пералука. Мясцовыя жыхары з былых салдат і франтавікоў, добра валодаючы зброяй і тактыкай боя, выкарыстоўваючы веданне мясцовасці, затрымалі тут наступ палка нямецкай рэгулярнай арміі. Акупанты адступілі. Было забіта болей 100 салдат і афіцэраў.

У гэтым баі адважна ваявалі камандзір атрада Сцяпан Фёдаравіч Карасёў, разведчык Аляксей Уладзіміравіч Грэцкі, байцы Максім Арцёмавіч Мядведкаў, Андрэй Іванавіч Карлашоў, Міхаіл Мацвеевіч Капусцін, кулямётчык Піліп Барсукоў, які да апошняга патрона вёў агонь па акупантах і загінуў у няроўным баі.

Партызанскі атрад, якім кіраваў старшыня

Помнік землякам, расстраляным нямецкімі акупантамі ў Свяцілавічах у 1918 г.

Акшынскага сельсавета Іван Пятровіч Раманаў і яго памочнік, жыхар в. Пералёўка Цярэнцій Мамантавіч Дзямідаў, рабіў на дарогах засады, граміў нямецкія камендатуры. Атрад вызначаўся манеўранасцю. Нападаў раптоўна, знішчаў жывую сілу і абозы ворага. Немцы літаральна палявалі за лятучым атрадам Івана Раманава.

Летам 1918 г. на тэрыторыі Веткаўшчыны дзейнічалі партызанскія атрады і партызанскія групы з розных рэгіёнаў Беларусі. У в. Навасёлкі прыйшоў з-пад Жлобіна партызанскі атрад Ерафея Харба. У м. Хальч прыйшоў атрад з-пад Церахоўкі ў складзе 25 байцоў з двума кулямётамі "Максім", а з-пад Мінска — атрад Саўцова з дзвюма гарматамі. Аб'яднаныя атрады літаральна акружылі акупантаў у Ветцы, Свяцілавічах, Стаўбуне, іншых вялікіх населеных пунктах.

Актыўна дзейнічалі партызанскія групы ў в. Сівенкі, Пералёўцы, Рэчках, Рудні-Споніцкай і інш.

Акупанты шалелі. У в. Вялікія Нямкі яны паўсюль рабавалі, рабілі вобыскі. Расстралялі ні ў чым не вінаватых сялян, спалілі вёску. Карнікі запраглі ў калёсы па 12 мужчын, жанчын, дзяцей і параненых партызан, паклалі нарабаваную маёмасць, пасадзілі салдат і прымусілі цягнуць абоз у Свяцілавічы. У Свяцілавічах немцы сагналі мясцовых жыхароў на бераг ракі Беседзь і на іх вачах расстралялі 17 палонных партызан. Вось іхнія імёны: Емяльян Васільевіч Анохаў, Іван Ціханавіч Джанкоў, Арцём Міронавіч Шуткін, Мікалай Цімафеевіч Чаплін, Пётр Карнеевіч Піражкоў, Макар Сямёнавіч Язерскі, Міхаіл Карнеевіч Раманаў – з в. Вялікія Нямкі, Лука Іванавіч Галко – з в. Свяцілавічы, Яўтух Яўсеевіч Ермакоў, Сямён Іванавіч Недаросткаў, Карп Яўхімавіч Новікаў, Нікан Андрэевіч Лабынёў – з в. Пералёўка, Пётр Салодкін – з в. Скачок, Васіль Аляксеевіч Куцянкоў – з в. Акшынка.

Перад расстрэлам Лука Галко зняў з сябе залітую крывёй кашулю і перадаў Хрысціне Маскалёвай:

— Схавай. Гэта ад усіх нас, на памяць. А затым крыкнуў:

— Забівайце нас, але Савецкую ўладу вам не расстраляць!

На беразе ракі Беседзь у Свяцілавічах стаіць помнік-абеліск, на якім – надпіс: "На гэтым месцы ў жніўні 1918 года былі расстраляны нямецкімі акупантамі 17 чырвонаармейцаў-камунараў, ураджэнцаў нашага раёна".

Пасля лістападаўскай рэвалюцыі 1918 г. у Германіі Веткаўскі Савет звярнуўся да нямецкіх салдат гарнізона з заклікам "стварацъ салдацкія Саветы і хутчэй вяртацца дахаты". Тэкст звароту пераклаў на нямецкую мову член Веткаўскага Савета Майсей Кепін, які быў у Германіі ў палоне і ведаў нямецкую мову.

2 снежня 1918 г. веткаўскія актывісты абяззброілі гайдамацкую "варту" і яшчэ да прыходу часцей Чырвонай Арміі вызвалілі Ветку ад акупантаў.

У. Я. Райскі.

ЛІТАРАТУРА:

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. Сб. документов и материалов. Т. 1. Мн., 1968. С. 157.

"Гомельская праўда". 1970. 12 лютага.

Диренок У.Д. Большевики Гомельщины в период Октябрьской революции и гражданской войны. Мн., 1976. С. 106.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 412. Л. 69, 70, 71, 72, 73.

Крах немецкой оккупации в Белоруссии в 1918 г. Мн., 1947. С. 57–58.

"Палеская праўда". 1923. № 403.

Дакументы сведчаць

З ТЭЛЕГРАМЫ НА ІМЯ САЎНАРКОМА АД КАМАНДУЮЧАГА ЗАХОДНІМ ФРОНТАМ

...Со свойственным нахальством немцы принялись за ограбление населения тчк Отбирается и вывозится от продовольствия и кончая медными ручками от дверей, забирается у крестьян последняя корова... Во всех концах Гомельского уезда, даже в самых глухих, идет организация партизанских отрядов. Без руководителей, без средств, без оружия, охваченные безумной жаждой мести и ненависти к врагу революции и свободы, собираются они в отдельные отряды, часто даже не связанные между собой. Исполком твердо решил стать во главе стихийного народного движения, придать ему планомерный и стройный характер.

Государственный архив Российской Федерации. Ф. 130. Воп. 2. Спр. 562. Л. 67.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ КАМАНДАРМА 1-й АРМІІ СЦЯПАНАВА

Немецкие бандиты мало того, что грабили, но еще надругались над седыми волосами стариков. Часть крестьян разбежалась, другая – взялась за оружие, встали на защиту своих родных уголков и отстаивали свою родную деревню, где остались только старики. Немцы

забрали имущество, заставили стариков на себе везти все награбленное имущество, надругались над сединами отцов.

Государственный архив Российской Федерации. Ф. 130. Воп. 2. Спр. 584. Л. 1–2.

СКЛАД ПЕРШАГА ВЕТКАЎСКАГА РЭЎКОМА

2 снежня 1918 г.

Авксентий Аввакумович Гончаров, Моисей Кенин, Михаил Бабков, Емельян Петрович Соловьев, Василий Спасенков, Митрофан Фадеевич Малеев, Сергей Герасимович Малеев, Иуда Абрамович Часов. От крестьян Ветки в состав ревкома кооптировали Льва Шановалова, Онуфрия Боброва, Пантелея Бурова и от слободы Тарасовка – Кирилла Сивакова и Геращенкова.

В боях и походах. Мн., 1972.

З РЭЗАЛЮЦЫІ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЖЫХАРОЎ в. ГЛУХАЎКА ПА ВЫБАРАХ КАМІТЭТА БЕДНАТЫ

23 снежня 1918 г.

Мы, граждане д. Глуховка Гомельского уезда, собрались на общий сход, согласно распоряжения волостного ревкома от 18 декабря 1918 г., об организации комитета бедноты, решили организовать таковой комитет, избрали председателем Григория Степановича Масилонова и секретарем – Федосия Яковлевича Афанасьева, представителем в волостной комитет – Александра Федоровича Кожемякина, в чем подписываемся (подписи).

Джяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 501. Оп. 1. Д. 2. Л. 6а.

Так было...

З успамінаў А. А. Грамыкі

...Агрессор пришел с оружием в руках, как поработитель... Кайзеровские солдаты бесчинствовали. Они грабили города и села, угоняли скот, грузили его на поезда, отправляли в Германию. У населения отбирали лошадей для перевозки немецких солдат. Нашего соседа оккупанты избили до полусмерти только за то, что он не сказал им, кому принадлежала лошадь, которую они пытались поймать, но не смогли. Вообще, избивали или убивали каждого, кто пробовал сопротивляться грабежу и разбою. Так было в нашей деревне и в ближайших селах.

В Старых Громыках они шли по дворам и угоняли коров. Как сейчас помню, трое вооруженных солдат начали уводить со двора и нашу корову. Мой отец и его братья, Николай и Иван, находились в то время в лесах, так что помочь ничем не могли. В хате старшим остался дед Матвей. Он и бросился отнимать корову, смело, отчаянно. Один из солдат стал целиться из винтовки в деда. В этот момент корова, запутавшись в веревке, упала на землю. Минуты замешательства было достаточно для того, чтобы все мы – и женщины, и дети, в том числе и я (мне было девять лет) и семилетняя сестренка, повисли на руках деда, удержали его от безнадежной борьбы.

...Женщины нашей деревни, в том числе и моя мать, долго еще потом выходили за околицу, поглядывали в ту сторону, куда ушли грабители, видимо, надеясь, что те вдруг опомнятся и вернут коров. Но коровы так и не вернулись. Сарай, куда мы с сестренкой бегали по утрам, чтобы выпить парного молока, опустел.

Однажды утром вся деревня Старые Громыки оказалась в дыму. Его принес ветер из находившегося в тридцати километрах очень большого села Перелевка, которое было полностью сожжено. Та же участь постигла и многие другие села и деревни. Это была месть оккупантов за действия партизан, за неудачи в попытках их уничтожить...

Громыко А. А. Памятное. Книга первая. М., 1998. С. 28–30.

У баях і паходах

Вясной 1919 г. тэрыторыя Веткаўскай воласці ізноў стала прыфрантавой зонай. На змену нямецкім захопнікам спяшаліся польскія акупанты, актывізаваліся пятлюраўскія банды. Веткаўскі Савет аб'явіў мабілізацыю. Сфарміраваныя ў воласці атрады накіроўваліся на фронт. Па партыйнай мабілізацыі на фронт пайшлі 21 камуніст з 26 і 47 беспартыйных добраахвотнікаў.

У Багунскім палку, якім камандаваў легендарны Мікола Шчорс, ваявалі артылерыстамі Несцер Аляксеевіч Хазаў, Павел Міхайлавіч Шаўцоў, браты Сцяпан і Ягор Брытавы з в. М. Нямкі. Першай артылерыйскай батарэяй Багунскага палка камандаваў Іларыён Дзмітрыевіч Сізоненкаў. У 1918 г. у баі за Добруш І. Д. Сізоненкаў падбіў бранявік, сарваў наступленне ворага на Навазыбкаў і Унечу. Першая рэвалюцыйная батарэя Сізоненкава ўдзельнічала ў баях за Сызрань, Самару, Уфу супраць белачэхаў і калчакаўцаў на Усходнім фронце, дзянікінцаў і белапалякаў на Паўднёвым і Заходнім франтах.

Смелым і кемлівым разведчыкам у Багунскім палку зарэкамендаваў сябе Сцяпан Васільевіч Масцюкін. Разам з байцамі 2-га сялянскага партызанскага атрада ён удзельнічаў у разгроме гайдамакаў і немцаў каля Закапыцця, Кармы і Цярэшкавіч, а потым у Багунскім палку ваяваў супраць пятлюраўцаў і белапалякаў. У складзе Багунскага палка ваявалі і байцы 1-га партызанскага атрада (в. Ст. Закружжа) — Леў Ільіч Астапенка, Міхаіл Іванавіч Маслакоў, Міхаіл Мацвеевіч Кулага, Стэфан Фёдаравіч Карасеў, Аляксей Уладзіміравіч Грэцкі, Іван Мікітавіч Кулага, браты Аксён і Яўхім Рыгоравіч Кущовы, Кірыл Зайцаў (в. М. Нямкі), браты Васіль і Захар Антонавіч Корхавы (в. Пералёўка), Фёдар Міхайлавіч Афанасенка (в. Покаць), Мікалай Кузьміч Бычкоў (в. Стаўбун), Емяльян Сямёнавіч Гулевіч (в. Р.-Стаўбунская), Захар Сцяпанавіч Цімаркоў (в. Янова), Міхаіл Рыгоравіч Кушняроў (в. Закружжа), Мікалай Антонавіч Кавальчук і інш.

М. А. Кавальчуку было 16 гадоў, калі рабочыя чугуначных майстэрань, дзе ён працаваў, даручылі юнаку распаўсюджванне рэвалюцыйных лістовак і тайную дастаўку зброі. У складзе чырвонагвардзейскага атрада ён удзельнічаў у раззбраенні вайсковых эшалонаў, якія ішлі цераз Гомель на Маскву і Петраград на дапамогу генералу Карнілаву.

Вясной 1918 г. М. А. Кавальчук разам з землякамі з Веткі С. Назаранкам, Ц. Дзямідавым, А. Пархомцавым і інш. уступіў у Чырвоную Армію. Яны склалі ядро браняпоезда, які адыходзіў на Усходні фронт у раён Багульмы. Там ішлі цяжкія кровапралітныя баі. Часці Чырвонай Арміі стрымлівалі бязлітасныя атакі калчакаўцаў, якія рваліся да Масквы. Гарачы бой разгарэўся ля ст. Дымка. Белагвардзейцы адрэзалі шлях адыходу падбітаму артылерыйскімі снарадамі браняпоезду і захапілі яго. У ліку палонных апынуўся паранены Мікалай Антонавіч Кавальчук. Белагвардзейцы расстралялі ўсю каманду браняпоезда. Мікалай Антонавіч атрымаў пяць кулявых ран, упаў разам з іншымі байцамі, але застаўся жывым.

Пасля лячэння ён вярнуўся ў строй і ваяваў да заканчэння грамадзянскай вайны ў складзе Багунскага палка.

У красавіку 1918 г. на ст. Унеча з байцоў і камандзіраў партызанскіх атрадаў і груп самаабароны бліжэйшых валасцей былі сфарміраваны падраздзяленні 1-га рэвалюцыйнага палка імя Леніна. У гэтым палку кулямётчыкамі ваявалі Мікалай Сяргеевіч Клімаў (в. М. Нямкі), Андрэй Аляксеевіч Патапенка, Міхаіл Музыка, Крупадзёраў, артылерыстамі Дзям'ян Васілевіч Тарасенка і Павел Міхайлавіч Шаўцоў (п. Ляды) і інш.

20 сакавіка 1919 г. у Гомелі ў тэрміновым парадку фарміраваліся баявыя пралетарскія атрады. У складзе 1-га Гомельскага атрада ваявалі веткаўчане Сцяпан Арцёмавіч Шчупачэнка, Архіп Паўлавіч Бова (в. М. Нямкі), Піліп Рыгоравіч Шапавалаў (в. Ст. Сяло), Павел Іванавіч Шульгін (в. Ст. Закружжа), Андрэй Фядотавіч Паўлікаў, Сцяпан Цімафеевіч Лулевіч (в. Рудня-Стаўбунская) і інш.

У складзе 2-га Гомельскага пралетарскага атрада ваявалі Іван Яўхімавіч Анікеіч, Іван Калінавіч Гамонаў, Лука Феафанавіч Сямёнаў, Васіль Антонавіч Корхаў (в. Пералёўка), бра-

Атрад асобага прызначэння.

ты Фёдар і Сяргей Скоблікавы (абодва артылерысты з 4-й рэвалюцыйнай батарэі), Міхаіл Пятровіч Скоблікаў — камандзір узвода конай разведкі, Леў Андрэевіч Бядрыцкі, Яўмен Пятровіч Граскоў і інш.

Шмат хто за гераізм і мужнасць удастоены ўзнагарод. У ліку ўзнагароджаных Ігнацій Кузьміч Чваркоў (в. Стаўбун). Ён нарадзіўся ў 1888 г. у беднай сялянскай сям'і. Яго ваенная служба пачалася ў 1910 г. Да 1917 г. Чваркоў быў ужо камандзірам роты ў званні штабс-капітана. Ён неаднаразова вылучаўся ў баях у гады першай сусветнай вайны, за што быў удастоены Георгіеўскага медаля і Георгіеўскіх крыжоў 4-й, 3-й, 2-й ступеняў. Варожая куля не абмінула храбрага салдата. Пад Лоддзю ён быў цяжка паранены, але паправіўся і зноў вярнуўся ў строй.

Пасля развалу старой арміі І. К. Чваркоў вярнуўся на радзіму. Гомельскі павятовы камісарыят пасылае Чваркова ў в. Стаўбун для арганізацыі барацьбы з бандытызмам. З чэрвеня 1919 г. І. К. Чваркоў у Чырвонай Арміі. Ваяваў камандзірам роты, начальнікам разведкі палка.

За гераізм, праяўлены ў барацьбе з польскімі захопнікамі, неаднаразова адзначаўся ў прыказах камандавання дывізіі і фронту. За баявыя аперацыі, якія забяспечылі палку фарсіраванне р. Бярэзіны і вызваленне Бабруйска, Ігнацій Кузьміч Чваркоў узнагароджаны ордэнам баявога Чырвонага Сцяга.

У Ветцы ў атрад асобага прызначэння ўвайшлі: І. Г. Шацілаў, П. М. Малееў, А. А. Ганчароў, М. З. Селязнёў, М. М. Амельчанкаў, М. Кенін, І. Вышнікаў, Ф. Зянкевіч, З. Гензелеў, С. Г. Малееў, М. Ф. Малееў, М. І. Лапіцкі, Ф. М. Асмалоўскі, Я. Самойлін, М. Шыфрын, І. Дадзіомаў, Б. Шэрын, А. М. Асонаў, Е. М. Седляроў, Л. З. Халасцякоў, П. М. Асмалоўскі, Я. Селязнёў, А. Гакаў, начальнік атрада Г. П. Паўленка і інш.

Другі атрад асобага прызначэння быў сфарміраваны ў Стаўбуне. У яго ўвайшлі: Іван Восіпавіч Азарушкін, Емяльян Іванавіч Расафонаў, Варфаламей Фёдаравіч Семянкоў, Кузьма Фёдаравіч Чарнабаеў, Кандрат Сямёнавіч Жукаў, Іван Аляксеевіч Парашчанкаў, Сцяпан Прохаравіч Прышчэпаў, Марк Сямёнавіч Лупекін, Мікіта Сямёнавіч Яначкін, Майсей Ананьевіч Войтаў, Андрэй Дзянісавіч Кавалёў, Дзмітрый Якаўлевіч Храпянкоў і інш.

У. Я. Райскі.

З ПРАТАКОЛА АБ'ЯДНАНАГА ПАСЯДЖЭННЯ КАМІТЭТА РКП(б) І ВАЛРЭЎКОМА ВЕТКАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

12 сакавіка 1920 г.

Слухалі: Аб мабілізацыі 50% камуністаў, згодна толькі што атрыманай тэлеграме гаркома

Выступілі: Ф. І. Жукаў. Прапанаваў з прычыны надзвычай вострага моманту і непасрэднай пагрозы нашай мясцовасці ад палякаў, калі праца на месцы сама па сабе звужана, а на фронце, відавочна, вялікая патрэба ва ўсялякай арганізаванай сіле, не абмяжоўвацца мабілізацыяй у 50%, а зрабіць самае вялікае дзеля падтрымкі фронту: пакінуць на месцы хворых і слабых і толькі двух самых неабходных работнікаў — старшыню, выканкома і ваенкома, а увесь астатні састаў узвода ў самым тэрміновым парадку накіраваць у распараджэнне гаркома

Прапанова прымаецца. Атраду выступіць у поўнай гатоўнасці 14 сакавіка г. г.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 80. Л. 57.

Удзельнікі грамадзянскай вайны

У архіўных справах ўдалося выявіць прозвішчы каля 400 удзельнікаў грамадзянскай вайны. Вось іх імёны.

ВЁСКА АКШЫНКА

Гулевіч Андрэй Конанавіч.

ВЁСКА БАРБА

Галафееў Іван Кірылавіч, Балішылаў Харытон Дарафеевіч, Кавалёў Дзям'ян Дзям'янавіч, Кір'янаў Усцім Іванавіч, Кавалёў Іван Кузьміч, Лабачоў Кузьма Цімафеевіч, Лабачоў Мітрафан Цімафеевіч, Маркаў Раман Калінавіч, Мушашкоў Маркій Паўлавіч, Раманаў Іван Калінавіч, Ражкоў Сава Цярэнцьевіч, Седляроў Севасцьян Маркавіч, Саламашын Дзям'ян Антонавіч, Салаўеў Пётр Сафронавіч, Седляроў Іван Яўцеевіч, Фёдараў Мініён Міхайлавіч, Фіцаў Харлен Лявонавіч, Шумейкін Дзей Фёдаравіч.

Р. Ф. Асонаў.

М. Г. Набокін.

МЯСТЭЧКА ВЕТКА

Адамчыкаў Пётр Іосіфавіч, 1891; Асонаў Рыгор Фядотавіч, 1890; Белы Пётр Пятровіч; Ганчароў Аўксенцій Авакумавіч, Грыгор'еў Мікалай Іванавіч, Ермакоў Мікалай Міхайлавіч, Захараў Аляксей Сцяпанавіч, 1895; Караедаў Павел Іванавіч, Караедаў Еўсцігней Аўрамавіч, Караедаў Фёдар Аўрамавіч, Мацюшын (Мацюшкін) Яфім Іванавіч, 1897; Міхайлаў Аляксандр, Міхалёў Яўмен Давыдавіч, Набокін Міхаіл Гаўрылавіч, 1890; Набокін Мацвей Якаўлевіч, 1900; Палякоў Афанасій Лукіч, 1902; Палякоў Аляксей Сцяпанавіч, 1902; Палаўцаў Васіль Антонавіч, 1891; Пашчанка Гаўрыла Дзмітрыевіч, 1892; Пералыгін Лука Емяльянавіч, 1902; Пракошын Харытон, Пазнякоў Савелій Дзям'янавіч, Семянцоў Міхаіл Рыгоравіч, Семянцоў Міхаіл Прохаравіч, 1895; Семянцоў Іван Прохаравіч, Селязнёў Іосіф Захаравіч.

ВЁСКА ГРАМЫКІ

Грамыка Іван Антонавіч, 1895; Грамыка Іван Іванавіч, Грамыка Пётр Антонавіч, 1900; Грамыка Міхаіл Антонавіч, 1894; Шалюта Цімафей Мікітавіч, 1892.

ВЁСКА ДАНІЛАВІЧЫ

Дзегцяроў Рыгор Іванавіч.

ВЁСКА КАЗАЦКІЯ БАЛСУНЫ

Баярчанка Емяльян Пятровіч, Баярчанка Мацвей Пятровіч, Волкаў Сямён Якаўлевіч, Васькоў Ерафей Максімавіч, Казлоў Кузьма Пракопавіч, Максіменка Дзяніс Іванавіч, Мартыненка Яўмен Фёдаравіч, Максіменка Антон Ісаевіч, Стракотаў В. В.

ВЁСКА КАЛІНІНА

Гайданаў Стэфан Андрэевіч, Тарасенка Емяльян Сямёнавіч.

ВЁСКА КУПРЭЕЎКА

Дзям'янаў Аляксандр Ільіч, 1888; Дзеравяшкін Іван Цімафеевіч; Іваноў Савелій Кірылавіч, 1895.

ВЁСКА КУНТАРАЎКА

Кабыш Васіль Паўлавіч.

ВЁСКА МАЛЫЯ НЯМКІ

Купцоў Яўхім Рыгоравіч, Ханевіч Сцяпан Іванавіч, Храмянкоў Дзяніс Апанасавіч.

ВЁСКА НЕГЛЮБКА

Гаўрыленка Рыгор Іванавіч.

ВЁСКА ПРЫСНО

Бычкоў Кузьма Несцеравіч, Голубаў Кірэй Мартынавіч, Кліменка Ягор Аксёнавіч, Лапцеў Андрэй Фёдаравіч, Мельнікаў Лявон Іванавіч, Марачкоў Рыгор Авакумавіч, Марачкоў Ягор Авакумавіч, Панчыкаў Пётр Іванавіч, Падчашоў Пётр Іванавіч, Радзькоў Гардзей Раманавіч, Радзькоў Міхаіл Ісакавіч, Сакуноў Герасім Іванавіч.

ВЁСКА ПЫХАНЬ

Дзегцяроў Парамон Якаўлевіч, Панчанка Міхаіл Якубавіч.

ВЁСКА РАДУГА

Каваленка Іван Іванавіч, Паладзьеў Сямён Пятровіч, 1880; Чашэйка Сяргей Іванавіч, 1892.

ВЁСКА РУДНЯ-СПОНІЦКАЯ

Барадзін Аляксандр Цімафеевіч, Дарашэнка Пётр Іосіфавіч, Канавалаў Міна Канстанцінавіч, Лысякоў Мітрафан Усцінавіч, Лысякоў Лаўрэнцій Усцінавіч, Цуканаў Піліп Феакціставіч, Чарнабаеў Міхаіл Астапавіч, Яськоў Радзівон Пятровіч.

С. І. Чашэйка.

Дз. Я. Маліноўскі.

С. Дз. Болбасаў.

Т. Дз. Болбасаў.

М. Ф. Васільеў.

С. А. Карнееў.

ВЁСКА РУДНЯ-СТАЎБУНСКАЯ

Гулевіч Язэп Іванавіч, Гулевіч Іван Ільіч.

ВЁСКА РУДНЯ-ШЛЯГІНА

Мохараў Іван Іванавіч.

М. А. Кізін.

Я. А. Траскуноў.

ВЁСКА СВЯЦІЛАВІЧЫ

Маліноўскі Дзмітрый Яўхімавіч, 1896; Сафонаў Барыс Сямёнавіч, Ткачоў Андрэй Пракопавіч, 1895.

ВЁСКА СІВЕНКА

Трафімаў Андрэй Паўлавіч.

ВЁСКА СТАРОЕ ЗАКРУЖЖА

Бескаравайны Пётр Аляксандравіч, Варывода Дзмітрый Міхайлавіч, Карзуноў Андрэй Іванавіч, Костачка Харытон Фадзеевіч, Мядзведзька Мікалай Апанасавіч, Рышктакоў Якаў Дзмітрыевіч, Тарасенка Т. В.

ВЁСКА СТАРОЕ СЯЛО

Андрэйка Радзівон Міхайлавіч, 1899; Арцюшкоў Рыгор Савельевіч, 1895; Арцюшкоў Міхаіл Васільевіч, 1897; Болбасаў Дзмітрый Міхайлавіч, 1878; Болбасаў Сазонцій Дзмітрыевіч, 1894; Болбасаў Трафім Дзмітрыевіч, 1902; Бардзюгоў Іван Цяренцьевіч, Бардзюгоў Міхаіл Якаўлевіч, Былькоў Давыд Рыгоравіч, Былькоў Павел Кірылавіч, Васільеў Іван Фёдаравіч, 1888; Васільеў Мікалай Фёдаравіч, 1893; Кавалькоў Давыд Рыгоравіч, 1896; Кавалькоў Іван Рыгоравіч, 1893; Кавалькоў Кузьма Рыгоравіч, 1890; Кавалькоў Ісак Дзямідавіч, Кавалькоў Іван Піліпавіч, 1889; Карнееў Сямён Антонавіч, 1893; Каршукоў Сцяпан Нічыпаравіч, 1888; Карнееў Піліп Антонавіч, Карнееў Іван Антонавіч, Кізін Макар Аляксандравіч, 1893; Кір'янаў Іван Міхайлавіч, 1900; Лук'янаў Еўдакім Ігнацьевіч, Паўлючкоў Сяргей Піліпавіч, Петрачкоў Якаў Майсеевіч, 1892; Польскі Сава Канстанцінавіч, 1894; Рачкоў

Каманда кананерскай лодкі "Быстрый" перад адпр ўкай з Кіева ў Гомель, канец 1920 г. На ёй служылі і ўраджэнцы Веткаўшчыны, адзін з іх — камандзір лодкі В. К. Спасенка — сядзіць чацвёрты злева.

Андрэй Васільевіч, Рачкоў Васіль Кандратавіч, 1890; Садаў Фёдар Іванавіч, Салаўёў Іларыён Самуілавіч, 1900; Салаўёў Сцяпан Самуілавіч, Самонаў Фёдар Рыгоравіч, 1890; Сапегін Галакціён Яўхімавіч, 1898; Семянцоў Самуіл Майсеевіч, 1891; Траскуноў Яўхім Аляксеевіч, 1891; Фанічаў Іван Іванавіч, 1895.

ВЁСКА СТАЎБУН

Арачкоў Міхаіл Максімавіч, Бурносаў Архіп Ігнатавіч, Бычкоў Марк Кузьміч, Булаў Ягор Восіпавіч, Кузьмічоў Рыгор Якубавіч, Лычкоў Марк Кузьміч, Мядзведзеў Алесь, Маслаў Нікадзім Ігнатавіч, Мядзведзеў Сцяпан Паўлавіч, Марачкоў Міхаіл Майсеевіч, Мядзведзеў Лявон Паўлавіч, Смыкоўскі Пётр Якаўлевіч, Самкоў Іван Сцяпанавіч.

ВЁСКА ТАРАСАЎКА

Башкіраў Сяргей Мінавіч, 1898; Саўчанка Леанід Іванавіч, 1895; Саўчанка Фядот Сідаравіч, 1900; Шарманаў Кірыла Іванавіч.

ВЁСКА УХОВА

Баранаў Цярэнцій Ігнацьевіч, Баравіцкі Іван Дзмітрыевіч, Белякоў Нічыпар Аўрамавіч, Кармачоў Іван Кандрацьевіч.

ВЁСКА ФЁДАРАЎКА

Галкоў Лука Фёдаравіч.

ВЁСКА ХАЛЬЧ

Бабкоў Піліп Васілевіч, 1888; Лапін Сямён Яўхімавіч, Панамарышкін Тарас Дзмітрыевіч, Юшчык Фёдар Ануфрыевіч.

ВЁСКА ШАРСЦІН

Бурыкін Палікарп Аляксандравіч.

Маракі з Веткаўшчыны

Многія ўраджэнцы Веткаўшчыны служылі як у Ваенна-Марскім флоце, так і ў Дняпроўскай ваеннай флатыліі, якая над час грамадзянскай вайны і ваеннай інтэрвенцыі налічвала больш за 20 баявых караблёў і каля васьмі тысяч матросаў. Супрацоўнік Цэнтральнага Ваенна-Марскога музея ў Санкт-Пецярбургу Іван Якаўлевіч Краўцоў ласкава прадставіў для Хронікі Памяці знойдзеныя ім звесткі пра жыццё і дзейнасць ваенных маракоў з Веткаўшчыны.

П. П. Адамчыкаў.

Т. М. Былькоў.

АДАМЧЫКАЎ Павел Парамонавіч, нарадзіўся 15.12.1895 г. у сям'і капітана рачных параходаў. У жніўні 1919 прызваны ў ДВФ і прызначаны лоцманам бронепарахода. Удзельнічаў у баях супраць дзянікінцаў і банд на Дняпры. З снежня 1919 стаў лоцманам канерскай лодкі "Геройский". Вясной 1920 ваяваў на Прыпяці. Выдатна ведаў раку, таму часта быў лоцманам у паходах штабных суднаў і канлодак.

БЫЛЬКОЎ Трафім Мікітавіч, нарадзіўся ў 1897 г. у Старым Сяле. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У Кіеве працаваў качагарам парахода. З 1.5.1919 — на бронепараходзе "Арнольд" ДВФ. На ім ваяваў супраць банд Струка, Зялёнага, Грыгор'ева, дзянікінцаў, пятлюраўцаў, палякаў на Дняпры, Прыпяці, Сожы. Ахоўваў м. Камарын ад банды Голака, удзельнічаў у вызваленні Кіева. У чэрвені 1920 служыў качагарам штабнога судна ДВФ "Пушкин", вызваляў Нароўлю, Барбарова, Мазыр.

ГРАМЫКА Іван Антонавіч, нарадзіўся ў 1895 г. у в. Грамыкі. Удзельнік 1-й сусветнай, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, рэвалюцыі 1917. У 1919 добраахвотнікам уступіў у ДВФ, стаў кулямётчыкам, потым камандорам бронепараходаў "Карл Либкнехт",

І. А. Грамыка.

П. М. Нячаеў.

І. М. Нячаеў.

Е. А. Пералыгін.

"Верный", ваяваў на Дняпры і Прыпяці супраць дзянікінцаў і палякаў. У 1920 г. на Беразіне і Дняпры служыў на бронекатэры і штабным судне "Батурин".

ГРОШЫКАЎ Даніла Арцёмавіч – удзельнік грамадзянскай вайны, патомны рачнік, з сям'і вядомага суднаўладальніка-купца. Рэвалюцыю 1917 г. прыняў і ў сакавіку 1919 плаваў камандзірам дапаможнага судна ДВФ "Решительный".

Камісар ДВФ К. Д. Дзюкаў і камісар групы суднаў ДВФ (м. Канеў) І.А. Агееў у характарыстыцы пісалі :

"У ліпені 1919 г. Д. А. Грошыкаў быў камандзірам парахода "Решительный" ДВФ на барацьбе з зялёнаўскімі бандамі. Капітану Д. Грошыкаву, як вопытнаму суднавадзіцелю, даручаліся адказныя баявыя заданні па дастаўцы дэсантных часцей і боепрыпасаў на цяжкія ўчасткі баявых пазіцый. Капітан Грошыкаў самаадданa і выдатна выконваў усе баявыя даручэнні, што садзейнічала паспяховаму разгрому і знішчэнню зялёнаўскіх банд. Потым капітан Грошыкаў разам з рэвалюцыйнымі маракамі флатыліі змагаўся супраць наступаючых контррэвалюцыйных войскаў Дзянікіна, Пятлюры і панскай Польшчы".

НЯЧАЕЎ Парфірый (Пярфіл) Мікітавіч, нарадзіўся ў 1896 г. Закончыў у Кранштаце школу рулявых Балтфлота. Удзельнік рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. З 28.6.1919 – рулявы дапаможнага судна "Прогрессист", які ўваходзіў у ДВФ, затым старшы боцман канлодкі. Удзельнічаў у баях на Дняпры супраць зялёнаўцаў, струкаўцаў, пятлюраўцаў, дзянікінцаў. Ваяваў супраць польскіх захопнікаў у 1-м Марскім берагавым атрадзе ДВФ.

НЯЧАЕЎ Іван Мікітавіч, нарадзіўся ў 1892 г. у Ветцы. Лютаўскую рэвалюцыю сустрэў на фронце. Стаў сакратаром салдацкага камітэта 4-га артдывізіёна, членам армейскага камітэта 10-й арміі, выбіраўся на з'езд прадстаўнікоў ад 10-й арміі (7 – 17 красавіка 1917 г.). Удзельнічаў у кастрычніцкіх падзеях 1917 г. на фронце.

У 1919 на канлодцы "Гневный" ваяваў супраць дзянікінцаў каля Екацярынаслава, банд Зялёнага – каля Трыполля, Струка – каля Чарнобыля. Улетку 1919 года – рулявы дапаможнага судна ДВФ "Рэтвізан" (камандзір Машкоўскі Іван Цітавіч з горада Веткі), дастаўляў на караблі зброю, амуніцыю з Гомеля да вусця р. Прыпяць.

МАЛІШЭЎСКІ Іван Сямёнавіч, нарадзіўся ў 1882 г. у в. Пабужжа. Памочнік машыніста партовага судна Дняпроўскай ваеннай флатыліі "Чигирин" (былы "Смоленск"). Летам 1920 разам з іншымі рачнікамі абслугоўваў караблі ДВФ у час баёў з польскімі акупантамі на Дняпры і Прыпяці. Жанаты. З студзеня 1921 г. звольнены з флатыліі па хваробе. Меў шасцярых дзяцей.

ПАЛАДЗЬЕЎ Сямён Пятровіч, нарадзіўся ў в. Радуга ў 1880. Служыў на Балтфлоце. Паранены ў баях з немцамі пад Псковам і пры абароне Петраграда ад Юдзеніча. З 16 верасня 1919 г. – боцман бронепарахода "Любеч". Удзельнічаў у баях з дзянікінцамі і бандамі пад Кіевам. Пад м. Скрыгалаў ля Мазыра камандаваў аддзяленнем. 4.3.1920. г. маракі адбілі атакі польскіх акупантаў, але былі акружаны пераўзыходзячымі сіламі праціўніка. Большасць маракоў вырваліся з акружэння, але 5.3.1920 г. зноў былі акружаны. С. П. Паладзьеў з баямі праз в. Баркі дабраўся да Гомеля. Летам 1920 г. на канаперскай лодцы ваяваў на Прыпяці і на Дняпры каля Лоева. Пасля баёў працаваў боцманам аховы рэйдаў у Кіеве.

ПЕРАЛЫГІН Емяльян Андрыянавіч, нарадзіўся ў 1869 г. У 1917 г. — капітан парахода "Радуль", з сакавіка — капітан бронепарахода "Верный" ДВФ. Ваяваў супраць банд Струка, Зялёнага, Грыгор'ева, у разгроме Дзянікінскай флатыліі паблізу Печак, у баях за Кіеў у кастрычніку 1919. У 1920 на кананерскай лодцы "Гневный" ваяваў супраць палякаў, на поўдзень ад Кіева. Пасля расфарміравання ДВФ вясной 1921 быў прызначаны капітанам парахода "Интернационал".

ПЕРАЛЫГІН Мікіта Емяльянавіч, нарадзіўся ў 1896 г. Удзельнік 1-й сусветнай і грамадзянскай войнаў, Лютаўскай рэвалюцыі 1917 у Аранієнбаўме і Петраградзе ў складзе вядомага ў гісторыі 1-га кулямётнага палка. У 1919—1920 гг. быў членам Дняпроўскага райкамвода і памочнікам механіка парахода "Пинск", залічанага ў ДВФ. Пасля грамадзянскай вайны служыў на параходзе "Интернационал".

СПАСЕНКА Васіль Кандратавіч, нарадзіўся ў 1891 г. Удзельнік рэвалюцыі 1917 г. У 1918 г. увайшоў у Гомельскі паўстанцкі штаб. Зацверждан як член Веткаўскага рэўкома. Член РКП(б) з 1917 г. У сакавіку 1919 г. удзельнічаў у падаўленні стракапытаўскага мяцяжу ў Гомелі. 26.06.1919 г. залічаны ў ДВФ. З верасня 1919 на камандзнай пасадзе артылерыста бронепарахода "Дарантея" на фронце супраць дзянікінцаў. Працаваў у губкоме. З 20.04.1920 г. старшы артылерыст канлодкі "Некрасов". Ваяваў супраць палякаў на Бераэіне і Дняпры ад Рэчыцы да Жлобіна. У канцы 1920 прызначаны камандзірам канлодкі "Быстрый" (былы "Днепровец"). Дэмабілізаваны ў 1921 як кантужаны. Прызначаны ў Кіеўскую надзвычайную камісію загадчыкам аддзела.

ТРАСКУНОЎ Міхаіл Аляксеевіч, нарадзіўся ў 1898 г. у в. Старое Сяло. Матрос парахода "Ваенна-санітарны № 2", які ажыццяўляў медыцынскае абслугоўванне часцей Чырвонай Арміі. На гэтым параходзе служыў машыністам і яго брат Траскуноў Яфім Аляксеевіч і іншыя ўраджэнцы Старога Сяла. У сакавіку 1919 параход увайшоў у склад ДВФ. М. А. Траскуноў быў прызначаны боцманам. Параход рабіў паходы ў раён баявых дзеянняў над Туравам, Кіевам, Лоевам. Дзейнічаў супраць дзянікінцаў і палякаў.

З успамінаў М.А. Траскунова

Амаль уся наша каманда "Ваенна-Санітарнага № 2" складалася з маіх землякоў са Старога Сяла, Свяцілавіч і іншых блізкіх месцаў

М. Е. Пералыгін.

В. К. Спасенка.

Маракі з Веткаўшчыны: справа — М. А. Траскуноў, у цэнтры — Б. С. Сафонаў, злева — А. П. Ткачоў.

Гомельшчыны. З маёй вёскі былі механік Васільеў Іван Фёдаравіч, яго брат памочнік машыніста Мікалай, мой брат памочнік машыніста Яфім, памочнік боцмана былы чарнаморац Самонаў Кандрат Арыставіч, лоцман Кізін Макар Аляксандравіч, матросы Салаўёў Іларыён Самуілавіч і Семянцоў Самуіл Майсеевіч. Са Свяцілавіч — качагары Маліноўскі Дзмітрый Яфімавіч і Сафонаў Барыс Сямёнавіч, матрос Ткачоў Андрэй Пракопавіч. З

Т. Н. Раманькоў.

М. Дз. Лашыпаў.

М. М. Яўцееў.

Д. М. Яўцееў.

Ф. С. Сафонаў.

Ц. Я. Целяпнёў.

І. М. Яўцееў.

С. М. Яўцееў.

Уваравіч — кок Гарбачоў Кірыла Дзям'янавіч. Многа выхадцаў са Старога Сяла служылі і ваявалі тады на бронепараходах і іншых суднах флатыліі. Кавалькоў Кузьма Рыгоравіч — матрос тралышчыка "Трал". На ім ён удзельнічаў у славутым Лоеўскім прарыве. Яго брат, былы марак-балтыец, Кавалькоў Іван служыў на агітпараходзе "Большевик". На гэтым судне служыў і Карнееў Сямён Антонавіч. На іншых параходах флатыліі служылі і марак-балтыец Самонаў Фёдар Рыгоравіч, брат Кузьмы і Івана Кавальковых — Давыд, матрос Арцюшкоў Рыгор Савельевіч, марак-балтыец Раманькоў Трафім Назаравіч, Целяпнёў Цімафей Ерамеевіч, Петрачкоў Якаў Майсеевіч, Былькоў Трафім Мікітавіч, Болбасаў Дзмітрый Міхайлавіч, Яськоў Сямён Рыгоравіч, Какулькін Авяр'ян Якаўлевіч, Бардзюкоў Трафім Нічыпаравіч, Самонаў Аксён Сільвестравіч, Лашыпаў Мікіта Дзмітрыевіч, Сафонаў Фока Самсонавіч, Целяпнёў Цімафей Ерамеевіч.

ЦЕЛЯПНЁЎ Цімафей Ерамеевіч, нарадзіўся ў 1894 г. Качагар дапаможнага судна "Решительный", які ўваходзіў у ДВФ. Дастаўляў гарматы для ўзбройвання бронепараходаў, ваенныя грузы, дэсанты, войскі.

ЯСЬКОЎ Сямён Рыгоравіч, нарадзіўся ў в. Старое Сяло. Матрос ДВФ на бронепараходзе "Курьер", "Прогрессист". Удзельнічаў у баях супраць банд Зялёнага, у разгроме мяцежных часцей Грыгор'ева ў Чаркасах.

17.8.1919 "Курьер" быў адрэзаны дзянікінцамі ніжэй Чаркас. Маракі ўзарвалі і спалілі карабель. Уся каманда вярнулася ўначы праз тылы дзянікінцаў да сваіх суднаў.

ЯЎЦЕЕВЫ — **Макар Міхайлавіч,** 1895, **Даніла Міхайлавіч,** 1897 г., **Іван Міхайлавіч,** 1900 г., **Сцяфан Міхайлавіч** (в. Тарасаўка). Узімку 1920 г. яны добраахвотна паступілі ў Дняпроўскую ваенную флатылію і былі назначаны на дапаможнае судна "Радуль", якое дастаўляла прадукты, паліва, амуніцыю на фронт. Макар Міхайлавіч Яўцееў служыў у Чырвонай Арміі, раней, у 1919 г., ваяваў на Усходнім фронце супраць калчакаўцаў.

Павіннасці, развёрсткі, рабункі

У канцы 1917 — пачатку 1918 гг. Савецкі урад пачаў ужываць меры працоўнай павіннасці. У лютым 1919 г. у воласці было сфарміравана тылавое апалчэнне. У ягоны склад увайшло каля 300 чалавек. Апалчэнцы капалі акопы, раманціравалі масты і дарогі, расчышчалі лясныя завалы і снежныя заносы. Галоўны цяжар павіннасцей клаўся на сялян. Яны неслі ваенна-гужавую і працоўную павіннасці. Дэкрэт аб гужавой павіннасці быў занадта строгі. За невыкананне гужналога прымаліся жорсткія меры аж да прымусовых работ на 5 гадоў, павелічэнне налога, арышт — да 2-х тыдняў, грашовыя штрафы і інш.

15 студзеня 1920 г., выступаючы на нарадзе ў Гомелі, сакратар выканкома І.А. Часаў гаварыў: "...Фурманачная павіннасць лажыцца цяжкім ярмом на насельніцтва воласці і калі было якое-небудзь спачуванне да Савецкай ўлады, то фурманачная павіннасць знішчыла яго і абвастрыла сялян".

Думку Часава падтрымалі прадстаўнікі іншых валасцей: "...насельніцтва проста збіта з толку развёрсткай упрадкома... сялянам прыходзіцца мець справу з акопнымі работамі, лютуе тыф, але прадстаўнікі павятовай адміністрацыі на ўсё гэта не зварочваюць належнай увагі". Ад бесперапыннай непасільнай работы дохлі коні. У лютым на веткаўшчыне было ўжо 804 бясконных гаспадарак, у красавіку — 40%.

У канцы студзеня 1920 г. СНК РСФСР прыняў Дэкрэт "Аб парадку ўсеагульнай працоўнай павіннасці". Валрэўком меў права аб'яўляць мабілізацыі, звязаныя з аказаннем дапамогі фронту. Тых, хто не хацеў удзельнічаць у працоўнай мабілізацыі, аб'яўлялі дэзерцірамі. Да іх прымяняліся законы ваеннага часу.

Нямецкая, а затым польская акупацыі дабілі гаспадарку, давялі яе да поўнага разбурэння. У 1919 г. у воласці поўнасцю бяздзейнічалі вінакурныя, маслабойныя, цагельныя і іншыя вытворчасці. Асабліва цяжка было з прадуктамі. Насельніцтва часта не атрымлівала ніякіх прадуктаў. Збяднелыя сяляне харчаваліся мякінай і жалудамі. Тым не менш у студзені 1919 г. быў прыняты Дэкрэт аб харчовым падатку. Сяляне павінны былі здаць дзяржаве па цвёрдых цэнах усе лішкі харчовых прадуктаў і фуражу. Пераразмеркаванне зямлі выклікала незадаволенасць заможнай часткі сялянства. Да гаспадарчых цяжкасцей дабаўлялася палітычная нестабільнасць. Актывізаваліся дробнабуржуазныя партыі. Барацьба выходзіла за межы сёл і вёсак. Яна працягвалася на пасяджэннях валвыканкомаў, гучала ў выступленнях дэлегатаў на 4-м павятовым з'ездзе Саветаў. Дэлегаты выказвалі процілеглыя меркаванні ў адносінах да кулацтва. Гучала, напрыклад, "...кулак — вясковы працаўнік, які працуе па 12—15 гадзін у дзень. Ён стараецца паболыш насеяць, завесці, вырасціць лепшую жывёлу — гэта не ёсць кулак, гэта працаўнік і мы павінны яму дапамагчы". Фёдар Іванавіч Жукаў ад імя веткаўскай дэлегацыі выказаў іншую думку: "...Дзяржаве патрэбен хлеб. Сялянства даваць яго адмаўляецца, а дастаць няма дзе. Што рабіць? Савецкая ўлада праз харчорганы вымушана ўжыць крайнія меры — выцягнуць хлеб з вёсак праз харчатрады. Бядняк не павінен давяраць кулакам, не прыкрываць іх, а выконваць развёрстку, бо развёрстка павінна быць страшнай не бедняку, а кулаку...".

Складаліся сур'ёзныя цяжкасці. Адна з іх — бязладныя рэквізіцыі. Было шмат фактаў незаконных, самавольных рэквізіцый. Так, камандзір кавалерыйскага палка самавольна, без узгаднення з мясцовымі органамі ўлады, учыніў збор з насельніцтва аўса, сала, масла і іншага. Або яшчэ. Калона Гомельскай партшколы, якая праходзіла цераз в. Хальч 6 снежня 1920 г., у 3 годзіны ночы адкрыла стральніну, патрабуючы ад сялян масла, сала і іншых прадуктаў.

Не лягчэй было і ад "законных" харчраз-вёрстак. Устанаўліваліся строгія тэрміны здачы падатку. За адказ ад выканання падатку альбо нявыплату падатку ў тэрмін гаспадарцы неадкладна спынялася выдача солі, мануфактуры і іншых востродэфіцытных тавараў з кааперацыі. За невыкананне паставак ва ўстаноўленыя тэрміны рэквізавалася жывёла, маёмасць, накладваліся штрафы ў 10-кратным памеры да велічыні падатку.

14 красавіка 1920 г. адбыўся аб'яднаны з'езд Гомельскай павятовай і гарадской міліцыі. У дакладзе з месца начальнік Веткаўскай валміліцыі Гаўраш гаварыў:

Пасля суботніка.

"... У в. Свяцілавічы атрад Асонава не прад'явіў дакументаў, а пры патрабаванні паказаць такія харчатрадаўцы пагражалі сялянам пусціць пулю ў лоб".

Такія дзеянні выклікалі нараканні з боку сялян, а ў іншых выпадках прыводзілі да больш сумных вынікаў. У прыватнаці, у в. Стаўбун Веткаўскай воласці жыхары ўчынілі самасуд над прадстаўніком губхарчкома Шаламенкам, які застрэліў грамадзяніна Маслава. У в. Кунтараўка салдаты штрафнога батальёна заявілі, што яны з харчатрада, і пад маркай канфіскацыі лішкаў прадуктаў распачалі марадзёрства і збіванне жыхароў. Пры гэтым камандзір штрафнікоў выдаваў сябе за начальніка павятовай міліцыі.

Эканамічныя абставіны ў 1919 – 1920 гг. заставаліся цяжкімі. У выступленні на 2-м з'ездзе Саветаў Гомельскага павета загадчык Веткаўскага валаснога харчаддзела Емяльян Пятровіч Салаўёў гаварыў: "За время существования Советской власти упродком дал волости всего 100 пудов муки. В одном м. Ветка проживает около 13000 человек. Поймите же, товарищи, какие это крохи... Голод между тем не ждет... имели место случаи в волости голодной смерти... Исполком на свои скудные средства открыл бесплатную детскую столовую на 400 душ. Для этой столовой использовано 40 пудов зерна из фонда чрезвычайного хлебного налога..."

Побач з харчразвёрсткай праводзіліся і так званыя "Тыдні дапамогі фронту". У ходзе такога "тыдня" сабралі 30 пар бялізны, 48 папах, 3 кажухі, 18 пар лапцей, 85 кісетаў з тытунём, 6 пар ботаў, анучы, канверты, іголкі, ніткі, 35 пудоў жыта. Толькі за перыяд з 1 жніўня 1919 г. па сакавік 1920 г. выканком перадаў валасному ваенкамату 30 стрэльбаў, 3 бярданкі, адно французскае ружжо, 6 трохцалёвых снарадаў і 3 узрыўныя галоўкі да іх, а таксама 4250 патронаў і інш.

ПАСЛЯВАЕННАЕ СТАНАЎЛЕННЕ ГАСПАДАРКІ

За гады імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў гаспадарка Веткаўшчыны прыйшла ў заняпад. Амаль спынілі сваю работу лесапільныя і канатныя прадпрыемствы, вінакурныя заводы, шавецкія майстэрні, цагельні, бандарныя, калёсныя, ганчарныя промыслы. Спынілася нарыхтоўка драўніны на экспарт. Не хапала рабочых і спецыялістаў.

У незайздросным стане знаходзілася базавая, асноўная галіна эканомікі воласці – сельская гаспадарка. Вясной 1921 г. на адну

сялянскую гаспадарку прыходзілася: 1—2 надзелы зямлі, 5—10 душ членаў сям'і, адзін конь, адна карова, адна свіння, тры-чатыры авечкі. Такіх гаспадарак у воласці было амаль 65%. Рэзка скараціўся памер пасяўных плошчаў. У 1920 г. супраць 1916 г. пасевы аўса склалі прыблізна 40%, бульбы паменшыліся на 50%, а льну і канапель адпаведна паменшыліся ў 2,5—3 разы, яравой пшаніцы і жыта — болей, чым у два разы. Амаль да адной чвэрткі паменшылася пагалоўе коней і буйной рагатай жывёлы. У в. Беседзь, напрыклад, у 1920 г. пагалоўе жывёлы складала ўсяго 18% ад іх колькасці ў 1914 г.

Лепшыя землі адводзіліся ў першую чаргу саўгасам, арцелям і камунам. Сяляне не адабралі такую палітыку. Старшыня Хальчанскага сельсавета Іокаў у сваім выступленні на сходзе заявіў: "Чаму ўлады імкнуцца ствараць саўгасы і чаму не аддаюць зямлю для патрэбаў беззямельным?". З такой пазіцыяй згадзіліся 10 іншых старшыняў сельсаветаў воласці. Нараканні былі далёка не беспадстаўнымі. У в. Хальч, напрыклад, з 1600 дзес. адведзеных саўгасу зямель выкарыстоўвалася толькі 75 дзес. лугу і 4 дзес. прысядзібных участкаў. Асноўная прычына такога стану — безгаспадарчасць адміністрацыі.

Галоўнымі вытворцамі таварнай прадукцыі ў аграрным сектары воласці заставаліся ініцыятыўныя, заможныя сяляне. Валвыканком падтрымліваў стварэнне пасёлкаў і выхад сялян на хутары. Аднак і ў гэтай справе не было дакладна вызначаных рашэнняў. Спрэчным заставалася пытанне аб памерах зямельных адводаў для тых, хто перасяляўся на хутары і пасёлкі. Не было адзіных думак наконт таго, каму і пры якіх умовах можна дазваляць перасяленне. Стала яўным стыхійнае імкненне арганізоўваць дробныя пасёлкі. Узмацнілася роля сельскагаспадарчай кааперацыі. Калектыўныя гаспадаркі ствараліся ў трох асноўных формах: камуны, сельгасарцелі і таварыства па сумеснай апрацоўцы зямлі. Паміж сабой іх розніла ступень абагульненасці сродкаў вытворчасці, арганізацыі працы і размеркавання прадукцыі. 9 кастрычніка 1919 г. у Ветцы была створана арцель "Праца". У арцель добраахвотна аб'ядналася 26 двароў, 257 чалавек, з якіх 141 — працаздольныя. У гаспадарцы было толькі 4 кані і 35 кароў. У арцелі "Пабужская" в. Пабужжа было 17 двароў, 95 душ, 200 дзес. зямлі, 4 кані, 20 кароў, адна саломарэзка, 4 плугі, 4 бараны, 8 кос, 10 сярпоў.

У арцелі "Старасельская" в. Старое Сяло ў гаспадарцы было 8 двароў, 50 чалавек, 100 дзес. зямлі, 3 кані, 10 кароў, 4 свінні, 4 авечкі, 5 плугоў, 8 барон, 4 касы, 8 сярпоў. У арцелі "Працаўнік" было 26 гаспадарак, 152 чалавекі, 162 дзес. зямлі, 7 коней, 24 каровы, 1 сеялка, 1 малатарня, 5 плугоў, 3 бараны, 20 кос, 11 сярпоў. Члены арцеляў мелі ў асабістым карыстанні прысядзібныя ўчасткі, прасцейшыя прылады працы і дамашнюю жывёлу. Даход размяркоўвалі па памерах унесенага паю.

Камуны ствараліся на базе намешчыцкіх маёнткаў. Дзейнічаў прынцып размеркавання прадукцыі па патрэбах выключна за кошт грамадскай гаспадаркі. У таварыствах сумеснай апрацоўкі зямлі даходы размяркоўваліся ў залежнасці ад колькасці абагульненай зямлі і затрачанай працы. У калектыўных гаспадарках захоўваліся элементы ваеннага камунізму — ураўнілаўка пры размеркаванні даходаў, адмова ад лішкаў прадуктаў.

Калектыўныя гаспадаркі мелі перавагі. Жыццё сялян у іх было больш абароненым законамі і дзяржаўнай палітыкай, чым жыццё хутараніна або аднаасобніка. Меншымі былі падаткі. Даваліся і пэўныя льготы. Напрыклад, права самастойна выкарыстоўваць лішкі прадукцыі, у тым ліку іх абмен у дзяржавы на тавары планавага забеспячэння (насенне, матэрыялы, машыны, інвентар). Набыццё калектыўнай

прадукцыі дзяржава вяла па цэнах, блізкіх да рынкавых, і пры гэтым частку прадукцыі калектыўныя гаспадаркі мелі права рэалізоўваць на рынку па свабодных цэнах. Асноўную колькасць таварнай прадукцыі збывалі праз кааператывы. Бясспрэчнай перавагай было і тое, што калектыўныя гаспадаркі плацілі за 1 дзес. пашы 2,5 руб. падатку, а аднаасобнік — 8 руб.

У рэальнай сітуацыі канца 1920 і пачатку 1921 года выпікі ваеннага разбурэння эканомікі адчуваліся на кожным кроку. Голад, эпідэміі і беспрацоўе спараджалі масавую незадаволенасць сялянства. Прадразвёрстка і манаполія дзяржавы на гандаль падрывалі матэрыяльныя стымулы зацікаўленасці сялянства ў развіцці вытворчасці.

Г. М. Чаянкова.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ВЕТКАЎСКАГА РЭЎСАЎДЭПА

21.2.1920 г.

"Аб барацьбе з продажам нарміраваных прадуктаў"

Дакладчыкамі выступілі: заг. арг. аддзела упрадкома т. Вайнберг і заг. прад. аддзела т. Салаўёў.

Пытанне ўзбудзіла гарачыя і вострыя спрэчкі, у выніку якіх былі прапанаваны дзве рэзалюцыі:

Першая — тав. С. Малеевым і Вайнбергам — "Прымаючы ва ўвагу, што свабодны гандаль, які ўзвінчвае надзвычайна высокія цэны на ўсе прадметы першай неабходнасці, не дае ніякай магчымасці беднаце набыць апошнія і што гэты самы гандаль у корані падрывае правядзенне ў жыццё харчовай палітыкі Цэнтра і падрывае правядзенне ў жыццё рэвалюцыйнага таваразвароту, Рэўсаўдэп пастанаўляе: бязлітасна змагацца з прыватным гандлем і спекуляцыяй".

Другая — тав. Часава. Заслухаўшы даклады Вайнберга і Салаўёва, Саўдэп пастанавіў: даклады прыняць да ведама. Наогул далучыцца да харчовай палітыкі Цэнтра, праводзіць у жыцце ўсё загады Цэнтра, з улікам выключных харчовых і эпідэмічных умоў мястэчка і воласці.

За першую рэзалюцыю галасавала 18 членаў Рэўсаўдэпа, за другую — 7. Прынята першая рэзалюцыя.

Старшыня

Сакратар

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 32. Воп. 1. Спр. 89. Л. 26.

З ЗАГАДА ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЯТОВАГА РЭЎКОМА

3.11.1920 г.

Для ўмацавання тылу і абароны маладой рэспублікі Саветаў па загаду рэўваенсавета Заходняга фронта ад 19 кастрычніка 1920 г. ў Віцебскай і Гомельскай губернях былі заснаваны рэвалюцыйныя камітэты як часовыя надзвычайныя органы пралетарыяту, у задачу якіх уваходзіла падтрыманне рэвалюцыйнага парадку на месцах, аператыўнае рашэнне задач абарончага значэння і інш. З лістапада 1920 г. на аснове загада Гомельскага павятовага рэўкома ў Ветцы быў арганізаваны валасны рэвалюцыйны камітэт. У яго загадзе адзначалася:

"... У Ветцы арганізаваны валасны і местачковы рэвалюцыйны камітэт, які аб'яўляе сябе вышэйшай палітычнай і адміністрацыйнай уладай на тэрыторыі воласці..."

Адстойваючы інтарэсы савецкай дзяржавы, інтарэсы рабочых і сялян, Веткаўскі рэвалюцыйны камітэт з першых дзён стварэння накіраваў сваю дзейнасць на падтрыманне парадку ў воласці і мястэчку, на барацьбу з бандытызмам, дэзерцірамі і спекулянтамі.

Першаступеннае значэнне прыдаваў рэўком таксама ўзмацненню працоўнай дысцыпліны, своечасоваму выкананню, распараджэнняў па забеспячэнню харчразвёрсткі і выкананню гужавой павіннасці.

У адным са сваіх першых загадаў, датаваных 3 лістапада 1920 г., Веткаўскі валасны рэўком патрабаваў:

"У сувязі з абставінамі, выкліканымі неражываемым момантам, загадваецца:

1. Усім аддзелам выканкома і іншым савецкім установам і арганізацыям падняць прадукцыйнасць працы, не дапускаючы расхлябанасці ў рабоце, супрацоўнікам быць акуратнымі і добрасумленнымі;

2. Сельсаветам прадпісваецца выконваць усе загады рэўкома ў найкарацейшы тэрмін, асабліва ў частцы выканання нарадаў па гужавой павіннасці і харчразвёрстцы..."

Далей у загадзе адзначалася, што ў далейшым будзе выкараняцца распаўсюджванне хлуслівых слухаў аб ваенных і палітычных падзеях, будуць прыцягвацца да пакарання ўсялякія спекуляцыйныя мерапрыемствы.

Як і ў іншых месцах Гомельскай губерні, Веткаўскі валасны рэўком, выканаўшы сваю місію, перадаў усе паўнамоцтвы пастаянным органам улады — Саветам.

А. Кутузаў.

СА СПРАВАЗДАЧЫ ГУБЕРНСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ МЕСЦАЎ ЗНЯВОЛЕННЯ

1922 г.

...В ведении губернского управления находится 5 исправительных домов и 2 сельскохозяйственные колонии для заключенных: ... "Заря" и "Воля".

...Колония имеет огромное воспитательное значение. В ней отсутствуют тюремные запоры, решетки и все зиждется на здоровом общении заключенного с работой в поле, огороде и мастерских. Колония "Воля", возникшая при чрезвычайных и трудных условиях, при отсутствии не только моральной, но и материальной поддержки все же успела оправдать свое существование. В ней проделана большая организационная работа, начиная от приспособления ее к новому назначению стать местом заключения, и кончая достаточно развитым сельским хозяйством с мастерскими с весьма солидным инструментальным и инвентарным живым и мертвым имуществом. Колония "Воля" располагала следующим количеством земли: пахотной 118 дес., луговой 40 десятин, под садом и огородом 12 десятин. В колонии "Воля" в 1922 г. было засеяно рожью 34 1/2 дес., под яровым 35 дес., под корнеплодами 1 дес., под капустою 1 дес. На будущий 1923 год выработан новый организационный план.

Живой инвентарь колонии "Воля" выражается: быков 1, коров 10, молодняка 6, лошадей 17, свиней 5, поросят 17.

Полесский коммунар, г. 1923, с. 117—121.

СА ЗВЕСТАК АБ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАХ, ЯКІЯ ЎВАЙШЛІ Ў СКЛАД НОВЫХ ВАЛАСЦЕЙ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

1922—23 г.

Воласць складаецца з Веткаўскай воласці за выключэннем Вылеўскай па р. Іпуць, сяла Старое Пакалюбіцкай воласці, Юркавічы, Шарсцін, Нова-Іванаўкі, Барталамееўкі і Вераб'ёўкі Рэчкаўскай воласці, вёскі Прысно Дудзіцкай воласці.

У новую Веткаўскую воласць уключаны:

Мястэчкі: Ветка, Хальч, Шарсцін.

Сёлы: Навасёлкі, Радуга, Чыстыя Лужы, Нова-Закружжа, Вылева, Старое, Прысно, Барталамееўка.

Вёскі: Кунтараўка, Беседзь, Рудня-Споніцкая, Тарасаўка, Пабужжа, Старое Закружжа, Асадым, Сінемкі, Ірынаўка, Лявонцева-Паскевіча, Лявонцева-Шацкае, Папсуеўка, Косіцкая, Дубовы Лог, Раманава, Юркавічы, Нова-Іванаўка, Вераб'ёўка. Іншых населеных пунктаў — 15.

Усяго ў воласці насельніцтва 37525 чалавек.

Заг. Уступраў (Сарокін)

Сакратар (Слуцкін)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 46. Л. 29.

Нэп на Веткаўшчыне

21 сакавіка 1921 г. сесія Усесаюзнага Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта РСФСР зацвердзіла "Закон аб харчовых падатках". Праз некалькі дзён урад выдаў Дэкрэт "Аб памерах натуральнага падатку" і Дэкрэт "Аб свабодным абмене, пакупцы і продажы сельскагаспадарчых прадуктаў у губернях, якія скончылі развёрстку". У комплексе гэтыя дакументы склалі заканадаўчую базу новай эканамічнай палітыкі (нэпа). Яны арыентавалі на традыцыйныя рыначныя сувязі розных форм уласнасці — дзяржаўнай, кааператыўнай, дробнатаварнай і прыватнай. Такая палітыка аказалася нечаканай для большасці кіраўнікоў усіх эшалоноў улады. Не гатовымі да такога павароту аказаліся і нізавыя органы ўлады. Працоўныя ж і горада і вёскі выказвалі сваё поўнае адабрэнне дэкрэтаў. 27 верасня 1921 г. 6-ы валасны з'езд Саветаў расцаніў нэп як "...мероприятие, идущее на пользу государству и трудящимся", ибо "... в нем заинтересованы и государство, и арендаторы, и рабочий".

Пробным каменем новай эканамічнай палітыкі стала пасяўная і падатковая кампанія. Вясной 1921 г. сталі ствараццa пасяўныя камітэты. Галоўная іх задача была ў тым, каб пашырыць пасяўныя плошчы. З 1 па 15 красавіка 1921 г. у воласці прайшоў "Двухтыднёвік Чырвонага аратага". Узялі на ўлік наяўнае насенне ў сялян, разгарнулі працу майстэрняў па рамонту інвентару, мабілізавалі саматужныя промыслы, кузні, рымарскія ды іншыя майстэрні для работы па рамонту сельгасінвентару і прылад працы. План сяўбы яравых і азімых на 1921 г. воласць выканала. У некалькіх месцах засеяныя плошчы наблізіліся да ўзроўню 1916 г.

Не менш сур'ёзным экзаменам для новага эканамічнага курсу ў воласці стала і першая прадпадатковая кампанія. У ліпені быў праведзены "Ударны харчовы месячнік" па збору прадпадатку. У жніўні – верасні – "Бульбяны двухтыднёвік". Да канца 1921 г. прадпадатак па хлебу, бульбе, іншых прадуктах воласць выканала на 100%.

З увядзеннем прадпадатку непарыўна было звязана развіццё гандлю. Галоўная роля ў таваразвароце адводзілася кааперацыі. У канцы 1920 г. веткаўскія кааператывы "Рыбкаап", "Чырвоны араты", "Грамадскі кааператыў" зліліся ў адзінае спажывецкае таварыства. У чэрвені 1921 г. у воласці правялі "Тыдзень кааперацыі". За гэты час крамы адчыніліся ва ўсіх сельсаветах. Кожнае вясковае кааператыўнае таварыства абслугоўвала ў сярэднім да тысячы чалавек. Практыка падказвала мэтазгоднасць хуткага развіцця грашовай рэформы гандлю. Прыняты Саўнаркомам у маі 1921 г. Дэкрэт "Аб абмене" дазволіў гандляваць тымі прадуктамі вясковай гаспадаркі, якія заставаліся пасля выканання прадпадатку. Права абмену і продажу распаўсюджвалася на вырабы саматужнікаў і рамеснікаў. Гандаль рабіўся рэнтабельным звяном у развіцці гаспадаркі. У гандлі праходзіла і мяжа вострых класавых супярэчнасцей. Менавіта ў гэтай сферы была канкурэнтная барацьба за тое, хто лепш абслужыць вёску, задаволіць яе эканамічныя патрэбы.

Прыватны рознічны гандаль у воласці меў шырокую сетку ларкоў, праяўляў гібкасць, вынаходлівасць. Прыкметную ролю адыгрываў і прыватны аптовы гандаль. Развівалася і спажывецкая кааперацыя. На 510 двароў з насельніцтвам 26800 чалавек у воласці спажывецкае таварыства мела 1273 пайшчыкаў спажыўкааперацыі. Кааперыравана было 20% гаспадарак. На той перыяд гэта быў поспех.

Адчуўшы рост уплыву кааперацыі ў Веткі, прыватнікі стварылі тут свой кааператыў. Павесілі маляўнічую шыльду, на якой было прыгожа напісана слова "Таварыства" і гэтым думалі прывабіць пакупнікоў. Канкурэнцыя з боку заможнай часткі гандляроў прымусіла спажывецкае таварыства знайсці дадатковыя сродкі і побач са сваёй крамай адчыніць бакалейна-мануфактурны магазін.

Значны асабісты ўклад у развіццё кааперацыі воласці зрабілі Майсеенка С. С., Набокіна М. Г., Бурыкіна М. А., Колікава Л., Нікіценка А., Модзіна П. Г., Раманькова М. І., Арцюшкова Е. М., Ксянзова Т. П., Казлова В. А. Варта падкрэсліць, што працаваць ім даводзілася ў складаных умовах крызісу збыту, "нажніц цэн".

Нэп выклікаў перабудову і ў прамысловасці. Летам 1921 г. у воласці пачалася перадача асобных прадпрыемстваў у арэнду прадпрымальнікам і кааператывам. Частку

дробных прадпрыемстваў дэнацыяналізавалі, а дзяржаўныя вытворчасці перавялі на дзяржразлік. Да 1 студзеня 1923 г. у арэнду было пададзена 134 прадпрыемствы, у т.л. 2 лесапільных, 2 харчовых, 47 кузняў, 55 ветраных, 2 паравыя і 2 нафтавыя млыны.

Ва ўмовах нэп выканком максімальную ўвагу ў воласці аддаваў развіццю вясковай гаспадаркі. Гэта быў працэс шматгранны і нялёгкі.

Г.М. Чаянкова.

Дакументы сведчаць

З РЭЗАЛЮЦЫІ ВЕТКАЎСКАГА ВАЛАСНОГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА АБ УХВАЛЕННІ ПАСТАНОВЫ IX УСЕРАСІЙСКАГА З'ЕЗДА САВЕТАЎ

22 января 1922 г.

Заслушав доклад о IX Всероссийском съезде Советов, Ветковский волсъезд постановляет: приветствовать все мероприятия IX съезда, направленные к поднятию и улучшению жизни страны. В области продналога съезд считает необходимым напрячь максимум усилий к тому, чтобы продналог по всем видам был выполнен к сроку, указанному Центром. В области оказания помощи голодающим Поволжья съезд приветствует мероприятия Советской власти по переходу от методов благотворительности к правильному снабжению голодающих Поволжья путем прикрепления голодающих к определенным сельским и городским пунктам.

Съезд предлагает волкомпомголоду в возможно кратчайший срок реализовать все продукты, причитающиеся от населения Ветковской вол., направив их по назначению. Съезд приветствует постановление IX съезда о предоставлении крестьянству выбора форм землепользования.

Съезд предлагает исполкому принять все меры к улучшению и поднятию сельского хозяйства: а) в возможно кратчайший срок уничтожить чересполосицу, б) передать малоземельным хозяйствам необходимое количество земли, дав таким образом возможность крестьянам целиком использовать свой труд, в) съезд предлагает исполкому произвести распределение лугов до весны, руководствуясь постановлениями Центра.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 11. Л. 5,7.

З РЭЗАЛЮЦЫІ АДКРЫТАГА СХОДУ ЧЛЕНАЎ ЯЧЭЙКІ РКП(б) АКОЛІЦЫ в. ХІЗЫ РЭЧКАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА АБ СУДЗЕ НАД ЭСЭРАМІ

18 июня 1922 г.

Мы, коммунисты и беспартийные околицы Хизов, Речковской вол., Гомельского у., присутствующие на собрании Хизовской комячейки, выслушав доклад о суде над партией эсеров, заявляем, что необходимо самым беспощадным образом рассчитаться с бунтовщиками, именующими себя социалистами. Необходимо раз и навсегда покончить с людьми, которые сознательно хотели вести темные народные массы обратно к торжеству помещиков и капиталистов.

Да здравствует Советская власть и ее вдохновитель РКП(б)!

Долой всех приспешников буржуазии, желающих нового закабаления освободившемуся трудовому народу!

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 197. Л. 39.

З РЭЗАЛЮЦЫІ ВАЛАСНОЙ СЯЛЯНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА АБ АРГАНІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ КААПЕРАЦЫІ

6 февраля 1924 г.

Заслушав доклад тов. Климанского о сельскохозяйственной кооперации, Светиловичская волостная конференция беспартийных крестьян:

1) одобряет линию Советской власти, взятую по отношению к кооперации;

2) конференция считает, что только через сельскохозяйственную кооперацию можно достигнуть улучшения сельского хозяйства в стране;

3) намеченный долгосрочный кредит машин даст возможность укрепить кооперацию, а равно и деловую смычку города с деревней;

4) по вопросу о коренной деятельности кооперации конференция считает, что только путем кооперирования крестьянских масс можем достигнуть социалистических начал, а равно лишить возможности развиваться частному капиталу, т.е. спекулянтам;

5) малый рост кооперирования крестьян по Гомельской губ., 3 проц., объясняется:

а) низким уровнем развития крестьянства и

б) отсутствием надлежащего кредита в кооперированных центрах.

6) Учитывая полный застой сельскохозяйственной кооперации в нашей Светиловичской вол., конференция просит губсельхозкредитсоюз усилить свою работу по развитию низовой первичной сети кооперативов.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 30. Воп. 1. Спр. 103. Л. 6,7.

У дапамогу Паволжу

Засуха і неўраджай у Паволжы ў 1921 г. прывялі да голаду ў шэрагу раёнаў Расіі. Кампанія дапамогі галадаючым Паволжа ў воласці пачалася ў ліпені 1921 г. 27 ліпеня 1921 г. з'езд Веткаўскага валсавета прыняў рашэнне па выяўленню спосабаў і магчымасцей аказання дапамогі галадаючым Паволжа. Прайшлі спецыяльныя сесіі сельсаветаў. Покацкі сельсавет пастанавіў: "...прымаючы ва ўвагу вялікія бедствы грамадзян Паволжа, а разам з імі і ўсёй нашай рабоча-сялянскай рэспублікі, неабходна зараз жа аказаць насільную дапамогу, пры гэтым устанавіць наступную норму – з усякага надзелу ўнесці дабравольна 15 фунтаў хлеба". Гэтае рашэнне было выканана.

У жніўні 1921 г. газета "Новая деревня" паведамляла, што ў Веткаўскай воласці работа па аказанню дапамогі галадаючым ідзе паспяхова. Сяляне в. Беседзь здалі галадаючым 50 пудоў жыта, у в. Тарасаўка – адлічылі па 20 фунтаў збожжа з кожнага надзелу, у в. Рудня-Споніцкая і в. Чыстыя Лужы – па 10 фунтаў з надзелу, а калектыў сталовай – 20% ад 2-месячнага акладу, калектыў рабочых камунгаса – па 20% ад натуральнага пайка. Мясцовае культпрасветграмадства ставіць спектаклі і арганізоўвае канцэрты, уся сума збораў ад якіх адлічваецца ў фонд дапамогі галадаючым. Сяляне і рабочыя воласці настроены спагадліва і з ахвотай адклікаюцца на заклік аб дапамозе.

2 жніўня 1921 г. агульны сход грамадзян Веткаўскага саюза будаўнікоў пастанавіў адлічыць на карысць галадаючым 20% натуральнага пайка і добраахвотна ахвяраваць сродкі на абсталяванне будаўнічага цэха. Нягледзечы на адлічэнні ад пайка, сход заклікаў грамадзян зрабіць пасільную дапамогу натурай. Апрача таго, са сродкаў адзінага спажывецкага таварыства адлічылі 20 пудоў зерня.

На 1 верасня 1921 г. у воласці было сабрана ў фонд галадаючых грашовых сродкаў 5 210 917 руб., збожжа – 310 пудоў.

У кастрычніку 1921 г. у воласці прайшоў "Тыдзень дапамогі Паволжу". На прадпрыемствах і ўстановах рабочыя добраахвотна адлічвалі ў фонд галадаючых частку заробку. рабілі суботнікі і нядзельнікі. Так, працоўныя канатна-вяровачнага завода адлічылі ў фонд галадаючых аднадзённую заработную плату. Гэты калектыў у фонд дапамогі адпрацаваў другую змену і адзін нядзельнік. Кошт сыравіны і матэрыялаў рабочыя аплацілі са свайго заробку. У выніку калектыў сабраў 47100 руб.

Сяляне в. Хальч, Тарасаўка, Пабужжа, Навілаўка, Навасёлкі, Кунтараўка, Прысно ды іншых сабралі апрача зерневых і агародныя культуры, бульбу, садавіну.

У зборы сродкаў удзельнічалі і святары цэркваў воласці. Збор адбываўся па нядзелях і ў святочныя богаслужэнні на талерку членаў прыходскага савета. У храме на відных месцах выстаўляліся талеркі ці кружкі з надпісам: "У дапамогу галадаючым". Падлік гэтых ахвяраванняў праводзіўся перыядычна членамі прыходскага савета. Сабраныя сродкі адда-

валіся царкоўнаму старасту на захаванне. Перад пачаткам збораў сродкаў зачытвалі заклік патрыярха і ў патрэбных выпадках вялася казань. Зборы ахвяраванняў праводзіліся і ў дамах прыхаджан грашыма і прадуктамі. Ахвяраванні цэркваў на карысць галадаючым уносіліся і царкоўнымі каштоўнасцямі.

Г. М. Чаянкова.

Дакументы сведчаць

З ПРАТАКОЛА АГУЛЬНАГА СХОДУ ВЕТКАЎСКАГА САЮЗА СПАЖЫВЕЦКІХ ТАВАРЫСТВАЎ

2 жніўня 1921 г.

Повестка дня:

п.3. О помощи голодающим Поволжья

Постановили: п.3. Принимая близко к сердцу несчастье братьев крестьян и рабочих Поволжья и остальных голодающих 10 губерний, общее собрание обещает по силе возможности и средств отчислить в пользу голодающих 20% натурального пайка и добровольные пожертвования на строительство цеха вне зависимости от отчислений от пайка, вносить посильную помощь натурой... Кроме того, из средств ЕПО отчислить 20 пудов зерна...

Председатель

Секретарь

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 26. Л. 4.

СПІС ДЗЯЦЕЙ ПАВОЛЖА, ЯКІХ УЗЯЛІ НА ВЫХАВАННЕ ГРАМАДЗЯНЕ ВЕТКАЎСКАЙ ВОЛАСЦІ

Фамилия и имя детей	Откуда ребенок прибыл (губерния)	Куда отдан (село, местечко, деревня)	Кому отдан
Саладовникова Прасковья	Уральской	м. Шерстин	Езину Якову
Живолонская Александра	Самарской	–"–	Лакину А.
Свентуковская Евдокия	Гродненской	–"–	Сундукову А.
Сердюков Пётр	–"–	Р. Хутора	Лосеву Ф.
Борисов Сергей	–"–	–"–	Парфенкову Л.
Борисов Николай	–"–	–"–	Будову Степ.
Обёртышев Григорий	–"–	м. Шерстин	Кожубину Ф.
Лавренкова Мария	–"–	Юрковичи	Демову Ф.
Суворова Матрёна	–"–	–"–	Котлярову М.
Шкуренкова Вера	–"–	–"–	Авсенкову И.
Прокофьев Виктор	Саратовской	–"–	Данилькову И.
Мурей Никита	–"–	–"–	Троянову Е.
Китасов Александр	Казань	Хизы	Ивановскому Д.
Константинов Константин	–"–	–"–	Лапицкому М.
Махналёв Василий	Вятской	–"–	Лапицкому П.
Егоров Егор	–"–	–"–	Лапицкому И.
Костин Иван	Самарской	–"–	Лапицкому А.
Гамактиолов Владимир	Воткинской обл.	–"–	Лапицкому Тимофею
Семёнов Александр	Оренбургской	д. Гористы	Обусовичу Тарасу
Ледяев Владимир	Самарской	–"–	Обуховичу С.
Турнев Илья	Вятской	–"–	Якубович Д.
Иванов Алексей	–"–	–"–	Лапицкому П.
Карпов Сергей	Казанской	–"–	Лапицкой Анне
Морейко Пётр	Екатеринослав.	–"–	Лапицкому И.
Тулакова Анна	Самарской	Юрковичи	Котлярову И.
Скибитская Ефросиния	Саратовской	Шерстин	Лосеву Б.

Адзіны сельскагаспадарчы падатак

Сяляне плацілі 13 відаў падатку (хлеб, сала, малако, мяса, яйкі, птушкі, мёд, воўна, лён, пушніна, скуркі, агародныя культуры і інш.). Падатак здавалі ўвесь год.

10 мая 1923 г. быў уведзены сельскагаспадарчы падатак. Выплачваўся на 40% натурай — жытам і пшаніцай і на 60% — грашыма.

28 мая 1923 г. у воласці прайшла беспартыйная сялянская канферэнцыя. Асноўнае пытанне — "Аб новай падатковай палітыцы". У прынятай рэзалюцыі падкрэслівалася, што "...задачай сялянства з'яўляецца дакладнае і бездакорнае выкананне падатковых абавязкаў перад Савецкай рэспублікай".

Праз год, 29 чэрвеня 1924 г. адбылася другая беспартыйная сялянская канферэнцыя. Галоўнае пытанне: "Аб адзіным сельгаспадатку". Выявілася сур'ёзнае незадавальненне метадамі налічэння адзінага падатку. Падатак 1924 г. аказаўся значна большым, чым у 1923 г., а ўраджаі у 1924 г. у цэлым быў ніжэй, чым у 1923 г. Падаткам абкладаўся маладняк да 1,5 года, які даходаў гаспадарцы не прыносіў. Выконваць ва ўстаноўленыя тэрміны падатак было цяжка, асабліва бедным сялянам, якія перасяліліся пасля на хутары. Нямала папрокаў выказвалася на "нажніцы" цэн (нізкія закупачныя цэны на сельгастаовары і высокія — на прамтавары).

Скаргі выказвалі дэлегаты ад в. Беседзь, Прысно, Шарсціна, Навасёлак, Хальча, Радугі, Веткі ды ад іншых вёсак. Не спяшаліся здаваць падатак і заможныя гаспадаркі. Чакалі павышэння закупачных цэн.

Падатковая палітыка дзяржавы мела ярка выражаны класавы характар. Дзейнічалі жорсткія метады — сельгаспадатак прымусова адбіралі. І гэта азлабляла сялян, выклікала не толькі незадавальненне, але падчас і ўзброенае супраціўленне. У в. Дзятлавічы быў забіты селькор і сакратар ячэйкі РЛКСМ І. С.Лебедзеў, у в. Радуга — загадчык Навасёлкаўскага вінзавода К. Н. Бялоў, у в. Прысно цяжка паранены старшыня сельсавета М. Ф. Власянкоў, у раёне в. Свяцілавічы пачала дзейнічаць узброеная група пад назвай "Агурчык" і іншыя банды.

У дакладзе аб працы міліцыі пад час сельгаскампаніі 1924 г. адзначалася, што лік зламысных ухіленняў ад уплаты падатку расце. Яшчэ болей было выпадкаў ухіленняў ад уплаты падаткаў у тэрмін. Падкрэслівалася, што беднякі кажуць: "...Бярыце ўжо апошнюю карову за падатак, а то вадзіў яе прадаваць да мясніка-спекулянта, а ён дае ўсяго 15 руб. Паміж тым, як у яго фунт мяса каштуе 15 кап".

Як падкрэслівалася ў дакладзе, дзеля таго, каб "...стварыць у вёсцы патрэбны пад'ём і прымусіць масу сялян да хутчэйшага ўнёску сельгаспадатку, прымяняліся меры адміністрацыйнага ўздзеяння шляхам заключэння асобных грамадзян пад варту для унёску падатку, які ім даваўся. Пасля чаго яны, па наяўнасці квітанцыі, вызваляліся".

У вёсках працавалі выязныя сесіі народнага суда. Пакаранні за несвоечасовую ўплату падатку былі розныя: ад аднаго года да двух тыдняў заключэння ў турму. У большасці выпадкаў прымянялася мера папярэджання: арышт на тэрмін ад двух да чатырох месяцаў, або ад двух тыдняў да аднаго месяца. Пры гэтым усякі прыгавор суправаджаўся канфіскацыяй маёмасці на суму ад 10 да 50 руб. і поўнай уплатай падатку. У вёсцы можна было пачуць, што "...Савецкая ўлада за нявыплату сельгаспадатку рабуе гэтак жа, як і ўраднік пры нявыплаце падатку".

У. Я. Райскі.

Дакументы сведчаць

№ 238

З РЭЗАЛЮЦЫІ ВЕТКАЎСКАЙ ВАЛАСНОЙ БЕСПАРТЫЙНАЙ СЯЛЯНСКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА АБ АДАБРЭННІ АДЗІНАГА СЕЛЬГАСПАДАТКУ

28 мая 1923 г.

Заслушав доклад о едином сельхозналоге, крестьянская конференция Ветковской вол. считает налоговую политику Советской власти, проводимую в деревне, безусловно правильной.

Конференция с удовлетворением отмечает, что XII съезд РКП(б) разрешил вопрос о налогах в деревне так, как учил проводить политику по отношению к крестьянству тов. Ленин. Мы сознаем, что те громадные расходы, которые приходится нести нашему рабоче-крестьянскому государству, должны ложиться определенной частью и на крестьянство. Но правительство рабочих и крестьян, руководимое Коммунистической партией, строго учитывает возможность обложения сельского хозяйства, устанавливая размеры единого сельскохозяйственного налога. Наше правительство, конечно, проводило в жизнь руководящую мысль тов. Ленина: "Брать с крестьянина столько, чтобы он становился в этом году богаче, чем был в прошлом году". А те мероприятия, которые наметило Советское правительство по установлению единого сельскохозяйственного налога, замене части налога деньгами, вывозу сельскохозяйственных продуктов за границу с целью повышения цен на сельскохозяйственные товары, — облегчает крестьянству выполнение налога.

В конечном счете мы видим, что правительство рабоче-крестьянских Советов проводит налоговую политику в деревне так, чтобы союз рабочих и крестьян — залог непобедимости республики Советов, становился крепче и неразрывнее. А задачей крестьянства является точное и безукоризненное выполнение налоговых обязательств перед Советской республикой, ибо это укрепляет ее мощь и делает неустрашимой для врагов рабочего класса.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 50. Л. 40.

ХОЗЯЙСТВО КРЕСТЬЯНИНА д. СТАРОЕ СЕЛО СЕМЕНЦОВА ИВАНА ФЕОФАНОВИЧА

По количеству пашни и живого инвентаря (0,5 дес.), одна лошадь и одна корова — это хозяйство подходит к группе бедняцких хозяйств, но по местным условиям, сравнительно с мощностью прочих хозяйств, данное хозяйство подходит к группе нижесредних хозяйств, которых в Старом Селе насчитывается до 150.

История хозяйства такова. В 1919 г. Семенцову удалось отобрать от церкви поповскую землю в пользу бедноты, часть которой была выделена и ему. С этого времени и началось хозяйство. 1919 год и последующие годы были годами тяжких переживаний и всякое созидание было сопряжено с затруднениями, то этим и объясняется бедность хозяйства постройками, живым и мертвым инвентарем, необеспеченность продуктами питания и предметами первой необходимости в достаточном количестве.

И тем не менее за 4 года видны достижения в развитии хозяйства: построена изба, сени и навес, куплена лошадь, необходимый инвентарь.

Земледелие. В хозяйстве под усадьбой 0,6 десятины, при усадьбе еще 7—8 десятин, пашни — 0,5 десятины, сенокос — 0,25 дес., кустарники — 0,04 дес., выгон — 0,05 дес. Итого усадебной земли 92,7%, неудобной 0,7 дес. (5,6%). Земля в поле и в огороде — суглинки.

Ввиду малоземелья — двуполье. Из-за чересполосицы и малоземелья травополье не практикуется. В озимом поле — рожь, в яровом —картофель. Урожай ржи — сам семь. Картофель — сам 6.

Доход от полеводства — 34 руб. Это 36% всех доходов от реализации сельскохозяйственных продуктов (в год 93 руб. 90 коп.).

Огородничество. В Старом Селе — это видная отрасль сельского хозяйства. Огород 125 кв. саженей. Благодаря тщательному уходу больший доход дала капустная рассада (48 руб.).

Расходы на продукты питания и товары первой необходимости составляют в хозяйстве 35% доходов. Товары закупаются большей частью в ЕПО или в сельскохозяйственном товариществе, в которых Семенцов пайщик. Другие расходы — за счет рынка или сельчан.

Валовой оборот хозяйства — 1225 руб. 52 коп. в год, от которого приход составляет 50%, расход — 40,7%, и таким образом экономия составляет 9,3%.

Приход от реализации своих продуктов составляет 35%, а отхожий промысел и займы — 65%.

Расходы на зернофураж, продукты питания и другие товары — 150 руб. 34 коп., на инвентарь — 106 руб. 51 коп. — 40%, на паи и проценты отчислений в кооператив — 11 руб. 75 коп.

1. Приход (35%) не покрывает расходов на 56 руб. 35 коп. (21%). Следовательно, хозяйство нерентабельное, не товаропроизводящее, а потребляющее.

2. Главная статья дохода (65%) — от отхожего промысла и займов. Следовательно, при

настоящих условиях хозяйство не может стать прибыльным и имеет избыток рабочей силы.

Быт семьи. В семье 2 трудоспособных — хозяин (34 года), его жена (24 года). У них двое детей (3 и 1 год).

И. Ф. Семенцов пользуется у бедноты большим авторитетом. Он был председателем и секретарем ККОВ, проводит классовую линию, защищает бедноту. Есть трения с сельсоветом на фоне землеустройства, так как председатель держит линию среднезажиточной части населения, не желающей землеустройства.

В 1918 г. Семенцов был пред. ревкома Старого Села. С октябрьской революции служил в красной гвардии. Состоял членом ревкома в г. Харькове, членом полкового комитета 29 пехотного полка и занимал должность комиссара полка. В партии не состоял. В члены партии вступил в 1924 году.

С 1918 года, с организацией в селе культпросветкружка, состоял членом драмкружка и участвовал в работе избы-читальни. Взаимоотношение с комсомольцами — товарищеское. В церковь Семенцов и вся его семья не ходит и попа не оплачивает.

Дзяржаўны архіў грамадскіх арганізацый Гомельскай вобласці (ДАГАГВ). Ф. 2. Воп. 1. Спр. 644. Л. 10–11.

Вясковы актыў

У 1923 г. адбыліся выбары ў мясцовыя Саветы. Старшынёй валвыканкома стаў Іван Іванавіч Дзядкоў. Быў ён з сялян. Яму на той час споўнілася 34 гады. Членамі валвыканкома абралі Уладзіміра Рыгоравіча Хатылёва, Данілу Трыфанавіча Аднавочка, Якава Ісакавіча Глушакова, Пятра Восіпавіча Дарашэнку. Старшынямі сельсаветаў сталі: у Купрэеўцы — Іван Аўрамавіч Клімаў, у Кунтараўцы — Васіль Фёдаравіч Кабыш, у Калініна — Сысой Пятровіч Худобін, у Хальчы — Рыгор Ермалаевіч Вяруцін, у Ветцы — Аляксей Фіцаў, у Радузе — Рыгор Дзмітрыевіч Калянкоў.

Новы склад валвыканкома і сельсаветаў у сваёй дзейнасці абапіраўся на актыў. Актывісты займаліся вывучэннем эканомікі вёскі, бюджэту вясковых двароў, пытанняў аб лішках прадукцыі, праводзілі ў вёсцы падпіску на газеты і часопісы, прыцягвалі сялян да актыўнага грамадскага жыцця. Гэта вельмі датычыла вясковых жанчын. Дзякуючы актывістам жанчын выбіралі ў Камітэты сялянскай грамадскай узаемадапамогі, а дзе-нідзе яны былі і старшынямі такіх камітэтаў. Іх выбіралі ў склад сельсаветаў, прызначалі на адказныя пасады ў валасных органах кіравання.

Вера Захараўна Андрэева кіравала ў Ветцы радыёвяшчаннем, Пелагея Кандрацьеўна Барадзіна — вясковым кааператыўным таварыствам. Вялікую грамадскую працу выконвала ў воласці Ганна Андрэеўна Вісман. У ліку першых камсамольцаў былі Еўдакія Голікава, Яўгенія Дынкіна, Клара Купчык, Ганна Конаўцава і інш. Зося Максімаўна Круцялёва стала арганізатарам і старшынёй ткацкай арцелі ў Ветцы. Ганна Ісакаўна Петрашэнка доўгія гады ўзначальвала жаночую арганізацыю Веткаўскай воласці. Гэтая арганізацыя мела вялікі актыў і праводзіла значную працу. У 1927 г. на Акружным з'ездзе жанчын Гомельшчыны дэлегаткамі ад Веткаўскай воласці была Яўгенія Герасімаўна Баннікава і Любоў Ісакаўна Дворкіна (г. Ветка), Алена Восіпаўна Кузькіна (в. Купрэеўка), Ганна Фёдараўна Мельнікава (в. Старое Сяло), Зінаіда Сяргееўна Рафановіч (в. Вылева).

Актывісты дапамагалі вырашаць гаспадарчыя і культурныя праблемы і гэта падштурхоўвала дэпутатаў валвыканкома да ўзмацнення сувязі з масамі.

24 ліпеня 1921 г. Веткаўскі валвыканком пастанавіў праводзіць па пятніцах адкрытыя сходы, каб органы рабоча-сялянскай улады не былі адарваны ад народа, каб людзі ведалі як працуе выканком. Гуртоўцы культпрасвета арганізоўвалі вечары памяці ахвяр рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. З дапамогай культпрасветаўцаў арганізоўваліся чыткі газет і палітлітаратуры, ставіліся спектаклі.

Жыццё ў рытме рэвалюцыйных традыцый набірала тэмпы.

У. Я. Райскі.

З ПАВЕДАМЛЕННЯ СЕЛЬКОРА

20 мая 1924 г.

В ночь с 28 на 29 апреля тяжело ранен председьсовета дер. Присно, Ветковской вол., Гомельского у. Он ранен защищающим кулацкие интересы председателем комитета взаимопомощи; председьсовета нанесено 14 ран.

Член РКСМ

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 76. Воп. 1. Спр. 1105. Л. 124.

З ДАВЕДКІ АБ ЗАБОЙСТВЕ СЕЛЬКОРА в. ДАНІЛАВІЧЫ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОЛ. ГОМЕЛЬСКАГА У. ЛЕБЕДЗЕВА І.С.

30 октября 1924 г.

Селькор газет "Новая деревня" и "Полесская правда" Лебедев Иван убит вечером 23 октября с.г. во время коллегиального заседания сельсовета, общества взаимопомощи и ячейки КСМ.

Убийство совершено выстрелом через окно из сада, прилегающего к школе. Пуля попала Лебедеву в голову и снесла полчерепа, пуля винтовочная, разрывная.

Лебедев убит во время своего выступления против сельских кулаков на заседании, при распределении земельных участков с. Даниловичи.

Следствием установлено, что до убийства на Ивана Лебедева в прошлом году неоднократно покушались местные кулаки-бандиты, которые из-за угла несколько раз стреляли в него.

Следствие по этому делу проводится усиленным темпом.

Заместитель заведующего административного отдела ГИКа

Начальник подотдела розыска

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 76. Воп. 3. Спр. 1731. Л. 108.

ІВАН СЯРГЕЕВІЧ ЛЕБЕДЗЕЎ

Нарадзіўся 9.2.1901 г. у в. Данілавічы Веткаўскага раёна. Адзін з першых беларускіх сельскіх карэспандэнтаў, актыўны змагар за сацыялістычныя пераўтварэнні ў вёсцы. Удзельнік грамадзянскай вайны. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі ў 1923 г. узначаліў камсамольскую арганізацыю ў сваёй вёсцы. Супрацоўнічаў у газетах "Новая вёска" і "Палеская праўда". Забіты кулакамі ў час выступлення перад сялянамі.

І. С. Лебедзеў.

Вострыя грані

У 20-я гады развіццё вытворчасці і гандлю дало магчымасць папоўніць бюджэтныя сродкі. З 1924 па 1928 гады бюджэт воласці вырас больш, чым у 10 разоў.

Палепшылася медыцынскае абслугоўванне. У 1930 г. у Ветцы працавалі дзве стацыянарныя бальніцы (на 39 і 49 ложкаў). Працавала 5 амбулаторый. Ахоп хворых павялічыўся ў 7 разоў. У воласці дзейнічалі 4 пункты першай дапамогі, 2 зубаўрачэбныя кабінеты, фельчарскі пункт. Прыкметна вырас жыццёвы ўзровень насельніцтва. Гадавая норма спажывання хлеба на душу насельніцтва павялічылася з 11,95 пуда у 1921 г. да 17,6 пуда — у 1926 г. Значную падтрымку аказвалі падатковыя льготы і танны крэдыт.

У 20-я гады быў зроблены першы крок у развіцці народнай адукацыі і культуры. У студзені 1921 г. у воласці дзейнічала ўсяго 17 школ 1-й ступені, навучалася 1679 чалавек. У

Гурток веткаўскіх фізкультурнікаў.

Ветцы працавала 1 вячэрняя школа рабочай моладзі. У 1923 г. было 24 школы, у тым ліку і сямігодка. У школах 1-й ступені працавала 39 настаўнікаў, у школах павышанага тыпу — 12. У 1927 г. дзейнічала ўжо 69 школ, у якіх навучалася 7135 навучэнцаў. Ці азначала ўся такая дынаміка, што ў воласці былі вырашаны ўсе праблемы непісьменнасці? Не. І ў 1928 г. непісьменных было: у Стаўбуне — 169, у Сівенках — 140, у Неглюбцы — 547, у Барталамееўцы — 159, у Беседзі — 30, у Калініне — 90, у Балсунах — 188, у Коўбаўцы — 77, у Вялікіх Нямках — 275, у Хальчы — 77, у Прысно — 118, у Дарынполлі — 31, у Новых Грамыках — 68, у Шалухоўцы — 144, у Старых Грамыках — 40, у Пералёўцы — 115, у Пацісах — 51, у Будзішчы — 48, у Рудні-Споніцкай — 58, у Тарасаўцы — 97, у Янове — 153. Дзейнічалі 23 пункты па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, якія ахоплівалі 38% непісьменнага насельніцтва.

Ствараласа новая па структуры і прынцыпах навучання школьная сістэма. Уводзіліся прынцыпы самакіравання з адзінай структурай арганізацыі. Зразумела, што ў арганізацыі вучэбнага працэсу, забеспячэнні школ абсталяваннем, вучэбнымі дапаможнікамі і матэрыяламі было шмат клопатаў. Праводзіліся "Тыдні асветы", "Тыдні дзіцяці" і інш. Доля адлічэнняў на патрэбы школы ў 1924 г. склала 26,8, у 1927 г. — 52,4, а ў 1928 г. — 52,6% бюджэту воласці. Гэта былі даволі значныя сумы.

У воласці захоўваўся моцны ўплыў царквы стараверaў. Дзейнічалі абшчыны і культавыя ўстановы. У Ветцы — сінагога, Пакроўская царква стараверaў, Праабражэнская царква, Троіцкая стараверская царква, Белакрыніцкая царква стараверaў, Мікольская царква (с. Старое Закружжа), Вылеўская царква (с. Вылева), абшчына евангельскіх хрысціянбаптыстаў (в. Дубовы Лог), абшчына евангельскіх хрысціян (в. Сівенка) і іншыя. Усяго ў 1923 г. у воласці функцыянавала 32 малітоўныя і культавыя ўстановы.

Сельскія Саветы перадавалі прыхаджанам у бясплатнае і бестэрміновае карыстанне цэрквы і малітоўныя дамы. Царкоўным служкам гарантавалася свабода веравызнання, а яны, у сваю чаргу, гарантавалі захаванне архітэктурных помнікаў і твораў мастацтва.

Веруючыя ў воласці складалі большасць насельніцтва.

У Ветцы дзейнічаў рабоча-сялянскі клуб — цэнтр культурна-асветніцкай дзейнасці. У 1929 г. у раёне працавала 8 хат-чытальняў, 4 клубы, 42 — чырвоныя куткі, 2 бібліятэкі. Хаты-чытальні ахоплівалі ў год да 6 тыс., а клубы — 12 тыс., чырвоныя куткі — 42 тыс. чалавек.

Такімі былі першыя крокі і першыя вынікі культурнага будаўніцтва на Ветцы.

Т. В. Чарнышова.

Дакументы сведчаць

З ТЭЛЕГРАМЫ ГОМЕЛЬСКАГА УКОМА

Сов. секретно
Циркулярно

Всем волячейкам РКП Гомельского уезда

В средине мая 1923 года завершился Всероссийский поместный собор православной церкви. Всем волостным ячейкам умело освещать работу и отдельные резолюции собора. Нужна чрезвычайная осторожность. Лучше всего проводить эту работу через учителей и беспартийных. Поставить дело так, чтобы инициатива партии была незаметна. Советская власть не собирается сотрудничать с церковью и духовенством.

Исх 23/с
13.6.23 г.
Секретарь УКОМА (Мысников)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 489. Л. 15.

СА СПІСА РЭЛІГІЙНЫХ УСТАНОЎ ПА ГОМЕЛЬСКАМУ ПАВЕТУ

1924 г.

№№ пп	Наименование религиозных обществ	Местонахождение
...		
8.	Ветковская синагога	м. Ветка
9.	Преображенская церковь	Там же
10.	Покровская старообрядческая церковь	Там же
11.	Троицкая старообрядческая церковь	Там же
12.	Дубово-Логская старообрядческая церковь	п. Дубовый-Лог
13.	Белокриницкая старообрядческая церковь	д. Борьба
14.	Николаевская церковь	с. Закружье
15.	Выльевская церковь	с. Выльево
16.	Шаковская община	Там же
17.	Община евангелистская христиан-баптистов	с. Дубовый-Лог
18.	Сивенская община евангелистских христиан	д. Сивенка
...		
20.	Романовичская община старообрядческих христиан	д. Романовичи
...		

Пом. начальника уездной милиции Зав. административным отделом

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 2. Воп. 1. Спр. 489. Л. 25.

СА ЗВЕСТАК АБ СТАНЕ СВЯЦІЛАВІЦКАЙ ВАЛАСНОЙ БІБЛІЯТЭКІ ГОМЕЛЬСКАГА ПАВЕТА

1. Всего имеется книг в библиотеке — 3300, на них по отделам: а) общий отдел — 120 книг, б) религия — 20 книг, в) обществ. знания — 2030 книг (из них большинство политических брошюр 1917, 18, 19, 20 и 21 гг.), г) математики и эстетики — 100 книг, д) прикладные знания — 755 книг, е) искусство и различные виды спорта — 15 книг, ж) литература — 250 книг, з) история и география — 10 книг.

2. Читателей одиночек числится при библиотеке 701 человек.

3. Имеется 23 передвижки, кои находятся в следующих пунктах: 1) дер. Бабичи — 34 кн., 2) Хизы — 18 кн., 3) Нисимковичи — 26 кн., 4) Казацкие Болсуны — 23 книги, 5) Малково — 29 книг, 6) Будище-Полесское — 33 кн., 7) Селицкое — 21 кн., 8) Покоть — 45 кн., 9) Хлусы — 17 кн., 10) Нестеровка — 54 кн., 11) Столбун — 18 кн., 12) Перелевка — 22 кн., 13) Новые Громыки — 13 кн., 14) Новиловка — 25 кн., 15) Речки — 32 кн., 16) Акшинка — 23 кн., 17) Речковские хутора — 19 кн., 18) Яново — 27 кн., 19) Большие Немки — 26 кн., 20) Поселок-Чемерня — 16 кн., 21) Даринполье — 25 кн., 22) Железники — 26 кн., 23) Малые Немки — 28 книг.

4. Общие выводы: состояние библиотеки неудовлетворительное. Ни одна книга не переплетена, в связи с чем таковые находятся в истрепанном состоянии. Имеется часть книг, которые придется изъять из обращения по вышеуказанной причине. Беллетристики в библиотеке почти что нет, мало имеется литературы по сельскому хозяйству, почти что нет литературы по обществоведению.

ПРЕДСЕДАТЕЛЬ ВОЛПОЛИТПРОСВЕТКОМА (подпись)

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ ВЕТКАЎСКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА АБ ПЕРАЙМЕНАВАННІ ВУЛІЦ

29.1.1924 г.

Слухалі:

1. Пастанаўленне вылвыканкома і прафсаюза аб пераіменаванні Праабражэнскай вуліцы ў памяць памершага правадыра рабочых і сялян У. І. Леніна – у вуліцу Леніна
2. Манастырскую – у Першамайскую
3. Келейныя завулкі – у Пралетарскія
4. Завулак, што каля драўлянай сінагогі, – у Нацыянальную вуліцу
5. Вуліцу Бяседскую – у Кастрычніцкую
6. Былую Малееву плошчу – у плошчу Кастрычніцкай рэвалюцыі
7. Фёдараўка – у імя Луначарскага
8. Былую Кладбішчынскую – у Брацкую
9. Вуліцу Канатную – у імя Свярдлова
10. Саломенку – у Чырвонаармейскую і Пабужскі завулак – у Чырвонаармейскі
11. Вуліцу Вінніцкую – у Камунараў і былы Банны завулак – у Падпольны
12. Сярэднюю вуліцу называць Пралетарскай
13. Галееўку – Інтэрнацыянальнай, а ідучыя ад яе завулкі – Інтэрнацыянальнымі
14. Худаяраўку – "Парыжскай камуны", а ідучыя ад яе завулкі – Чырвонаармейскімі
15. Коскую – Савецкай
16. Новамаеўку – вул. Карла Маркса
17. Зарэчную – Камсамольскай
18. Кавальку і ідучыя ад яе завулкі – Набярэжнымі
19. Базарную плошчу – Краснай плошчай
20. Базарную вуліцу – імя Валадарскага
21. Завулкі, ідучыя па ручаю, – Краснагорскімі
22. Давыдаўку – Калінінскай і Слабодку – "Красны Пахар"

Камунальнаму аддзелу адзначыць пачатак і канец вуліц і завулкаў адпаведнымі таблічкамі.

Старшыня [выканаўчага камітэта]

Сакратар

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 49. Л. 43.

АДРАДЖЭННЕ

У 1923 годзе на Веткаўшчыне распачаліся землеўпарадкавальныя работы. Гэта садзейнічала развіццю гаспадаркі. За 1924 – 1928 гады ў воласці пасяўныя плошчы павялічыліся ў 2,9 раза, пагалоўе жывёлы – амаль у 2,9, коней – у 2,4 раза. Па пагалоўю свіней і авечак воласць да сярэдзіны 20-х гадоў стала вядучай у Гомельскім павеце і губерні. Пашырыліся пасевы льну, канапель, бульбы. Севазварот стаў шматпольным. Павысілася ўраджайнасць культур і прадукцыйнасць жывёлагадоўлі. Па асноўных паказчыках паляводства і жывёлагадоўлі воласць пераўзышла дарэвалюцыйны ўзровень. Але аграрны сектар заставаўся маладаходным і да канца 20-х гадоў працягваў насіць спажывецкі характар. Даходнасць сялянства ад асноўнай крыніцы заставалася нізкай. Амаль 30% даходаў складалі заробкі не ад асноўнай вытворчасці.

Нэп павялічыў значэнне вытворчай і

Работнікі завода "Пралетарый".

спажывецкай кааперацыі. У 1925 г. у воласці дзейнічалі 4 саўгасы (Іванаўскі, Старазакружскі, Навасёлкаўскі, калонія "Воля"). Працавалі дзве арцелі — "Ясная паляна", "Вярхулішча". У 1927 г. было ўжо 6 саўгасаў. Аднак па сваёй ролі ў эканоміцы да канца 20-х гадоў яны так і не сталі базай развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, хоць у саўгасах збіралі больш высокія ўраджаі, чым сяляне-аднаасобнікі.

У ліку іншых кааператыўных прадпрыемстваў у воласці ў 1921 г. пачаў працаваць спецыялізаваны конезавод, 6 меліярацыйных таварыстваў, 3 — па распрацоўцы торфу, 4 — па эксплуатацыі рыбных вадаёмаў. Дзейнічалі: 1 — машыннае, 1 — малочнае, 3 — пасялковых, 1 — жывёлагадоўчае таварыствы. У 1928 г. у воласці было 67 арцеляў і таварыстваў. У іх працавала больш за 1685 чалавек.

Разглядаючы эканамічны стан калектыўных гаспадарак, валасная канферэнцыя 1928 г. падкрэслівала, што "...сельгасаб'яднанні працягваюць працаваць на датацыях, а павінны працаваць не на датацыях і крэдытах, а за кошт рэнтабельнасці і прыбытку".

Не ў менш руцінным стане заставаліся і прадпрыемствы мясцовага промыслу. Пераважалі саматужныя вытворчасці. Колькасць іх расла. За 1926—1928 гг. увайшлі ў строй 15 арцеляў саматужнай прамысловасці. Гэта былі канатна-вяровачная і ткацкая арцель "Пралетарый", панчошна-трыкатажная — "Працаўніца", швейная, шавецкая, сталярная, анучна-мыечная (у в. Рудня-Споніцкая), лапцепляцення (у Новых Грамыках, Неглюбцы, Барталамееўцы і інш.). Працавалі 3 цагельных, 2 — крухмалапатачныя, маслабойная арцелі. У 1928 г. у Ветцы пачалі працаваць арцелі "Працаўнік", "Чырвоны Маяк", "Чырвоны каваль", "Молат", "Пралетарый" і інш. Цяжка было з вытворчымі памяшканнямі. Гатовых будынкаў для размяшчэння вытворчасцей не было, а сродкаў для будаўніцтва новых выканком не меў.

Да дзяржаўных прадпрыемстваў у воласці адносіліся вінакурныя заводы ў Навасёлках, а таксама Радужскі лесапільны, крухмалапатачны і крухмальны заводы. Рэканструкцыя вінаробных прадпрыемстваў падняла іх прадукцыйнасць. Калі ў 1929 г. Новасёлкаўскі спіртзавод выпрацаваў 2 307 353 л спірту, то ў 1930 г. — 3 354 816. Да пачатку 30-х гадоў увайшоў у

строй Веткаўскі канатна-вяровачны завод. У яго складзе працавалі: ткацка-пянькавая арцель (90 рабочых, гадавы аб'ём вытворчасці 9120 м тканіны), трыкатажная арцель (143 рабочых, аб'ём вытворчасці 20600 вырабаў), вяровачны цэх (каля 400 рабочых), цэх па вырабу лапцей (380 рабочых, аб'ём вытворчасці 400000 пар у год). Свяцілавіцкі крухмала-патачны завод вырабляў у год 215 тон крухмалу і 140 тон патакі. Было тут 13 рабочых. Працавала Веткаўская шавецкая майстэрня (110 рабочых , 65 тыс. вырабаў у год), абутковая арцель (95 рабочых, 128 тыс. пар абутку ў год), кавальская арцель (25 рабочых, да 4000 вырабаў у год), больш 100 рабочых працавалі ў панчошна-трыкатажнай арцелі. Тут выраблялі больш за 150 тыс. пар вырабаў у год.

З будаўнічых прадпрыемстваў вылучыўся цагельна-бетонны завод магутнасцю 4 млн. штук цэглы ў год і 200000 штук чарапіцы, 20000 штук бетонных вырабаў.

28 сакавіка 1925 г. у Ветцы пачала працаваць гарадская электрастанцыя. Праўда, яе магутнасць ледзь пакрывала патрэбы некалькіх прадпрыемстваў горада.

Дзейнасць прамысловасці замаруджвалася недахопам зваротных сродкаў, адсутнасцю цэнтралізаванага забеспячэння сыравінай, матэрыяламі і фінансаваннем.

Значная частка Веткаўскай прамысловай прадукцыі асядала ў Беларусі. Але нямала вырабаў адпраўлялася на Украіну, у Маскву, Архангельск, Іркуцк, Свярдлоўск, Ленінград, Астрахань, Керч, Петразаводск і ў іншыя гарады. У асноўным гэта былі гаспадарчыя вяроўкі, чуні, сеткі, канаты, мешкавіна.

Невысокі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, аграрная перанаселенасць абумовілі развіццё саматужных промыслаў. Саматужнікі нярэдка складалі сур'ёзную канкурэнцыю кааператывам, мясцовым і дзяржаўным прадпрыемствам. На рынку збыту з імі даводзілася лічыцца.

У. Я. Райскі.

За газетным радком

Чем определялось и чем характеризовалось настроение деревни? Оно определялось хозяйственным ее положением и характеризовалось небывалым доныне хозяйственным порывом, стремлением к поднятию своего хозяйства. Для этого крестьянство имело не только хозяйственный стимул, но и государственную моральную поддержку. Но были ли все необходимые условия для одновременного и равномерного хозяйственного роста всех слоев деревни? Нет, не имелись. Проведенное землеустройство хотя по размерам и очень значительно, все же оно не дало нужного хозяйственного эффекта. Шло углубленное расслоение крестьянства. Прозябали и нищенствовали большинство общинных хозяйств. Даже землеустроенная часть крестьянства оказалась не в состоянии подняться из нищеты и именно эта часть крестьян поднимала вопрос о новом землеустройстве. И только маленькая часть деревни, благодаря рациональному расположению участков, начинала заметно расти.

Землеустройство имело целью прежде всего уничтожить дальноземелье, многополосицу и чересполосицу. Оно должно было развязать хозяйственную инициативу, устранить принудительный севооборот. Землеустроительные работы преследовали цель уменьшить аграрную перенаселенность, создать условия для роста сельского хозяйства. Что оказалось в итоге в 1925 году?

По Гомельскому уезду: на расстоянии до 3 верст имели усадьбы 35,7% хозяйств; от 3 до 5 верст — 40,9%; от 5 до 7 верст — 17,4% и от 7 до 10 верст — 6% хозяйств. Таким образом, землеустройством дальноземелье не уничтожено. Если расстояние поля от усадьбы в 100 саженей составляет 23,5 рубля, то в 3 версты — 37,4 рубля, 5 верст — 55,4 рубля, а 6 верст — 67,9 рубля. Следовательно, проведенное землеустройство не только не удешевило, а наоборот, удорожило каждую единицу продукции и повысило самоэксплуатацию крестьянства.

Другой бич — многополосица. По Гомель-

скому уезду в результате проведенных землеустроительных работ она не только не исчезла, но в 1925 году составляла печальную картину: 50,2% крестьянских хозяйств имело от 20 до 40 полос, 34,9% хозяйств — от 10 до 20 полос, 10% — от 40 до 60 полос и т.д.

Полесский коммунар. 1925. N 18 (101).

Дакументы сведчаць

ЭКАНАМІЧНЫ СТАН ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА (1926/27 г.)

СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА

Усёй зямлі ў Веткаўскім раёне, у тым ліку:		59743,36 дзес.
Сялянскай		42584 дзес. (71,3%)
З іх:		
раллі	21945 дзес.	
лугі і хмызнякі на балоце	4861 дзес.	
лугі заліўныя	5901 дзес.	
лясы мясцовага значэння	2903 дзес.	
сядзібы	1770 дзес.	
няўдобіцы	5204 дзес.	
Зямлі саўгасаў		2483 дзес. (4,2% усёй плошчы раёна)
З іх:		
раллі	1136 дзес.	
лугі	583 дзес.	
сады	179 дзес.	
лясы	124 дзес.	
сядзібы і агароды	28,5 дзес.	
выган па няўдобіцах	382 дзес.	
Дзяржфонд		14542 дзес. (24,2% усёй плошчы раёна)
З іх:		
Лясы	14119 дзес.	
Лугі	369,84 дзес.	
Сады	53,30 дзес.	
Пад школамі і ККОВ	133,72 дзес.	

МЕЛІЯРАЦЫЯ І ДЗЯРЖМАЁМАСЦЬ
(таварыствы і арцелі)

а). У 1926 г. у раёне арганізавана 6-ць меліярацыйных таварыстваў па распрацоўцы лугавых сядзіб, лясфонду і дзяржфонду. Па распрацоўцы торфу — 3 торфамеліярацыйныя таварыствы: 1). Пас. Ягаднае; 2). Новае Жыццё; 3). Серадавіна. Па эксплуатацыі рыбных вадаёмаў — 4 рыбаводна-меліярацыйных таварыствы; 1). Хальчанскае — "Праца" — 14 чалавек; 2). Старасельскае — "Пралетарый" — 11 чалавек; 3). Шарсцінскае "Вадзяная праца" — 7 чалавек; 4). Новазакружскае "Майская ноч"...

б). Улік і арэнда садоў:

У распараджэнні райвыканкома садоў дзяржзямельнай маёмасці з агульнай плошчай 53,8 дзес.

З іх:

Сад "Раманаў лес" на плошчы	12 дзес.
"Канічаў"	17 дзес.
"Шыдаўка"	7 дзес.
"Асадым"	7,8 дзес.

"Беседзь" 1,5 дзес.
"Пабужжа" 8,0 дзес.
Адзначаныя сады здаюцца райвыканкомам па дагаворах у арэнду насельніцтву.

ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЯ І ВЕТЭРЫНАРЫЯ

Агульны ўлік жывёлы па раёну:

Назва жывёлы	1924 г.	1925 г.	1926 г.
	усяго	усяго	усяго
Коней	6606	7108	6934
Кароў	9637	10462	11148
Авечак	5338	–	10229
Свіней	5171	–	4959

СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ КААПЕРАЦЫЯ І МАШЫНІЗАЦЫЯ

Усяго членаў сельгаскааперацыі — 574, у т.л. 4 арцелі

Склад членаў сельгаскааперацыі і іх маёмасць

Колькасць зямлі	Колькасць коней	Колькасць жывёлы
Беззямельных – 28	Без коней – 116	Немаючых – 62
да 1-й дзесяціны – 17	па 1-му каню – 365	па 1 карове – 249
ад 1-й да 2-х дзес. – 86	2 каня – 82	2 каровы – 167
ад 2-х да 4-х дзес. – 235	3 каня – 3	3 каровы – 55
ад 4-х да 6-ці дзес. – 117	4 і больш каня – 4	4 і больш – 41
ад 6-ці да 8-мі дзес.– 87		

КРЭДЫТАВАННЕ

	1923/24	1924/25	1925/26	1926/27	Усяго
Выдана крэдытаў	13014	10661	20409	2742	46821

На 1 сакавіка 1927 г. мелася запазычнасць 17 959 р. 96 к.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 131, 148, 148 зв., 149.

З ПРАТАКОЛА МІЖВЕДАМАСНАЙ НАРАДЫ ПРЫ ВЕТКАЎСКІМ ВАЛВЫКАНКОМЕ АБ ЭЛЕКТРЫФІКАЦЫІ ВЕТКІ

26 ліпеня 1924 г.

Парадак дня:
п. 1. Электрыфікацыя мястэчка Веткі
п. 2. .....

СЛУХАЛІ: Па 1-му і 2-му пытаннях тав. Арлова, які паведаміў, што выканком заключыў дагавор з Петраградскім Эльмаштрэстам аб электрыфікацыі м. Ветка.
Дагавор прадугледжвае ўстанавіць рухавік у 25 л.с. магутнасцю ў 15 квт і развесці электрасетку ў 10000 метраў на 600 лямпачак. Вартасць абсталявання склала па дагавору ў суме 9800 руб. Але ў валвыканкоме такіх сродкаў няма. Крэдыторамі сталі ЕПО і сельскагаспадарчае таварыства.

... пра карысць гэтай справы размаўляць няма чаго, грошай у валвыканкоме няма.

ПАСТАНАВІЛІ: Лічыць жаданым і неабходным у м. Ветка ўстройванне электрыфікацыі. п. 2. З дагаворам... згадзіцца, але лічыць неабходным больш працяглую растэрміноўку плацяжу, а таксама лічыць неабходным устанавіць машыну да 50 сіл.

Старшыня ВВК (Арлоў)
Сакратар (Пушкін)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 317. Воп. 1. Спр. 49. Л. 160.

ГАДЫ ЦЯЖКІХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

Праз 10 гадоў пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў раёне яшчэ было каля 2300 дробных і надта дробных сялянскіх гаспадарак, трэцяя частка з якіх не магла пракарміць саміх сябе. Больш 690 двароў (10%) не мелі рабочай жывёлы, 27% — пашавага інвентару, 13,8% — кароў. У гэтых гаспадарках каса і саха лічыліся асноўнымі прыладамі працы. У 1928 г. ручным спосабам засявалі 2/3 плошчы яравых, а сярпамі збіралі каля паловы зерневых, больш 40% усяго ўраджаю абмалочвалі ланцугамі.

Таварнасць сялянскіх гаспадарак на Веткаўшчыне ў 1928 г. ледзь склала 23% к даваеннаму часу. Да канца 1927 г. калгасы і саўгасы мелі прыблізна 8,7% усіх пасяўных плошчаў і не адыгрывалі важнай ролі ў дзяржаўных нарыхтоўках мяса, збожжавых і тэхнічных культур. У канцы 1927 г. у краіне ўзнік крызіс хлебанарыхтовак. Пачаліся перабоі ў забеспячэнні хлебам. Была ўведзена картачная сістэма размеркавання харчавання. Развілася спекуляцыя хлебам. Тады райвыканком сваёй пастановай зачыніў рынак. Супраць "злосных сабатажнікаў" сталі прымяняць 72 артыкул Крымінальнага кодэкса БССР, як за "антысавецкую дзейнасць", "антысавецкую агітацыю". Меры пакарання — пазбаўленне свабоды ад 3-х да 5-і гадоў з поўнай ці частковай канфіскацыяй маёмасці, высяленнем на Поўнач або ў Сібір. У неплацельшчыкаў хлебныя "рэшткі" канфіскоўваліся ў карысць дзяржавы, а 25% канфіскаванага хлеба размяркоўвалася сярод беднякоў і маламаёмных сераднякоў па нізкіх дзяржаўных цэнах або ў доўгатэрміновы крэдыт.

Дзейнічалі і надзвычайныя так званыя "тройкі". Яны аўтаматычна выносілі пастановы на канфіскацыю. Санкцыі і ўціск разбуралі эканамічна моцныя гаспадаркі. Надзвычайныя меры прымаліся да сераднякоў. Ішоў злом нэпа як сістэмы эканамічных адносін. Калектывізацыя ішла марудна. На 1 кастрычніка 1928 г. у раёне было зарэгістравана ўсяго 13 калгасаў, з іх працуючых толькі 6.

13 кастрычніка 1929 г. у в. Старое Сяло на агульным сялянскім сходзе абмяркоўвалася пытанне: "Што такое калектывізацыя?" Сяляне моўчкі слухалі дакладчыка, быццам не чуючы, што ён кажа. Жадаючых выступіць не знайшлося. Старшыня сходу падняў некалькі мужыкоў. Адзін з іх, М. Ватрушка, заявіў: "Перадзел зямлі ў вёсцы карысці не прынёс, наадварот, адну шкоду. Каб лепей жыць, патрэбны не калгасы, а малочныя і машынныя таварыствы". А бядняк з в. Пералёўка Павел Канапелькін спытаў: "Вось я, бядняк, і ўступаю ў калгас, а ў мяне няма ніякага адзення — дадуць мне яго ў калгасе?". Старшыня райвыканкома яму растлумачыў: "Што маеш, тое і будзеш насіць, а калі не будзе, то вам дадуць адзенне, але толькі з часам будуць з вашага заробку вылічваць яго кошт". Канапелькін адказаў: "Як мы не ў калектыве беднякі, так і ў калектыве будзем тымі

самымі беднякамі і яшчэ горш. З вамі і ў калектыве ніколі не разлічышся". На тым жа сходзе бядняк Сямён Дылеў заявіў старшыні райвыканкома: "Вы як тыя самыя рабаловы, якія чым болей зловяць рыбы, тым ім болей у кішэню. Так і вам — чым болей спакусіце нас у калектывы, як тую самую рыбу, тым болей будзе вам барыша і павышэння чыну".

Карыстаючыся правам зямельнага Закона 1928 г., мясцовыя Саветы абмяжоўвалі заможным гаспадаркам памеры і тэрміны арэнды зямлі, правы па найму рабочай сілы, амаль пазбаўлялі дзяржаўных крэдытаў. За 1928 г. ім выдалі ўсяго 3,2% пазыкі, назначанай для аднаасобных гаспадарак. У адказ на гэтыя меры заможнікі вясной 1928 г. спрабавалі сарваць веснавую сяўбу на Веткаўшчыне.

Да сярэдзіны 1929 г. курс на калектывізацыю ў раёне ажыццяўляўся асцярожна. У канцы 1929 г. эканамічныя меры ўступаюць месца метадам прымусовым. Даходзіла да таго, што мясцовыя ўлады спынялі завоз солі, газы і мануфактуры ў тыя вёскі, дзе не ішла калектывізацыя, пагражалі арыштамі, пазбаўлялі грамадзян права голасу, абрэзвалі зямельныя надзелы, прымусам абагульнялі ў калгасы.

На Веткаўшчыне ўжо ў 1921 г. дарэвалюцыйных заможнікаў ужо не было. У гады нэп сфарміраваўся новы заможны слой, які з'явіўся ў выніку афіцыйнай палітыкі. Яго інтарэсы ўвайшлі ў супярэчнасць з інтарэсамі адміністрацыйна-камандней сістэмы кіравання, якая к гэтаму часу склалася і ўзмацнела.

Так узнік новы "наш кулак", і гэта менавіта ён адмаўляўся прадаваць хлеб па так званых "цвёрдых цэнах", за што яго сталі разглядваць як сабатажніка, забіраць ягоную маёмасць і высяляць у далёкія чужыя краі.

Высяленне выклікала незадаволенасць сялян. Нярэдка былі і такія заявы: "У нас няма кулакоў і няма каго высяляць", "Мы з вёскі нікога не аддадзім, няхай бяруць усю вёску", "Вы высылаеце добрых людзей" і да т.п. Былі выпадкі масавага супраціўлення высяленню, бегствы людзей, якія падлягалі высяленню. Жонкі заможнікаў, асабліва выхадцы з бедных сем'яў, патрабавалі развода з мужамі, якіх належала выселіць. Разбураліся сем'і. Расла сацыяльная напружанасць.

Між тым прымяненне надзвычайных мер у раёне стала практыкай. Жорсткія меры прымяняліся і да тых кіраўнікоў, якія праяўлялі "мяккасць", "прымірэнства", "зрастанне з кулаком". Прайшла чыстка савецкага апарата раёна. Пад суд былі аддадзены 4 старшыні сельсаветаў, яшчэ 6 — пазбаўлены пасады. Асудзілі ўвесь склад прэзідыума Калінінскага сельсавета. А ў в. Барталамееўка за год знялі з пасады 2-х старшыняў сельсаветаў, у 6-і сельсаветах старшыні і сакратары былі адміністрацыйна пакараны "за класава варожае" кіраўніцтва. Але нягледзячы на "варожае" кіраўніцтва саветамі ніводзін з іх, а ўсе яны — дэпутаты сельсаветаў, не быў адазваны выбаршчыкамі.

У снежні 1929 г. калгасцэнтр разаслаў цыркулярны ліст, у якім патрабавалася да пачатку веснавой пасяўной кампаніі 1930 г. абагульніць 100% кароў, 80% свіней, 60% авечак і коз, якія належалі калгаснікам. Таму многія сяляне, перш чым пад прымусам уступіць у калгас, забівалі частку жывёлы. Толькі за люты — сакавік 1930 г. пагалоўе жывёлы ў раёне паменшылася на адну чвэрць. Супрацьстаянне сялян і ўлад абвастралася. Тым не менш было вырашана надаць калектывізацыі "паскораныя тэмпы", прымяніць метад "спаборніцтва".

11 снежня 1929 г. пры абмеркаванні пытання "Аб калектывізацыі" камуніст Д. А. Яўсеенка прапанаваў, каб кожны з прысутных камуністаў абавязаўся ў адной з вёсак раёна стварыць калгас. Падтрымліваючы прапанову калегі, камуніст Лаза-

раў абавязаўся арганізаваць калгас у пасёлку Жалезнікі і выклікаў на спаборніцтва камуніста А. І. Мацко. У прынятай пастанове запісалі: "Не ўсе члены сельсаветаў падтрымліваюць калгаснае будаўніцтва. У Барталамееўскім, Акшынскім, Беседзьскім сельсаветах члены Савета выступілі супраць суцэльнай калектывізацыі". Сход пастанавіў: "Зрабіць раён суцэльна калгасным да 1 кастрычніка 1930 г."

На пачатку 1930 г. узровень калектывізацыі ў раёне пачаў імкліва расці. Калі на 1 студзеня 1930 г. было абагульнена 8,9% гаспадарак, то на 1 сакавіка 1930 г. іх было ўжо 14%. Абвастрылася праблема землеўладкавання калектыўных гаспадарак. Ішла падворная абрэзка зямлі ў сялян, якія не ўступілі ў калгасы. У выніку парушаліся межы землекарыстання і 14106 (87%) двароў не ведалі свайго яравога кліна. Ды калі б і ведалі, то яго падзел заняў бы шмат часу. Такім чынам, у раёне ў 1930 г. узніклі праблемы сяўбы яравых.

З другога боку, у выніку падворнай абрэзкі зямлі і перадачы яе калгасам выраслі плошчы яравога кліна, і маладыя калгасы асвоіць іх не змаглі.

Аб'яднанне беднаты і сераднякоў у калгасы зрабіла заможнага селяніна ўвогуле "лішнім" у вёсцы. Узнікла пытанне: што ж рабіць з гэтым заможнікам, да якога прыляпілі мянушку "кулак".

У лютым 1930 г. на Веткаўшчыне пачалася масавая "аперацыя" па ліквідацыі кулацтва як класа. Спецыяльная камісія вызначала катэгорыі "кулацкіх гаспадарак". Уласнасць раскулачаных уключалася ў якасці першага ўзносу беднаты пры ўступленні ў калгас. Але здаралася так, што гэта маёмасць проста прысвойвалася беднатой. Гэта абвастрыла палітычную сітуацыю ў раёне, выклікала антаганізм паміж беднатою і ўладамі.

На 1 кастрычніка 1930 г. з 129261 руб. асноўных фондаў калгасаў 98128 руб. складала ўласнасць раскулачаных мясцовых сялян. Па афіцыйных звестках, на 31 сакавіка 1930 г. у раёне было 32 калгасы, якія аб'ядноўвалі 2460 сялянскіх гаспадарак. Да калектывізацыі гэтыя гаспадаркі мелі ўсяго 8751 га пашы. Калгасам, у якія яны ўвайшлі, было выдзелена 17480 га, г. зн. іх зямельная плошча ўзрасла ў два разы. Насення ж ледзь хапіла на 40% гэтай плошчы. Блытаніна з землеўпарадкаваннем спарадзіла эксцэсы ў час веснавой сяўбы. Выступленні супраць калгасаў прайшлі ў Казацкіх Балсунах, Янове, Коўбаўцы і іншых населеных пунктах. Пачаўся масавы выхад калгаснікаў з калгасаў. За перыяд з 7 па 10 красавіка 1930 г. у раёне з калгасаў вышла 100 гаспадарак, а ўступіла толькі 9. За сакавік — красавік калгасы пакінулі больш 50% гаспадарак. Па афіцыйных звестках, на 18 красавіка 1930 г. у раёне быў зарэгістраваны 31 калгас з колькасцю 1089 гаспадарак.

2 сакавіка 1930 г. газета "Правда" надрукавала артыкул Сталіна "Галавакружэнне ад поспехаў", а 14 сакавіка — Пастанову "Аб барацьбе са скрыўленнем партлініі ў калгасным руху". Ажывіўся абмен думак. Сяляне казалі: "Робяць адзін крок наперад, а два — назад", "Раней спяшаліся, а цяпер — стоп, перабралі", "У нас усё гэтак праводзіцца, як і калектывізацыя на дабравольных пачатках, — адабранне цэркваў і сінагог, запіс на пазыку і другія мерапрыемствы, якія нібыта самі працоўныя жадаюць". Або: "Сталін у артыкуле б'е адбой, так што цяпер трэба вярнуць кулакам усё тое, што ў іх адабралі, а таксама і зямлю, так што, атрымліваецца, Бухарын быў правы", "Развіццё калгаснага руху было ні чым, як жаданнем зрабіць на працягу двух тыдняў сялян камуністамі".

"Артыкул Сталіна, — пісаў у інфармацыйным, зусім сакрэтным бюлетэні работнік АДПУ, — [сяляне] носяць за пазухай і тлумачаць па-свойму, што калгасы можна не рабіць, яны нам непатрэбныя і

г.д. Кулакі заварушыліся як толькі можна. З тэрыторыі калгасаў ніхто і не думае высяляцца. Патрэбна міліцыя і патрэсці ўсіх кулакоў і тых, хто выбыў з калгасаў, як належыць, інакш нічога не будзе".

У спецыяльнай зводцы за 5 красавіка 1930 г. паведамлялася, што толькі за 3 дні з калгасаў у раёне выйшла 537 гаспадарак, а ўступіла ўсяго 34. Сітуацыя рабілася непадуладнай. Развал гаспадарак прывёў раённыя ўлады да разгубленасці. Самавольства заўзятых выканаўцаў даручэнняў "зверху" ў раёне нарастала са скорасцю снегавога кома, які сарваўся з горнай вяршыні. У Шарсцінскім сельсавеце, напрыклад, сума падаткаў на сялянскія гаспадаркі ўстанаўлівалася адвольна. Каб разлічыцца з падаткамі, сяляне вымушаны былі кідаць гаспадаркі ды ісці шукаць працу. А ў в. Шарсцін кіраўніцтва сельсавета паставіла сабе за мэту калектывізаваць 100% двароў без уліку класавага стану сялян. Высокая ж улада заплюшчвала на гэта вочы. Больш за тое, яна заахвочвала "энтузіястаў калектывізацыі".

Аднаасобнікам паабяцалі зняць падатак на сена за выхад на калгасны сенакос і выдаць адпаведную частку разам скошанага сена, а ў дадатак яшчэ заахвоціць і гарэлкай. У першы дзень сумеснай касьбы са сродкаў сельсавета было прапіта больш 400 руб. На 4 – 5 чалавек выдалі па літру гарэлкі. На другі дзень пасля выпіўкі і сумеснай касьбы сабралі сход, на якім сяляне нібыта пагадзіліся ўсёй вёскай, без індывідуальных заяў, вярнуцца ў калгас. А калі камісія сельсавета пайшла падворна абагульняць і ацэньваць маёмасць, то амаль усе мужыкі адмовіліся вяртацца ў калгас. У адрас аднаасобнікаў пасыпаліся пагрозы і штрафы без разбору. У выніку аднаасобнікі гэтага сельсавета засталіся без сена, а 175 га сенакоса – няскошанымі.

5 чэрвеня 1931 г. раённая газета "За бальшавіцкія тэмпы" паведамляла: "Па тэмпах калектывізацыі ў Хальчанскім і Рудня-Споніцкім сельсаветах за апошнюю дэкаду няма ніводнага працэнта росту. Ганебна адстаюць Стаўбунскі, Маланямкоўскі, Неглюбскі сельсаветы. На 1 чэрвеня 1931 г. у раёне калектывізавана 22,7% гаспадарак. Спераду – Акшынскі сельскі Савет".

Гонка за тэмпамі калектывізацыі і ліквідацыя кулацтва як класа выклікалі ў раёне масавыя выезды сялян. У фондах філіяла Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці захаваліся звесткі "Аб бегстве сялян з Веткаўскага раёна". У перыяд з кастрычніка 1933 г. па 22 лютага 1934 г. за межы раёна выехала 885 сямей, у якіх мелася 2790 га зямлі. Прададзена 458 коней, 632 галавы буйной рагатай жывёлы, 512 – дробнай. Да сакавіка 1934 г. лік выехаўшых з раёна перавысіў 1000 гаспадарак. Сяляне ехалі на Украіну, у Сібір, на новабудоўлі. З Сівенскага сельсавета выехала 186, з Рэчкаўскага – 70, з Калінінскага – 66, Дзям'янкаўскага – 58, Новаграмыцкага – 59, Барталамееўскага – 56, Неглюбскага – 58, Тарасаўскага – 40 сем'яў. На долю гэтых сельсаветаў прыходзілася 66,4% тых, хто выехаў.

Прычыны бегства сялян з раёна – розныя. Але сярод перасяленцаў пераважалі раскулачаныя людзі, хто не захаваў сваю маёмасць, ды іншыя. Разбурэнне вёскі і яе традыцыйнай гаспадаркі было неверагодна вялікім. Гэта падарвала яе сілы на дзесяцігоддзі.

У. Я. Райскі.

Дакументы сведчаць

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ Ў ЦК КП(б)Б

Сакрэтна

... У вёсцы Шарсцін [мясцовыя ўлады] арганізавалі "кабарэ" і дом дапушчальнасці для жонак засланых і расстраляных бандытаў, гетманаўцаў і інш., які наведвалі некаторыя актывісты з партячэйкі і сельскага Савета і была ўстаноўлена чарга, каму першаму, каму другому ісці. З "кабарэ" ў вёску разнесліся венерычныя захворванні...

...Суд, які адбыўся ў вёсцы, прыгаварыў старшыню сельскага Савета Зайцава да пяці гадоў пазбаўлення волі і 2-м гадам пазбаўлення грамадзянскіх правоў, сакратара сельскага Савета Траякова — да 6 год зняволення і 3-м гадам пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Нам, старшыні сельскага Савета Кончыца, сакратара партячэйкі да 3-х год, бухгалтара калгаса Кузняцова, камсамольца — да 2-х год, былога сакратара партячэйкі Халасцякова — да 1 года і г.д... Гэта так называемая Шарсцінская справа...

Інструктар ЦК КП(б)Б (Галоўка)

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 519. В. 2. Спр. 288. Л. 21—26.

"ЧЫСТКА" КАЛГАСАЎ

"Гомкалгассаюз"
6 лютага 1930 г.
№ 812

Усім райкалгассаюзам, спецыяльным саюзам, старшыням раённых камісій, дзяржкалгассаюзу і калгассекцыям, паляводсаюзам.

Прыкладая пры гэтым інструкцыі па чыстцы калгасаў ад кулацкіх, нэпманскіх, антысавецкіх элементаў Акркалгассаюз прапануе тэрмінова правесці чыстку калгасаў, якую закончыць не пазней 5 мая 1930 г.

Для кіравання чысткай калгасаў у раёнах стварыць раённыя камісіі ў складзе прадстаўніка Акркалгассаюзу (старшыня камісіі), прадстаўнікоў РВК, саюзу сельгаслесрабочых, КСТ і аднаго калгасніка.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 138. Воп. 1. Спр. 95. Л. 9.

СА ЗВЕСТАК АБ ХОДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ Ў ВЕТКАЎСКІМ РАЁНЕ НА 1 МАЯ 1930 г.

Сельсавет	Калгас	Дата заснавання	Колькасць гаспадарак	Колькасць калгаснікаў	Колькасць раллі (га)
1	2	3	4	5	6
Рэчкаўскі	"1 мая"	15.05.1928	32	144	130
Старасельскі	"Ясная Паляна"	18.02.1925	16	72	30
Веткаўскі	"1 Мая"	02.05.1929	9	43	43
Веткаўскі	"Пралетарская Перамога"	09.04.1930	55	158	150
Прыснянскі	"Вярхуліпча"	12.03.1928	8	37	78
Прыснянскі	Імя Варашылава	01.04.1930	93	416	500
Чысталужскі	"Камунар"	05.08.1926	8	42	72
М. Грамыкі	"Новая"	09.06.1928	6	39	40,4
Кунтараўскі	"Слабадзішча" перайменаваны	02.04.1929	11	48	120,18
	ў імя Сталіна	20.04.1929	97	393	425
Янаўскі	"Барэц"	01.04.1930	21	81	125
Свяцілавіцкі	"Севастопальскі металіст"	01.05.1929	101	326	300
Неглюбскі	"Хваля"	01.04.1929	33	134	106
Р.-Стаўбунскі	"Новае жыццё"	01.04.1929	45	217	408
Р.-Шлягінскі	"Чырвоны пахар"	19.07.1929-	75	293	200
Кунтараўскі	"Чырвоны баец"	03.03.1930	88	435	330
Старасельскі	"Шлях да камунізму"	01.04.1930	18	89	103
Хальчанскі	"Чырвоная хваля"	01.04.1930	9	28	34
Пабужскі	"Сацыялізм"	08.12.1929	21	91	49
Беседскі	"Чырвоная моладзь"	01.04.1930	24	90	105
Беседскі	"Везувій"	01.04.1930	88	269	260
Дзям'янкаўскі	"Молат"	01.04.1930	12	98	65
Ст. Закружскі	"Чырвоны кастрычнік"	01.04.1930	48	197	212

1	2	3	4	5	6
Н. Грамыцкі	"Гарадок"	01.04.1930	44	156	600
Рэчкаўскі	"9 студзеня"	01.04.1930	35	142	135
Ухоўскі	"Іскра"	01.04.1930	17	70	301
Ухоўскі	"Шлях да сацыялізма"	19.03.1930	31	140	85
Акшынскі	"Багатыр"	01.04.1930	32	148	450
Акшынскі	"Перамога"	01.04.1930	23	91	94
К.-Балсунскі	"Чырвоны Пуцілавец"	01.04.1930	27	73	81
Жалезніцкі	"Пралетарый"	10.02.1930	72	330	650
Барталамееўскі	"Барэц"	10.03.1930	1	92	56
Стаўбунскі	"Ясная Зорка"	01.04.1930	16	51	60

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 362. Л. 122, 122 зв.

ВЕТКАЎШЧЫНА ПАД ЧАС КАРЭННЫХ ЗМЕН

"Гонка за тэмпамі" калектывізацыі стала сур'ёзнай прычынай шматлікіх бед. Да гэтага прыбавіўся голад 1932—1933 гг. Зусім натуральна, што хуткага сацыяльнага абнаўлення вёскі не адбылося. З 1933 г. у калгасах Веткаўшчыны працавала 130 брыгад. За 1933 г. пасяўныя плошчы павялічыліся супраць 1931 г. па саўгасах больш чым у 2, а па калгасах — у 1,7 раза. Па аднаасобнаму сектару, наадварот, ішло значнае скарачэнне. Калгасы пашырылі пасевы жыта, аўса, другіх культур. У 1933 г. яны сабралі жыта па 9 ц, аўса па 7,5 ц з гектара. Гэта было значна больш, чым у 1931 — 1932 гг.

11 сакавіка 1933 г. у раёне прайшоў 1-ы з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Дэлегат ад калгаса "Чырвоны шлях" Мохараў гаварыў: "Наш калгас пры арганізацыі не меў коней, цяпер іх у нас 135". Дэлегат з калгаса "Праўда" Кірыленка паведамляў, што калгас ужо двойчы прэміраваны за выкананне плана дзяржпастаўак на 140% і за датэрміновае выкананне заданняў па лесавывазу. Дэлегат з калгаса імя Сталіна (в. Шарсцін) паведамляў, што з дня арганізацыі калгаса яго балансавы кошт маёмасці ўзрос у 7 раз. Першыя крокі жыцця калгаснай вёскі былі цяжкімі, але ж тым большымі здаваліся дасягнутыя поспехі.

Веткаўскі раён спецыялізаваўся на жывёлагадоўлі. У канцы 1933 г. на калгасных фермах утрымлівалася 3997 галоў рагатай жывёлы, 4682 — свіней. У 11712 гаспадарках аднаасобнікаў было 12529 галоў рагатай жывёлы і 9882 свінні. Варта адзначыць, што прырост пагалоўя жывёлы ў калгасах у гэты перыяд ішоў галоўным чынам за кошт амаль поўнага абагульнення жывёлы з індывідуальных сядзіб калгаснікаў і адчужэння іх у аднаасобнікаў за нядоімкі па падатках. Натуральна, што такія метады выклікалі негатыўную рэакцыю насельніцтва. У в. Глыбаўка сяляне гаварылі: "Як гэта можа дзяржава развесці жывёлагадоўлю, калі селянін трымае ўсяго адну карову, адну авечку і яе, апошнюю, трэба здаць на мясапастаўку... Выдалі закон, каб апошнюю авечку забіраць у бедняка. А між тым бараноў мы самі парэзалі, а для мясапаставак будзем лавіць вераб'ёў, таму што згодна закону птушку таксама прымаюць у лік мясапаставак". І ў гэтых выказваннях быў рэзон, бо ў 1931 — 1932 гг. у раёне была абагульнена ўся прадукцыйная жывёла.

Паўтарыўся пачатковы этап калектывізацыі зімы 1930 г., ды толькі яшчэ з больш цяжкімі наступствамі. У верасні 1935 г. на Веткаўшчыне 886 двароў

калгаснікаў увогуле не мелі кароў. Жывёлу абагульнялі, але для яе размяшчэння і ўтрымання не было дастаткова ні фермаў, ні кармоў. Падзеж жывёлы, асабліва маладняку, у раёне дасягнуў у 1932 г. — 54%, а ў 1933 г. — 46% пагалоўя.

На 12 лютага 1935 г. на Веткаўшчыне засталося ўсяго 43 калгасы. У жніўні 1934 г. пачала працаваць Веткаўская МТС, у якой было 24 трактары. Дзейнічалі насенняводчы саўгас "Закружжа" і конезавод "Навасёлкі".

Пасля памяншэння раёна ў ім пражывала 40000 чалавек насельніцтва. Мелася 7187 гаспадарак, у тым ліку — 79% двароў калгаснікаў. У ліку жыхароў 33225 — беларусы, 5028 — рускія, 1341 — яўрэі, 163 — палякі, 243 чалавекі іншых нацыянальнасцей.

Даючы палітычную ацэнку стану раёна, кампетэнтныя органы адзначалі напружаныя крымінальныя абставіны.

7 жніўня 1932 г. быў прыняты закон "Аб ахове сацыялістычнай маёмасці". Закон уводзіў у якасці меры пакарання за крадзеж калгаснай і кааператыўнай маёмасці расстрэл з канфіскацыяй усёй маёмасці і з заменай, пры змякчаючых абставінах, пазбаўленнем волі на тэрмін не ніжэй 10 гадоў з канфіскацыяй усёй маёмасці. Амністыя па справах гэтага роду была забаронена. У вёсцы гэты закон называлі "Законам аб пяці каласках". У свеце новага закона сельскія Саветы нярэдка чынілі самасуды.

У в. Тарасаўка сельсавет судзіў калгаснікаў за нявыхад на працу без народнага суда. У Беседскім сельсавеце грамадзянку прыгаварылі да прымусовых работ толькі за тое, што, "маючы мужа, яна асмелілася выйсці на вуліцу пагуляць".

У судовым парадку ў III квартале 1934 г. была разгледжана 1341 крымінальная справа. Асуджана 83 "кулакі", 324 крымінальна-дэкласаваныя элементы, 554 аднаасобнікі, 170 калгаснікаў, 105 служачых і інш. За 1931 — 1933 гг. раскулачана 300 гаспадарак. У 1934 г. з калгасаў выключана 50 так званых "чуждых классовых элементов".

У гэты час назіраецца развал камсамольскіх ячэек. У 1933 г. з 238 камсамольцаў раёна былі выключаны 78 чалавек, большасць з фармулёўкай — "классово чуждый элемент", і гэта ў перыяд, калі машына рэпрэсій і беззаконня яшчэ толькі набірала тэмпы. Наступствы рэпрэсій адлюстраваліся і на партыйнай арганізацыі раёна. Ужо ў 1933 г. з партыі было выключана 6 сакратароў партячэек, 8 старшынь сельсаветаў, 12 старшынь калгасаў, 2 дырэктары саўгасаў. У 1935 г. раённая партарганізацыя мела 10 партячэек, 9 кандыдацкіх і 13 партыйна-камсамольскіх груп, якія аб'ядноўвалі 149 камуністаў. З іх у 1933 г. было выключана з партыі 19 чалавек, а ў 1934 г. — 18. Партспагнанні атрымалі 35 — 40% камуністаў. Рэпрэсіі абрынуліся на ўсе слаі насельніцтва — і радавых жыхароў, і на кіраўніцкі апарат раёна. Толькі ў 1933 г. у 39 калгасах змянілася па 2, а ў 10 калгасах — па 3 старшыні. У 1933 г. з 74 старшынь калгасаў толькі 14 чалавек мелі стаж працы на гэтай пасадзе болей аднаго года, а 63 — меней аднаго года.

У 1935 г. быў прыняты новы Прыкладны статут сельскагаспадарчай арцелі. Зямля замацоўвалася за калгасамі ў бестэрміновае, вечнае карыстанне. Яна не падлягала ні куплі-продажу, ні здачы ў арэнду. Статут вызначаў і памеры прысядзібных участкаў калгаснікаў. Правядзенне артыкулаў статута ў жыццё выклікала пад'ём творчай энергіі і працоўнага энтузіязму.

Здараліся выпадкі і іншага характару. Так, на пасаду старшыні калгаса ў вёску Старое Сяло ў 1930 годзе быў пасланы добры арганізатар, справядлівы і сумленны чалавек Іван Яўхімавіч Белякоў з в. Радуга. Сяляне абралі яго старшынёй калгаса, аказалі падтрымку, вывелі сваю ка-

І. Я. Белякоў.

лектыўную гаспадарку з прарыву. А ў красавіку 1935 г. ці тыя, хто не хацеў сумленна працаваць, ці тыя, хто зайздросціў І. Я. Белякову, выстралам з урэзка смяртэльна паранілі яго. Сяляне пахавалі старшыню ў Старым Сяле, паставілі помнік на магіле. У 1941 г. фашысты помнік узарвалі. Пасля вайны ўдзячныя старасельцы яго зноў аднавілі.

У 1937 г. сярэдні ўраджай зерневых склаў па жыту — 11, па льну — 3,7, каноплях — 4,4, па бульбе — 140 ц з гектара. На гэтым фоне дасягненні перадавікоў-наватараў у раёне былі сапраўды высокімі. Не адставалі і жывёлаводы. Аднак высокія дасягненні наватараў не былі масавымі і вызначальнымі.

Помнік першым механізатарам раёна.

У 1937 г. у калгасы было аб'яднана 84,1% сялянскіх гаспадарак, якія ахоплівалі 96% пасяўных плошчаў. Колькасць трактароў у раёне павялічылася ў 3, а іх агульная магутнасць — у 7,3 раза. Удзельная вага механізаваных сродкаў у балансе цяглавай сілы ўзрасла з 9% у 1933 г. да 47,2% — у 1937 г. У другой пяцігодцы аграрны сектар вытворчасці ў раёне займаў у яго эканоміцы вядучае месца.

Пераход на суцэльную калектывізацыю ў раёне зрабіў уплыў на паніжэнне прадукцыйнасці жывёлагадоўлі, паніжэнне ўраджайнасці, рост сабекошту прадукцыі. Негатыўна адлюстраваліся на эканамічных паказчыках перагібы ў калгасным будаўніцтве. Вынікі спаду сельскагаспадарчай вытворчасці аказаліся адчувальнымі.

Так, колькасць пагалоўя жывёлы аж да пачатку Вялікай Айчыннай вайны не падняласа вышэй узроўню 1928 г. Паменшылася колькасць жывёлы ў гаспадарках калгаснікаў. Калі на 1 студзеня 1940 г. у раёне было 398 двароў, якія не мелі жывёлы, то на 1 студзеня 1941 г. іх было ўжо 552. Без цялят было 16% двароў, без свіней — 28%.

На 1 красавіка 1941 г. у раёне на 100 гектараў ворыва калгасы мелі буйной рагатай жывёлы — 12 галоў, свіней — 5, авечак — 9, коней — 11. Гэта амаль у 4 разы меней, чым у сярэднім па Беларусі па буйной рагатай жывёле, у 7,8 раза менш па свінніях і амаль у 5 разоў меней па авечках.

У 1938—1941 гг. у Веткаўскім раёне стабільна ў неабагульненым сектары было ў 1,3 раза больш буйной рагатай жывёлы, свіней — больш чым у 4, авечак — амаль у 3 разы, чым у абагульненым сектары.

На 1 студзеня 1941 г. на Веткаўшчыне ў аграрным сектары было 8535 двароў, у іх мелася 14088 галоў буйной рагатай жывёлы, 10374 свінні, 4151 авечка, 400 коз, 5700 коней.

Такімі былі вынікі карэнных змен на Веткаўшчыне напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны.

У. Я. Райскі.

Дакументы сведчаць

СПІС КІРАЎНІКОЎ КАЛГАСАЎ ВЕТКАЎСКАГА РАЁНА (1929 год)

1. Рудня-Споніцкі с/с к-с "Камунар"	Башылаў Нічыпар Янавіч	25 гадоў б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
2. Веткаўскі с/с к-с "1 мая"	Вольф Лазар Калманавіч	23 гады б/п	з дня заснавання	Яўр.	Шк.II ст.
3. Тарасаўскі с/с к-с "Пралетарская Перамога"	Міхалькоў Парфірый Сцяпанавіч	30 гадоў б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
4. Старасельскі с/с к-с "Ясная Паляна"	Альшулер Іосіф Навумавіч	18 гадоў КСМ	з мая 1929	Яўр.	7-я шк.
5. Рэчкаўскі с/с к-с "1 мая"	Поснікаў Аляксандр Фёдаравіч	30 гадоў б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
6. Прыснянскі с/с к-с імя Варашылава	Глухаў Ян Максімавіч	26 гадоў	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
7. Прыснянскі с/с к-с "Вярхулішча"	Звагельскі Іосіф Мордухавіч	24 гады б/п	з 1.1.1927	Яўр.	Сельск. шк.
8. Радугаўскі с/с к-с "Слабадзішча"	Аксёнаў Аляксандр Дзмітрыевіч	23 гады б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
9. Яноўскі с/с к-с "Барба"	Ганчароў Аляксей	28 гадоў б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
10. Нова-Грамыцкі с/с к-с "Новая"	Башмакоў Макар Сцяпанавіч	42 гады б/п	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.
11. Р.-Стаўбунскі с/с к-с "Новае жыццё"	Гулевіч Іосіф Іванавіч	33 гады чл. КПБ	з дня заснавання	Пал[як]	Сельск. шк.
12. Свяцілавіцкі с/с к-с "Іскра"	Жывін Майсей Шлёмавіч	40 гадоў б/п	з дня заснавання	Яўр.	Сельск. шк.
13. Ухаўскі с/с к-с "Іскра"	Кончыц Ян Яфімавіч	22 гады КСМ	з дня заснавання	Бел.	Шк.II ст.
14. Р.-Шлягінскі с/с к-с "Чырвоны шлях"	Ключынскі Пётр Васільевіч	21 год КСМ	з дня заснавання	Пал[як]	Сельск. шк.
15. Неглюбскі с/с к-с "Хваля"	Каротчанка Галакціён Фёдаравіч	31 год КПБ	з дня заснавання	Бел.	Сельск. шк.

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 466. Воп. 1. Спр. 362. Л. 58.

ПІСЬМО-ПАПЯРЭДЖАННЕ СТАРШЫНІ КАЛГАСА "ЧЫРВОНАЯ МОЛАДЗЬ" МІХАЛУ ІВАНАВІЧУ ШАЛЮТУ

...з кожным новым днём усё больш трывожных вестак паступае ў райком аб становішчы Вашага калгаса і аб Вашай рабоце, як старшыні калгаса. У іх факты масавай хваробы коней, слабай падрыхтоўкі гаспадаркі да зімы, дрэнная арганізацыя ўборачных работ па копцы бульбы, няма паставак у фонд дзяржавы. Пры гэтым галоўная спасылка на нездавальняю-

чае становішча спраў "... у нас неўраджай". На ўсё адзін адказ...

...Тав. Шалюта, не даводзьце справу да скандалу, не знеслаўляйце да канца сябе і калгас страхніце, скіньце тую цвіль, якая пачынае Вас адольваць.

З сяброўскім прывітаннем Кожар.

3.10.1936 г.

г. Ветка

Дзяржаўны архіў Гомельскай вобл. Ф. 519. Воп. 2. Спр. 462. Л. 153.

За газетным радком

ПА СТАРОНКАХ РАЁННАЙ ГАЗЕТЫ "ЗА БАЛЬШАВІЦКІЯ ТЭМПЫ" *

25 чэрвеня 1931 г.

Веткаўская канатна-вяровачная прафшкола абвяшчае набор у першую групу школы ў колькасці 40 чалавек.

Тэрмін навучання 3 гады. Вучні забяспечваюцца інтэрнатам і стыпендыяй і атрымліваюць заработную плату ў залежнасці ад кваліфікацыі.

Прымаюцца асобы з адукацыяй у аб'ёме першай ступені не маладзей 14 гадоў.

Райпрамсаюз

26 ліпеня 1931 г.

Шарсцін. 185 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак уліліся ў калгас "Сталіна" і пад лозунгам "Далой мяжы, за ўсеагульны калгасны пасяўны азімы клін, за 100-% калектывізацыю сельсавету і поўную ліквідацыю кулацтва як класа" заканчываюць калектыўна сенакос і распачынаюць ворыва ў адзін масіў.

Казацкія Балсуны. У калгас "Чырвоны пуцілавец" уступіла 50 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, у Вераб'ёўцы — 26.

Бесядзь. Уноў арганізаваны калгасы "Чырвоныя ляскі" — 31 гаспадарка; "Бесяцкі" — 20 гаспадарак.

Свяцілавічы. У калгас "Севастопальскі металіст" уступіла 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Вялікія Нямкі. У Дарнаполлі арганізаваўся новы калгас з 18 гаспадарак.

Янава. Уноў арганізаваўся калгас "Новы свет" — 20 гаспадарак.

Прысна. У калгас імя Варашылава ўлілося 24 гаспадаркі.

15 верасня 1931 г.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Прашу рэдакцыю змясціць у Вашай уважаймай газеце маю заяву: я, святар Старасельскай царквы Веткаўскага раёна Іван Мікалаевіч Піневіч, знімаю з сябе сан служыцеля рэлігійнага культа і пераходжу на працу, карысную працоўным грамадзянам СССР.

І. Піневіч.

Я, пражываючы ў в. Свяцілавічы, увесь час быў "разьніком", зараз адмаўляюсь ад гэтай "прафесіі", якая не прыносіць нікому ніякай карысці, і знімаю з сябе званне "разьніка".

Г. Готгольф.

15 верасня 1931 г.

На фронце культурнага будаўніцтва ў раёне маецца шэраг буйных прарываў. Школьнае будаўніцтва не закончана, 17 школ не ўкамплектаваны работнікамі. Палітэхнізацыя не разгорнута. Сетка ўстаноў па лікбезу не распрацавана. Кадраў ліквідатараў [непісьменнасці] няма. Ніхто справай лікбеза не займаецца. Ліквідацыя непісьменнасці пад пагрозай зрыву.

Патрабуем ад РВК і райнарасветы безадкладна прыняць рашучыя захады да выпраўлення прарыву.

---

*Арфаграфія і стыль тагачасных публікацый захаваны.

Веткаўскі куставы фізкультурны гурток канатна-вяровачнай арцелі.

24 верасня 1931 г.

Наш раён павінен завербаваць для Данбасжылбуду 250 асоб. На 22 верасня навярбавана 77 асоб. Уперадзе ідуць Старасельскі сельсавет, які даў 4 асоб, хаця ў план ён ня быў уключан. Барталамееўскі, Прыснянскі, Рэчкаўскі выканалі кантрольную лічбу.

Ня далі ніводнага чалавека сельсаветы: Жалезніцкі, Калінінскі, Мар'інскі, Р.-Стаўбунскі, Р.-Шлягінскі, Стаўбунскі, Свяцілавіцкі, Шарсцінскі, Ухаўскі, Хізаўскі, Тарасаўскі, Янаўскі.

Неабходна ліквідаваць ганебныя адставанні ў бліжэйшыя дні.

12 снежня 1931 г.

Калі зайдзеш у Свяцілавіцкі клуб, зараз жа прачытаеш: "Райбібліятэка". І сапраўды, у гэтай бібліятэцы пануе "рай". Амаль што ні аднаго кніжнага выдання 1928—1929 г. у бібліятэцы не знойдзеш. А пра кніжныя выданні 1930—1931 г. і не запытвайся. Ляжаць старыя, аджыўшыя свой век кнігі пра "райскае" жыццё паноў. Кніг пра сучаснасць няма. Дык калі ж замест "рай"-бібліятэкі будзе бібліятэка, адпавядаючая сучаснасці.

Язерскі.

2 сакавіка 1938 г.

26 лютага ў г. Ветка адбылося спаборніцтва на лыжах. У спаборніцтве прынялі ўдзел 5 фізкультурных калектываў лікам 42 чалавекі. Першае месца ў спаборніцтве заняў калектыў канатна-вяровачнай арцелі "Пралетарый". Другое — раённай калгаснай школы. У індывідуальным спаборніцтве на дыстанцыі 10 км першым быў т. Варсанохаў (ткацкая арцель). 10 км ён прайшоў на лыжах за 56 мінут. Другім быў т. Малюшын — 57 мінут (арцель "Пралетарый"), трэцім — т. Палякоў — 58,5 мінут. Сярод дзяўчын першае месца занялі тав. Міхалёва і Капусціна (арцель "Крупскай"). Лепшыя калектывы і пераможцы ў індывідуальным спаборніцтве прэміраваны.

Даўгадзілін, Герасімаў.

30 красавіка 1932 г.

Новаграмыцкі сельскі савет, дзе каля 250 асоб непісьменных і малапісьменных, дабіўся 100% ахопу непісьменных і малапісьменных лікпунктамі і індывідуальным навучэннем шляхам шырокага разгортвання штодзённай растлумачальнай работы, актыўнага і добрасумленнага ўдзелу настаўніцтва. Не паслабляючы работы, сельсавет ператворыцца ў суцэльнапісьменны да 1 мая г.г.

20 ліпеня 1936 г.

Пракуратура ўстанавіла, што настаўнік Маршын Апанас Міронавіч сапраўды вучыўся і скончыў Растоўскі педінстытут і зусім законна атрымаў дыплом. Дырэкцыя педінстытута, будучы запрошанай, у першы раз аднеслась фармальна і пацвердзіла паклёпніцкі матэрыял на А. М. Маршына.

Другі выпуск курсаў райана ў Свяцілавічах. 1937 г.

Змяшчаючы гэту даведку, рэдакцыя лічыць настаўніка Маршына рэабілітаваным ад пра-д'яўленых яму паклёпніцкіх абвінавачанняў.

Люты 1937 г.

На люты 1937 г. праўленне калгасу "Прасвет" выпісала толькі адну газету "Краснаармейская праўда". Акрамя гэтага, быў складзен спісак на выпіску 25 калгаснікам раённай газеты "За бальшавіцкія тэмпы". Але гэты спісак застаўся ў праўленні калгаса і газеты калгаснікам не выпісаны.

На пасаду лістаносца вылучаны 11-гадовы хлопчык, які атрымлівае па 0,75 працадня толькі за тое, што з сельсавета прыносе адзін экземпляр газеты ў праўленне калгаса.

Старшыня калгаса т. Мінчанка І. катэгарычна адмаўляецца адпускаць грошы на выпіску газеты калгаснікам.

В. Мінчанка.

15 ліпеня 1938 г.

АДКРЫЎСЯ ПІЯНЕРЛАГЕР

У ўрочышчы "Поважбор" на высокім беразе ракі Беседзь адкрыўся піянерскі лагер. 197 самых лепшых вучняў адпачываюць у гэтым надзвычайным лагеры.

Лагер добра абсталяваны. Месца, дзе раскінуўся лагер, — самы жывапісны куток Веткаўскага раёна. Лагер распалагае дастатковай колькасцю сродкаў, каб зрабіць адпачынак дзяцей здаровым, сытым і культурным.

Лідзненкова.

31 ліпеня 1938 г.

Заслушаў справаздачу дэпутата Вярхоўнага Савета БССР Ганчарова Сямёна Андрэевіча аб рабоце першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР, выбаршчыкі г. Ветка з ваадушаўленнем адзначаюць, што першая сесія Вярхоўнага Савета поўнасцю адлюстравала ў сваіх работах чаянні народа...

Агульны гарацкі сход выбаршчыкаў поўнасцю адабрае ўсе рашэнні, прынятыя першай сесіяй Вярхоўнага Савета БССР.

4 кастрычніка 1938 г.

Яшчэ ў 1935 г. калгаснікі калгаса "Партызан" Сівенскага сельсавета на агульным сходзе пастанавілі пабудаваць лазню.

П. К. Барадзіна.

У I квартале 1936 г. будаўніцтва распачалі: паставілі зруб, паклалі столь і падлогу. Выдаткавалі на гэта шмат грошай, затрацілі шмат працадзён, але будаўніцтва яе не закончылі. Два гады стаяў зруб не закончаны. З яго раскралі дошкі і інш. будаўнічы матэрыял больш як на 2 тысячы рублёў.

У пачатку 1938 г. прэзідыум РВК прапанаваў праўленню калгаса закончыць будаўніцтва лазні ў гэтым годзе. Але калгас гэтага рашэння не выканаў і зруб застаўся на месцы.

П. Васькоў.

29 кастрычніка 1938 г.

Ганчароў Сямён Андрэевіч вылучаны на Дошку гонару пярвічнай камсамольскай арганізацыяй калгаса "Чырвоная моладзь". Калгас пад яго кіраўніцтвам своечасова ўбраў ўраджай, датэрмінова выканаў хлебапастаўкі.

Казунова Люба Калінаўна вылучана пярвічнай камсамольскай арганізацыяй калгаса "Чырвоная моладзь". Калгасніца — стаханаўка. Выконвае нормы выпрацоўкі на 200%.

Баршчук Стыся Львоўна вылучана пярвічнай камсамольскай арганізацыяй арцелі імя Крупскай. Сакратар камсамольскага камітэта, стаханаўка, выконвае нормы на 130%.

Камсамольска-маладзёжная брыгада ткацкага цэха арцелі імя Крупскай у складзе Губкінай (брыгадзір), Спасянковай, Паляковай, Аронавай вылучана пярвічнай камсамольскай арганізацыяй трыкатажнага цэха. Брыгада штомесячна выконвае план на 150%, усе члены брыгады стаханаўцы.

15 жніўня 1940 г.

Камітэт фізкультуры і спорта СНК БССР узнагародзіў граматай фізкультурны калектыў калгаса імя Горкага і грашовай прэміяй 500 рублёў. Узнагароджаны граматай і грашовай прэміяй у 150 рублёў кіраўнік фізкультурнага калектыву Якаўцоў П.

28 верасня 1940 г.

ВЫНАХОДЗЕЦ

Механік ткацкай арцелі імя Р. Люксембург Вышнікаў І. сканструіраваў насос, накачваючы ваду для ахладжэння рухавіка. Раней у рухавік ваду налівалі вёдрамі спецыяльна прымацаваныя рабочыя. Гэта вынаходніцтва дасць прыбаўку эканамічных сродкаў арцелі 3000 руб. у год. За гэта Вышнікаў узнагароджаны месячным акладам.

20 кастрычніка 1940 г.

За мінулы год грамадзяне г. Ветка ўзялі ў райбібліятэцы для чытання 24 тыс. кніг.

Вавілава.

Па другому тыражу дзяржаўнай пазыкі трэцяй пяцігодкі 23—25 верасня ў раёне выплачана на 3537 руб. выйграшаў.

Макаранка.

За паляўнічы сезон 1939 г. было забіта: 13 ваўкоў, 64 лісы, 1108 зайцоў, 178 вавёрак, 24 гарнастаі, 6 ласак, 1 норка і 81 харок, а ў 1940 г. забіта 3 дзікі. Уся пушніна здана ў райзаг. Самым выдаючым паляўнічым стаў у раёне Клюеў (в. Косіцкая). За два гады — 21 ліса і 100 зайцоў. У 1939 г. за зданую пушніну Клюеў атрымаў 950 руб. і прэміраваны паляўнічым ружжом.

М. Даўгадзілін.

З ГАЗЕТЫ "ГОМЕЛЬСКАЯ ПРАЎДА" ЗА 24 ЖНІЎНЯ 1939 г.

Барадзіна Пелагея Кандрацьеўна — ардэнаносец, удзельнік ВДНХ, загадчыца дзвюма жывёлаводчыскімі фермамі ў калгасе "Пралетарская перамога". За 5 гадоў сваёй работы дала калгасу 107 тыс. руб. прыбытку ад жывёлагадоўлі.

НАПЯРЭДАДНІ БЯДЫ

У другой палове 30-х гадоў асаблівым клопатам веткаўчан стала імкненне падняць у раёне сельскую гаспадарку, асабліва жывёлагадоўлю. І гэта ўдалося. Перадваенныя гады адзначаліся дасягненнямі.

13 мая 1940 г. на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве Веткаўшчыну прадстаўлялі: І. Ф. Астапаў, С. А. Брулевіч, А. Ф. Грамыка, Д. Ф. Грамыка, Е. І. Калошын, А. І. Каралёў, Т. А. Нікіцін, К. Е. Рэмізонаў, З. Х. Рыўкін, А. І. Смірноў, Е. М. Сынкоў, П. М. Трэйбач, Е. Ф. Халадкоў, М. А. Хулапаў. Гэта іх працай і талентам падымалася сельская гаспадарка, дасягаліся высокія паказчыкі.

У 1941 г. у Ганаровую кнігу УСГВ былі занесены: калгас "Х з'езд Саветаў", імя Кагановіча, саўгас № 1, малочная ферма саўгаса № 1, свінагадоўчая ферма калгаса "3-і Рашаючы", авечкагадоўчыя таварныя фермы калгасаў імя Кірава, імя Варашылава, "Рашаючы", "Чырвоныя Ляскі", "Шлях камунізму", імя Куйбышава, "Пралетарская перамога", "Камінтэрн", імя Сталіна, "Чырвоны змагар" і інш. Больш як 125 наватараў і перадавікоў вытворчасці раёна былі занесены ў Кнігу гонару УСГВ.

Значнымі былі дасягненні паляводаў, садаводаў, пчаляроў і агароднікаў раёна. Шмат калгасаў і саўгасаў атрымлівалі ад садоўніцтва па 500—700 тыс. руб. даходу ў год. Імёны лепшых садаводаў — П. І. Глазунова, Ф. А. Гаўрушава, А. Д. Кір'янава, І. І. Кір'янава, М. Т. Мамошына, Д. К. Станкова былі вядомы далёка за межамі раёна і вобласці. І тым не менш трэба адзначыць, што калі ў 1931 г. у раёне пад садамі было занята 725 га зямлі, у т.л. у саўгасах і калгасах — 524 га, то ў 1939 г. засталося ўсяго 55 га, у т.л. у калгасах — 40 і ў індывідуальным сектары — 15 га. У 1931 г. насадка клубніц у раёне мела прамысловае значэнне. У 1939 г. пад гэтай культурай засталося ўсяго 18 га зямлі, у т.л. у калгасах — 10 га.

Прыродныя ўмовы раёна былі спрыяльнымі для пчалярства. Да пачатку 1941 г. у раёне мелася 40 пчальніковых гаспадарак, амаль 1000 вуллёў пчол. Атрымлівалі мёд, воск. Пчалярства павышала ўраджайнасць многіх культур.

Ішло тэхнічнае пераўзбройванне сельскай гаспадаркі раёна. Веткаўская і Закружская МТС папоўніліся трактарамі і камбайнамі, аўтамашынамі. У гэтых калектывах працавала каля 100 дыпламаваных трактарыстаў і камбайнераў. Адна Веткаўская МТС абслугоўвала калгасы 12 сельсаветаў раёна. Механізатары-наватары забяспечвалі высокія і рэкордныя выпрацоўкі. Асабіста вызначылася жанчына-трактарыст Марыя Якаўлеўна Мартыненка. Яна была першай трактарысткай-жанчынай мясцовага калгаса "Чырвоны пуцілавец".

У сям'і Мартыненка было 12 дзяцей. Марыя — малодшая. Калі 1 красавіка 1930 г. арганізоўваўся калгас, сям'я Мартыненка ўступіла ў яго ў ліку першых. Пад час сяўбы і ўборкі ўраджаю ў іх доме кватаравалі трактарысты. Марыя працавала з імі. Была прычэпшчыцай на трактары. У 1935 г. разам з іншымі дзяўчатамі Марыю паслалі на курсы механізатараў. Праз год Марыя ўжо з поспехам працавала на трактары ХТЗ. Бераглa яна трактар нібы маці малое дзіця і дасягнула свайго — яе машына прапрацавала без паломак. У выніку дзяўчына апярэдзіла многіх вядомых у МТС трактарыстаў-мужчын. Ёй уручылі кніжку ўдарніка, узнагародзілі Знакам выдатніка, прэміравалі каштоўнымі падарункамі. Ды і было за што. Марыя Якаўлеўна да мінімуму скараціла халастыя праезды трактара, ушчыльніла працоўны дзень і ў канцы года рапартавала, што яе машына апрацавала

амаль 1000 га, пры гэтым зэканоміла паліва і тэхнічныя змазкі. Яна стала першым "стогектарнікам", гэта значыць, ударнікам, які засяваў не менш 100 га за дзень.

На Веткаўшчыне ў ліку лепшых трактарыстаў напярэдадні вайны былі П. М. Готаў, М. М. Колікаў, В. Д. Ліцвінаў, Ф. Р. Самонаў, Д. А. Фядулін.

Значныя поспехі былі і ў камбайнераў. М. Е. Дзям'янаў з Закружскай МТС на сваім камбайне "Камунар" у 1940 г. сабраў зерневыя з 600 га пры норме 160 га і намалаціў каля 6,6 тыс. цэнтнераў збожжа. Гэта было адно з лепшых дасягненняў у рэспубліцы.

Па прыкладу механізатараў працавалі і паляводы. У калгасе імя Варашылава (старшыня Сцяпан Васільевіч Пракапенка) у 1939 г. сабралі з аднаго гектара зерневых — 13,0 ц, ільнасемя — 4,7 ц, ільновалакна — 4,1 ц. Гаспадарка выканала план дзяржнарыхтовак па тэхнічных культурах на 200%. Лепшай працаўніцай у калгасе была Таццяна Васільеўна Шапарава. За год яна выпрацавала 780 працадзён, а разам з мужам — 1121. Звеняявая Марфа Рудая выпрацавала 929 працадзён. Сямён Арцянкоў — 779, Іван Шышкоў — 535 працадзён.

У барацьбе за ўраджай актыўна ўдзельнічала моладзь. Веткаўскі райком камсамола ў 1940 г. аб'ядноўваў 81 пярвічную арганізацыю, у тым ліку — 44 калгасныя, 2 — МТС, 8 — прамарцеляў, 14 — школьных, 12 арганізацый установ ды іншыя. 1852 камсамольцы ўяўлялі сабой значную сілу. У калгасе "Чырвоны кут" лепшымі механізатарамі былі камсамольцы Дуня Сарокіна, Фядосаў, Максімаў, якія перавыконвалі нормы на 140%, а звяно Дзмітрыя Шапавалава — на 140—150%. Механізатары-камсамольцы Пятро Мінькоў, Мікалай Сакалянаў, Цімафей Голубеў, Мікіта Афанаськоў на сяўбе перакрывалі зменныя нормы на 180—200%, а камсамольцы Макар Нявейкін, Фёдар Зайцаў, Іван Лосеў на касьбе выконвалі па 2,5—3 нормы, Хрысціна Кротава з калгаса імя Сталіна — на 220%, Груня Гатальская, Марыя Козелева, Шура Вашчанка, Марыя Харшунова з калгаса імя Фрунзе — на 180—210%, Дуня і Пелагея Рослікавы з калгаса "Чырвоны сцяг" выпрацоўвалі па 3 і больш нормы.

16 студзеня 1941 г. раённая газета "За бальшавіцкія тэмпы" надрукавала Пастанову Галоўвыстаўкома УСГВ СССР аб прысуджэнні ўзнагарод удзельнікам выстаўкі. Па Веткаўскаму раёну Дыплом 2-й ступені, прэмію 5 тыс. руб. і матацыкл прысудзілі калгасу "Камунар" Старасельскага сельсавета. Вялікі сярэбраны медаль атрымаў Міхаіл Кірылавіч Шаўчэнка — авечкавод калгаса "Партызан" Сівенскага сельсавета. Малым сярэбраным медалём была адзначана Пелагея Кандрацьеўна Барадзіна — загадчыца авечкагадоўчай фермы калгаса "Пралетарская перамога".

Перадавікоў і наватараў вытворчасці смела вылучалі на адказныя работы. За 1940 г. 70 камсамольцаў былі вылучаны кіраўнікамі розных участкаў вытворчасці: 7 камсамольцаў працавалі старшынямі калгасаў, 13 — брыгадзірамі, 17 — звеннявымі, 7 — загадчыкамі фермаў, 33 — жывёлаводамі, 19 — трактарыстамі, 2 — камбайнерамі, 4 — брыгадзірамі трактарных брыгад. На адказных пасадах у калгасах раёна працавала 113 камсамольцаў.

Спаборніцтва наватараў і перадавікоў вытворчасці набывала новыя формы і значнасць. У 1941 г. Веткаўскі раён уступіў у спаборніцтва з Уваравіцкім раёнам. Дамову заключылі на рэспубліканскім злёце перадавікоў сельскай гаспадаркі. Дамова паміж раёнамі да многага абавязвала. Яе паказчыкі тычыліся не толькі сельскай гаспадаркі, але і прамысловасці, і

Сандружына раёна. 1940 г.

культуры, і аховы здароўя, і народнай асветы.

Напярэдадні вайны мясцовая прамысловасць раёна ўключала 184 прадпрыемствы, асноўныя фонды якіх складалі 2194 тыс. руб. Тут працавала больш за 3842 чалавекі. Аб'ём валавой прадукцыі складаў каля 9 млн. руб. Па тых часах сума даволі значная. Працавалі гарбарныя, швейныя, тэкстыльныя, металаапрацоўчыя, торфаздабываючыя прадпрыемствы. З 184 прадпрыемстваў 176 былі калгаснага і кааператыўнага падпарадкавання. У прамкааперацыі было занята 3423 рабочыя, якія працавалі на 36 вытворчасцях з асноўным капіталам 1300000 руб. За год вырабляласа прадукцыі на 1885000 руб.

Перад вайной у раёне дзейнічала 5 прадпрыемстваў будматэрыялаў, 62 — металаапрацоўкі, у тым ліку: 53 кузні, 17 дрэваапрацоўчых, 48 харчовых прадпрыемстваў і інш. Прадпрыемствы ў большасці пабудаваныя ў гады пяцігодак. Сярод іх і Барталамееўскі цагельны завод магутнасцю 14 млн. штук цэглы ў год. Працавала Веткаўская верф па рамонту рачных суднаў.

Поспехі гаспадарчага развіцця раёна садзейнічалі росту дабрабыту насельніцтва. Пра гэта сведчаць расходы калгаснай сям'і на набыццё прадметаў бытавога ўжытку, вопраткі, абутку, культурныя патрэбы. У 1939 г. у раёне ў два разы павялічылася колькасць прададзенай мануфактуры і адзення, у 1,5 раза — абутку і амаль у 5 разоў — разнастайных культтавараў. У дамах калгаснікаў нярэдкімі сталі патэфоны, швейныя машыны, веласіпеды, гадзіннікі і радыёпрыёмнікі. Трывала ўвайшлі ў жыццё кнігі, газеты, часопісы, кіно, спектаклі, канцэрты. Прыкметным было імкненне да адукацыі, культуры, ведаў. А наперадзе была... вайна. Вайна суровая і бязлітасная.

У. Я. Райскі.

Перадавікі вытворчасці Веткаўшчыны, занесеныя ў Кнігу гонару УСГВ (1941 г.)

КАЛГАС ІМЯ БУДЗЁННАГА

Саўкін А. Г. — бухгалтар
Чуяшкоў Т. А. — брыгадзір

КАЛГАС ІМЯ ВАРАШЫЛАВА

Глытаў С. Е. — палявод
Кудраўскі Т. Ф. — конюх
Партны А. Б. — чабан
Шапараў Т. В. — садавод
Шныпаркоў Д. М. — бухгалтар
Шышакоў І. Я. — конюх

КАЛГАС ІМЯ ГОРКАГА

Прышчэпаў І. А. — загадчык малочнатаварнай фермы
Яськова І. Ф. — цялятніца

КАЛГАС "Х З'ЕЗД САВЕТАЎ"

Арцюшкоў М. В. — калгаснік
Бабкова З. Т. — заг. авечкагадоўчай таварнай фермы
Басякова І. Н. — калгасніца
Болбасава М. Ф. — цялятніца
Болбасаў Ф. І. — загадчык малочнатаварнай фермы
Бялькоў П. Т. — брыгадзір
Гарпушкін М. П. — калгаснік
Грышуцін Я. Л. — старшыня
Гаўрушава Ф. А. — садавод
Журава З. П. — цялятніца
Кір'янаў М. І. — брыгадзір
Кір'янаў Д. А. — калгаснік
Кулеба І. Т. — ветфельчар
Лесаў З. М. — заг. свінатаварнай фермы
Малюшына М. Т. — садавод
Малажаўскі С. Г. — калгаснік
Мацкуноў К. Г. — калгаснік
Небрын П. Ф. — конюх
Нікіцін Ц. А. — брыгадзір
Паўлючкоў В. М. — заг. авечкагадоўчай таварнай фермы
Самонава Е. П. — брыгадзір
Сапегін Е. М. — брыгадзір
Целяпнёў Ф. В. — калгаснік
Шапавалаў Е. П. — заг. свінатаварнай фермы
Яськоў Н. Г. — намеснік старшыні

КАЛГАС "Х З'ЕЗД ВЛКСМ"

Булановіч Д. Н. — конюх
Крыенка Р. І. — заг. фермы

КАЛГАС ІМЯ КАГАНОВІЧА

Нікулін В. С. — рахункавод

КАЛГАС "КАМІНТЭРН"

Рагузаеў С. І. — чабан
Чуяшкоў Р. Р. — брыгадзір

КАЛГАС "КАМУНАР"

Злоціна І. К. — цялятніца
Кулагін А. В. — каваль
Рогачаў А. А. — старшыня

КАЛГАС ІМЯ КІРАВА

Валчкоў А. І. — калгаснік
Космыкаў І. В. — калгаснік
Лабакоў П. І. — калгаснік
Леўшуноў А. Т. — брыгадзір
Ляшчоў Д. А. — калгаснік
Маргуноў С. В. — калгаснік
Мельнікаў Ф. Г. — калгаснік
Пысікаў Е. Е. — калгаснік
Салаўёў Г. К. — калгаснік

КАЛГАС ІМЯ КУЙБЫШАВА

Воінаў Т. Д. — брыгадзір меліяратараў
Шараеў М. С. — чабан

КАЛГАС "ПАРТЫЗАН"

Шапавалаў К. Н. — конюх
Шаўчэнка М. К. — чабан

КАЛГАС "ПЕРАМОЖАЦ"

Князеў К. К. — конюх
Някрасаў М. А. — чабан

КАЛГАС "1 МАЯ"

Стучанкоў А. К. — конюх

КАЛГАС "ПЕРАДАВІК"

Козін С. С. — конюх

КАЛГАС "ПРАСВЕТ"

Дзям'янкова А. С. — цялятніца
Івахаў К. П. — рахункавод

КАЛГАС "ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА"

Барадзіна П. К. — заг. авечкагадоўчай таварнай фермы

Барадзін П. І. — брыгадзір
Вышнікава М. Д. — ветфельчар
Дзюбіна М. Т. — цялятніца
Калугін Н. С. — калгаснік
Канавалаў К. Д. — чабан
Конанцаў П. П. — бухгалтар
Кукін В. С. — брыгадзір
Кулагін І. Г. — каваль

КАЛГАС "РАШЫЦЕЛЬНЫ"

Папкоў І. А. — мельнік
Хрычкоў Ф. Н. — заг. авечкагадоўчай таварнай фермы

КАЛГАС "САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Грамыка А. М. — конюх

КАЛГАС "VII З'ЕЗД САВЕТАЎ"

Дзядкоў С. І. — рахункавод

КАЛГАС ІМЯ СТАЛІНА

Бурыкін А. Г. — заг. свінатаварнай фермы
Герынаў К. А. — бухгалтар
Ешкаўцоў М. Д. — ветфельчар
Катлярова М. С. — цялятніца
Кашубін Я. А. — конюх
Сеўдалёва Е. С. — свінарка
Старавойтаў П. Г. — садавод
Чашачкіна А. М. — свінарка

КАЛГАС "З-і РАШАЮЧЫ"

Агалеў Ф. С. — каваль
Еўтухова Д. П. — свінарка
Кананенка В. М. — рахункавод
Мажанава Е. І. — чабан
Пракапенка А. В. — конюх
Сепікава А. К. — цялятніца
Серакаў Я. Т. — загадчык свінафермы
Станкоў Д. К. — садавод
Ткачоў І. Д. — ветфельчар
Фетрукоў К. Ф. — брыгадзір
Шчарбакова А. С. — свінарка
Шчарбакова А. І. — свінарка

КАЛГАС "УДАРНІК"

Дзімянкова Е. В. — цялятніца

КАЛГАС ІМЯ ФРУНЗЕ

Гайдукевіч М. К. — рахункавод

КАЛГАС "ЧЫРВОНЫ БАЕЦ"

Кабыш І. С. — загадчык авечкагадоўчай таварнай фермы
Марозаў Я. С. — конюх

КАЛГАС "ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК"

Аляксеенка В. І. — рахункавод
Конанцаў І. Т. — калгаснік

КАЛГАС "ШЛЯХ ЛЕНІНА"

Грыськоў І. А. — конюх

КАЛГАС "ШЛЯХ ДА КАМУНІЗМА"

Кір'янаў А. Д. — садавод

ВЕТКАЎСКАЯ МТС

Глотаў П. М. — трактарыст
Зенчанка Н. А. — слесар
Касмакоў І. Д. — каваль
Колікаў М. М. — трактарыст
Набокін А. Н. — аграном
Самонаў Ф. С. — брыгадзір трактарнай брыгады

ЗАКРУЖСКАЯ МТС

Дзям'янаў М. Е. — камбайнер
Літвінаў В. Д. — трактарыст
Фядулін Д. А. — трактарыст

САЎГАС № 1 (ХАЛЬЧ)

Банузаў І. М. — памочнік начальніка саўгаса
Глазуноў П. І. — садавод
Жданаў А. В. — аграном
Краўцоў С. М. — начальнік саўгаса

РАЙЗЕМАДДЗЕЛ

Азарушкін Ф. П. — аграном-садавод
Ануфрыеў І. І. — старшы заатэхнік
Кучынскі М. А. — землямер
Мельнікаў Г. М. — заатэхнік
Рабенькі М. І. — начальнік зематрада
Раманаў К. В. — інструктар-бухгалтар
Чачын Д. Д. — старшы ветфельчар

РАЙЛЯЧЭБНІЦА

Лукашоў Ф. В. — ветфельчар
Шараеў — ветфельчар

За бальшавіцкія тэмпы. 1941. 22 мая.

З НЕБЫЦЦЯ

Шчыры энтузіязм, упартая і напружаная праца, надзея на лепшае не дазвалялі ў канцы 20-х і ў 30-я гады асэнсаваць і ўсвядоміць, што ж на самай справе адбывалася ў грамадстве. Людзі фанатычна, слепа верылі ў справядлівасць і законнасць усяго таго беззаконня, што адбывалася навокал. А рэпрэсіі між тым кожны дзень вырывалі з актыўнага жыцця людзей розных узростаў, прафесій, грамадскага і сацыяльнага становішча — родныя, блізкія, проста знаёмыя аказваліся "ворагамі народа", "шпіёнамі", "дыверсантамі". І знікалі. Знікалі абылганымі і зняважанымі. Людзі не маглі зразумець, як, чаму і адкуль з'явілася столькі "шпіёнаў", "дыверсантаў", "ворагаў народа". На вялікі жаль, тады такія пытанні ад страху за ўласны лёс не ўзнікалі. Усё гэта цяжка растлумачыць. Толькі ў Веткаўскім раёне рэпрэсіі адабралі, зламалі і пакалечылі жыццё больш як 770 сем'яў. Былі расстраляны або памерлі ў лагерах і на лесапавалах, у рудніках і шахтах 205 чалавек, яшчэ 565 — адбывалі розныя тэрміны зняволення. А колькі ні ў чым не вінаватых сумленных людзей раптоўна былі ачэрнены страшэннымі імёнамі — "вораг народа", "сын ворага народа", "дачка ворага народа", "жонка шпіёна", "бацька дыверсанта", "маці здрадніка"?!

Спісы землякоў, якія мы публікуем, яшчэ далёка не поўныя. Працэс рэабілітацыі яшчэ не скончаны. На жаль, у многіх закатаваных і расстраляных грамадзян не засталося сваякоў, хто б узняў пытанне аб рэабілітацыі.

"17 гадоў на Калыме"

Так называўся артыкул у раённай газеце. Ён пачынаўся: "1937 год..." Менавіта тады быў рэпрэсіраваны і мой бацька, Міхаіл Кандратавіч Якаўцоў, удзельнік рэвалюцыйных падзей на Веткаўшчыне. Працаваў ён на той час прарабам у будаўнічым аддзеле райвыканкома. І трэба ж было так здарыцца, што не спадабаўся нечым свайму калегу — Гусеву. Той хуценька і сфабрыкаваў данос, паведаміў у Камітэт дзяржаўнай бяспекі, што, маўляў, бацька ў размове сказаў нешта такое, аб чым гаварыць тады было не прынята. У выніку "тройка", доўга не марудзячы, асудзіла яго на 10 гадоў.

Нас у маці засталося трое: браты Георгій, Віктар (апошні інвалід) і я, чатырнаццацігадовая. Кінула вучобу ў школе, пайшла працаваць.

Для адбыцця пакарання бацька быў накіраваны на Калыму. Але спачатку, разам з іншымі арыштаванымі ён быў адпраўлены ў Гомель. Маці ездзіла туды, брала мяне з сабою. Абыходзіліся са зняволенымі вельмі жорстка. На ўскраіне Гомеля, у раёне Лешчынца, вялікая тэрыторыя была абнесена ў некалькі радоў калючым дротам, а за ім — мора людзей.

Маці пісала ў Маскву Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, скардзілася на самавольства ў адносінах да нашага бацькі. Сапраўды, як жа мог стаць удзельнік рэвалюцыі, грамадзянскай вайны ворагам народа? Адказу на пісьмо мы так і не дачакаліся.

Прайшло 10 гадоў. Атрымалі ад бацькі вестку, у якой ён паведамляў: нягледзячы на тое, што тэрмін зняволення скончыўся, пытанне аб яго вызваленні можа вырашыць толькі Масква, а хадайнічаць павінна радня.

Зноў пішам пісьмо ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета краіны. На гэты раз адказ прыйшоў. У ім гаварылася, што па гэтаму пытанню звярнуцца трэба ў КДБ СССР. Напісалі. Адтуль паведамілі, што звязацца неабходна з Магаданам, з упаўнаважаным Камітэта дзяржаўнай бяспекі па Дальбуду. На гэты адрас пісалі двойчы. Клопатаў нашых так ніхто і не заўважыў.

Страцілі ўсялякую надзею на сустрэчу з бацькам. Аднак у другой палове 1954 года прыходзіць ад яго пісьмо з радаснай весткай:

"Мяне рэабілітавалі, хутка буду дома". У снежні гэтага ж года пасля 17 гадоў лагераў бацька вярнуўся на радзіму.

Потым расказваў аб сваіх пакутах. Успаміны аб жудасных гадах зняволення не маглі не ўразіць. Цяжкім быў шлях да Калымы. Многія не вытрымалі дэспатызму, беззаконнасці. Тысячамі везлі людзей у таварных вагонах, трумах марскіх параходаў. Цяжка было захаваць чалавечае аблічча за калючым дротам.

Толькі зараз мы зразумелі сэнс тых падзей, іх маштабы. А тады ж і ў галаву не прыходзіла думка аб тым, што вызваленне бацькі, яго рэабілітацыя стане магчымым толькі пасля смерці "бацькі ўсіх часоў і народаў" – Сталіна.

У 1967 годзе ў сувязі з 50-годдзем Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі наш бацька, як удзельнік падзей 1917 – 1920 гг., быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. 4 чэрвеня 1970 г. яго не стала...

Чалавечыя лёсы... Якія яны зыбкія і якія трагічныя.

В. Герасімава (Якаўцова).

Вынішчаліся цэлыя роды

Гулевічы ў в. Рудня-Стаўбунская на Веткаўшчыне – прозвішча карэннае. Па словах Івана Андрэевіча Гулевіча, запісаных пры абследаванні Стаўбунскага нацыянальна-польскага сельсавета ў 1935 г. (тады Івану Андрэевічу быў ужо 91 год): "... Гадоў 300 таму назад з вёскі Старая Рудня (Рудня-Свяцілавіцкая), па дазволу графа Чарнышова, на яго землі, у лясны масіў пераехала некалькі сямей. Іх прозвішча было Гулевічы. Яны раскарчавалі месца і заснавалі вёску Рудня-Стаўбунская".

Амаль два стагоддзі ў згубленай у лясных нетрах вёсцы Гулевічы плавілі ліманіт (балотную руду), выраблялі так патрэбнае мясцовым сялянам жалеза. І дымілася рудня па-над лесам і ўзімку, і ўлетку. Змяняліся пакаленні, расла вёска. З развіццём у Расіі металапрамысловасці ў канцы XIX ст. саматужная вытворчасць жалеза спынілася. Пагасла рудня і ў вёсцы, а назва паселішча так і засталася – Рудня-Стаўбунская.

Пасля рэвалюцыі калектывізацыя ў гэтай вёсцы праходзіла цяжка. У 1933 г. з'явіліся першыя рэпрэсіраваныя і раскулачаныя. Толькі за 1937 год з вёскі арыштавалі 10 Гулевічаў, а ў 1938 г. – яшчэ дваіх. Расстралялі ўсіх. У ліку расстраляных – Варвара Іосіфаўна Гулевіч.

Аб тым, як гэта было, расказала дачка – Станіслава Іосіфаўна Гулевіч (зараз пенсіянерка, заслужаная артыстка БССР, жыве ў Мінску):

– Аўтамабіль, празваны ў народзе "чорны воран", тады ўжо добра прымільгаўся жыхарам вёскі. Рэдкі ў тыя гады ў нашых глухіх мясцінах рокат матора спачатку выклікаў жывы інтарэс. Аднак хутка людзі сталі смяротна страшыцца паяўлення гэтага "цуда савецкай тэхнікі", на якім вывазілі з вёскі людзей і яны знікалі назаўсёды. Пачуўшы шум рухавіка, хаваліся па хатах, зачынялі засоўкі, апускалі заслоны, хрысціліся нават няверуючыя: "Божа, пранясі!". Але страх не знікаў. Чужая бяда хаця і аддаленая, усё роўна шчаміла сэрца.

У той дзень мама, брат і я былі ў бабулі. Аз бацькі з Данбасу, куды яго накіравалі на працу, даволі доўгі час не было звестак. Што ж атрымалася? Мама хвалявалася. Уся яна панікла, змарнела, замкнулася ў сабе. Куды падзявалася яе добрая, шчырая ўсмешка? Нават голас, заўсёды звонкі і пявучы, стаў глухім і ціхім. На вачах часта з'яўляліся слёзы, на твары – страх. Мабыць, сэрцам прадчувала няўхільную бяду...

У нашай вёсцы бацька быў арганізатарам і першым старшынёй мясцовага калгаса. Ды і мама, заўжды такая правільная, сумленная, актыўная, не праходзіла міма разбэшчанасці ці безгаспадарчасці. Вось і знайшоўся такі той, хто з помсты і зайздрасці да добрай і сардэчнай жанчыны пісаў на яе недарэчныя даносы. Тады гэтага хапіла, каб у той страшэнны зімовы дзень 19 снежня звезці яе назаўсёды...

У дзень, калі ўзялі маму, сказалі: "Для паказанняў, як сведку на допыт", а звезлі назаўсёды.

Маме было ўсяго 37 гадоў. У калгасе "Новае жыццё" яна працавала даяркай, была актывісткай сельскага Савета. Судзілі маму па надуманаму і бязглуздаму абвінавачанню. Расстралялі ў Гомелі 1 красавіка 1938 г.

З дому маму павялі два ўзброеныя салдаты. Толькі і паспела крыкнуць з парога: "Дзеці мае, дзеткі, родненькія... Гэта ўсё!".

Настаўніца, якая пазней вярнулася з няволі, расказала, як зневажалі і здзекаваліся з мамы следчыя, яны прымушалі яе падпісаць імі ж сфабрыкаваныя паказанні. Надломленая маральнымі і фізічнымі катаваннямі, яна паверыла, што разам з "прызнаннямі" яе пакінуць у спакоі. Хуткі суд быў няўмольным. Прыгавор — расстрэл.

ЖАРНОСЕНКА Андрэй Сцяпанавіч, н. у 1893. Калгаснік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 19.12.1932. Асуджаны на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 18.8.1989.

МОХАРАЎ Ігнат Паўлавіч, н. у 1876. Калгаснік. Арыштаваны 19.12.1932. Асуджаны да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 18.8.1989.

ВЁСКА КОСІЦКАЯ

ПАПСУЕЎ Ісак Спірыдонавіч, н. у 1885. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.9.1929. Асуджаны 23.11.1929 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 10.3.1993.

ПАПСУЕЎ Пётр Спірыдонавіч, н. у 1870. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.9.1929. Асуджаны 23.11.1929 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 10.3.1993.

ПРЫШЧЭПАЎ Сяргей Якаўлевіч, н. у 1895. Жывёлавод. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 24.6.1941. Асуджаны 7.10.1941 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і да 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Рэабілітаваны 17.8.1990.

СІНЯГРЫБАЎ Карней Сямёнавіч, н. у 1898. Арыштаваны 10.2.1938. Асуджаны 25.5.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 9.8.1938. Рэабілітаваны 14.5.1963.

ВЁСКА СІВЕНКА

СЛЯПУХІН Сцяпан Васільевіч, н. у 1890. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 21.8.1932. Асуджаны 8.10.1932 на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 12.3.1962.

СУГАНЯКІН Марцін Дзям'янавіч, н. у 1877. Аднаасобнік. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 14.12.1933. Асуджаны 19.2.1934 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 25.1.1935 у Цемлагу. Рэабілітаваны 20.9.1989.

ШАПАВАЛАЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.5.1937. Асуджаны на 1,5 года зняволення ў ППЛ. Паўторна асуджаны 8.7.1939 на 8 гадоў зняволення ў ППЛ і на 4 гады пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены. Рэабілітаваны 28.2.1968.

ШАПАВАЛАЎ Ягор Герасімавіч, н. у 1880. Аднаасобнік. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 29.10.1932. Асуджаны 3.11.1932 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 11.12.1989.

СТАЎБУНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ГАРАДОК

ЯСІНСКАЯ Людвіга Мікалаеўна, н. у 1918. Арыштавана 2.9.1937. Асуджана 23.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана 27.7.1989.

ВЁСКА КАЛІНІНА

АРЦЮХОЎ Самуіл Пятровіч, н. у 1901. Калгаснік. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 8.1.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ДЗЕМЧАНКА Пётр Ягоравіч, н. у 1878. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЦУПРЫКАЎ Антон Ігнатавіч, н. у 1910. Калгаснік. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 23.11.1989.

ЦУПРЫКАЎ Ігнат Фёдаравіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЦУПРЫКАЎ Трафім Ігнатавіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да высылкі на 5 гадоў. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ВЁСКА КОЎБАЎКА

СТРАДАЕЎ Павел Лаўрынавіч, н. у 1899. Калгаснік. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 26.10.1943. Асуджаны 21.4.1944 да 10 гадоў зняво-

лення ў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці і да 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены ў 1953. Рэабілітаваны 7.12.1960.

ВЁСКА СТАЎБУН

АБЕХЦІКАЎ Яўсей Фядотавіч, н. у 1898. Аднаасобнік. Арыштаваны 1.2.1933. Асуджаны 15.3.1933 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 23.1.1937. Рэабілітаваны 8.9.1961.

ГУЛЕВІЧ Васіль Паўлавіч, н. у 1878. Селянін. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 14.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ГУЛЕВІЧ Вікенцій Рыгоравіч, н. у 1880. Селянін. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 18.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.9.1957.

ГУЛЕВІЧ Франц Якаўлевіч, н. у 1893. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 18.3.1934. Асуджаны на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.9.1957.

КЕРНАЖЫЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1875. Святар. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны 17.9.1937 да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 28.9.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 19.5.1989.

КЕРНАЖЫЦКІ Павел Іванавіч, н. у 1882. Благачынны Гомельскай гарадской акругі. Арыштаваны 11.5.1927. Асуджаны 16.9.1927 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 8.8.1988.

МЯДЗВЕДЗЕВА Марыя Антонаўна, н. у 1915. Калгасніца. Арыштавана 25.11.1944. Асуджана да высылкі на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалена ў 1946. Рэабілітавана 4.1.1993.

СТАРАЗАКРУЖСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЗАКРУЖЖА

АГЕЙЧАНКА Іосіф Фёдаравіч, н. у 1872. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 6.11.1930. Асуджаны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ГАЛЛЕ-АЛІС Фрыдрых Андрэевіч, н. у 1885. Служачы. Арыштаваны 26.1.1928. Асуджаны 28.6.1928 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 10.12.1992.

ПАНКОЎ Васіль Ціханавіч, н. у 1908. Калгаснік. Арыштаваны 21.8.1940. Асуджаны 15.6.1942. Памёр у Нарыльлагу 23.11.1944. Рэабілітаваны 6.1.1958.

ПІНЕВІЧ Пётр Сяргеевіч, н. у 1881. Святар. Арыштаваны 4.2.1930. Асуджаны 6.3.1930 да высылкі на Поўнач на 2 гады. Рэабілітаваны 30.6.1960.

ВЁСКА НОВАЕ ЗАКРУЖЖА

АБАРАВА Любоў Канстанцінаўна, н. у 1897. Хатняя гаспадыня. Мела дваіх дзяцей. Арыштавана 28.11.1937. Асуджана на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітавана 12.7.1989.

АГЕЙЧАНКА Пётр Іосіфавіч, н. у 1895. Настаўнік. Арыштаваны 9.10.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 9.11.1964.

АЛЯКСЕЕНКА Нікіфар Пятровіч, н. у 1892. Дырэктар. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у Усольскім лагеры 30.9.1942. Рэабілітаваны 13.1.1958.

КАМАРОЎ Васіль Цімафеевіч, н. у 1883. Арыштаваны 26.9.1939. Асуджаны 20.10.1939 на 7 гадоў зняволення ў ППЛ і 3 гады пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Рэабілітаваны 12.12.1989.

КОНАНЦАЎ Пётр Лукіч, н. у 1876. Арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 7.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 23.5.1989.

КОНАНЦАЎ Сямён Якаўлевіч, н. у 1908. Калгаснік. Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны 26.11.1937 да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.1.1989.

РАФЕЕЎ Дзмітрый Міхайлавіч, н. у 1893. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 23.9.1930. Асуджаны на 1 год зняволення ў ППЛ. Паўторна арыштаваны 22.8.1938. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1945. Рэабілітаваны 15.12.1965, 5.9.1966.

ЯСТРАБКОЎ Міхаіл Фролавіч, н. у 1873. Арыштаваны 4.9.1930. Асуджаны 27.9.1930 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ (заменена высылкай з сям'ёй у Сібір). Рэабілітаваны 24.7.1989.

ЯСТРАБКОЎ Пётр Міхайлавіч, н. у 1908. Арыштаваны 8.10.1937. Асуджаны 26.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

ВЁСКА СТАРОЕ ЗАКРУЖЖА

ВАРЫВОДА Іван Еўдакімавіч, н. у 1884. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 28.12.1932. Асуджаны 16.2.1933 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 4.12.1989.

ВАРЫВОДА Мікіта Карпавіч, н. у 1882. Калгаснік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 28.12.1932. Асуджаны 16.2.1933 да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.12.1989.

КАРАСЁЎ Лявон Іванавіч, н. у 1875. Пчаляр. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 18.9.1937. Рэабілітаваны 2.11.1950.

КОСТАЧКА Харытон Фадзеевіч, н. у 1888. Калгаснік. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны 15.11.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

КУЛАГА Яфім Васільевіч, н. у 1877. Аднаасобнік. Арыштаваны 27.12.1932. Асуджаны 16.2.1933 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны. Рэабілітаваны 4.12.1989.

ЛІСТАПАДАЎ Павел Аляксандравіч, н. у 1907. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 16.1.1933 на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 12.9.1989.

УДОДАЎ Герасім Іванавіч, н. у 1904. Аднаасобнік. Арыштаваны 29.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 28.8.1989.

УДОДАЎ Даніла Андрэевіч, н. у 1882. Калгаснік. Арыштаваны 14.12.1933. Асуджаны да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 20.9.1989.

УДОДАЎ Даніла Данілавіч, н. у 1906. Калгаснік. Арыштаваны 14.12.1933. Асуджаны 19.2.1934 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 20.9.1989.

УДОДАЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1889. Аднаасобнік. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 16.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 12.9.1989.

УДОДАЎ Пётр Іванавіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны 19.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да 3 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 26.8.1989.

УЛАСЕНКА Фёдар Мікалаевіч, н. у 1904. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 12.4.1932. Асуджаны 26.6.1932 да 3 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 15.9.1989.

ФЕШЧАНКА Андрэй Іванавіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 3.1.1933. Асуджаны 16.1.1933 на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 12.9.1989.

ШАПУРКА Ціт Майсеевіч, н. у 1871. Дзяк. Арыштаваны 29.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 28.8.1989.

ХАЛЬЧАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА СТАРОЕ СЯЛО

БАРДЗЮГОЎ Філімон Якаўлевіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Арыштаваны 16.11.1929. Асуджаны 3.12.1929 да 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 22.8.1933. Рэабілітаваны 30.8.1989.

БАРСУКОЎ Цярэнцій Іванавіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 17.7.1937. Асуджаны 17.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у лагеры 31.1.1941. Рэабілітаваны 16.12.1959.

ВАЯВОДА Васіль Сцяпанавіч, н. у 1887. Рабочы. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 21.5.1932. Асуджаны 22.7.1932 да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 15.9.1989.

КАРНЕЕЎ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1892. Арыштаваны 10.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 28.6.1989.

КАРНЕЕЎ Навум Антонавіч, н. у 1887. Арыштаваны 5.8.1937. Асуджаны 17.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 7.7.1958.

МАЛАЖАЎСКІ Цімафей Піліпавіч, н. у 1901. Арыштаваны 10.7.1940. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ і на 4 гады пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Рэабілітаваны 26.6.1990.

ПАЗНЯКОЎ Іван Сільвестравіч, н. у 1880. Калгаснік. Арыштаваны 2.9.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 16.1.1989.

САЛАЎЁЎ Ціт Піліпавіч, н. у 1890. Служачы. Арыштаваны 7.9.1937. Асуджаны 5.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у Кулайлагу 9.2.1939. Рэабілітаваны 18.4.1958.

СЕМЯНЦОЎ Акім Аўксенцьевіч, н. у 1877. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 31.1.1930. Асуджаны. Рэабілітаваны 5.7.1989.

СЕМЯНЦОЎ Фёдар Акімавіч, н. у 1907. Калгаснік. Арыштаваны 31.1.1930. Асуджаны. Паўторна арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 23.5.1989, 5.7.1989.

ШКЛЯРЭЎСКІ Уладзімір Мікалаевіч, н. у 1891. Святар. Арыштаваны 30.4.1935. Асуджаны 4.10.1935 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 21.5.1992.

ВЁСКА ХАЛЬЧ

БЕЛАКАПЫТАЎ Павел Трафімавіч, н. у 1885. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 25.9.1937. Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 26.12.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 16.6.1989.

ВЕРАБ'ЁЎ Трафім Рыгоравіч, н. у 1878. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.11.1929. Асуджаны 15.12.1929 да высылкі ў Сібір на 3 гады. Рэабілітаваны 25.8.1992.

ГРЫШКЕВІЧ Мікалай Іосіфавіч, н. у 1910. Арыштаваны 24.9.1941. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ з пазбаўленнем правоў на 10 гадоў. Вызвалены 3.5.1951. Рэабілітаваны 27.12.1967.

ЖАЎТАНОГАЎ Іван Фадзеевіч, н. у 1889. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 1.2.1930. Асуджаны 21.2.1930 да высылкі на Поўнач. Рэабілітаваны 4.12.1989.

ЖГІРАЎ Гаўрыла Мікітавіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны 20.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у лагеры 13.4.1938. Рэабілітаваны 29.7.1963.

ЗВЯРОВІЧ Іван Лявонцьевіч, н. у 1894. Агранном. Арыштаваны 3.9.1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і да 3 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены ў 1946. Рэабілітаваны 27.1.1958.

КАРОБУШКА Міна Васільевіч, н. у 1872.

Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 19.5.1931. Асуджаны 4.7.1931 на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 2.11.1989.

КАРОБУШКІН Яфім Барысавіч, н. у 1908. Арыштаваны 29.9.1942. Асуджаны 26.10.1942 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены 7.4.1952. Рэабілітаваны 19.2.1969.

КОНЧЫЦ Макар Мацвеевіч, н. у 1884. Настаўнік. Арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны 23.10.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 7.2.1941. Рэабілітаваны 30.9.1960.

КРАСНОЎ Георгій Георгіевіч, н. у 1889. Сталяр. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 22.3.1939. Асуджаны 8.6.1939 і паўторна — 25.6.1939 па 5 гадоў зняволення ў ППЛ і на 3 гады пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Рэабілітаваны 10.12.1991.

ЛУБАЧКІН Павел Еўдакімавіч, н. у 1884. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 24.11.1927. Асуджаны 27.4.1928 да зняволення на 3 гады ў ППЛ. Рэабілітаваны 12.11.1992.

ЛУШЧЫК Міхаіл Іванавіч, н. у 1898. Служачы. Меў траіх дзяцей. Асуджаны 16—17.4.1938 на 2 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 23.1.1958.

ПРЫХОДЗЬКА Навум Барысавіч, н. у 1877. Арыштаваны 31.7.1929. Асуджаны 20.11.1929 да 3 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 4.1.1993.

ПРЫХОДЗЬКА Фёдар Васільевіч, н. у 1913. Арыштаваны 25.9.1937. Асуджаны 6.12.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Гомелі 26.12.1937.

СЕЛЬКІН Ціхан Іванавіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Арыштаваны 25.11.1929. Асуджаны 15.12.1929 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 25.8.1992.

ЯРМОЛІН Іван Васільевіч, н. у 1887. Настаўнік. Арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны 23.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 12.8.1938. Рэабілітаваны 18.3.1959.

ХІЗАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА БЫКАВЕЦ

КАДЗЕТАЎ Пётр Кір'янавіч, н. у 1914. Калгаснік. Арыштаваны 6.12.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.1.1938 у Гомелі. Рэабілітаваны 28.6.1961.

ВЁСКА ГАРЫСТЫ

КРУПСКІ Андрэй Іванавіч, н. у 1890. Калгаснік. Арыштаваны 6.12.1937. Асуджаны 3.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Гомелі 10.1.1938. Рэабілітаваны 2.7.1963.

ЛАПІЦКАЯ Марыя Іосіфаўна, н. у 1903. Сялянка. Мела траіх дзяцей. Арыштавана 6.11.1930. Асуджана да высылкі ў Сібір. Рэабілітавана 24.10.1989.

Ц. П. Малажаўскі.

ШУЛЬМАН Нысан Азаравіч, н. у 1899. Калгаснік. Арыштаваны 24.2.1949. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 28.9.1961.

ЯКУБОВІЧ Мікалай Фёдаравіч. Арыштаваны 7.8.1930. Асуджаны 25.8.1930 на 3 гады зняволення ў канцлагеры (Салавецкі ППЛ). Вызвалены ў 1933. Рэабілітаваны 14.5.1990.

ЯКУБОВІЧ Павел Іосіфавіч, н. у 1910. Арыштаваны 6.12.1937. Асуджаны 3.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Гомелі 10.1.1938. Рэабілітаваны 29.3.1961.

ВЁСКА ГУТА

ВАСІЛЕЎСКІ Андрэй Іванавіч, н. у 1884. Арыштаваны 6.12.1937. Асуджаны 3.1.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны ў Гомелі 10.1.1938. Рэабілітаваны 20.9.1961.

ГЕРМАНАЎ Іоў Васільевіч, н. у 1875. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 1.2.1933. Асуджаны 15.3.1933 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 8.9.1961.

ВЁСКА ХІЗЫ

БУЙНЕВІЧ Андрэй Рыгоравіч, н. у 1924. Арыштаваны 24.11.1943. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены датэрмінова. Рэабілітаваны 29.5.1962.

ГРАМЫКА Канстанцін Андрэевіч, н. у 1919. Калгаснік. Арыштаваны 15.6.1938. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў верасні 1948. Рэабілітаваны 11.9.1989.

ГРАМЫКА Кацярына Пятроўна, н. у 1897. Аднаасобніца. Мела чацвярых дзяцей. Арыштавана 22.7.1941. Асуджана да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляна 6.8.1941. Рэабілітавана 23.12.1966.

ІВАНОЎСКАЯ Домна Дзмітрыеўна, н. у 1896. Арыштавана 4.1.1945. Асуджана 19.1.1946 да высылкі на 4 гады. Вызвалена ў 1948. Рэабілітавана 11.9.1961.

КРУПСКІ Іван Яфімавіч, н. у 1921. Служачы. Арыштаваны 29.5.1947. Асуджаны 8.3.1948 на 25 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення

грамадзянскіх правоў з канфіскацыяй маёмасці. Вызвалены 18.1.1955. Рэабілітаваны 17.5.1977.

ЛАПІЦКІ Аляксандр Васільевіч, н. у 1904. Арыштаваны 23.7.1938. Асуджаны 27.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 16.11.1960.

ЛАПІЦКІ Аляксандр Ільіч, н. у 1905. Калгаснік. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 3.8.1948. Рэабілітаваны 17.1.1956.

ЛАПІЦКІ Апанас Максімавіч, н. у 1891. Арыштаваны 14.6.1947. Асуджаны 26.9.1947 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 26.9.1947.

ЛАПІЦКІ Апанас Рыгоравіч, н. у 1908. Калгаснік. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны 25.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены 20.1.1948. Рэабілітаваны 5.11.1959.

ЛАПІЦКІ Васіль Лявонцьевіч, н. у 1909. Арыштаваны 22.7.1938. Асуджаны 27.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 7.10.1938. Рэабілітаваны 16.11.1960.

ЛАПІЦКІ Дзям'ян Іванавіч, н. у 1901. Арыштаваны 6.8.1938. Асуджаны 22.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 16.11.1960.

ЛАПІЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1902. Калгаснік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 24.6.1938. Асуджаны 25.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр у ППЛ. Рэабілітаваны 16.11.1960.

ЛАПІЦКАЯ Кацярына Лаўрэнаўна, н. у 1912. Калгасніца. Мела дваіх дзяцей. Арыштавана 20.1.1945. Асуджана да высылкі ў Краснаярскі край на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 18.1.1983.

ЛАПІЦКІ Мікалай Ільіч, н. у 1898. Калгаснік. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны 29.9.1938 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 11.9.1939. Рэабілітаваны 21.6.1960.

ЛАПІЦКІ Мікалай Пятровіч, н. у 1906. Арыштаваны 29.6.1938. Асуджаны 22.8.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 1.10.1938. Рэабілітаваны 24.5.1961.

ЛАПІЦКІ Яфім Васільевіч, н. у 1901. Арыштаваны 20.7.1938. Асуджаны 22.9.1938 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 1.4.1938. Рэабілітаваны 13.7.1960.

ЯКУБОВІЧ Лука Паўлавіч, н. у 1913. Арыштаваны 5.4.1937. Асуджаны 19.8.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і на 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Памёр у лагеры 26.3.1938. Рэабілітаваны 3.5.1960.

ШАРСЦІНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА ЛЯДЫ

АСІПЕНКА Іван Ягоравіч, н. у 1902. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 4.5.1933. Асуджаны 13.5.1933 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 17.11.1989.

ВЁСКА НАВАСЁЛКІ

АНДРЭЙКА Іван Яфімавіч, н. у 1909. Дзяк. Арыштаваны 30.2.1930. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Паўторна асуджаны 20.9.1937 да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 28.9.1937. Рэабілітаваны 29.1.1968.

БЯЛЯЕЎ Іван Гаўрылавіч, н. у 1895. Арыштаваны 14.4.1933. Асуджаны да высылкі ў Казахстан на 5 гадоў. Рэабілітаваны 3.8.1989.

КАКАШЫНСКІ Станіслаў Уладзіміравіч, н. у 1888. Рабочы. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 31.10.1937. Асуджаны 15.2.1938 да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны ў Гомелі 14.3.1938. Рэабілітаваны 18.4.1959.

КЕЛЬБАС Уладзімір Геацынтавіч, н. у 1895. Бухгалтар. Арыштаваны 2.3.1933. Асуджаны 17.4.1933 да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 1.4.1958.

НІКУЛІН Мікіта Сямёнавіч, н. у 1880. Калгаснік. Арыштаваны 2.9.1937. Асуджаны 12.9.1937 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 25.3.1941. Рэабілітаваны 13.10.1989.

ПАЎЛАЎ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1905. Арыштаваны 3.2.1930. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1939. Рэабілітаваны 29.1.1968.

ШАЎЦОЎ Фядос Ліфаравіч, н. у 1885. Калгаснік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 20.11.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 29.12.1937. Рэабілітаваны 9.6.1989.

ВЁСКА РАМАНАВА

МАРЧАНКА Фадзей Ісідаравіч, н. у 1890. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 25.2.1932. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 19.10.1989.

ВЁСКА ШАРСЦІН

АСІПКОЎ Аляксей Рыгоравіч, н. у 1884. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны 22.8.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 30.6.1989.

АСІПКОЎ Данііл Яўстацьевіч, н. у 1892. Калгаснік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 21.11.1937. Асуджаны на 8 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 8.8.1990.

БЛІННІКАЎ Фама Іванавіч, н. у 1889. Рабочы. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 21.9.1937. Асуджаны 19.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 26.6.1989.

ДЗЯНІСАЎ Павел Сямёнавіч, н. у 1898. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 8.9.1937. Асуджаны 28.9.1937 да вышэйшай меры пакарання

з канфіскацыяй маёмасці. Расстраляны 7.10.1937 у Гомелі. Рэабілітаваны 25.5.1989.

ЕЗІН (ІОЗІН) Фядос Цімафеевіч, н. у 1899. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 11.2.1933. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ІОЗІН (ЕЗІН) Аляксей Якаўлевіч, н. у 1915. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.11.1930. Асуджаны да высылкі як заможны селянін у Сібір. Рэабілітаваны 21.4.1992.

ІОЗІН (ЕЗІН) Мікалай Якаўлевіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.11.1930. Асуджаны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ІОЗІН (ЕЗІН) Якаў Якаўлевіч, н. у 1870. Аднаасобнік. Высланы як заможны селянін у Сібір. Рэабілітаваны 24.10.1989.

КАРОТКІ Павел Рыгоравіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.4.1933. Асуджаны 17.5.1933 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 10.1.1977.

КАТЛЯРОЎ Герасім Рыгоравіч, н. у 1903. Рабочы. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 10.1.1945. Асуджаны 15.4.1945 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 13.4.1964.

КУЗНЯЦОЎ Клім Аляксеевіч, н. у 1884. Аднаасобнік. Меў шасцярых дзяцей. Арыштаваны 11.2.1933. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 24.7.1989.

МАКЕЕЎ Нічыпар Ульянавіч, н. у 1899. Арыштаваны 20.5.1940. Асуджаны на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 9.1.1990.

МЫСЛІЎЦАЎ Аляксандр Андрэевіч, н. у 1881. Аднаасобнік. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 11.2.1933. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ПОМАЗАЎ Іван Мітрафанавіч, н. у 1866. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 16.9.1937. Рэабілітаваны 14.5.1989.

ПЯРЫНАЎ Андрэй Мікалаевіч, н. у 1875. Арыштаваны 22.10.1937. Асуджаны 3.11.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 19.7.1989.

РАМАНЦОЎ Мартын Мікалаевіч, н. у 1864. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 8.2.1930. Асуджаны 21.2.1930 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 21.7.1989.

ТАПЛЁНКІН Аляксандр Сямёнавіч, н. у 1895. Арыштаваны 1.9.1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 5.5.1989.

ТАПЛЁНКІН Ягор Сямёнавіч, н. у 1871. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.7.1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 10.11.1938 у турме. Рэабілітаваны 9.11.1981.

ЧАШЫН Ягор Арцёмавіч, н. у 1883. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 11.2.1933. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 24.7.1989.

ВЁСКА ЮРКАВІЧЫ

БУДАЎ Фама Якаўлевіч, н. у 1909. Аднаасобнік. Арыштаваны 17.12.1932. Асуджаны 2.1.1933 да 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 27.1.1989.

БУДАЎ Якаў Якаўлевіч, н. у 1900. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 20.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ДАНІЛЬКОЎ Фёдар Аляксандравіч, н. у 1880. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 15.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ЗЫЧКОЎ Аляксей Іванавіч, н. у 1906. Рахункавод. Арыштаваны 15.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ЗЫЧКОЎ Варфаламей Яфімавіч, н. у 1889. Аднаасобнік. Арыштаваны 20.11.1937. Асуджаны да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 28.6.1989.

ЗЫЧКОЎ Ягор Васільевіч, н. у 1897. Аднаасобнік. Меў семярых дзяцей. Арыштаваны 17.12.1932. Асуджаны 2.1.1933 да 3 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ЗЫЧКОЎ Ягор Ільіч, н. у 1904. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 26.1.1939. Асуджаны да 6 гадоў зняволення ў ППЛ і да 3 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены ў 1944. Рэабілітаваны 11.2.1967.

ЗЫЧКОЎ Яўціх Васільевіч, н. у 1903. Калгаснік. Арыштаваны 20.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 да высылкі на Поўнач на 3 гады. Рэабілітаваны 27.10.1989.

КАСЦЮКОЎ Нікіфар Фядосавіч, н. у 1892. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.1.1933. Асуджаны 26.1.1934 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Вызвалены ў 1936. Рэабілітаваны 21.12.1959.

КАСЦЮКОЎ Фядот Ісакавіч, н. у 1881. Калгаснік. Арыштаваны 15.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ПАРФЯНКОЎ Рыгор Максімавіч, н. у 1892. Рахункавод. Меў пяцярых дзяцей. Арыштаваны 29.4.1938. Асуджаны 15.9.1938 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ і да 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Памёр 14.6.1942 у лагеры. Рэабілітаваны 18.1.1961.

ПІГУНОЎ Павел Ігнацьевіч, н. у 1867. Аднаасобнік. Арыштаваны 13.12.1932 да высылкі на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ШАПАВАЛАВА Анастасія Дзмітрыеўна, н. у 1896. Аднаасобніца. Арыштавана 19.12.1932. Асуджана 2.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітавана 27.12.1989.

ШАПАВАЛАЎ Іван Халімонавіч, н. у 1914. Арыштаваны 17.3.1934. Асуджаны 27.3.1934 на 5 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 27.10.1989.

ШАПАВАЛАЎ Мікалай Піліпавіч, н. у 1915. Арыштаваны 17.12.1932. Асуджаны 2.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ШАПАВАЛАЎ Філімон Емяльянавіч, н. у 1885. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 6.12.1932. Асуджаны 2.1.1933 да высылкі на 5 гадоў. Рэабілітаваны 27.12.1989.

ШУКАЎ Антон Віктаравіч, н. у 1896. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 10.1.1933. Асуджаны 23.6.1933 на 3 гады ўмоўна з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітаваны 21.12.1959.

ЯНОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКА СТАЎБУНСКАЕ БУДЗІШЧА

ГАНЧАРОЎ Свірыд Макаравіч, н. у 1874. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЛУГАНАЎ Аляксей Акімавіч, н. у 1908. Цясляр. Арыштаваны 15.11.1937. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 5.8.1968.

ЧУГАЕЎ Акім Емяльянавіч, н. у 1860. Аднаасобнік. Арыштаваны 6.11.1930. Асуджаны да высылкі ў Сібір. Рэабілітаваны 24.10.1989.

ВЁСКА ЯНОВА

БАЙЛУКОВА Соф'я Андрэеўна, н. у 1906. Калгасніца. Мела траіх дзяцей. Арыштавана 28.2.1945. Асуджана да высылкі на 5 гадоў з канфіскацыяй маёмасці. Рэабілітавана 27.1.1993.

БІЧАЎ Павел Іванавіч, н. у 1897. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ГАНЧАРОЎ Дзмітрый Свірыдавіч, н. у 1902. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 на 5 гадоў зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ДЗЕМЧАНКА Архіп Пятровіч, н. у 1909. Калгаснік. Арыштаваны 26.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 23.11.1989.

ДЗЕМЧАНКА Міхаіл Харытонавіч, н. у 1900. Калгаснік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 23.11.1989.

ДЗЕМЧАНКА Ціт Харытонавіч, н. у 1912. Калгаснік. Арыштаваны 8.4.1946. Асуджаны на 10 гадоў зняволення ў ППЛ і 5 гадоў пазбаўлення грамадзянскіх правоў. Вызвалены 3.11.1948. Рэабілітаваны 1.3.1968.

ІНДЗЮКОЎ Мікіта Васільевіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЛУГАЧОЎ Іван Мікалаевіч, н. у 1892. Аднаасобнік. Меў чацвярых дзяцей. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 16.4.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЛЫГАЧОЎ Міхаіл Андрэевіч, н. у 1912. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.6.1930. Асуджаны 26.7.1930 на 3 гады зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 4.2.1993.

МАЁРАЎ Іосіф Мікітавіч, н. у 1914. Аднаасобнік. Арыштаваны 18.6.1930. Асуджаны 26.7.1930 да высылкі. Рэабілітаваны 4.2.1993.

МАЁРАЎ Сямён Васільевіч, н. у 1887. Аднаасобнік. Меў семярых дзяцей. Арыштаваны 6.8.1937. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Расстраляны 10.9.1937. Рэабілітаваны 11.5.1989.

НОВІКАЎ Іосіф Ціханавіч, н. у 1909. Арыштаваны 21.2.1933. Асуджаны 17.3.1933 на 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 6.1.1968.

ЦУПРЫКАЎ Ігнат Пятровіч, н. у 1908. Аднаасобнік. Арыштаваны 26.2.1932. Асуджаны 17.3.1933 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Рэабілітаваны 23.10.1989.

ЦУПРЫКАЎ Макар Венядзіктавіч, н. у 1906. Аднаасобнік. Меў траіх дзяцей. Арыштаваны 28.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да высылкі на 3 гады. Рэабілітаваны 30.11.1989.

ЦУПРЫКАЎ Сяргей Дзям'янавіч, н. у 1902. Аднаасобнік. Арыштаваны 31.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 да высылкі на 3 гады. Паўторна арыштаваны і асуджаны 17.10.1937 да 10 гадоў зняволення ў ППЛ. Памёр 13.3.1940. Рэабілітаваны 23.6.1989. 30.11.1989.

ЦУПРЫКАЎ Якаў Венядзіктавіч, н. у 1890. Аднаасобнік. Арыштаваны 30.12.1932. Асуджаны 11.1.1933 на 3 гады зняволення ў канцлагеры. Рэабілітаваны 30.11.1989.

1941

1945

ІШЛА ВАЙНА НАРОДНАЯ*

Вайна... У лёс кожнага чалавека яна ўварвалася па-рознаму. Але агульнымі для ўсіх былі неймаверныя людскія пакуты і мільёны загубленых чалавечых жыццяў, незлічоныя матэрыяльныя страты, разбураныя і спаленыя гарады і вёскі. Але было і іншае: вайна выявіла лепшыя людскія якасці: самаадданы патрыятызм, з'яднанасць і дружбу брацкіх народаў. Такога чыстага парыву любві да сваёй Айчыны, такога ахвярнага напалу і гатоўнасці аддаць за яе ўсе сілы і сродкі яшчэ не ведала гісторыя. Але гэта было крыху пазней. У першыя ж часы і дні вайны ніхто не ведаў, не мог нават уявіць, якія выпрабаванні чакаюць усіх.

Жыхары Веткаўшчыны даведаліся аб пачатку вайны ў 12 гадзін 22 чэрвеня 1941г. з выступлення па радыё намесніка старшыні СНК СССР, наркома замежных спраў В. М. Молатава. Жыццё раёна адразу ж змяніла сваю хаду. На ўсіх прадпрыемствах і ўстановах, сельсаветах, калгасах, МТС былі праведзены мітынгі і сходы, на якіх працоўныя выказвалі гнеў і абурэнне да фашысцкіх захопнікаў, якія вераломна парушылі пакт аб ненападзенні, упэўненасць у хуткім разгроме агрэсара на яго ўласнай тэрыторыі "малакроўным магутным ударам".

Згодна з пастановай ЦК КП(б)Б ад 22 чэрвеня 1941 г. "Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК СССР В.М. Молатава", у райцэнтры і раёне былі прыняты тэрміновыя захады па пераводу ўсяго жыцця на ваенны лад. Калектывы прамысловых прадпрыемстваў і транспарту, працаўнікі сельскай гаспадаркі бралі абавязацельствы замяніць тых, хто пайшоў у армію, перавыконваць вытворчыя заданні, мабілізаваць усе сілы і сродкі для аказання дапамогі фронту.

Пачынаючы з 23 чэрвеня, райваенкамат арганізавана правёў мабілізацыю ваенна-абавязаных. Большасць з іх былі накіраваны на папаўненне 3-й арміі.

Ветка і Веткаўскі раён у сучасных граніцах больш за месяц (да жніўня 1941 г.) з'яўляліся тылавым, а потым прыфрантавым раёнам. Гэта акалічнасць дазволіла ажыццявіць шэраг мерапрыемстваў па пераводу ўсяго жыцця на ваенны лад, эвакуацыі матэрыяльных каштоў-

---

У 1-й кнізе гісторыка-дакументальнай хронікі "Памяць. Веткаўскі раён" у раздзеле, прысвечаным Вялікай Айчыннай вайне, змешчаны толькі ўступны нарыс і спісы воінаў Чырвонай Арміі, што загінулі пры абароне і вызваленні раёна і пахаваны на яго тэрыторыі. Астатнія матэрыялы раздзела глядзі ў 2-й кнізе хронікі.

насцей, маёмасці прадпрыемстваў і калгасаў у савецкі тыл.

У адпаведнасці з дырэктывай ЦК КП(б)Б ад 23 чэрвеня 1941 г. усім абкомам, райкомам КП(б)Б і выканкомам раённых Саветаў дэпутатаў працоўных усходніх абласцей рэспублікі аб арганізацыі барацьбы з варожымі дыверсантамі і парашутыстамі ў Веткаўскім і Свяцілавіцкім раёнах былі створаны знішчальныя батальёны. Веткаўскі батальён на чале з упаўнаважаным НКУС Я. Т. Зарэцкім налічваў 200 байцоў, Свяцілавіцкі, які ўзначальваў Яўмененка, — 100 чалавек. Байцы знішчальных батальёнаў вялі барацьбу з дыверсантамі, ахоўвалі народна-гаспадарчыя аб'екты і шляхі зносін.

Пры набліжэнні фронту да граніц раёна жыхары Веткаўшчыны, галоўным чынам жанчыны, старыя, падлеткі, прынялі актыўны ўдзел у будаўніцтве абарончых рубяжоў па Сожы.

Паўсюдна ва ўсходніх раёнах Беларусі, у тым ліку і на Веткаўшчыне, згодна з дырэктывай СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 6 ліпеня 1941 г., пры прадпрыемствах, на транспарце, у саўгасах, калгасах ствараліся атрады народнага апалчэння.

У іх задачы ўваходзіла падтрымка Чырвонай Арміі ў праводзімых ёй аперацыях, у прасоўванні грузаў, у арганізацыі сувязі, разведкі, аховы гарадоў, фабрык, заводаў, калгасаў, мастоў, сродкаў сувязі, арганізацыя барацьбы з дэсантамі і дыверсіённымі групамі праціўніка і інш. У выпадку акупацыі мясцовасці ворагам атрады народнага апалчэння павінны былі пераходзіць да метадаў партызанскай барацьбы.

Згодна звестак ваеннага аддзела Гомельскага абкома КП(б)Б аб колькасным складзе атрадаў народнага апалчэння вобласці, на 1 жніўня 1941 г. у Веткаўскім атрадзе налічвалася 140 чалавек, у Свяцілавіцкім — 745 чалавек (Всенародное партизанское движение в Белоруссии... Т. I. С. 56—57,58).

А тым часам становішча на франтах ускладнялася. 8—10 жніўня 1941 г. нямецкія войскі прарвалі абарону 21-й арміі на ўчастку Крычаў — Прапойск — Рэчыца і выйшлі на подступы да Гомеля. Упартыя баі разгарнуліся ў раёне вёсак Сямёнаўка і Пакалюбічы, дзе разам з часцямі Чырвонай Арміі змагаліся апалчэнцы Гомеля. Лінія фронту ўшчыльную наблізілася да межаў Веткаўскага раёна.

18 жніўня войскі Цэнтральнага фронта вялі цяжкія баі на ўсіх напрамках. Праціўнік, сустрэўшы ўпартае супраціўленне часцей Чырвонай Арміі, вымушаны быў перагрупіраваць свае сілы. Яго 1-я кавалерыйская дывізія абышла правы фланг атрада падпалкоўніка Маневіча[1], заняла Хальч, фарсіравала раку Сож у раёне Веткі. Адціснуўшы часці 55-й танкавай дывізіі [2], яна рушыла да Добруша. Узнікла пагроза для Гомеля з напрамку Ветка — Добруш.

Асабліва жорсткія баі разгарнуліся за г. Ветку, які абаранялі часці 55-й дывізіі. Напярэдадні рашучых баёў воіны аднаго з палкоў гэтага злучэння пісалі землякам-калгаснікам: "Обещаем сражаться с врагом не щадя сил и жизни. За наших матерей, жен и детей, за нашу честь и свободу мы будем сражаться до последнего дыхания, а если придется умереть, то будем умирать так, чтобы от нашей смерти было страшно врагу".

Сваё абяцанне яны з гонарам стрымалі. Горад Ветка некалькі разоў пераходзіў з рук у рукі. Палкі 55-й дывізіі неаднаразова пераходзілі ў контратакі. Толькі пасля таго, як гітлераўцы падцягнулі дадат-

[1] Атрад падпалкоўніка Маневіча налічваў 1200 чалавек, меў батарэю 76 мм гармат.

[2] Дывізія не мела танкаў і дзейнічала як стралковая.

ковыя сілы, нашы часці, панёсшы вельмі вялікія страты, на гэтым участку вымушаны былі адысці ў лясы на ўсход ад Добруша. У баях за Ветку асабліва вызначыўся 1010-й полк. Яго воіны мужна змагаліся, нягледзячы на цяжкія страты. Быў паранены камандзір палка. З трох камандзіраў батальёнаў адзін быў забіты, два паранены. У рукапашных сутычках загінула многа байцоў і малодшых камандзіраў. Але нягледзячы на гэта, полк не страціў боездольнасці і арганізавана адступіў на ўсход.

Стойка ўтрымлівалі займаемыя рубяжы атрады пад кіраўніцтвам камбрыга Гусеўскага. Ваенны Савет фронта падмацаваў яго стралковым і артылерыйскім палкамі 266-й стралковай дывізіі.

Аб тым, як змагаліся савецкія воіны пад камандаваннем Гусеўскага, сведчыць данясенне інспектара палітупраўлення фронта батальённага камісара Купервацкага, які з групай палітработнікаў знаходзіўся на пярэднім краі. "...Камуністычныя атрады ў гэтыя дні стойка выконвалі пастаўленыя задачы, — пісаў ён. — Пры гэтым асабліва вызначыўся атрад данбаскіх шахцёраў пад камандаваннем маёра Смолькіна і палкавога камісара Андрэева. Атрад не ўступаў праціўніку ні адзінай пядзі зямлі. Панёсшы цяжкія страты — да 70 працэнтаў асабовага складу, атрад выстаяў. Храбра змагаўся і атрад тав. Маневіча і ваеннага камісара старшага палітрука Ермакова. Ён стойка абараняў шашу Касцюкоўка — Яроміна да 12.00 19 жніўня".

Насельніцтва Веткаўшчыны дапамагала савецкім воінам усім, чым толькі магло. Калгасы забяспечвалі іх прадуктамі харчавання, фуражом. У населеных пунктах разгортваліся шпіталі і медыцынскія пункты. Жыхары прымалі актыўны ўдзел у лячэнні чырвонаармейцаў, многім дапамаглі вярнуцца ў строй, у якасці праваднікоў дапамагалі часцям Чырвонай Арміі выходзіць з акружэння. У складаных умовах прыфрантавой і франтавой паласы яны мужна выконвалі свае гаспадарчыя абавязкі, удзельнічалі ў збудаванні абарончых рубяжоў.

Але ў вайны былі свае законы, якія не ўлічваюць чалавечыя жаданні, імкненні. На вайне апошняе слова заўсёды застаецца за сілай, а ў той час яна была на баку гітлераўцаў.

18 жніўня 1941 г. Ветка была захоплена ворагам. Наступілі змрочныя дні акупацыі, якія працягваліся два гады і тры месяцы.

На акупіраванай тэрыторыі раёна, як і на ўсёй захопленай тэрыторыі рэспублікі, гітлераўцы ўстанавілі жорсткі акупацыйны рэжым. Асноўны яго сэнс зводзіўся да таго, каб самымі бязлітаснымі сродкамі і мерамі не дапусціць супраціўлення нашага народа, фізічна знішчыць значную частку насельніцтва краіны, а астатніх ператварыць у паслухмяных рабоў.

Яшчэ задоўга да агрэсіі верхаводы трэцяга рэйха адобрылі распрацаваны гітлераўскім апаратам план падзелу захопленай тэрыторыі. Восенню 1941 г. падзел часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі быў у асноўным завершаны. Яе этнаграфічную цэласную тэрыторыю, у тым ліку і Гомельшчыну, захопнікі гвалтоўна парэзалі на часткі, груба парушыўшы пры гэтым супольнасць тэрыторыі, мовы, культуры беларускага народа, якія склаліся гістарычна. Паўднёвыя раёны Гомелыпчыны былі ўключаны ў рэйхскамісарыят "Украіна", астатнія, якія назвалі Гомельскай акругай, — у зону армейскага тылу групы армій "Цэнтр". У гэтую акругу ўвайшлі Гомельскі, Добрушскі, Веткаўскі, Свяцілавіцкі, Чачэрскі, Уваравіцкі, Буда-Кашалёўскі, Церахоўскі раёны вобласці.

Для ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі сюды прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і

іншыя карныя органы. У зоне Гомельскай акругі дзейнічалі "тайльгрупы" з зондэркаманды-8, якую ўзначальваў дзяржаўны саветнік штурмбанфюрэр СС кат Рыхтэр.

Уся ўлада ў акрузе належала ваеннаму каменданту палкоўніку Лаубу, пазней — палкоўніку Кайзенбергу.

У Ветцы размясціліся раённая і гарадская камендатуры, якім належала ўся ўлада, аддзяленне жандармерыі і іншыя карныя органы.

Для больш эфектыўнага ажыццяўлення сваёй злачыннай палітыкі акупанты спрабавалі заручыцца падтрымкай мясцовага насельніцтва. Для надання бачнасці мясцовага самакіравання яны стварылі марыянетачную "мясцовую" ўладу — раённыя, валасныя ўправы, у кожнай вёсцы прызначылі стараст.

Для падтрымання свайго "парадку" і барацьбы з партызанамі і падпольшчыкамі гітлераўцы стварылі з мясцовых жыхароў, якія перайшлі да іх на службу, так званую дапаможную паліцыю парадку. Гарнізоны з такіх паліцэйскіх былі створаны ў буйных вёсках Веткаўскага і Свяцілавіцкага раёнаў — Новых Грамыках, Хальчы, Рудні, Вялікіх Нямках, Свяцілавічах і інш.

Ва ўсіх населеных пунктах былі абнародаваны загады акупантаў з пагрозай расстрэлу за парушэнне каменданцкага часу, за рататанне чырвонаармейцаў, дапамогу партызанам.

Гітлераўцы рабавалі прадпрыемствы, калгасы, сялянскія гаспадаркі. Замест калгасаў стварылі так званыя абшчынныя гаспадаркі. Строга сачылі за падзелам зямлі, надзяляючы ёю перш за ўсё тых, хто лаяльна ставіўся да акупацыйных ўлад, падтрымліваў іх. Сяляне абкладаліся вялікімі падаткамі збожжа, бульбы, мяса, малака, фуражу. Акупанты гвалтоўна забіралі ў сялян цёплае адзенне для сваёй арміі, рабавалі іх маёмасць.

За невыкананне нарыхтовак у сялян адбіралі надзелы, жывёлу, падвяргалі рэпрэсіям. Але вяскоўцы усяляк зрывалі здачу сельскагаспадарчых прадуктаў, сабаціравалі ўсе мерапрыемствы акупантаў. Толькі ў першыя месяцы 1942 г. нямецкія ўлады не дабралі ў лік паставак па Веткаўскаму раёну 510 галоў жывёлы, што складала больш паловы ад запланаванай колькасці. У адказ акупанты разгарнулі шырокія рэпрэсіі.

18 жніўня 1941 г. калона гітлераўцаў уварвалася ў вёску Старое Сяло. Пачалося рабаванне сялян. З дома Панцялея Раманькова яны забралі нават выпечаны хлеб. Гаспадар звярнуўся з просьбай пакінуць хоць адзін бохан для малых дзяцей. У адказ нямецкі афіцэр застрэліў Раманькова.

Акупанты прымушалі калгаснікаў баранаваць дарогі, каб абясшкодзіць іх ад партызанскіх мін.

У Ветцы з першых дзён акупацыі гітлераўцы стварылі гета, куды сагналі жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Іх прымусілі насіць на спіне і грудзях апазнавальныя знакі — жоўтыя латы і шасціканцовыя зоркі, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі. Ім забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месцажыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, наведваць культурныя ўстановы, школы. У камендатуры горада прайшла рэгістрацыя ўсіх вязняў гета. Жылі яны ў цяжкіх умовах, на галодным пайку. Акупанты рабавалі насельніцтва гета, адбіралі золата, срэбра і іншыя каштоўнасці. Яўрэяў прымушалі выконваць самую цяжкую работу. Рабочы дзень для іх працягваўся па 12—14 гадзін. многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі.

Масавыя забойствы вязняў Веткаўскага гета адбыліся ў снежні 1941 г. і верасні 1942 г. Было знішчана больш за 400 чалавек, у асноўным старых, жанчын, дзяцей.

У складаных умовах нараджаўся, рос і шырыўся антыфашысцкі рух на Веткаўшчыне. Тэрор і насілле гітлераўцаў не зламалі волі веткаўчан. Усё больш патрыётаў узнімалася на барацьбу супраць акупантаў.

У адпаведнасці з партыйнымі і ўрадавымі дырэктывамі ў Веткаўскім і Свяцілавіцкім раёнах, як і наогул на ўсёй тэрыторыі Гомельшчыны, была праведзена значная падрыхтоўчая работа для пераходу да падпольнай барацьбы і разгортванню партызанскага руху.

Яшчэ да акупацыі нямецка-фашысцкімі войскамі Веткаўскага і Свяцілавіцкага раёнаў у канцы ліпеня — сярэдзіне жніўня 1941 г. на іх тэрыторыі было створана 9 партызанскіх груп. У Веткаўскім раёне 4 групы, якія налічвалі 78 чалавек, на чале з загадчыкам аддзела райкома КП(б)Б В. Н. Окуневым і Свяцілавіцкім — 5 груп у складзе 116 чалавек на чале з Аляшкевічам. (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 4. Воп. 33. Спр. 65. Л. 60.)

Восенню 1941 г. быў створаны Веткаўскі партызанскі атрад. Аднак, праіснаваўшы два месяцы, з-за неспрыяльных умоў і галоўным чынам адсутнасці матэрыяльнай базы, вопыту барацьбы ў тыле ворага, пасля некалькіх баёў з праціўнікам атрад прымушаны быў разгрупаваць свае сілы на невялікія групы. Частка партызан разышлася па хатах і перайшла да падпольнай работы, другая — выйшла за лінію фронту.

У лістападзе 1941 г. быў створаны Свяцілавіцкі партызанскі атрад на чале з сакратаром Свяцілавіцкага райкома КП(б)Б В. А. Абушэнкам.

Трэба адзначыць, што восенню і зімой 1941 — 1942 гг. становішча партызанскіх груп на Беларусі, у тым ліку і Веткаўшчыне, было вельмі цяжкім. Не было сувязі з Вялікай зямлёй, не хапала зброі, боепрыпасаў, прадуктаў харчавання, цёплай вопраткі. У вёсках насельніцтва тэрарызавалі акупанты, якія распаўсюджвалі правакацыйныя чуткі аб разгроме Чырвонай Арміі, захопе Масквы і Ленінграда. Усё гэта адмоўна адбівалася на развіцці партызанскага руху.

Увосень 1941 г. асноўныя партызанскія сілы дыслацыраваліся ў Лявонцеўскай дачы Веткаўскага раёна. Сюды ў лістападзе 1941 г. перайшлі гомельскія гарадскі (камандзір І. С. Федасеенка) і сельскі (камандзір К. У. Буры) атрады. Разам з імі прыбыў сакратар Гомельскага абкома КП(б)Б А. А. Куцак, які ажыццяўляў кіраўніцтва партыйным падполлем і партызанскім рухам на поўначы Гомельскай вобласці.

Нягледзячы на тое, што партызанскія атрады былі невялікімі, яны праводзілі актыўныя баявыя дзеянні: рабілі засады супраць гітлераўцаў, падрывалі варожыя аўтамашыны, знішчалі паліцэйскія ўчасткі.

У гэты час ішоў складаны працэс у арганізацыі партызанскіх сіл. У снежні 1941 г. Свяцілавіцкі атрад аб'яднаўся з Гомельскім сельскім атрадам пад камандаваннем К. В. Бурага. У лютым 1942 г. выйшаў з яго ў сувязі з пераходам апошняга ў свой раён. Група В. А. Абушэнкі зноў пачала работу па стварэнню Свяцілавіцкага партызанскага атрада, які і быў сфарміраваны ў лютым 1942 г. Да мая 1942 г. атрад налічваў больш за 20 чалавек.

Вось як аб гэтых падзеях успамінаў былы сакратар Чачэрскага падпольнага райкома КП(б)Б, камісар партызанскага атрада імя М. І. Калініна, камісар 1-й Гомельскай брыгады П. І. Дзедзік: "...Чечерская районная партийная организация оказала практическую помощь коммунистам соседних районов в создании партизанских отрядов. В Светиловичской партизанской группе во главе с секретарем РК КП(б)Б В. А. Абушенко было всего шесть народных мстителей. По предложению А.

А. Куцака они объединились с партизанами Гомельского сельского отряда, в котором насчитывалось 13 человек. К нам приходило много военнопленных. Их объединили в одну группу, которую возглавил И. Н. Филиппов. В конце марта 1942 г. по нашему предложению группа В. А. Абушенко перешла в группу И. Н. Филиппова. Из них был создан Светиловичский партизанский отряд, командиром которого стал И. Н. Филиппов, а комиссаром — В. А. Абушенко" (В грозовые годы. Мн., 1987. С. 46).

Пад уплывам перамогі Чырвонай Арміі пад Масквой і актыўных баявых дзеянняў партызан павялічваўся прыток патрыётаў у атрады. У гэтым сваю станоўчую ролю адыгралі прапагандысцкія конныя рэйды партызан па вёсках. У партызаны ішлі мясцовыя жыхары, чырвонаармейцы, якія трапілі ў акружэнне ці збеглі з фашысцкага палону.

У выніку актыўных баявых дзеянняў партызан была створана Чачэрская партызанская зона, у якую ўваходзілі больш за 100 населеных пунктаў Чачэрскага, Кармянскага, Свяцілавіцкага, Краснапольскага і Краснагорскага раёнаў. Зона ахоплівала амаль усё левабярэжжа ракі Сож. У ёй дзейнічалі органы Савецкай ўлады — райвыканком на чале з былым дырэктарам Чачэрскай МТС Т. К. Кароткім, старшыні сельсаветаў. Ім у дапамогу былі створаны гаспадарчыя камісіі, якія займаліся пытаннямі размеркавання зямлі, лугоў, цяглавай сілы, інвентару і г.д.

Сілы партызан у зоне павялічваліся. У канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1942 г. сюды прыбылі Прапойскі партызанскі атрад (камандзір І. А. Сцефаненка, камісар Г. П. Баснін), Кармянскі атрад (камандзір А. І. Ушаў, камісар М. С. Бруек), спецгрупы НКГБ СССР і БССР "Уперад" (камандзір П. Г. Шамякін), "Другія" (камандзір П. П. Качуеўскі, камісар Н. В. Зябніцкі), спецгрупа М. А. Міхайлашава, разведгрупа Заходняга фронту пад камандаваннем А. К. Новікава. Тут заставаліся Веткаўскі і Свяцілавіцкія атрады.

Для каардынацыі дзеянняў партызанскіх сіл зоны 6 ліпеня 1942 г. Гомельскі падпольны абком КП(б)Б правёў нараду камандзіраў атрадаў, кіруючых партыйных і савецкіх работнікаў. На нарадзе было створана камандаванне аб'яднаных партызанскіх атрадаў і спецгруп. Камандзірам аб'яднанага штаба быў прызначаны П. Г. Шамякін, камісарам — сакратар Гомельскага падпольнага абкома КП(б)Б А. А. Куцак. У састаў штаба ўвайшлі І. П. Крывенчанка, І. А. Сцефаненка, П. А. Балыкоў, А. К. Новікаў. Стварэнне аб'яднанага штаба партызанскіх атрадаў станоўча адбілася на актывізацыі баявой дзейнасці народных мсціўцаў. Да восені 1942 г. аб'яднаныя сілы партызан, якія налічвалі 915 чалавек, пусцілі пад адхон 66 варожых эшалонаў, знішчылі 1 браняпоезд, 1 аварыйны цягнік, 49 цыстэрн з палівам, 6 самалётаў, узарвалі 34 шашэйныя масты, затапілі 2 баржы, знішчылі 84 грузавыя і легкавыя аўтамашыны, 15 матацыклаў, разабралі 2 кіламетры чыгункі, парушылі 12 кіламетраў тэлефонна-тэлеграфнай сувязі. Амаль усе атрады пакінулі лясныя базы і перайшлі ў вёскі. За кожным атрадам былі замацаваны пэўныя ўчасткі абароны зоны. Рака Сож стала мяжой паміж усходняй партызанскай тэрыторыяй і заходняй, акупіраванай гітлераўцамі.

Занепакоеныя дзеяннямі партызан у тыле сваіх войскаў, гітлераўцы арганізоўвалі супраць іх карныя экспедыцыі. Адна з іх была праведзена ў ліпені 1942 г. у Веткаўскім і Чачэрскім раёнах Гомельскай вобласці і Краснапольскім раёне Магілёўскай вобласці сіламі двух батальёнаў 638-га ахоўнага палка пры падтрымцы артылерыі, танкаў і авіяцыі супраць 700 партызан, якія базіраваліся ў гэтых раёнах.

Карнікі мелі намер адным ударам разграміць і знішчыць партызан. Аднак

мэты сваёй не дасягнулі. 21 ліпеня 1942 г., у першы дзень наступлення фашысцкіх войск, партызанскія атрады пад камандаваннем П. А. Балыкова, П. І. Дзедзіка, І. Н. Філіпава і В. А. Абушэнкі ў вёсцы Покаць смела ўступілі ў бой, у выніку якога знішчылі 150 нямецкіх салдат і афіцэраў. На другім напрамку — у вёсцы Палессе — адбівала атакі карнікаў партызанская група пад камандаваннем М. А. Шульгіна. Адважна змагаліся, наносячы ўдары па ворагу з засад, групы партызан, якімі камандавалі М. А. Міхайлашаў, А. Н. Падабедаў, Я. Л. Дуброўскі, Я. С. Тарасенка і іншыя.

Пасля некалькіх дзён жорсткіх баёў аб'яднаны штаб партызанскіх атрадаў аддаў загад адкрытых баёў не прымаць. Чачэрскаму і Свяцілавіцкаму атрадам было загадана разбіцца на мелкія групы і на тэрыторыях сваіх раёнаў дзейнічаць з засад. Астатнім — прарывацца з блакады ў клятнянскія лясы Арлоўскай вобласці (РСФСР). Камандзіры беларускіх атрадаў А. І. Умаў і П. Р. Шамякін хутка вярнуліся на свае месцы і разгарнулі работу па стварэнню новых партызанскіх атрадаў.

Летняя блакада не дала чакаемых вынікаў для карнікаў. Ім не ўдалося знішчыць партызан. Сваю злосць яны вымяшчалі на мясцовых жыхарах.

Пасля блакады вакол лясных масіваў гітлераўцы стварылі буйныя апорныя пункты, гарнізоны якіх складаліся галоўным чынам з нямецкіх салдат.

28 жніўня 1942 г. у чачэрскія лясы прыбыло Чарнігаўскае партызанскае злучэнне пад камандаваннем А. Ф. Фёдарава. Цяжкае становішча, калі вораг заблакіраваў усе шляхі, пастаянна прачосваў лес, вымусіла ўкраінскіх партызан адысці ў клятнянскія лясы Арлоўскай вобласці. Разам з імі выйшлі туды Чачэрскі і Свяцілавіцкі партызанскія атрады.

У снежні 1942 г. з Масквы ў клятнянскія лясы прыбыў упаўнаважаны ЦК КП(б)Б і БШПР І. Я. Палякоў. Ён прывёз загад беларускім атрадам вярнуцца ў раёны сваёй дзейнасці і выказаў незадаволенасць камандаванню ўкраінскіх партызанскіх злучэнняў за самавольнае ўключэнне ў свой склад беларускіх партызан.

